# ВЕСЦІ
## НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК 2011 № 2

# ИЗВЕСТИЯ
## НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ

СЕРИЯ ГУМАНИТАРНЫХ НАУК 2011 № 2

ЗАСНАВАЛЬНІК – НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

Часопіс выдаецца са студзеня 1956 г.

Выходзіць чатыры разы ў год

## ЗМЕСТ

### ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ

**Навіцкая Т. Я.** Сучасныя рэлятывісцкія мадэлі сацыяльнай прасторы ........ 4
**Квилинкова Е. Н., Сакович В. А.** Национальные культуры в условиях глобализации ........ 9
**Палхоўская К. Б.** Тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да вывучэння эканамічных паводзін ........ 15

### ПРАВА

**Давыдзік У. У.** Нарматыўная прававая база дзяржаўнай пагранічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь ........ 22
**Лосеў С. С.** Маёмасныя аўтарскія правы ў грамадзянскім праве Рэспублікі Беларусь ........ 28

### ЭКАНОМІКА

**Нікіценка П. Г., Пачэкін В. Л.** Навуковыя асновы інфармацыйнай бяспекі знешняй эканамічнай дзейнасці ........ 35
**Сафонава В. А.** Метадычныя аспекты ідэнтыфікацыі і фарміравання кластараў у мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь ........ 46

## ГІСТОРЫЯ

**Зябко А. А.** Адносіны беларускага настаўніцтва да воінскага абавязку напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны .......... 53
**Фірыновіч А. Э.** «Жаночы фактар» у паўстанні 1863–1864 гг.: інфармацыйны патэнцыял беларускіх архівасховішчаў .......... 59
**Радзюк А. Л.** Беларускія кааператывы ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.): сучасны стан даследавання праблемы .......... 66

## МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР

**Семікава А. В.** Вакальнае эстраднае мастацтва Беларусі: этапы станаўлення і развіцця ў XX стагоддзі .......... 74
**Клімовіч Ю. М.** Ансамблевае музіцыраванне як від музычна-выканаўчай дзейнасці .......... 83
**Свярдлоў П. Л.** Праблемы аўтарства ў беларускай музычнай журналістыцы .......... 88

## ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА

**Гараднiцкі Я. А.** Суб'ектнасць структуры рамана Івана Мележа «Завеі, снежань» .......... 95
**Шамякіна С. В.** Сістэмнасць кампанентаў змястоўнай структуры рэчыўных вобразаў (на матэрыяле беларускіх чарадзейных казак) .......... 101

## МОВАЗНАЎСТВА

**Мароз В. К.** Летапісныя разначытанні як адлюстраванне варыянтнага формаўжывання ў нарматворчых працэсах старабеларускай мовы .......... 106
**Федунова Т. В.** Супастаўляльныя даследаванні лексічнай сістэмы моў: вопыт семасіялагічнага аналізу.... 112

## ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ

**Міхаіл Фёдаравіч Піліпенка** (Да 75-годдзя з дня нараджэння) .......... 119
**Аляксандр Аляксандравіч Каваленя** (Да 65-годдзя з дня нараджэння) .......... 122

ИЗВЕСТИЯ НАЦИОНАЛЬНОЙ АКАДЕМИИ НАУК БЕЛАРУСИ 2011 № 2

Серия гуманитарных наук

*на русском и белорусском языках*

Тэхнічны рэдактар М. В. Савіцкая
Камп'ютарная вёрстка В. А. Тоўстая

---

Здадзена ў набор 21.03.2011. Падпісана ў друк 22.04.2011. Выхад у свет 27.04.2011. Фармат 60 × 84$^{1}/_{8}$. Папера афсетная. Ум. друк. арк. 14,88. Ул.-выд. арк. 16,4. Тыраж 170 экз. Заказ 91. Кошт нумару: індывідуальная падпіска – 18850 руб.; ведамасная падпіска – 46794 руб.

---

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецкі дом «Беларуская навука». ЛИ № 02330/0494405 ад 27.03.2009. Вул. Ф. Скарыны, 40, 220141, Мінск. Пасведчанне аб рэгістрацыі № 394 ад 18.05.2009.

Надрукавана ў РУП «Выдавецкі дом «Беларуская навука».

© Выдавецкі дом «Беларуская навука»
Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук, 2011

# PROCEEDINGS
## OF THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

HUMANITARIAN SERIES 2011 N 2

FOUNDER IS THE NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

The Journal has been published since January 1956

Issued four times a year

## CONTENTS

### PHILOSOPHY AND SOCIOLOGY

**Navitskaya T. E.** Contemporary relativistic models of the social space .......... 4
**Kvilinkova E. N., Sakovich V. A.** National cultures in conditions of the globalization .......... 9
**Palkhouskaya K. B.** Theoretic and methodological approaches to the economic behaviour investigation .......... 15

### LAW

**Davydzik V. V.** Normative legislation base of the state border policy of the Republic of Belarus.......... 22
**Loseu S. S.** Intellectual property rights in the civil law of the Republic of Belarus .......... 28

### ECONOMICS

**Nikitenko P. G., Pochekin V. L.** Scientific fundamentals of information security in the external economic activity....... 35
**Safonova O. A.** Methodical aspects of cluster identification and formation in the social and economic development model of the Republic of Belarus. .......... 46

### HISTORY

**Zyabko A. A.** Belarussian teachers attitude to the military service before and during the years of the First world war.... 53
**Firynovich A. E.** «Feminine factor» in the revolt of 1863–1864: information potential of Belarusian archive depositaries .......... 59
**Radzyuk A. L.** Belarusian cooperative societies in Western Belarus (1921–1939): current state of the problem research.......... 66

### ARTS, ETHNOGRAPHY AND FOLKLORE

**Semikova A. V.** Vocal popular art of Belarus: stages of formation and development in XX century.......... 74
**Klimovich Yu. M.** Musical companies as kind of musical activity.......... 83
**Svyardlou P. L.** Authorship problems in Belarusian musical journalism .......... 88

### LITERATURE STUDIES

**Haradnitski Y. A.** Structure subjectness of Ivan Meležh's novel «Snowstorms. December» .......... 95
**Shamyakina S. V.** System of material images substantial structure components (on examples of the Belarusian magic fairy tales) .......... 101

### LINGUISTICS

**Maroz V. K.** Different interpretations of annals as illustration of the variant form use in norm-building processes of the ancient Belarusian language .......... 106
**Fedunova T. V.** Comparative investigations of lexical system of different languages: experience of the semasiological analysis. .......... 112

### SCIENTISTS OF BELARUS

**Mikhail Fyodorovich Pilipenka** (To the 75th anniversary).......... 119
**Aliaksandr Aliaksandravich Kavalenia** (To the 65th anniversary).......... 122

## *ФІЛАСОФІЯ І САЦЫЯЛОГІЯ*

*УДК 101. 1: 316. 4 + 316. 2*

*Т. Я. НАВІЦКАЯ*

# СУЧАСНЫЯ РЭЛЯТЫВІСЦКІЯ МАДЭЛІ САЦЫЯЛЬНАЙ ПРАСТОРЫ

*Інстытут філасофіі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 15.06.2010)*

Адной з адметных рыс сацыяльна-гуманітарнага дыскурса канца XX – пачатку XXI ст. стала актуалізацыя прасторавай тэматыкі. Маштабы такога зрушэння акцэнтаў у вывучэнні соцыуму дазваляюць некаторым даследчыкам нават класіфікаваць яго як «прасторавы паварот» [1, с. 7]. Сапраўды, «прасторавая» тэрміналогія набыла незвычайную папулярнасць у сацыяльных навуках апошніх гадоў. Кажучы аб прычынах дадзенай з'явы, можна адзначыць перш за ўсё сучасныя глабалізацыйныя працэсы і развіццё тэлекамунікацыйных, інфармацыйных і камп'ютарных тэхналогій, якія вядуць да ўсеагульнага паскарэння і сціскання прасторава-часавых дыстанцый і, як вынік, стымулююць цікавасць да праблематыкі сацыяльнай прасторы. У гэтай сувязі ўзнікае неабходнасць у пераасэнсаванні дадзенай катэгорыі і мадэляў, што адлюстроўваюць сучасную сацыяльна-прасторавую структуру. Асаблівую тэарэтыка-метадалагічную значнасць набывае выкарыстанне гэтых мадэляў для аналізу трансфармацый, якія адбываюцца ў свеце пад уздзеяннем працэсаў глабалізацыі, у прыватнасці, яны могуць быць ужыты пры даследаванні сацыяльна-прасторавых аспектаў беларускага грамадства, якія на сённяшні дзень неабходна разглядаць у кантэксце трансмежных палітычных, эканамічных, культурных і сацыяльных сувязяў.

Да надзвычай актуальных праблем сацыяльнай прасторы, якія сталі прадметам даследавання сучасных грамадазнаўцаў, належаць: па-першае, праблемы структуравання транснацыянальнай прасторы, а таксама праблемы сацыяльнай дыстанцыі і кіравання ў дадзеным кантэксце; па-другое, праблемы, звязаныя з крызісам нацыянальнай дзяржавы, інтэрпрэтацыя якіх у сацыяльнай літаратуры вагаецца ад глыбока песімістычных прагнозаў да імкнення да ідэалаў касмапалітычнага грамадства; па-трэцяе, праблемы арганізацыі гарадской прасторы (у тым ліку публічнай), вытворчасці ў кантэксце сацыяльнай прасторы горада практык штодзённасці і г. д. Акрамя таго, прадметам вывучэння застаюцца такія праблемы, як азначэнне катэгорыі сацыяльнай прасторы, суадносіны геаграфічнай і фізічнай прастор, прыроды і функцыянавання ўлады, што канстытуюе сучасную сацыяльную прастору. Вынікі падобнага роду даследаванняў прадстаўлены ў канцэпцыях А. Негры і М. Харта, Н. Кляйн, Э. Тода, З. Баумана, П. Вірыльё, М. Кастэльса, У. Бека, Э. Гідэнса.

Аднак шырокая распаўсюджанасць метафары прасторы ў даследаваннях сацыяльнага жыцця вядзе да шэрагу недахопаў. Так, часта змест дадзенага паняцця выразна не артыкуляваны, яно ўжываецца варыятыўна, надзяляецца занадта шырокім значэннем: пад спецыфічнай «прасторай» разумеецца адвольнае мноства працэсаў і з'яў, якія маюць месца ў дадзенай сферы грамадства.

Апрача таго, цяжкасці падчас азначэння сацыяльнай прасторы выклікае праблема яе суадносін з фізічнай прасторай, кожны раз непазбежна патрабуючая тлумачэння пры звароце да дадзенай тэмы. У гэтай сувязі, каб пазбегнуць залішняга «геаграфізму», мэтазгодна звярнуцца да традыцыі ў трактоўцы сацыяльнай прасторы ў сацыялогіі – ад Э. Дзюркгейма, які лічыў сацыяль-

ную арганізацыю «ўзорам прасторавай арганізацыі, якая з'яўляецца як бы калькай з першай» [3, с. 189], да П. Бурдзьё, што разглядаў фізічную прастору як сацыяльную канструкцыю і праекцыю сацыяльнай прасторы, сацыяльную структуру ў аб'ектаваным стане, аб'ектывацыю і натуралізацыю мінулых і цяперашніх сацыяльных адносін [4, с. 40]. Неабходна падкрэсліць, што сацыяльная прастора тут разглядаецца ў кантэксце яе дыферэнцыяцыі, прысвойвання і кластарызацыі: Э. Дзюркгейм у якасці прыкладу прыводзіць арганізацыю паселішчаў некаторых амерыканскіх плямёнаў, П. Бурдзьё – схему кабільскага дома або план горада.

Безумоўна, з аднаго боку, фізічная прастора аказваецца асновай для выбудоўвання сацыяльнай прасторы, шэраг характарыстык, што задаюць сацыяльна-прасторавую спецыфіку, забяспечваецца ландшафтам, аднак, з другога – сацыяльная прастора з'яўляецца парадкам і вынікам *сацыяльных адносін*, г. зн. яна матэрыялізуецца ў наглядных формах, але не зводзіцца выключна да іх. Таму ў далейшым у якасці зыходнага паняцця будзем разглядаць сацыяльную прастору як шматмерную сістэму ўзаемазвязаных паміж сабой сацыяльных адносін, уключаных у тэрытарыяльны кантэкст.

Варта адзначыць не толькі сацыяльную абумоўленасць прасторавых размяшчэнняў у грамадстве, але і ўяўленняў аб прасторы, якія знаходзяць сваё выяўленне як на штодзённым узроўні (у вобразнай форме, мове, камунікацыі), так і на тэарэтычным, з'яўляючыся прадметам спецыяльнага даследавання (у філасофіі, сацыялогіі, сацыяльнай геаграфіі). Існуе пэўная сувязь паміж падыходамі да разумення прасторы ва ўласным сэнсе, г. зн. фізічнай (прасторы целаў, якія характарызуюцца формай і працягласцю і канфігуратыўна размяшчаюцца ў адносінах адзін да аднаго) і канцэпцыямі сацыяльнай прасторы, у якіх дадзенае паняцце ўсё ж выкарыстоўваецца метафарычна (з мэтай візуалізацыі гетэрагенных сацыяльных адносін). Такім чынам, філасофскія канцэпцыі прасторы могуць быць аплікаваны на тэарэтычныя сацыяльна-тапалагічныя схемы. У дадзенай сувязі найбольшую цікавасць для нашага аналізу ўяўляе рэлятывісцкая ідэя прасторы, выяўленая ў сваёй класічнай форме Г. В. Лейбніцам, паколькі яе асноўныя палажэнні знайшлі сваё выяўленне (зразумела, у мадыфікаваным выглядзе) у большасці сучасных сацыяльна-прасторавых канцэпцый.

Мэтай артыкула з'яўляецца тэарэтыка-метадалагічны аналіз сучасных рэлятывісцкіх мадэляў сацыяльнай прасторы, а таксама схем яе арганізацыі і канстытуявання.

Паводле Г. В. Лейбніца, прастора ёсць «не што іншае, як парадак існавання рэчаў, што разглядаюцца ў іх адначасовасці» [5, с. 473]. Яна не з'яўляецца анталагічнай сутнасцю рэчаў, а толькі вынікам іх карэляцый: узаемаадносіны спараджаюць прастору. Манады, у адпаведнасці з думкай Г. В. Лейбніца, з'яўляючыся элементамі ўсіх рэчаў, не размяшчаюцца ў нейкай кантэйнерызаванай прасторы, што ім папярэднічае, яны самі ўтвараюць прастору. Прастора ўяўляе сабой вытворны феномен (спосаб праявы рэальнасці), парадак адносін, фундаваны ўзаемадзеяннем манад. Патрэбна адзначыць прынцыповае палажэнне Г. В. Лейбніца аб успрыманні свету кожнай манадай ва ўласнай унікальнай перспектыве. З множнасці перспектыў і магчымасці іх змены ў сваю чаргу вынікае дынамічная прырода прасторавасці.

Вельмі выразна генетычная сувязь з рэлятывісцкай ідэяй прасторавасці Г. В. Лейбніца прасочваецца ў канцэпцыі французскага сацыёлага П. Бурдзьё. У якасці базавых элементаў яго тэарэтычнай мадэлі сацыяльнай прасторы выступаюць паняцці сілы, сацыяльнага поля, капіталу і габітуса. З першага позірку сацыяльная прастора можа быць разгледжана як структура сацыяльных пазіцый. Такое азначэнне падкрэслівае яе рэляцыйную прыроду: структураўтваральным фактарам з'яўляюцца сацыяльныя практыкі, з дапамогай якіх суадносяцца сацыяльныя агенты. Апошнія ў сваю чаргу могуць быць ахарактарызаваны як носьбіты габітуса (сукупнасці схем успрымання, усталёвак, звычак, фундаваных сацыяльным статусам індывіда), арыентаваныя на падтрыманне або змену ўласнага становішча ў кантэксце сацыяльнай прасторы.

Аднак у дадзенай сувязі важна падкрэсліць, што сацыяльная прастора канстытуюецца, па П. Бурдзьё, не як нейкія адвольныя суадносіны паміж індывідамі, якія займаюць у ёй пазіцыі. Яна ёсць не проста візуалізацыя сацыяльнай канфігурацыі, яе прынцыповай рысай з'яўляецца сілавая прырода. Калі разглядаць сацыяльна-тапалагічную мадэль П. Бурдзьё як спадчынніцу субстанцыйнага рэлятывізму Г. В. Лейбніца, нельга апусціць той факт, што значную ролю

ў канцэпцыі французскага сацыёлага адыгрывае паняцце сілы. Нагадаем, што, паводле манадалагічнай інтэрпрэтацыі субстанцыі, прастора апісваецца як суадносіны сіл (падрабязны аналіз дадзенага пытання ажыццёўлены ў артыкуле Н. А. Шматко [6]). Расійская даследчыца адзначае шэраг метадалагічных патрабаванняў у канцэпцыі П. Бурдзьё, звязаных з выкарыстаннем канцэпту сілы, адносячы да іх ліку наступныя:

1) поле канстытуюецца спецыфічнымі сіламі;

2) адносіны сілы выяўляюцца як размеркаванне адпаведнага капіталу або актыўных уласцівасцей;

3) структура пазіцый – гэта структура крыніц сілы [6, с. 565].

Такім чынам, мадэль сацыяльнай прасторы П. Бурдзьё выбудоўваецца вакол наступнага разумення дадзенай катэгорыі: «Сацыяльная прастора – абстрактная прастора, канстытуяваная ансамблем падпрастораў або палёў (эканамічнае поле, інтэлектуальнае поле і інш.), якія абавязаны сваёй структурай няроўнаму размеркаванню асобных відаў капіталу, і можа ўспрымацца ў форме структуры размеркавання розных відаў капіталу, якая функцыянуе адначасова як інструменты і мэты барацьбы ў розных палях...» [4, с. 39].

Варыянт даследавання сацыяльна-прасторавай праблематыкі, які, з аднаго боку, базіруецца на становішчах рэляцыйнай анталогіі Г. В. Лейбніца, а з другога – альтэрнатыўны сацыяльнаму канструктывізму, прадстаўлены актарна-сеткавай тэорыяй. Спецыфічнай рысай гэтага падыходу з'яўляецца акцэнтаваны зварот да пытання аб значэнні матэрыяльных аб'ектаў у канстытуяванні сацыяльнай тапалогіі.

У сувязі з гэтым Б. Латур, адзін са стваральнікаў актарна-сеткавай тэорыі, прадстаўнік яе парыжскай галіны, выказвае надзею на тое, што «грамадазнаўцы і фізікі рана або позна змогуць забыць аб тым, што іх падзяляе, і аб'яднацца ў сумесным даследаванні рэчаў, якія, будучы па прыродзе гібрыдамі, ужо (шмат дзесяцігоддзяў) аб'ядноўваюць іх на практыцы» [7, с. 354–355]. Дадзеная версія канцэптуалізацыі сацыяльнай прасторы класіфікуецца Б. Латурам як анталогія гібрыднага свету: на яго думку, грамадства ёсць сістэма манад, якія злучаюць матэрыяльнае і нематэрыяльнае, чалавечае і не-чалавечае ў гетэрагенную сетку, прычым сацыяльнае і матэрыяльнае перманентна канстытуююць адно аднаго. Такім чынам, прастора – гэта форма адносін паміж аб'ектамі. Аднак, калі існуе мноства адносін паміж аб'ектамі, можна казаць і аб множнасці прастораў.

Дж. Ло, прадстаўнік ланкастарскай галіны актарна-сеткавай тэорыі, які праводзіць даследаванне ў гэтым кірунку, вывучае розныя формы прасторавасці. Адной з такіх формаў з'яўляецца сеткавая форма. Аб'екты прасторы інтэрпрэтуюцца Дж. Ло па-семіятычнаму – як вытворныя сеткі адносін. Гэта значыць, адносіны як бы папярэднічаюць і матэрыяльным, і сацыяльным аб'ектам. Ён, як і П. Бурдзьё, называе свой падыход «сацыяльнай тапалогіяй» і, услед за тапалагамі, разглядае аб'екты сацыяльнай прасторы з пункту гледжання бесперапыннасці іх формы. Асноўная ідэя яго сацыяльнай тапалогіі заключаецца ў тым, што «аб'екты захоўваюць сваю цэласнасць датуль, пакуль адносіны паміж імі стабільныя і нязменныя» [8, с. 31]. Адпаведна, трансфармацыі аб'екта, якія вядуць да згубы гамеамарфізму, запускаюць механізм формагенезу і ўтварэння новага, адрознага ад ранейшага аб'екта.

Такім чынам, сутнасць аб'екта прасторы застаецца нязменнай, пакуль ён не губляе сваёй пазіцыі ва ўстойлівай сетцы адносін з іншымі аб'ектамі і захоўвае цэласнасць функцыянальных сувязяў уласных элементаў. Важна, што Дж. Ло пастулюе існаванне множных формаў прасторавасці (прастора «сетак», «патокаў», «рэгіёнаў»); ён разглядае паводзіны аб'ектаў прасторы ў розных прасторавых вымярэннях, якія накладаюцца адно на адно, напрыклад, у сеткавай прасторы адносін і ў еўклідавай прасторы. Пры гэтым Дж. Ло прыходзіць да высновы, што «аб'екты ўяўляюць сабой перасячэнні характарыстык нязменнасці формы ў розных тапалогіях» [8, с. 36].

Акцэнтуючы вытворны характар прасторавых аб'ектаў, Дж. Ло адзначае, што іх канстытуяванне мае тапалагічныя вынікі: стварэнне аб'ектаў у адной прасторы цягне за сабой змены ў іншай прасторы, падчас вытворчасці прасторы знаходзяцца ў адносінах узаемных карэляцый, вытворчасць прастораў мультытапалагічная.

На падставе разгляду сучасных мадэляў сацыяльнай прасторы, якія базіруюцца на палажэннях рэляцыйнай анталогіі, прадстаўленых сацыяльным канструктывізмам П. Бурдзьё, а таксама актарна-сеткавай тэорыяй у выяўленні Б. Латура і Дж. Ло, можна зрабіць шэраг метадалагічных высноў.

1. У цэлым, рэляцыйныя інтэрпрэтацыі сацыяльнай прасторы, нягледзячы на розныя формы канцэптуалізацыі прасторавасці (у выглядзе ансамбля, рэгіёна, сеткі і г. д.) аб'яднаны тым, што выбудоўваюцца вакол адносін паміж уваходзячымі ў іх элементамі. Аднак у сацыяльнай тапалогіі П. Бурдзьё сілы, а не індывіды канстытуююць марфалогію сацыяльнай прасторы, а паводле палажэнняў актарна-сеткавай тэорыі ў версіі Дж. Ло, элементы – аб'екты з'яўляюцца вытворнымі ад прасторы сеткавых адносін.

Між тым, калі П. Бурдзьё не надзяляе элементы сацыяльнай прасторы анталагічным зместам, а тлумачыць іх у духу «класаў на паперы», а значыць, як менавіта тэарэтычныя канструкты, якія выкарыстоўваюцца ў якасці тлумачальнага прынцыпу, то назва канцэпцыі «анталогіі гібрыднага міру» кажа сама за сябе.

2. Адметнай рысай сучасных рэляцыйных сацыяльна-тапалагічных мадэляў з'яўляецца прызнанне існавання множнасці прасторавых формаў: актарна-сеткавая тэорыя выводзіць гэтую ўласцівасць прасторавасці з мноства існуючых адносін, прычым адзін і той жа аб'ект становіцца кропкай перасячэння рознага роду прастор, а ў інтэрпрэтацыі П. Бурдзьё палі разглядаюцца як субпрасторы, да якіх можа мець дачыненне адзін і той жа агент.

3. На думку П. Бурдзьё, сацыяльная прастора канстытуюецца, зыходзячы з двух прынцыпаў: аб'ектыўнага (на аснове сацыяльных адносін, якія знаходзяць сваё выяўленне ў структуры размеркавання капіталаў) і суб'ектыўнага (на аснове ўяўленняў сацыяльных агентаў аб навакольнай рэчаіснасці). Значыць, агенты прадукуюць практыкі, тым самым захоўваюць або трансфармуюць структуру, а сацыяльныя структуры ў сваю чаргу дэтэрмінуюць сацыяльныя практыкі і ўяўленні агентаў. Але не варта перабольшваць значэнне сацыяльнага агента ў канструяванні сацыяльнай прасторы – дзеянне можа быць выканана толькі ў папярэднім яму сацыяльным кантэксце. Падобная інтэнцыя выяўлена і ў актарна-сеткавай тэорыі: аб'екты сеткавай прасторы прадукуюцца ўстойлівымі сеткамі адносін. Увогуле, такі падыход распаўсюджваецца і на іншыя мадэлі арганізацыі і функцыянавання сацыяльнай прасторы. У якасці прыкладу можна прывесці папулярную сёння канцэпцыю сеткавага грамадства М. Кастэльса, які абвясціў «грамадства сеткавых структур (network society), характэрнай прыкметай якога з'яўляецца дамінаванне сацыяльнай марфалогіі над сацыяльным дзеяннем» [9, с. 494].

Аднак застаецца адкрытым пытанне аб тым, чаму менавіта мадэлі сацыяльнай прасторы, цэнтраваныя вакол рэляцыйнай прыроды грамадства, з'яўляюцца рэпрэзентатыўнымі і могуць кампенсаваць дэфіцыт метадалагічнага інструментарыю пры вывучэнні трансфармацый, якія адбываюцца пад уздзеяннем глабалізацыйных працэсаў. У дадзеным кантэксце ўяўляецца мэтазгодным больш дэталёвы разгляд раней пазначаных канцэпцый прасторы на прадмет іх адпаведнасці сучасным сацыяльным рэаліям.

Рэляцыйныя мадэлі сацыяльнай прасторы адкрываюць шэраг метадалагічных перспектыў для аналізу сацыяльных трансфармацый у кантэксце глабалізацыі.

Па-першае, панперспектывізм, што характарызуе дадзеныя рэпрэзентатыўныя мадэлі, дазваляе аналізаваць сацыяльную прастору з мультытапалагічнага пункту гледжання, разглядаць праблемы сацыяльнай прасторы «аб'ёмна» ў супрацьвагу вузка «аднамерным» канцэпцыям, канкрэтызаваць разуменне ўключанасці таго ці іншага агента або аб'екта, што аказваецца асабліва важным ва ўмовах глабалізацыйных працэсаў. На гэтым павінны грунтавацца вынікі практычнага прымянення трохмернай інтэрпрэтацыі сацыяльнай прасторы – з улікам трансфармацый, якія адбываюцца ў розных формах прасторавасці.

Па-другое, зварот да сеткавай метафары дазваляе разглядаць сістэмны і структурны аспекты сучаснай сацыяльнай прасторы. Акрамя таго, варта надаць увагу прасторы патокаў як адной з ключавых форм сучаснай сацыяльнай прасторы, што мае перадумовай тэмпаральнае вымярэнне як фактар аналізу трансфармацыйных працэсаў. Мяркуем, нягледзячы на сучасныя глабалізацыйныя пераўтварэнні, не меншай актуальнасцю па-ранейшаму характарызуецца прасторава-рэгіянальны аспект аналізу сацыяльнай прасторы.

Па-трэцяе, у дадзенай сувязі важна падкрэсліць маючы месца разрыў паміж лакальным і глабальным, аб якім усё часцей заяўляюць сучасныя сацыяльныя тэарэтыкі [10; 11]: прастора месцаў часам аказваецца выключанай з сеткавай прасторы. Напружанне і амбівалентнасць, якія ўзнікаюць у кропках судакранання прасторы месцаў (рэгіёнаў) з прасторай патокаў і сеткавай прасторай, сведчаць аб сацыяльных праблемах, выкліканых нераўнамернасцю ў сучасных глабалізацыйных працэсах. Пераадоленне разрыву паміж сацыяльна-прасторавымі формамі, па выразу З. Баумана, «немагчыма растлумачыць зваротам толькі да адной з дзвюх прастор, якія злучаны паміж сабой / сапернічаюць / дапаўняюць адна адну / супрацоўнічаюць» [11, с. 40]. Сутнасць зменаў – у спецыфіцы ўзаемадзеяння, што і вызначае магчымасць іх навуковага пазнання. Так, адной з пераваг рэлятывісцкіх мадэляў у сувязі з пытаннем аб іх адэкватнасці для аналізу сацыяльна-прасторавых трансфармацый з'яўляецца тое, што яны ўлічваюць як працэсы глабалізацыі, так і лакалізацыі.

На падставе сказанага вышэй можна зрабіць выснову, што выкарыстанне рэлятывісцкіх мадэляў сацыяльнай прасторы ў якасці метадалагічнай базы з'яўляецца прадуктыўным падчас аналізу яе сучасных трансфармацый ва ўмовах глабалізацыі.

## Літаратура

1. D ö r i n g, J., T h i e l m a n n, T. Was lesen wir im Raume? Der Spatial Turn und das geheime Wissen der Geographen / J. Döring, T. Thielmann (Hg.) // Spatial Turn: Das Raumparadigma in den Kultur- und Sozialwissenschaften. – Bielefeld, 2008. – S. 7–49.

2. Л у к а ш е в и ч, В. К. Модели и метод моделирования в человеческой деятельности / В. К. Лукашевич. – Минск, 1983.

3. Д ю р к г е й м, Э. Элементарные формы религиозной жизни / Э. Дюркгейм // Мистика. Религия. Наука. Классики мирового религиоведения. Антология. – М., 1998. – С. 175–231.

4. Б у р д ь е, П. Физическое и социальное пространства: проникновение и присвоение / П. Бурдье // Бурдье П. Социология политики. – М., 1993. – С. 33–52.

5. Л е й б н и ц, Г. В. Переписка с А. Кларком / Г. В. Лейбниц // Сочинения: в 4. т. Т. 1. – М., 1982. – С. 430–528.

6. Ш м а т к о, Н. А. «Социальное пространство» Пьера Бурдье / Н. А. Шматко // Бурдье П. Социальное пространство: поля и практики. – М., 2005. – С. 555–576.

7. Л а т у р, Б. Когда вещи дают отпор: возможный вклад исследований науки в общественные науки / Б. Латур // Социология вещей. Сб. ст. – М., 2006. – С. 342–364.

8. Л о, Д ж. Объекты и пространства / Дж. Ло // Социологическое обозрение. Т. 5. – № 1. – 2006. – С. 31–43.

9. К а с т е л ь с, М. Становление общества сетевых структур / М. Кастельс // Новая постиндустриальная волна на Западе. Антология; под ред. В. Иноземцева. – М., 1999. – С. 494–505.

10. К а с т е л ь с, М. Информационная эпоха: экономика, общество и культура / М. Кастельс. – М., 2000.

11. Б а у м а н, З. Город страхов, город надежд / З. Бауман // Логос. – 2008. – № 3. – С. 24–53.

*T. E. NAVITSKAYA*

**CONTEMPORARY RELATIVISTIC MODELS OF THE SOCIAL SPACE**

## Summary

Sources of the social space contemporary relativistic models as well as schemes of its organisation have been analyzed in the article. Methodological perspectives of this models application during the conducting of social transformations analysis have been considered in the context of globalization.

*УДК 13*

*Е. Н. КВИЛИНКОВА, В. А. САКОВИЧ*

# НАЦИОНАЛЬНЫЕ КУЛЬТУРЫ В УСЛОВИЯХ ГЛОБАЛИЗАЦИИ

*Институт философии НАН Беларуси*

*(Поступила в редакцию 17.01.2011)*

**1. Краткий историографический обзор глобализационных процессов в сфере культуры.** Современный глобализационный процесс – динамичное и многогранное социальное явление, которое можно рассматривать в различных аспектах [1]. В представленной статье мы остановимся лишь на одной проблеме – на процессе взаимодействия мировой и национальной культур в условиях глобализации.

Следствием глобализационных процессов является более тесное взаимодействие различных культур. Вместе с тем возможность объединения различных культур в единую культуру, о которой в последнее время много говорится, отрицается некоторыми западными и многими восточными учеными, которые приводят при этом различные аргументы [2; 6; 9]. Сама по себе глобализация не в состоянии породить нового человека, новый человек формируется в рамках конкретных этносов, конкретной цивилизации, история и культура которых исчисляются тысячелетиями [3].

Есть и иная точка зрения. По мнению А. Н. Чумакова, глобализация оказывает значительное влияние на процессы, происходящие в области культуры, и ведет к формированию единой культуры и единой цивилизации. Но при этом глобализация «не отменяет ни культурного разнообразия, ни специфических особенностей цивилизационного развития тех или иных регионов» [4]. Другой автор – С. Н. Иконникова – отмечает, что, «по мнению многих исследователей, в сфере культуры человечество в настоящее время находится в стадии формирования новой планетарной цивилизации, основанной на гуманизме, переоценке традиционных ценностей, новом отношении к природе, свободного и демократичного мира» [5]. Используемое указанным автором в работе понятие «новая планетарная цивилизация» является слишком абстрактным. Тем не менее, нельзя не замечать активно протекающих в области культуры процессов.

Вопрос о влиянии процессов глобализации на размывание традиционной идентификации рассмотрен в книге известного американского ученого С. Хантингтона «Столкновение цивилизаций и передел мирового порядка» [6]. Тем самым автор в своей работе ставит проблему отношения глобализации не только к культуре, но и к цивилизации.

Современные исследования в области культурной антропологии показывают, что культурная самобытность любого народа неотделима от культурной самобытности других народов. Из этого делается вывод о том, что все большее значение приобретает способность к пониманию иной культуры и точек зрения, признанию культурной самобытности других народов, признанию правомерности существования многих истин, умению строить диалогические отношения и идти на разумный компромисс. Происходящие культурные изменения все больше подчиняются логике культурной коммуникации [7].

**2. Международные организации о сохранении национально-культурного своеобразия.** Проблема взаимовлияния культур и исторического единства человечества, сохранения национально-этнического своеобразия в настоящее время является особо актуальной. О степени важности этих вопросов свидетельствует тот факт, что саммит в Нью-Йорке в 2000 году, в котором принимали участие лидеры всех стран мира, был посвящен не только безопасности и глобальным угрозам, но и вопросам культурной, религиозной, цивилизационной идентичности.

Осознание необходимости разрешения ряда проблем в области культурного взаимодействия, возникших в процессе глобализации, дало основание Организации Объединенных Наций провозгласить 2001 год – Годом диалога между культурами.

**3. О взаимодействии культур в условиях глобализации.** Вопрос о содержании процессов глобализации в области культуры до настоящего времени остается дискуссионным. Можно говорить о том, что глобализация культуры в определенной степени является результатом социально-политических и экономических процессов, протекающих в мире. Остается открытым вопрос, в какой степени можно рассматривать глобализацию культуры как глубинное культурное явление, имеющее собственно культурную основу.

Несомненно, глобализация является следствием объективного исторического процесса, который значительно усилил интеграцию различных стран и континентов. Процесс глобализации в разных формах наглядно проявляется во всех областях человеческой деятельности: экономике, политике, науке, искусстве, спорте и т. д. Наиболее значимые изменения происходят в важных сферах человеческой жизнедеятельности: сфере новых технологий и информационных систем (системе коммуникаций); области этнических отношений на планете; процессе развития мировой экономической системы. В ходе глобализации некоторые идеи и структуры современной жизни распространились по всему миру.

В процессе глобализации в области культуры произошли значительные изменения. Результатом этого процесса, охватившего самые разные сферы жизнедеятельности, явилось усиление миграционных потоков, что, в свою очередь, привело к бурному росту обменов в области культуры. Они выражаются в стремительно возрастающем количестве прямых контактов между государственными институтами, социальными группами и представителями различных стран и культур. Этот процесс в той или иной степени затронул все культуры. Взаимопроникновение культур наблюдается не только в жизни отдельных индивидов, оно все более становится характерной чертой для целых обществ. При этом глобализация не устраняет их разнообразия. Внутри глобализирующейся культуры формируются и сосуществуют различные позиции и точки зрения.

**4. Двойственное содержание процесса глобализации культур.** Распространение одинаковых культурных образцов по всему миру, открытость границ для культурного влияния и расширяющееся культурное общение позволяют говорить о процессе глобализации современной культуры. В определенной степени глобализация культуры представляет собой процесс интеграции отдельных культур в единую мировую культуру на основе развития транспортных средств, экономических связей и средств коммуникации. Это проявляется в расширении культурных контактов, заимствовании культурных ценностей и миграции людей из одной культуры в другую.

Особенностью создания так называемой «общемировой» культуры в глобализирующемся обществе можно считать то, что она основывается на общечеловеческих принципах, но не учитывает традиционные ценности, являющиеся стержнем существования народной культуры и обеспечивающей возможность сохранения народом своего лица. В данном случае речь идет о прогрессивных компонентах традиционной культуры. Это дает основание говорить о том, что глобализация культуры происходит за счет разрушения культурного многообразия и утраты народами своей культурной идентичности.

**5. Тенденция к унификации культур.** В то же время глобализация в известной степени представляет собой сознательную и целенаправленную деятельность определенных стран по объединению мира. При этом культурные особенности отдельных народов на фоне глобальных процессов приобретают все более резкие очертания или вообще впервые осознаются как таковые. Многим народам и этническим общностям зачастую приходится пересматривать или под давлением извне отказываться от некоторых традиционных ценностей собственной культуры. В ходе этих контактов исчезает множество традиционных форм жизни и способов мышления.

Ярко выраженная тенденция к унификации культур, которая характерна для процесса глобализации, в значительной степени усиливает у некоторых народов потребность в культурном самоутверждении и желание сохранить собственные культурные и индивидуальные ценности. Следствием глобализационных процессов является возникновение новых форм культуры и идентичности.

Глобализация, направленная на установление однополярного мира и создание единого этноса, вызывает протесты интеллигенции разных стран, которая противопоставляет свою этниче-

скую культуру западной культуре. Это свидетельствует о том, что процесс «культурной глобализации» содержит в себе определенный конфликтный потенциал.

**6. Функции культуры как механизма адаптации к новым условиям.** Культура выполняет в обществе одну из важных социализирующих функций. С помощью обычаев, обрядов, норм поведения, материальных и духовных ценностей передается из поколения в поколение культурный код (способ организации жизни, совокупный опыт людей и т. д.). Человек не может существовать вне какой-либо культуры. Сразу же после рождения он впитывает в себя имеющиеся в обществе культурные традиции и ценности. Социализирующая функция культуры приобщает человека к организации и ценностям традиционной жизни своего народа и еще до осознания им своей национальной принадлежности обеспечивает ему чувство причастности к нормам, образу и стилю жизни своей социальной группы.

***Функция социализации*** реализуется через процесс воспитания на культурных ценностях, общепринятых в каждом конкретном обществе. В ходе социализации формируется определенный стереотип поведения человека, вырабатываются механизмы адаптации к социокультурной среде, что позволяет индивидууму сознательно действовать в рамках существующих культурных ценностей. Кроме того, народная культура выполняет функцию адаптации личности к новым культурным условиям, в которых она оказалась. Оказавшись в другом государстве с иной культурой и ценностями, человек на уровне социального инстинкта пытается установить баланс между давлением со стороны и своими культурными интересами. В результате культурной адаптации становится возможным вовлечение индивидуума в культурный процесс. Вместе с тем ***культура осуществляет и ряд других важных функций: познавательную, информативную, коммуникативную, аксиологическую*** (устанавливает определенную систему ценностей).

**7. Соотношение глобальной и национальной культур.** Культура представляет собой результат жизнедеятельности людей и выступает как важнейший фактор (наряду с природным и экономическим) общественного развития. Она оказывает влияние на все процессы жизнедеятельности общества и индивида. Культура представляет собой сложную динамическую систему, включающую в себя стабильное ядро или культурное наследие (традиции) и инновации.

К устойчивым элементам культуры относятся традиции, благодаря которым происходит сохранение и передача накопленного опыта. Традиции являются составной частью культуры и выполняют функцию обеспечения устойчивости общества. Именно традиции, передаваемые от поколения к поколению, позволяют народу сохраниться как самостоятельное культурное явление современного мира. Поэтому важной задачей любого народа является сохранение собственно этнических компонентов (обычаи, традиции, язык, самосознание).

Значимым является вопрос о роли так называемой глобальной и национальной культур и о степени их соотношения. Общепринятым в этнологической науке является разграничение понятий «традиционная этническая культура» и «национальная культура» [8]. «Национальная культура», или «этническая культура современности», включает в себя «вариативно адаптированные к нуждам и ценностям этноса инновации», а также элементы традиционной культуры. Своеобразие этнической культуры проявляется в специфических средствах художественно-эстетического восприятия им реальной действительности. Для этноса (этнической общности) наиболее значимыми являются, прежде всего, элементы бытовой культуры, в то время как профессиональная культура по содержанию во многом интернациональна, поскольку ее основу составляет сумма знаний, необходимых в профессиональной деятельности человека. Взаимопереплетение и взаимодополнение различных этнических и надэтнических элементов определяет содержание этнонациональной культуры.

**8. Культура как сложная динамическая система.** Понятие «культура» включает в себя творческую деятельность людей во всех сферах бытия, направленную на осмысление и преобразование действительности, а также результаты такой деятельности, которые находят всевозможное выражение в обычаях, традициях, вероисповеданиях, философии, науке, искусстве, быту, производстве, технологиях и т. п. При этом в каждом этносе (нации, народе) доминирует определенный тип мышления, что связано с существованием у представителей каждого этноса того или иного способа мировосприятия [9].

Каждая этнонациональная культура в результате многовекового развития включает в себя как развитые прогрессивные способы и формы освоения действительности (производственная и политическая деятельность, наука, литература и др.), так и определенные элементы архаичности (в области некоторых форм трудовой деятельности, различных обрядах и верованиях, национальном фольклоре, в быту, семье и т. д.). В современном мире имеется множество каналов, по которым происходит взаимовлияние культур. Этот источник культурной динамики может носить как прямой (через межкультурные контакты индивидов), так и косвенный характер (через действие СМИ, потребляемые товары, образовательные учреждения и т. д.). Наряду с другими факторами значительную роль в процессе взаимовлияния культур играют межэтнические семьи. Именно через семью происходит глубокое усвоение многих важных элементов культуры как одного, так и другого этноса.

Одним из главных объективных противоречий, свойственных культурам всех народов мира, является противоречие между стремлением к развитию национальных культур и их сближением через процесс взаимопроникновения. Взаимодействие культур будет способствовать формированию духовного единства человечества и вместе с тем создаст возможность сохранения многополярного мира. Взаимопереплетение процессов интеграции, взаимообогащение в сфере культурно-творческого освоения действительности и одновременно привнесение в него элементов национально-этнической специфики, этнокультурной самобытности способны создать необходимые гарантии как для прогресса полиэтнического социума в целом, так и для проявления каждой личностью своих способностей и дарований.

Известный американский ученый Ф. Боас считал, что «каждая культурная группа имеет свою уникальную историю, зависящую отчасти от своеобразного (peculiar) внутреннего развития социальной группы, а отчасти от посторонних влияний, которым она подвергается». Поэтому одним из наиболее действенных методов, по его мнению, является «изучение динамических изменений» в отдельных обществах [10].

Французский ученый К. Леви-Стросс выступал против всего, что может привести к уничтожению различий между людьми, между культурами, нарушить их разнообразие и неповторимость. Он подчеркивал необходимость сохранения уникальных особенностей каждой отдельной культуры [11]. Таким образом, важнейшим методологическим принципом понимания культуры является диалог, поскольку именно в нем проявляются сущностные характеристики культуры. Взаимодействие культур является основой их саморазвития. В этой связи можно отметить, что становление языковых форм, развитие творческой мысли в прошлом происходили в ходе диалога людей и культур.

Значительную роль в культурной динамике играют культурные заимствования, т. е. использование предметов, норм поведения, ценностей, созданных и апробированных в других культурах. Данный вид культурной динамики развивается в тех случаях, когда одна культура подвергается влиянию другой, более развитой. Однако ***в процессе этнокультурного взаимодействия народ заимствует не все подряд, а лишь то, что является близким его собственной культуре, отвечает внутренним потребностям данного этноса***. Если нововведение оказывается несовместимым с традиционными основами культуры, то оно отторгается данной культурой. Таким образом, влияние одной культуры на другую реализуется только в том случае, если существуют необходимые условия для такого влияния. Это еще раз доказывает, что диалог культур возможен только при определенном сближении их культурных кодов, наличии или возникновении общей ментальности.

**9. Проблема сохранения национальной культурной идентичности.** Общество ощущает себя целостным и существует как единое целое благодаря сохранению и следованию своим ценностям. Здесь возникает противоречие между культурой, претендующей на роль общемировой, и народной культурой. По утверждению К. Кисса, «образование глобальных систем – это феномен, возникший не на основе ценностей общества» [12]. Однако вряд ли можно однозначно утверждать, что создание так называемой общемировой культуры совершенно не учитывает традиционных ценностей, ценностей человеческой культуры.

Особый тип мышления и способ восприятия, свои ценностные установки создают серьезные трудности для большинства представителей различных этносов при необходимости включения

ценностей чужих по духу культур в собственную культуру. По мнению В. И. Самохваловой, «проблема национальной культурной идентичности могла бы быть смягчена развертыванием равноправного культурного диалога, который помогал бы становлению многоуровневой идентичности как психологической переходной стадии, однако в реальности культурного диалога фактически не наблюдается, идет жесткое цивилизационное выравнивание и монологический диктат культуры гегемона». И далее автор добавляет: «В этом случае трудно говорить о том, что имеет место действительно культурный процесс, скорее речь идет о технологической, хотя и глубоко «эшелонированной» стратегии выживания одних за счет других» [3].

Реакция различных обществ на происходящие изменения в области культуры проявляется по-разному: от пассивного неприятия ценностей иных культур до активного противодействия их распространению и утверждению. В последнее время все чаще целый ряд государств и культур демонстрирует, нередко в агрессивной форме, свое стремление к освобождению от влияния со стороны традиционно доминировавших государств и культур и выступает против глобальных культурных изменений. Это проявляется в стремлении государства к самоизоляции от глобальных мировых процессов, противопоставлении национальной и мировой культуры и в преувеличении значения своей культурной самобытности. Все это усугубляется наличием нерешенных исторических проблем, главным образом геополитических, ведущих к изменению границ политико-экономических пространств, появлению «горячих точек», превращению границ между культурами в зоны конфликтов, которые нередко приобретают форму этнорелигиозных, что в большей степени относится к традиционным культурам Кавказа, исламской культуре, архаичным культурам Африки, некоторых стран Латинской Америки и Азии.

Усиливающееся обострение глобальных проблем (технологический, социальный, экологический кризисы и т. д.) создает, с одной стороны, определенные трудности во взаимоотношениях между различными государствами, а с другой – делает необходимым объединение усилий всех государств и народов для сотрудничества с целью разрешения этих проблем.

**10. Методология взаимодействия культур.** Методология взаимодействия культур, в частности диалога культур, была разработана в трудах М. М. Бахтина. Он рассматривал диалог как процесс взаимопонимания участвующих при сохранении ими своего мнения [13]. Развивая свою мысль, М. М. Бахтин отмечал, что великие явления в культуре рождаются только в диалоге различных культур, только в точке их пересечения. Способность одной культуры осваивать достижения другой – один из источников ее жизнедеятельности. «При диалогической встрече двух культур они не сливаются и не смешиваются, каждая сохраняет свое единство и открытую целостность, но они взаимно обогащаются» [13]. Подражание чужой культуре или полное ее неприятие должны уступить место конструктивному взаимодействию. Диалогичность предполагает сопоставление национальных ценностей и выработку понимания того, что собственное этнокультурное сосуществование невозможно без уважительного и бережного отношения к ценностям других народов.

В своих работах, посвященных проблемам взаимодействия культур, российский ученый С. Н. Артановский подробно рассмотрел содержание понятия «единство». По мнению автора, понятие «единство» не следует истолковывать метафизически как полную однородность или неделимость. «Историческое единство культур не означает их тождественности, т. е. полную повторяемость явлений, их идентичность. «Единство» означает целостность, коренную общность, преобладание внутренних связей между элементами данной структуры над внешними» [14].

В заключение отметим, что мирное сосуществование народов и государств в современной цивилизации может быть достигнуто только путем диалога между ними, при котором ни одна культура не выступала бы в качестве доминирующей, подавляющей и не преподносила бы свой способ мировоззрения как единственно верный. Равноценность культур выдвигает проблему понимания и диалога, результатом которого было бы ***не слияние и смешение, а взаимное обогащение культур.*** Из этого следует, что отношения между культурами должны строиться на принципах терпимости и взаимопонимания. В основе этих отношений лежат общечеловеческие ценности, имеющиеся в каждой культуре, которые должны быть использованы для установления межкультурного диалога.

## Литература

1. К в и л и н к о в а, Е. Н. Традиционная духовная культура гагаузов: этнорегиональные особенности / Е. Н. Квилинкова. – Кишинев: Buziness-Elita, 2007. – С. 569–609.

2. А н и к и е в, Е. Н., С е м у ш к и н, А. В. Диалог цивилизаций: Восток и Запад / Е. Н. Аникеев, А. В. Семушкин // Вопросы философии. – 1998. – № 2.

3. С а м о х в а л о в а, В. И. Выступления участников «круглого стола», 2003 [Электронный ресурс]. – 2003. – Режим доступа: http:// www.russianglobalclub.com.

4. Ч у м а к о в, А. Н. Единство и взаимообусловленность понятий «культура», «цивилизация», «глобализация». Выступления участников «круглого стола», 2003 [Электронный ресурс]. – 2003. – Режим доступа: http:// www.russianglobalclub.com.

5. И к о н н и к о в а, С. Н. Методология гуманитарного знания в перспективе XXI века. К 80-летию проф. Моисея Самойловича Кагана. Материалы междунар. науч. конф. Серия «Symposium». – Вып. 12 / С. Н. Иконникова. – СПб., 2001. – С. 42–51.

6. H a n t i n g t o n, S. P. The Clash of Civilization and Remaking the World Order / S. P. Hantington. – New York, 1996.

7. Г р у ш е в и ц к а я, Т. Г., П о п к о в, В. Д., С а д о х и н, А. П. Основы межкультурной коммуникации: Учеб. для вузов / Т. Г. Грушевицкая [и др.]; под ред. А. П. Садохина. – М., 2002.

8. А р у т ю н о в, С. А. Народы и культуры: развитие и взаимодействие / С. А. Арутюнов. – М., 1989. – С. 150; Т о п о р о в, В. Н. Модель мира / В. Н. Топоров // Мифы народов мира. – М., 1982. – Т. 2; М а м о н т о в а, Н. Н. Проблемы изучения традиционных форм культуры и понятие «народное искусство» / Н. Н. Мамонтова // Научные чтения памяти В. М. Василенко: Сб. ст. – М., 1997. – Вып. 1; З а х а р о в, А. В. Традиционная культура в современном обществе. А. В. Захаров // Социологические исследования. – 2004. – № 7. – С. 105–115.

9. Р о т е н б е р г, В. С., А р ш а в с к и й, В. В. Межполушарная асимметрия мозга и проблема интеграции культур / В. С. Ротенберг, В. В. Аршавский // Вопросы философии. – 1984. – № 4. – С. 83.

10. Б о а с, Ф. Задачи антропологического исследования / Ф. Боас // СЭ. – 1933. – № 3–4.

11. Л е в и - С т р о с с, К. Структурная антропология / К. Леви-Стросс. – М., 1983.

12. К и с с, А. Глобализация / А. Кисс // Глобалистика. Энциклопедия. – М., 2003. – С. 190.

13. Б а х т и н, М. М. Эстетика словесного творчества / М. М. Бахтин. – М., 1986. – С. 430.

14. А р т а н о в с к и й, С. Н. Историческое единство человечества и взаимное влияние культур. Философско-методологический анализ современных зарубежных концепций / С. Н. Артановский. – Л., 1967. – С. 43.

*E. N. KVILINKOVA, V. A. SAKOVICH*

**NATIONAL CULTURES IN CONDITIONS OF THE GLOBALIZATION**

## Summary

Key problem of the article is the loss of cultural identity as a result of globalization processes which is not specific only for reduced but for numerous peoples also. Some aspects connected to the problem of national cultural identity preservation have been covered, too. A special importance has been given to the analysis of relation between the global and national cultures within the framework of globalization processes. Stable elements of culture as well as fields of the most vivid results of the ethno-cultural dialogue (language, music, dance) have been showed.

*УДК 316.334.2:330.16*

*К. Б. ПАЛХОЎСКАЯ*

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА ВЫВУЧЭННЯ ЭКАНАМІЧНЫХ ПАВОДЗІН

*Інстытут сацыялогіі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 07.09.2010)*

Праблемы вывучэння эканамічных паводзін сталі актуальнымі ў сувязі з фарміраваннем і развіццём у Рэспубліцы Беларусь сацыяльна арыентаванай рыначнай эканомікі. Даследаванне эканамічных паводзін чалавека важна пры асэнсаванні і рашэнні сацыяльных праблем, звязаных з рэфармаваннем эканомікі, зменай каштоўнасных арыентацый, перабудовай агульнай сістэмы ў цэлым.

У вывучэнні эканамічных паводзін чалавека можна вылучыць тры асноўныя падыходы: эканамічны, эканоміка-сацыялагічны і сацыялагічны, аналіз якіх дазваляе выявіць шэраг істотных момантаў у асэнсаванні дадзенага феномена.

Асэнсаванне эканамічных паводзін пачалося ў рамках эканамічнай тэорыі. Прадстаўнікамі эканамічнага падыходу да аналізу эканамічных паводзін з'яўляюцца А. Сміт, А. Маршал, П. Хейнэ.

Згодна з А. Смітам, асноўны натхняльнік гаспадарчай дзейнасці чалавека – уласны інтарэс. Аднак клапаціцца аб сваіх інтарэсах чалавек можа, аказваючы паслугі іншым людзям, прапаноўваючы ў абмен сваю працу і вынікі працы. Людзі дапамагаюць адзін аднаму і адначасова садзейнічаюць развіццю грамадства, хаця кожны з іх мае на мэце ўласныя інтарэсы. Чалавек у любым выпадку стараецца дзейнічаць з выгадай для сябе, дзейнічаць па прынцыпу: «Дай мне тое, што мне патрэбна, і ты атрымаеш тое, што патрэбна табе» [1, с. 91].

Спроба сінтэзу «эканамічнага» і «сацыяльнага» ў вывучэнні эканамічных паводзін чалавека была зроблена англійскім эканамістам А. Маршалам. Эканамічныя паводзіны, на думку А. Маршала, асэнсаваныя: «чалавек перш за ўсё вылічвае выгады і нявыгады нейкага канкрэтнага дзеяння, перш чым да яго прыступіць» [2, с. 76]. Кожны наступны дзейны акт здзяйсняецца пад уплывам прывычак і звычаяў, якія ўзніклі ў працэсе стараннага выяўлення выгад і нявыгад ад розных спосабаў дзеянняў. Чалавек імкнецца да задавальнення і пазбягае непрыемнасцей, больш таго, ён бярэ пад увагу эканамічныя інтарэсы іншых людзей, аднак яго стымуляцыйнае поле змяшчаецца ў бок асабістага эканамічнага інтарэсу.

Канцэпцыя амерыканскага эканаміста П. Хейнэ непасрэдна вынікае з асаблівасцей эканамічнага тыпу мыслення: людзі выбіраюць, толькі індывідуумы выбіраюць, індывідуумы выбіраюць рацыянальна, усе грамадскія працэсы можна трактаваць як рыначныя [3, с. 27–28]. Чалавек у эканамічнай сферы імкнецца дзейнічаць рацыянальна, аднак уплыў эмацыянальных фактараў і дзеянняў па звычцы пазбаўляе эканамічныя паводзіны чалавека дастатковай долі рацыянальнасці. Асаблівасць дадзенай канцэпцыі заключана яшчэ ў сцвярджэнні аб тым, што ўсе грамадскія ўзаемадзеянні можна трактаваць як рыначныя працэсы. Дзеянні любых дзяржаўных структур таксама з'яўляюцца вынікам рыначнага працэсу. Тут неабходна звярнуць увагу на тое, у якой меры ў гэтых дзеяннях выяўлена ступень развітасці рыначных працэсаў. Больш высокая ступень развіцця рыначных адносін у грамадстве сведчыць аб перавазе сфарміраванага і актыўнага эканамічнага мыслення, адэкватнага рэальным патрабаванням сацыяльна-эканамічнага асяроддзя. Такім чынам, эканамічная тэорыя П. Хейнэ спрабуе растлумачыць любыя паводзіны людзей як вынік рацыянальнага выбару.

Такім чынам, трактоўка эканамічных паводзін з эканамічных пазіцый зыходзіць са сцвярджэння аб тым, што сацыяльныя суб'екты пры выбары таго або іншага тыпу эканамічных паводзін, па-першае, маюць поўную інфармацыю аб унутраным і знешнім становішчы грамадства; па-другое, ажыццяўляюць супастаўленне мяркуемых выгад і выдаткаў; па-трэцяе, улічваюць магчымасці наяўнага комплексу рэсурсаў; па-чацвёртае, знаходзяцца пад уплывам сістэмы сацыяльных сувязей. Аднак акцэнтаванне ўвагі на незалежны ад іншых суб'ектаў выбар стратэгіі паводзін, заснаваны выключна на прынцыпе максімізацыі выгад і мінімізацыі выдаткаў, усё ж абмяжоўвае разуменне чалавека як сацыяльнага феномена.

Працэс развіцця навуковых поглядаў на праблему фарміравання эканамічных паводзін паступова прывёў да сацыялагізацыі эканамічнай думкі. Такім чынам, з'яўляецца эканоміка-сацыялагічны падыход да аналізу эканамічных паводзін індывіда. Да прадстаўнікоў дадзенага падыходу можна аднесці К. Маркса, Т. Вэблена, У. Зомбарта і Й. Шумпетэра.

Дзейнасць чалавека, паводле К. Маркса, ёсць праца. І менавіта дзякуючы гэтай дзейнасці чалавек «узнаўляе чалавека з усім багаццем яго існасці, узнаўляе багатага і ўсебаковага, глыбокага ва ўсіх яго пачуццях і ўспрыманнях чалавека» [4, с. 118]. Эканамічная структура ў К. Маркса выступае асноўным элементам даследавання функцыянавання грамадства ў цэлым. Вызначэнне эканамічнай структуры як сацыяльнага інстытута, які характарызуецца асноўным спосабам вытворчасці, садзейнічала разуменню сацыяльна-эканамічнай прыроды эканамічнай дзейнасці і эканамічных паводзін як сацыяльнага феномена. Эканамічныя паводзіны ў дадзеным выпадку разглядаюцца як прадукт сацыяльных адносін, які быў створаны ў выніку эканамічнай дзейнасці.

Паводле Т. Вэблена, у грамадстве маюць месца два эканамічныя інстытуты: інстытут нічым не занятага класа і інстытут працуючых. Інстытут нічым не занятага класа развіваецца з узніклага раней размежавання відаў дзейнасці, згодна з якім адны віды ў павазе, другія – не. У адпаведнасці з гэтым Т. Вэблен выдзяляе два тыпы эканамічных паводзін: скнарнасці, характэрны для прадстаўнікоў нічым не занятага класа, і вытворчы тып, характэрны для класа працуючых. Асноўнымі крытэрыямі фарміравання эканамічных паводзін Т. Вэблен лічыць эвалюцыю грамадскага асяроддзя, эвалюцыю сацыяльнага ўладкавання, якая з'яўляецца працэсам натуральнага адбору сацыяльных інстытутаў: «змяненне інстытутаў вядзе ў сваю чаргу да далейшага адбору індывідаў з найбольш прыстасаваным складам характару і да прыстасавання звычак і тэмпераменту асобных людзей да асяроддзя, якое змяняецца ў выніку ўтварэння новых інстытутаў» [5, с. 200].

Стрыжнёвым у канцэпцыі В. Зомбарта выступае паняцце гаспадарчага духу, пад якім ён разумее «сукупнасць душэўных якасцей і функцый, якія суправаджаюць гаспадаранне. Гэта ўсе праяўленні інтэлекту, усе рысы характару, якія выяўляюцца ў гаспадарчых імкненнях, але гэта адначасова і ўсе задачы, усе меркаванні аб каштоўнасцях, якімі вызначаюцца і кіруюцца паводзіны чалавека, які гаспадарыць. Эканамічны рацыяналізм можа праяўляцца і можа не праяўляцца больш ці менш закончана ў суб'екце, які гаспадарнічае, ён можа аб'ядноўвацца і не аб'ядноўвацца ў ім з больш ці менш моцна развітым імкненнем да нажывы» [6, с. 6–10].

Такім чынам, В. Зомбарт аналізуе эканамічныя паводзіны чалавека, зыходзячы, перш за ўсё, з эканамічных запатрабаванняў і інтарэсаў, абумоўленых «псіхічнымі» ці «духоўнымі» (паводле тэрміналогіі В. Зомбарта) асаблівасцямі суб'екта, які гаспадарнічае.

Й. Шумпетэр распрацаваў канцэпцыю прадпрымальніцкай дзейнасці, у якой ахарактарызаваў магчымасць існавання новага тыпу эканамічных паводзін індывідаў, галоўнай асаблівасцю якіх з'яўляецца ўспрымальнасць да новых ідэй, «новаўвядзенняў». У кнізе «Тэорыя эканамічнага развіцця» Й. Шумпетэр прапаноўвае канцэпцыю «стваральнага разбурэння» [7, с. 157–185]. Стваральнае разбурэнне адбываецца ў тым выпадку, калі ўзнікае сітуацыя, пры якой існуючым запатрабаванням адпавядае нейкая новая расстаноўка сіл, адрозная ад той, што маецца, і якая працягваецца да таго часу, пакуль не ўзнікне нейкая новая сітуацыя. У цэлым аўтар лічыў, што прычынай розных эканамічных няўдач з'яўляецца неадпаведнасць рэалізуемай індывідам стратэгіі эканамічных паводзін рэаліям новага часу.

Падагульняючы сказанае, можна зрабіць вывад, што прадстаўнікі эканоміка-сацыялагічнага падыходу ў трактоўцы эканамічных паводзін засноўваюцца на ідэях эканамістаў, аднак, імкнуцца інтэграваць «эканамічнае» і «сацыяльнае» ў вывучэнні феномена эканамічных паводзін. У да-

дзеным падыходзе ўвага даследчыкаў перамяшчаецца ад разгляду прынцыпу максімізацыі выгад і мінімізацыі выдаткаў да вывучэння пазітыўнага або негатыўнага ўплыву сацыяльнай рэальнасці на эканамічныя паводзіны індывіда.

У далейшым вывучэнне ўплыву сацыяльных сувязяў і сацыяльных інстытутаў на эканамічныя паводзіны намі будзе выканана ў кантэксце прац Э. Дзюркгейма, М. Вэбера, Р. Мэртана, М. Гранаветэра. Дадзеных даследчыкаў мы можам назваць прадстаўнікамі сацыялагічнага падыходу да вывучэння эканамічных паводзін індывіда.

Ключавым момантам эканамічнай сацыялогіі Э. Дзюркгейма стала ідэя сацыяльнай салідарнасці. Паводле Э. Дзюркгейма, эканамічныя паводзіны чалавека цалкам санкцыянаваны строгімі нормамі і правіламі [8, с. 67–70]. Любое адхіленне ад норм калектыўных паводзін каралася з боку ахоўнікаў парадку. Пры разглядзе эканамічных паводзін Э. Дзюркгеймам акцэнт рабіўся не на калькуляцыі выдаткаў і канчатковага выніку, а на дэперсаніфікацыі асобы, яе падпарадкаванні калектыўнай волі.

З імем нямецкага эканамічнага гісторыка і сацыёлага М. Вэбера звязаны інстытуцыянальны падыход у вывучэнні эканамічных паводзін. Асноўным пастулатам інстытуцыяналізму М. Вэбера выступае наяўнасць пэўнай сувязі паміж сацыяльнымі інстытутамі і эканомікай. Укладам М. Вэбера ў вывучэнне эканамічных паводзін з'яўляецца даследаванне эканамічнага дзеяння. Эканамічнае дзеянне разумеецца М. Вэберам як здзяйсненне ненасільнымі метадамі кантролю над абмежаванымі рэсурсамі ў мэтах вытворчасці даброт і паслуг у працэсе забеспячэння жыццядзейнасці людзей [9, с. 634–635]. Эканамічна арыентаваныя паводзіны чалавека ўяўляюць сабой форму сацыяльных паводзін, якія па свайму сэнсу суадносяцца з задавальненнем жаданняў, звязаных з атрыманнем карысці. Такім чынам, у аснове эканамічных паводзін ляжыць прынцып рацыянальнасці. Такія паводзіны характэрны для сучасных грамадстваў. Рацыяналізуецца і спосаб мыслення людзей, спосаб іх адчування, а таксама лад жыцця ў цэлым. Значны ўплыў на гэты працэс аказвае навука, якая ўяўляе сабой чыстае ўвасабленне рацыянальнасці [10].

У межах структурна-функцыянальнага падыходу, адным з прадстаўнікоў якога з'яўляецца амерыканскі сацыёлаг Р. Мэртан, робіцца спроба ўпісаць эканамічнае дзеянне ў глабальную сістэму сацыялагічных катэгорый, прадставіць эканоміку як адну з функцыянальных падсістэм грамадства, якая выконвае асноўныя патрабаванні сістэмы ў цэлым – адаптацыі, дасягнення мэт, інтэграцыі і латэнтнасці. Эканамічныя паводзіны апісваюцца праз катэгорыю «сацыяльнага дзеяння», якое абумоўлена чалавечымі запатрабаваннямі, упісана ў пэўны кантэкст і рэгулюецца дзеяннем сацыяльных нормаў. Дзякуючы такой рэгуляцыі эканамічныя паводзіны ўключаюцца ў складаную сістэму эканамічных адносін. Нягледзячы на тое, што эканамічныя паводзіны, паводле Р. Мэртана, нарматыўна абумоўлены, індывід мае права выбару магчымых варыянтаў стратэгіі паводзін, выбару наяўных рэсурсаў, легітымных спосабаў дасягнення мэт. Калі паводзіны індывідаў перастаюць быць нарматыўна абумоўленымі, узнікае небяспека анаміі ў сістэме і росту дэвіянтных паводзін, пры якіх культурныя нормы пачынаюць разыходзіцца з інстытуцыянальнай падтрымкай сістэмы. З прычыны гэтага ўзнікаюць розныя тыпы рэакцый паводзін на дэфармацыі і напружанні сацыяльнай структуры: канфармізм, інавацыя, рытуалізм, рэтрызм, мяцеж [11, с. 672–682]. Такім чынам, эканамічнае дзеянне, з аднаго боку, мэтанакіравана і імкнецца задаволіць пэўныя запатрабаванні чалавека; з другога – залежыць ад фактараў акружэння (сацыяльных, культурных, фізічных), якія выконваюць рэгулюючую і кантрольную функцыі.

Вядомы амерыканскі сацыёлаг М. Гранаветэр паспрабаваў знайсці сярэдні шлях паміж мадэлямі «перасацыялізаванага» і «недасацыялізаванага» чалавека ў канцэпцыі «сацыяльнай укаранёнасці» эканамічнага дзеяння [12, с. 58]. Мадэль «перасацыялізаванага» чалавека характарызуецца празмернай пачуццёвасцю людзей да думкі іншых, строгім выкананнем нормаў і каштоўнасцей, выпрацаваных у працэсе сацыялізацыі, ірацыянальнымі і непаслядоўнымі паводзінамі, нядольнасцю да калькуляцыі выгад і выдаткаў. Класічныя і некласічныя эканамісты, наадварот, карыстаюцца «недасацыялізаванай» канцэпцыяй чалавечай дзейнасці. Яны адмаўляюць які-небудзь уплыў сацыяльнай структуры і сацыяльных адносін на вытворчасць, размеркаванне і спажыванне, а «эканамічнага чалавека» апісваюць як чалавека незалежнага, эгаістычнага, рацыянальнага, кампетэнтнага.

Такім чынам, сацыялагічны падыход да даследавання эканамічных паводзін чалавека як сацыяльнага феномена дазволіў разгледзець яго ў сістэме сацыяльных сувязяў, з пазіцыі ўплыву сацыяльных інстытутаў, сацыяльных наступстваў (санкцый), уплыву эканамічных запатрабаванняў і інтарэсаў на працэс фарміравання эканамічных паводзін чалавека, разгледзець эканамічныя паводзіны ў адпаведнасці з рэаліямі і патрабаваннямі грамадскай рэчаіснасці. У рамках дадзенага падыходу здымаецца абмежаванне адносна таго, якія перадумовы фарміруюць выбар стратэгіі эканамічных паводзін сацыяльнага суб’екта. Пад увагу бярэцца не толькі імкненне атрымаць максімальную выгаду, але і асаблівасці сістэмы грамадскіх нормаў і каштоўнасных арыентацый чалавека.

Дзякуючы аналізу катэгорыі «эканамічныя паводзіны», усебакова выкладзенаму ў працах заходніх прадстаўнікоў сацыяльна-эканамічнай думкі, сучасныя сацыёлагі эфектыўна вывучаюць дадзены сацыяльны феномен, вычарпальна яго апісваючы і аналізуючы. Расійскі эканаміст У. У. Радаеў імкнецца растлумачыць азначэнне эканамічных паводзін, дадзенае М. Вэберам, падрабязней разглядаючы кожны з яго кампанентаў [13, с. 21]. Так, згодна з У. У. Радаевым, *абмежаванасць рэсурсаў* – абавязковая прыкмета эканамічных паводзін. Калі рэсурс (удыхаемае намі паветра або вада з ракі) можа спажывацца ў неабмежаваных колькасцях, то ён не становіцца эканамічным.

Эканамічныя паводзіны з’яўляюцца там, дзе пачынаюцца рэсурсныя абмежаванні. Больш тонкі і меней відавочны элемент эканамічных паводзін звязаны з *альтэрнатыўным ужываннем* абмежаваных рэсурсаў. Гэтая прыкмета падразумявае наяўнасць выбару паміж рознымі спосабамі іх выкарыстання. і калі такі выбар адсутнічае, паводзіны губляюць эканамічны характар. Напрыклад, калі ў чалавека ёсць грошы, за якія прапаноўваецца адзін толькі хлеб па фіксаванай цане, то ў дадзеным выпадку «купля» таксама не можа кваліфікавацца як эканамічнае дзеянне, нягледзячы на тое, што ў наяўнасці знешняе падабенства таварна-грашовага абмену. Эканамічныя паводзіны прадугледжваюць наяўнасць магчымасці вырашаць, як паступіць з рэсурсам або гатовым прадуктам, на што выдаткаваць наяўныя грошы, ці варта наогул расходаваць рэсурсы, калі ёсць магчымасць сэканоміць, адклаўшы спажыванне або куплю.

Што датычыцца *ненасільнага кантролю* над рэсурсамі, як правіла, супраць выкарыстання дадзенай прыкметы рэдка ўзнікаюць сур’ёзныя пярэчанні. Рабаванне, экспрапрыяцыя рэсурсаў і любыя іншыя дзеянні, звязаныя з гвалтам або пагрозай яго ўжывання, не адносяцца да эканамічных паводзін, якія калі і не заўсёды прадугледжваюць неадкладнае эквівалентнае пакрыццё выдаткаў, то ўсё роўна ў іх закладзены розныя формы аплаты і пэўная ступень волі – напрыклад, магчымасць разарваць эканамічныя сувязі без пагрозы для свайго жыцця і здароўя.

Вельмі няпростая прыкмета – *забеспячэнне жыццядзейнасці людзей*. Яна паказвае на адмысловы гістарычны ракурс эканамічных адносін, якія першапачаткова афармлялі ўмовы выжывання чалавека і чалавечых супольнасцей у іх няспыннай барацьбе з прыродай. Такое выжыванне не абмяжоўваецца забеспячэннем мінімуму матэрыяльных сродкаў існавання людзей (і тым больш не зводзіцца да забеспячэння іх фізіялагічнага мінімуму). Паняцце жыццядзейнасці, нават у мінімальным аб’ёме, абавязкова ўключае сацыяльныя элементы.

Па меркаванні аўтара, пад жыццядзейнасцю разумеецца набор элементаў, без якіх парушаецца працэс біялагічнага і сацыяльнага ўзнаўлення і ўзнікае пагроза самому існаванню асобнага чалавека, групы або супольнасці. Паняцце жыццядзейнасці азначае таксама, што эканамічныя паводзіны не абавязкова зводзяцца да *эгаістычнай цікавасці* чалавека або задавальнення чыхнебудзь асабістых інтарэсаў. Забеспячэнне жыццядзейнасці не можа абмяжоўвацца дасягненнем дабрабыту асобнага чалавека. Яно ўключае інтарэсы выжывання і дабрабыту яго блізкіх, аж да адкрыта альтруістычных элементаў.

Нарэшце, эканамічныя паводзіны прадугледжваюць *колькасную пэўнасць* мэты і звязаныя з яе дасягненнем сродкі. Гаворка ідзе не проста аб магчымасці якаснага выбару, але і аб калькуляцыі – колькасным супастаўленні параўноўваемых варыянтаў. Не проста аб задавальненні запатрабаванняў, але аб найлепшым, *найболей эфектыўным* (з пункту гледжання гаспадарчага агента) спосабе іх задавальнення. Паняцце эфектыўнасці азначае максімізацыю *карыснасці* – колькасна вызначанай ступені задавальнення гэтых запатрабаванняў, суадносную

з аптымізацыяй выдаткаў. Такім чынам, У. У. Радаеў вызначае эканамічныя паводзіны як «ненасільнае выкарыстанне абмежаваных рэсурсаў, якія маюць living рознае ўжыванне, для дасягнення колькасна пэўнай мэты, звязанай з забеспячэннем жыццядзейнасці людзей» [13, с. 20–21].

Сучаснае бачанне феномена эканамічных паводзін індывіда склалася ў выніку доўгай эвалюцыі падыходаў да разумення эканамічнага чалавека як актыўнага суб’екта, уключанага ў структуру гаспадарчых сувязяў і адносін. Так, расійскі даследчык У. І. Вярховін прыводзіць у манаграфіі «Эканамічная сацыялогія» наступнае азначэнне вывучаемага намі феномена: «Эканамічныя паводзіны – гэта сістэма сацыяльных дзеянняў, якія, па-першае, звязаны з выкарыстаннем розных па функцыях і па прызначэнні эканамічных рэсурсаў і, па-другое, арыентаваны на атрыманне карысці (выгады, узнагароды, прыбылі) ад іх звароту» [14, с. 354].

Расійскі даследчык Ю. У. Весялоў, аналізуючы розныя кірункі ў эканамічнай сацыялогіі, адзначае, што «прадстаўнікі структурна-функцыянальнага аналізу прапануюць даследаваць эканамічныя паводзіны як пэўны выпадак сацыяльных паводзін, успрымаючы гэтыя паводзіны як комплексы роляў, даследуючы яго з пункту гледжання грамадскага статусу. Прыхільнікі «разумеючай сацыялогіі» таксама выбіраюць ў якасці прадмета аналізу паводзіны чалавека ў эканоміцы, але ўжо з пункту гледжання эканамічнага дзеяння як формы сацыяльнага дзеяння, акцэнтуючы ўвагу на выяўленні сэнсу і матываў гэтага дзеяння» [15, с. 7]. Такім чынам, дадзеныя падыходы аб’ядноўвае трактоўка эканамічнага дзеяння як формы сацыяльнага дзеяння.

Даследаваннем эканамічных паводзін індывіда займаюцца і такія беларускія навукоўцы, як Г. М. Сакалова, А. В. Кабяк, Т. У. Купчынава, Л. У. Філінская. Так, эканамічныя паводзіны, па азначэнні Г. М. Сакаловай, уяўляюць сабой паводзіны, звязаныя з пераборам эканамічных альтэрнатыў з мэтай адносна рацыянальнага выбару, шмат у чым абумоўленага эканамічным мысленнем, эканамічнымі інтарэсамі і сацыяльнымі стэрэатыпамі індывідаў і груп. Пры гэтым кожны феномен уносіць нешта сваё, па-свойму фарміруе той або іншы тып эканамічных паводзін. Так, тэхніка эканамічнага мыслення – гэта першая передумова, якой чалавек кіруецца ў сваіх паводзінах. Зыходзячы з балансу рацыянальнасці і эмацыянальнасці свайго мыслення, індывіды прадпрымаюць толькі тыя дзеянні, якія прынясуць ім найбольшую карысць. У зносінах паміж сабой, асабліва з нагоды размеркавання і спажывання абмежаваных эканамічных рэсурсаў, суб’екты аддаюць перавагу сваім эканамічным інтарэсам, задавальняюць свае надзённыя запатрабаванні. Гэта другая передумова іх эканамічных паводзін, якая дазваляе шмат у чым іх прадказваць. Дынамічнасць сацыяльнага стэрэатыпа (рухомая раўнавага кагнітыўнай выявы і інструментальна-лагічнай устаноўкі) стварае трэцюю передумову выбару альтэрнатыўных варыянтаў. Такім чынам, выбар індывідаў у рэальнай сітуацыі вызначаецца станам балансу рацыянальнага і эмацыянальнага ў эканамічным мысленні; іх эканамічнымі інтарэсамі, рухомасцю раўнавагі нарматыўнага і індывідуальнага ў сацыяльным стэрэатыпе [16, с. 424–426].

Стратэгія эканамічных паводзін індывіда з’яўляецца, такім чынам, вынікам суб’ектыўнарацыянальнага выбару, выбару ў кантэксце індывідуальных меркаванняў аб рацыянальнасці (аптымальнасці, разумнасці) вызначаных дзеянняў. Гэтыя меркаванні могуць быць вельмі далёкія ад мадэлі «эканамічнага чалавека», пастулірующага незалежнасць, эгаістычнасць, рацыянальнасць і інфармаванасць індывідуальнага гаспадарчага суб’екта. Такое разуменне эканамічных паводзін падкрэслівае яго сацыяльную абумоўленасць.

Беларускі сацыёлаг А. В. Кабяк вызначае эканамічныя паводзіны індывіда як дэтэрмінаваны эканамічным мысленнем і выяўлены ў сістэме сацыяльных дзеянняў суб’ектыўна аптымальны спосаб задавальнення індывідуальных запатрабаванняў праз аперыраванне абмежаванымі рэсурсамі падчас вытворчасці, размеркавання, абмену і спажывання матэрыяльных і нематэрыяльных выгод [17, с. 24].

Аўтар падкрэслівае, што паказчыкамі эканамічных паводзін выступаюць пэўныя дзеянні індывіда, якія з’яўляюцца вынікам суб’ектыўнага выбару спосабаў дзеяння, аднак, здзейснены ў кантэксце адзнак аб’ектыўных умоў гаспадарчай дзейнасці. Эканамічная дзейнасць чалавека накіравана на больш поўнае задавальненне запатрабаванняў, якія ўяўляюць сабой неабходнасць і магчымасць набыцця, захавання і выкарыстання эканамічных і неэканамічных, матэрыяльных і нематэрыяльных даброт.

Кожны чалавек, з’яўляючыся членам сацыяльнай сістэмы, акружаны так званым стымуляцыйным полем, якое падахвочвае яго да змены свайго сацыяльнага статусу. У сувязі з гэтым, для таго каб выклікаць пэўную рэакцыю ў паводзінах чалавека, неабходна, каб пад дзеяннем працэсаў успрымання і ўсведамлення актуалізавалася тое або іншае запатрабаванне, прыняўшы форму эканамічнай цікавасці як праяўлення яго актуальнай пазіцыі.

Перад прыняццем якога-небудзь рашэння адносна выбару стратэгіі сваіх паводзін, з аднаго боку, суб’ектам усведамляюцца запатрабаванні і суадносяцца з адпаведнымі рэальнымі магчымасцямі, з другога – успрымаюцца ўмовы знешняга асяроддзя як вызначанай сукупнасці грамадскіх адносін, вытворчых і невытворчых, узятых у адносінах да асобнага індывіда або некаторай сацыяльнай групы.

Такім чынам, эканамічныя паводзіны можна разглядаць: па-першае, як праяву механізма грамадскай каардынацыі дзейнасці людзей, у аснове якой ляжыць прынцып узаемавыгаднага супрацоўніцтва; па-другое, як вынік самастойнага рацыянальнага выбару магчымых стратэгій паводзін. Рацыянальнасць, у дадзеным выпадку, азначае знаходжанне спосабаў найболей аптымальнага дасягнення абраных мэт. Працэс фарміравання эканамічных паводзін чалавека ўяўляе сабой супастаўленне суб’ектыўных і аб’ектыўных фактараў, жаданага і магчымага. Суб’ектыўныя фактары складаюць такія пераменныя, як запатрабаванні, стымулы, матывы, эканамічныя інтарэсы, каштоўнасці і каштоўнасныя арыентацыі, эканамічная культура індывіда, сацыяльныя стэрэатыпы. Сацыяльна-эканамічнае становішча рэгіёна, у якім жыве чалавек, матэрыяльнае становішча хатняй гаспадаркі, стан рынку працы, культура гаспадарання прадпрыемстваў уяўляюць сабой аб’ектыўныя фактары фарміравання эканамічных паводзін індывіда [17, с. 50–86].

Падагульняючы сказанае вышэй, у даследаванні эканамічных паводзін як сацыяльнага феномена важна ўлічваць наступныя фактары. Па-першае, эканамічныя паводзіны ўяўляюць сабой форму сацыяльных паводзін, працэс узаемадзеяння гаспадарчых суб’ектаў, звязаных паміж сабой сістэмай узаемных чаканняў адносна вынікаў дзейнасці. Па-другое, эканамічныя паводзіны сацыяльна абумоўлены, паколькі яны ўкаранёны ў сістэму сацыяльных адносін. Па-трэцяе, эканамічныя паводзіны, як правіла, арыентаваны на максімізацыю выгады і мінімізацыю выдаткаў. Па-чацвёртае, працэсы фарміравання эканамічных паводзін гаспадарчага суб’екта засноўваюцца на спалучэнні аб’ектыўных (такіх, як сацыяльна-эканамічнае становішча краіны, рэгіёна, сітуацыйнае асяроддзе сацыяльных суб’ектаў, наяўнасць неабходных рэсурсаў) і суб’ектыўных перадумоў (узровень запатрабаванняў, інтарэсы, матывы, каштоўнасныя арыентацыі).

Сацыялагічны аналіз эканамічных паводзін накіраваны, перш за ўсё, на выяўленне сацыяльных, псіхічных, культурных фактараў, якія спрыяюць або перашкаджаюць рацыянальнаму выбару чалавека. Спецыфіка эканамічных паводзін складаецца ў дасягненні жаданай мэты, якая часам выходзіць за рамкі эканамічнага ўтрымання, з большай выгадай для сябе, але пры гэтым інтарэсы іншых не ігнаруюцца. Тэарэтычны аналіз названых падыходаў дазваляе сацыёлагам на матэрыялах эмпірычных даследаванняў вывучаць асаблівасці эканамічных паводзін розных сацыяльна-прафесійных груп, апісваць фактары, якія ўплываюць на фарміраванне эканамічных паводзін, выбудоўваць тыпалогіі і мадэлі эканамічных паводзін, распрацоўваць эфектыўныя праграмы развіцця прадпрыемстваў, галін, эканомікі ў цэлым.

## Літаратура


1. С м и т, А. Исследование о природе и причинах богатства народов / А. Смит // Антология экономической классики: в 2 т. – М.: Наука, 1993. – Т. 1. – 569 с.
2. М а р ш а л л, А. Принципы политической экономии: в 3 т. / А. Маршалл. – М.: Наука, 1983. – Т. 1. – 415 с.
3. Х е й н е, П. Экономический образ мышления / П. Хейне. – М.: Дело, 1991. – 701 с.
4. М а р к с, К. Сочинения. 2-е изд. / К. Маркс, Ф. Энгельс. – М.: Политиздат, 1974. – Т.42. – 574 с.
5. В е б л е н, Т. Теория праздного класса / Т. Веблен. – М.: Прогресс, 1984. – 367 с.
6. З о м б а р т, В. Буржуа: Этюды по истории духовного развития современного экономического человека / В. Зомбарт. – М.: Наука, 1994. – 443 с.
7. Ш у м п е т е р, Й. Теория экономического развития / Й. Шумпетер. – М.: Прогресс, 1982. – 455 с.
8. Д ю р к г е й м, Э. О разделении общественного труда / Э. Дюркгейм. – М.: Канон, 1996. – 430 с.

9. В е б е р, М. Основные социологические понятия / М. Вебер // Избранные произведения: пер. с нем. – М.: Прогресс, 1990. – 804 с.
10. В е б е р, М. Протестантская этика и дух капитализма / М. Вебер. – Ивано-Франковск: Ист-Вью, 2002. – 352 с.
11. M e r t o n, R. K. Social Structure and Anomie / R. K. Merton // American Sociological Review. – 1938. – N 3. – P. 672–682.
12. G r a n o v e t t e r, M. The Sociology of Economic Life / M. Granovetter, R. Svedberg. – NY.: Westview Press, 1992. – 399 p.
13. Р а д а е в, В. В. Что такое экономическое действие / В. В. Радаев // Экономическая социология. – 2002. – Т. 3. – № 5. – С. 18–25.
14. В е р х о в и н, В. И. Структура и функции экономического поведения / В. И. Верховин // Экономическая социология / В. И. Верховин. – Минск: Бел. наука, 2000. – 384 с.
15. В е с е л о в, Ю. В. Основы экономической социологии: учеб. пособие / Ю. В. Веселов, Т. К. Мацукова, А. В. Петров. – СПб.: Изд-во С.-Петерб. гос. ун-та, 1998. – 80 с.
16. С о к о л о в а, Г. Н. Экономическая социология / Г. Н. Соколова. – Минск: Наука и техника, 1995. – 255 с.
17. К о б я к, О. В. Экономический человек: закономерности формирования мышления и механизмы управления поведением / О. В. Кобяк. – Минск: Право и экономика, 2006. – 214 с.

*K. B. PALKHOUSKAYA*

**THEORETIC AND METHODOLOGICAL APPROACHES TO THE ECONOMIC BEHAVIOUR INVESTIGATION**

## Summary

In the article main approaches to the investigation of economic behavior have been analyzed. They are economic, economy-sociological and sociological ones. Modern concepts to the analysis of economic behavior have been studied. On the basis of foreign and Belarusian scholar's theories the author reveals the features of difference between models and typologies of the individual economic behavior.

## *ПРАВА*

*УДК 351*

*У. У. ДАВЫДЗІК*

# НАРМАТЫЎНАЯ ПРАВАВАЯ БАЗА ДЗЯРЖАЎНАЙ ПАГРАНІЧНАЙ ПАЛІТЫКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь*

*(Пастрыпіў у рэдакцыю 23.11.2010)*

Дзяржаўная граніца з'яўляецца неад'емным атрыбутам любой суверэннай дзяржавы, а ахова граніцы, нацыянальнай бяспекі і тэрытарыяльнай цэласнасці – найважнейшым яе абавязкам. Гэты абавязак звязаны, перш за ўсё, з прававым забеспячэннем дзейнасці ўсіх суб'ектаў пагранічных адносін. Прававое забеспячэнне ўяўляе сабой дзейнасць дзяржавы, паўнамоцных органаў па распрацоўцы і выданні юрыдычных норм (правіл), агульнаабавязковых у выкананні ўсімі дзяржаўнымі і грамадскімі інстытутамі, грамадзянамі ў ахове Дзяржаўнай граніцы.

Нарматыўную прававую аснову такой дзейнасці складаюць законы і іншыя нарматыўныя прававыя акты, прынятыя за апошняе дзесяцігоддзе. Сярод іх найбольш значнымі для дзейнасці органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь з'яўляюцца: Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года (са змяненнямі і дапаўненнямі), Канцэпцыя нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, Ваенная дактрына Рэспублікі Беларусь, Законы «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь», «Аб органах пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь», «Аб аператыўна-вышуковай дзейнасці», «Аб удзеле грамадзян у ахове правапарадку», Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь, а таксама Загады Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб некаторых пытаннях аховы Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь».

Праведзенае даследаванне сведчыць аб тым, што акты, якія складаюць аснову нарматыўнай прававой базы правядзення дзяржаўнай пагранічнай палітыкі Рэспублікі Беларусь, умоўна можна падзяліць на некалькі груп.

Да першай групы адносяцца акты, якія замацоўваюць канстытуцыйна-прававыя прынцыпы Дзяржаўнай граніцы як неабходнага атрыбута дзяржаўнага суверэнітэту і яе прававы статус (Канстытуцыя краіны, заканадаўчыя акты, якія вызначаюць прававы статус Дзяржаўнай граніцы, парадак яе ўстанаўлення і змянення, функцыі і рэжым Дзяржаўнай граніцы). Так, у артыкуле 1 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзначаецца, што Рэспубліка Беларусь абараняе сваю незалежнасць і тэрытарыяльную цэласнасць. Незалежнасць дзяржавы ў знешніх і панаванне ва ўнутраных справах ёсць яе суверэнітэт. Суверэнітэт замацаваны ў якасці прынцыпу міжнароднага права ў Статуце ААН. Пры правядзенні дзяржаўнай пагранічнай палітыкі забаронена навязваць свае ўмовы іншаму боку ці любымі сродкамі абмяжоўваць ці перашкаджаць ажыццяўленню дзяржаўным органам ці службовым асобам ажыццяўленню сваіх паўнамоцтваў на тэрыторыі сваёй дзяржавы. У роўнай ступені ўсімі нарматыўна замацаванымі спосабамі суб'екты дзяржаўнай пагранічнай палітыкі абавязаны нейтралізаваць падобныя спробы ў адносінах Рэспублікі Беларусь.

Тэрытарыяльная цэласнасць з'яўляецца абавязковай умовай дзяржаўнасці і адной з асноў суверэнітэту. Тэрыторыя дзяржавы, межы якой вызначаюцца Дзяржаўнай граніцай, з'яўляецца абавязковай умовай яе існавання. Гэта палажэнне замацавана ў артыкуле 9 Канстытуцыі Рэс-

публікі Беларусь: «Тэрыторыя Рэспублікі Беларусь з'яўляецца натуральнай умовай існавання і прасторавай мяжой самавызначэння народа, асновай яго дабрабыту і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Тэрыторыя Беларусі адзіная і неадчужальная» [1].

Парадак усталявання і змянення Дзяржаўнай граніцы, праходжанне і абазначэнне яе на мясцовасці вызначае Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 ліпеня 2008 г. № 419 «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь». У артыкуле 15 гэтага Закона ўказана, што Дзяржаўная граніца ўстанаўліваецца і змяняецца ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі. Усталяванне Дзяржаўнай граніцы, калі іншае не прадугледжана міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь, уключае дэлімітацыю і дэмаркацыю Дзяржаўнай граніцы.

Дакументы аб змяненні Дзяржаўнай граніцы, у тым ліку аб удакладненні праходжання Дзяржаўнай граніцы на мясцовасці, праведзеным у парадку сумеснай праверкі праходжання Дзяржаўнай граніцы на мясцовасці на падставе міжнародных дагавораў Рэспублікі Беларусь, уводзяцца ў дзеянне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь.

Праходжанне і абазначэнне Дзяржаўнай граніцы на мясцовасці вызначае артыкул 16 указанага Закона. Апісанне і парадак устаноўкі пагранічных знакаў вызначаецца міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь і нарматыўнымі прававымі актамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь [2].

Функцыі і рэжым Дзяржаўнай граніцы выкладзены ў главе 5 Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь». Усталяванне рэжыму Дзяржаўнай граніцы вызначаецца міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь з сумежнымі дзяржавамі і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь [3].

Да другой групы адносяцца дакументы, якія звязаны з прававым рэгуляваннем дзейнасці дзяржавы на яе граніцах, пагранічнай тэрыторыі і ў пагранічнай прасторы і маюць адносіны да ўсталявання рэжыму Дзяржаўнай граніцы, пагранічнага рэжыму, рэжыму ў пунктах пропуску праз Дзяржаўную граніцу, супрацоўніцтва з іншымі дзяржавамі па пагранічных пытаннях [4]. Рэжым Дзяржаўнай граніцы ўключае наступныя правілы:

трыманне Дзяржаўнай граніцы;

перасячэнне Дзяржаўнай граніцы;

пропуск праз Дзяржаўную граніцу фізічных асоб, транспартных сродкаў і тавараў;

усталяванне і адкрыццё пунктаў пропуску;

парадак узлёту і пасадкі паветраных судоў пры выкананні міжнародных палётаў;

парадак заходу і знаходжання водных судоў у частцы вод пагранічных рэк, азёр і іншых водных аб'ектаў, якія належаць Рэспубліцы Беларусь;

вырашэнне пагранічных інцыдэнтаў;

вядзенне на Дзяржаўнай граніцы гаспадарчай і іншай дзейнасці.

З улікам узаемных інтарэсаў Рэспублікі Беларусь і сумежных дзяржаў асобныя правілы рэжыму Дзяржаўнай граніцы могуць не ўстанаўлівацца, а характар усталявання правіл можа быць спрошчаным.

Пагранічны рэжым вызначаны главой 6 Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь» і ўсталёўваецца ў мэтах стварэння неабходных умоў для аховы Дзяржаўнай граніцы ў межах пагранічнай зоны і пагранічнай паласы. Парадак забеспячэння пагранічнага рэжыму ўстанаўліваецца Палажэннем аб парадку пагранічнага рэжыму на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджаным Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Пагранічны рэжым вызначае межы пагранічнай зоны і пагранічнай паласы і ўключае правілы:

уезду (уваходу) часовага знаходжання і перамяшчэння ў пагранічнай зоне і пагранічнай паласе;

уліку, трымання, плавання і знаходжання водных судоў ва ўнутраных водах Рэспублікі Беларусь у межах пагранічнай зоны і пагранічнай паласы;

вядзення гаспадарчай і іншай дзейнасці ў пагранічнай зоне і пагранічнай паласе.

Рэжым у пунктах пропуску ўстанаўліваецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, падтрымліваецца і кантралюецца органамі пагранічнай службы ў мэтах стварэння неабходных умоў для ажыццяўлення пагранічнага, мытнага і іншых відаў кантролю [5].

Рэжым у пунктах пропуску ўключае правілы ўезду (уваходу) у гэтыя пункты, перамяшчэння і выезду (выхаду) з іх фізічных асоб і транспартных сродкаў, а таксама парадак ажыццяўлення гаспадарчай і іншай дзейнасці ў пунктах пропуску.

Міжнароднае супрацоўніцтва па пагранічных пытаннях і ахове знешніх граніц дзяржаў-удзельнікаў Саюза Незалежных Дзяржаў (далей – СНД) Рэспубліка Беларусь ажыццяўляе на аснове міжнародна-прававых дакументаў, прынятых Саветамі кіраўнікоў дзяржаў СНД, міжнародных дагавораў, пагадненняў, мемарандумаў, канцэпцый, а таксама на аснове двухбаковых і шматбаковых прававых актаў, якія прыняты Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Урадам Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўным пагранічным камітэтам Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржпагранкамітэт) і адпавядаюць мэтам і прынцыпам СНД. Асноўнымі з іх з’яўляюцца: Мемарандум аб падтрыманні міру і стабільнасці ў СНД (Савет кіраўнікоў дзяржаў, г. Алма-Ата, 10 лютага 1995 г.); Дагавор аб супрацоўніцтве ў ахове граніц дзяржаў-удзельнікаў СНД (Савет кіраўнікоў дзяржаў, г. Мінск, 26 мая 1995 г.); Пагадненне аб узаемадзеянні пагранічных войск дзяржаў-удзельнікаў СНД пры ўзнікненні крызісных сітуацый на знешніх граніцах (Савет кіраўнікоў дзяржаў, г. Масква, 17 мая 1996 г.); Міжнародная праграма сумесных мер барацьбы з арганізаванай злачыннасцю і іншымі відамі небяспечных злачынстваў на тэрыторыі дзяржаў-удзельнікаў да 2000 г. (Савет кіраўнікоў дзяржаў, г. Масква, 1996 г.); Дэкларацыя аб прынцыпах устанаўлення і падтрымання рэжыму знешніх граніц дзяржаў-удзельнікаў СНД (Савет кіраўнікоў дзяржаў, г. Масква, 28 сакавіка 1997 г.); Дагавор аб супрацоўніцтве дзяржаў-удзельнікаў СНД у барацьбе з тэрарызмам (Савет кіраўнікоў дзяржаў, г. Мінск, 4 чэрвеня 1999 г.); Рашэнне Савета кіраўнікоў дзяржаў ад 21 чэрвеня 2000 г. аб стварэнні Антытэрарыстычнага цэнтра СНД; Дагавор аб заснаванні Еўрапейскага эканамічнага таварыства ад 10 кастрычніка 2000 г.; дакументы аб стварэнні Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), прынятыя кіраўнікамі дзяржаў (Беларусі, Расіі, Арменіі, Казахстана, Кіргізіі і Таджыкістана ў красавіку 2003 г.).

У розны час былі прыняты пагадненні па пытаннях інфармацыйнага ўзаемадзеяння, падрыхтоўкі кадраў, навукова-даследчай дзейнасці і сацыяльна-прававой абароны ваеннаслужачых.

Супрацоўніцтва з сумежнымі дзяржавамі, якія з’яўляюцца членамі Еўрапейскага саюза (Латвія, Літва, Польшча), ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Планам сумесных мерапрыемстваў паміж Дзяржпагранкамітэтам і Дзяржаўнай пагранічнай аховай Латвійскай Рэспублікі, а таксама Службай аховы дзяржаўнай граніцы пры МУС Літоўскай Рэспублікі. У цяперашні час вядзецца актыўная работа па правядзенні перагавораў і заключэнні міжнародных дагавораў паміж Урадам Рэспублікі Беларусь і Урадам Латвійскай Рэспублікі аб рэжыме беларуска-латвійскай граніцы; Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Дзяржпагранкамітэтам і Дзяржаўнай пагранічнай аховай Латвійскай Рэспублікі; Дагавора паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча аб рэжыме беларуска-польскай дзяржаўнай граніцы, супрацоўніцтве і ўзаемадапамозе па пагранічных пытаннях; Пагаднення паміж Дзяржпагранкамітэтам і Галоўнай камендатурай Пагранічнай варты Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Рэспублікі Польшча аб спосабах і напрамках супрацоўніцтва.

Супрацоўніцтва па пагранічных пытаннях з міжнароднымі арганізацыямі ажыццяўляецца ў межах сумесных праектаў і праграм. З Еўрапейскім саюзам – рэалізацыя праекта «Узмацненне пагранічнага і мытнага кантролю ў Беларусі, Украіне і Малдове (БАМБЕЛ-3)», «Павышэнне эфектыўнасці раздзялення і работы з міграцыйнымі хвалямі на Дзяржаўнай граніцы і ўнутры Рэспублікі Беларусь (ЭНЕЙ-3)». З Японіяй – рэалізацыя праекта «Мадэрнізацыя сістэмы процідзеяння незаконнаму абароту ядзерных і радыеактыўных матэрыялаў праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь (РАДБЕЛ)». Дзяржпагранкамітэт – АБСЕ ажыццяўляе сумесны праект «Аказанне садзейнічання ў рэфармаванні органаў пагранічнай службы Беларусі». Адбываецца таксама рэалізацыя Дзяржпагранкамітэтам доўгатэрміновага праекта па прафілактыцы ВІЧ/СНІД, які фінансуецца ПРААН.

У цяперашні час у межах флагманскай ініцыятывы «Інтэграванае кіраванне граніцай», ініцыятывы Еўрасаюза «Усходняе партнёрства» вядзецца распрацоўка новых праектных прапаноў.

Адным з прыярытэтных напрамкаў супрацоўніцтва па пагранічных пытаннях для органаў пагранічнай службы становіцца актывізацыя ўзаемадзеяння з Пагранічным агенцтвам Еўрасаюза «ФРОНТЭКС».

Да трэцяй групы адносяцца дакументы, звязаныя з прававым рэгуляваннем дзейнасці дзяржавы па забеспячэнні пагранічнай бяспекі на Дзяржаўнай граніцы, барацьбе з міжнародным тэрарызмам, кантрабандай, нелегальнай міграцыяй, перавозкай наркотыкаў, падтрыманнем правапарадку на сухапутнай, воднай, паветранай частках пагранічнай прасторы. Забеспячэнне пагранічнай бяспекі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Законам «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь», іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку шляхам аховы Дзяржаўнай граніцы, функцыянавання пунктаў пропуску праз Дзяржаўную граніцу і папярэджвання правапарушэнняў на пагранічнай тэрыторыі.

Парадак аховы Дзяржаўнай граніцы выкладзены ў главе 4 Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь». Ахова Дзяржаўнай граніцы ажыццяўляецца ў мэтах недапушчэння супрацьпраўнага змянення Дзяржаўнай граніцы, забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь і прытрымлівання фізічнымі і юрыдычнымі асобамі заканадаўства аб Дзяржаўнай граніцы.

Дасягненне галоўнай мэты дзяржаўнай пагранічнай палітыкі – забеспячэнне пагранічнай бяспекі – немагчыма без узгодненых дзеянняў дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, адказных за ахову Дзяржаўнай граніцы. Таму праблема ўзаемадзеяння і супрацоўніцтва ў галіне аховы Дзяржаўнай граніцы знайшла адлюстраванне ў артыкуле 18 Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь», дзе ўказана, што дзяржаўныя органы і іншыя дзяржаўныя арганізацыі Рэспублікі Беларусь узаемадзейнічаюць паміж сабой у галіне аховы Дзяржаўнай граніцы і ў межах сваёй кампетэнцыі ажыццяўляюць узаемнае інфармаванне ў гэтай галіне.

Грамадскія адносіны, якія ўзнікаюць у сувязі з удзелам грамадзян Рэспублікі Беларусь, замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, а таксама аб’яднанняў грамадзян у ахове правапарадку, замацаваны заканадаўча. Асноўнымі прынцыпамі ўдзелу грамадзян і іх аб’яднанняў у ахове правапарадку з’яўляюцца: добраахвотнасць, законнасць, гуманнасць і павага правоў чалавека, галоснасць, цеснае ўзаемадзеянне з дзяржаўнымі органамі, якія ажыццяўляюць ахову правапарадку [6].

Акрамя таго, артыкул 19 Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь» вызначае парадак аказання садзейнічання органам пагранічнай службы ў ахове Дзяржаўнай граніцы грамадскімі аб’яднаннямі і іншымі арганізацыямі.

Для барацьбы з нелегальнай міграцыяй кантроль уезду іншаземцаў у Рэспубліку Беларусь і выезду з Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца органамі пагранічнай службы ў адпаведнасці з Правіламі знаходжання іншаземных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь [7].

Парадак арганізацыі барацьбы з тэрарызмам выкладзены ў Законе ад 3 студзеня 2002 г. «Аб барацьбе з тэрарызмам». У адпаведнасці з гэтым законам органы пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляюць барацьбу з тэрарызмам шляхам папярэджвання, выяўлення і спынення спроб перасячэння тэрарыстамі Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь, а таксама незаконнага перамяшчэння праз Дзяржаўную граніцу Рэспублікі Беларусь зброі, боепрыпасаў, выбуховых, атрутных, радыеактыўных рэчываў і іншых прадметаў, якія могуць быць выкарыстаны ў якасці сродкаў ажыццяўлення актаў тэрарызму, удзельнічаюць у правядзенні контртэрарыстычных аперацый [8].

За апошнія гады створана дастаткова поўная нарматыўная правая база, якая рэгулюе адносіны ў дзейнасці дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў краіны ў пагранічнай сферы. Разам з тым, як паказваюць даследаванні, яна яшчэ не ў поўнай меры адпавядае патрэбам практычнай дзейнасці суб’ектаў пагранічных адносін.

Па меркаванні аўтара, у шэрагу нарматыўных прававых актаў маюцца недакладнасці ў базавых азначэннях і палажэннях, назіраецца не заўсёды карэктнае выкарыстанне паняційна-катэгарыяльнага апарату, што дае падставы да дваістага тлумачэння паняццяў, ускладняе выпрацоўку неабходных мер. Існуюць супярэчлівасць у трактоўцы асноўных палажэнняў у розных заканадаўчых актах, няўзгодненасць прававых норм розных галін ведаў, недастаткова дакладна вызначаны механізмы рэалізацыі паўнамоцтваў.

Так, узнікае шэраг істотных пытанняў, звязаных са зместам некаторых артыкулаў Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь», прынятым 21 ліпеня 2008 г. У артыкуле 1 уста-

ноўлена, што «Дзяржаўная граніца Рэспублікі Беларусь (далей – Дзяржаўная граніца) ёсць лінія і праходзячая па гэтай лініі вертыкальная паверхня, якія вызначаюць межы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (сушы, вод, нетраў, паветранай прасторы)» [9]. Дадзенае азначэнне змяшчае недакладнасць. Яна заключаецца ў тым, што лінія і праходзячая па гэтай лініі вертыкальная паверхня не вызначаюць, а толькі абазначаюць межы дзеяння дзяржаўнага суверэнітэту. Вызначэнне межаў дзяржаўнага суверэнітэту ажыццяўляе сама дзяржава.

Акрамя таго, у дадзеным азначэнні нічога не гаворыцца аб тым, што Дзяржаўная граніца ёсць лінія, узгодненая з зацікаўленымі бакамі і замацаваная ў дагаворы аб устанаўленні Дзяржаўнай граніцы. Гэта больш распаўсюджаная практыка, чым устанаўленне Дзяржаўнай граніцы ў аднабаковым парадку. Паняцце «дзяржаўная граніца» з'яўляецца галоўнай катэгорыяй тэорыі дзяржаўных граніц. Таму ў Законе «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь» неабходна сфармуляваць больш поўнае і дакладнае азначэнне.

Ёсць у Законе і іншыя недакладнасці. Артыкул 3 вызначае, што «заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб Дзяржаўнай граніцы заснавана на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і міжнародных дагаворах Рэспублікі Беларусь і складаецца з дадзенага Закона і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь». У гэтым азначэнні адсутнічае ўпамінанне аб Загадах і іншых нарматыўных актах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановах Урада Рэспублікі Беларусь. Такім чынам, дадзенае азначэнне патрабуе ўдакладнення.

Дасягненне галоўнай мэты дзяржаўнай пагранічнай палітыкі – забеспячэнне пагранічнай бяспекі – немагчыма без узгодненых дзеянняў дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў, адказных за ахову Дзяржаўнай граніцы. Таму праблема каардынацыі дзейнасці паўнамоцных суб'ектаў у забеспячэнні пагранічнай бяспекі знайшла адлюстраванне ў артыкуле 6 Закона «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь», у якім адным з паўнамоцтваў Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь з'яўляецца арганізацыя ўзаемадзеяння і ажыццяўленне каардынацыі дзейнасці дзяржаўных органаў і іншых арганізацый у галіне правядзення дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэння пагранічнай бяспекі.

Па нашым меркаванні, рашэнню складаных задач каардынацыі суб'ектаў, якія ўдзельнічаюць у правядзенні дзяржаўнай пагранічнай палітыкі, магла б дапамагчы распрацоўка Канцэпцыі каардынацыі дзеянняў дзяржаўных органаў і грамадскіх арганізацый як міжведамаснай, так і міжнароднай палітыкі ў галіне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі. Улічваючы ўзрастанне ролі каардынацыі, мэтазгодна, каб гэта праблема была больш поўна адлюстравана ў Законе «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь» з выкладаннем усіх асноўных палажэнняў арганізацыі і ажыццяўлення самога механізма каардынацыі, а не толькі вызначэння каардынуючага органа і паўнамоцтваў дзяржаўных органаў у галіне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі, як гэта мае месца ў дзеючым законе. Таксама важна, каб праблемы каардынацыі дзеянняў усіх зацікаўленых ведамстваў знайшлі адлюстраванне ў законах і іншых нарматыўных прававых актах на ўзроўні ўсіх суб'ектаў, якія ўдзельнічаюць у правядзенні дзяржаўнай пагранічнай палітыкі. Канкрэтная і дэталёвая рэгламентацыя пагранічных адносін у пагранічнай прасторы павінна быць зафіксавана і ў актах мясцовага кіравання і самакіравання. Гэта павінна быць добра наладжаная сістэма сумеснай распрацоўкі нарматыўных прававых актаў дзяржаўных органаў і органаў мясцовага кіравання і самакіравання, якая прадугледжвае выкарыстанне магчымасцей усіх без выключэння суб'ектаў дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і пабудаваная на аснове адзіных прынцыпаў яе фарміравання, узаемнага ўліку інтарэсаў усіх дзяржаўных і грамадскіх інстытутаў; каардынацыя, забяспечаная надзейным механізмам рэалізацыі паўнамоцтваў і дастаткова цэнтралізаваная.

Як вядома, эфектыўнасць дзейнасці любога дзяржаўнага органа, у тым ліку і органаў пагранічнай службы Рэспублікі Беларусь, залежыць ад дакладнага фармулявання мэты, задач, функцый. На жаль, у заканадаўчых і іншых прававых актах яны выкладаюцца без адпаведнай сістэматызацыі і не ў поўнай меры суадносяцца з функцыямі кіравання. Асноўныя функцыі кіравання – арганізацыйна-распарадчыя (вырашае, устанаўлівае, сцвярджае); рэгулюючыя (разглядае, узгадняе, каардынуе, прапаноўвае); кантрольныя (арганізоўвае, забяспечвае, кантралюе, аналізуе); выканаўчыя (распрацоўвае, улічвае, робіць справаздачу, выконвае) – не прапісваюцца.

Толькі дакладная фармулёўка ў нарматыўных прававых актах зместу кожнай функцыі Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Рэспублікі Беларусь як кіруючага органа ў галіне дзяржаўнай пагранічнай палітыкі можа ўнесці яснасць у тое, што яны ўяўляюць сабой, і як у адпаведнасці з імі арганізаваць сваю дзейнасць.

У правядзенні дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэнні пагранічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь побач з дзяржаўнымі органамі ўдзельнічаюць органы мясцовага кіравання і самакіравання, прадпрыемствы і іх аб'яднанні, установы і арганізацыі, грамадскія аб'яднанні і грамадзяне. Было б мэтазгодна заканадаўча ўстанавіць парадак заахвочвання, які адпавядае значнасці і ўкладу суб'ектаў у правядзенні дзяржаўнай пагранічнай палітыкі. Напрыклад, для іх заахвочвання могуць спецыяльна выдзяляцца фінансавыя сродкі, бясплатна давацца дровы, сенакосныя ўгоддзі, права на набыццё на льготных умовах паляўнічых ліцэнзій, стымулявацца льготнае падаткаабкладанне, ажыццяўляцца дадатковыя выплаты да заработнай платы і да т. п. Гэтыя і іншыя прапановы маглі б быць унесены ў якасці дапаўненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб Дзяржаўнай граніцы Рэспублікі Беларусь».

Прымаючы меры па ўдасканаленні нарматыўнай прававой базы дзяржаўнай пагранічнай палітыкі, вельмі важна дабіцца, каб яна стала больш поўнай, скаардынаванай, адпавядала прынцыпам міжнароднага права, сумесна рэагавала на змяненні, якія адбываюцца ў пагранічнай сферы, адпавядала рэальным патрэбам дзейнасці ўсіх суб'ектаў дзяржаўнай пагранічнай палітыкі і забеспячэнню пагранічнай бяспекі краіны.

Дзяржаўная пагранічная палітыка Рэспублікі Беларусь у цяперашні час знаходзіцца на этапе фарміравання як галіна беларускага заканадаўства і права, заяўляе аб сабе як аб маладой юрыдычнай навуцы і, магчыма, новай навучальнай дысцыпліне. Таму ўдасканаленне яе нарматыўнай прававой базы набывае асаблівую значнасць і актуальнасць.

## Літаратура


1. Конституция Республики Беларусь. – Минск: Беларусь, 2004. – 44 с.
2. Положение о порядке обозначения Государственной границы Республики Беларусь на местности: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 22.01.2009 г., № 70 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2009. – № 30. – 5/29182.
3. О ратификации договора между Республикой Беларусь и Литовской Республикой о белорусско-литовской Государственной границе: постановление Верх. Совета Респ. Беларусь, 25 апреля 1996 г., № 217-XIII // Вед. Верх. Совета Респ. Беларусь. – 1996. – № 15. – Ст. 193, 194.
4. О некоторых вопросах охраны Государственной границы Республики Беларусь: Указ Президента Респ. Беларусь, 9 марта 2009 г., № 125 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2009. – № 67. – 1/10532.
5. Положение о режиме в пунктах пропуска через Государственную границу Республики Беларусь: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 22.01.2009 г., № 70 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2009. – № 30. – 5/29182.
6. Об участии граждан в охране правопорядка: Закон Респ. Беларусь, 26 июня 2003 г., № 214–З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2003. – № 74. – 2/983; 2010. – № 5. – 2/1630.
7. Об утверждении правил пребывания иностранных граждан и лиц без гражданства в Республике Беларусь: постановление Совета Министров Респ. Беларусь, 20 января 2006 г., № 73 // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2006. – № 19. – 5/17151; № 78. – 5/22324; 2008. – № 6. – 5/26598.
8. О борьбе с терроризмом: Закон Респ. Беларусь, 3 января 2002 г., № 77-З // Нац. реестр правовых актов Респ. Беларусь. – 2002. – № 6. – 2/825.
9. О Государственной границе Республики Беларусь: Закон Респ. Беларусь, 21 июля 2008 г., № 419-З // Сб. законов Респ. Беларусь. – Минск, 2009.


*V. V. DAVYDZIK*

**NORMATIVE LEGISLATION BASE OF THE STATE BORDER POLICY OF THE REPUBLIC OF BELARUS**

## Summary

In the article analysis of the existing normative legal basis for the state border policy of the Republic of Belarus has been made. Recommendations for the normative legal basis improvement have been given, too.

*УДК 347.78*

*С. С. ЛОСЕЎ*

# МАЁМАСНЫЯ АЎТАРСКІЯ ПРАВЫ Ў ГРАМАДЗЯНСКІМ ПРАВЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Інстытут прававых даследаванняў Нацыянальнага цэнтра заканадаўства і прававых даследаванняў Рэспублікі Беларусь*

*(Паступіў у рэдакцыю 28.12.2010)*

**Уводзіны.** Найбольш важным аспектам любога права з'яўляецца яго змест. У. І. Сераброўскі вызначаў змест аўтарскага права як сукупнасць дадзеных аўтару правоў (правамоцтваў), неабходных для абароны інтарэсаў, якія ўзнікаюць у сувязі са стварэннем і выкарыстаннем твора грамадствам [1, с. 94–95].

Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб аўтарскім праве зыходзіць з традыцыйнага для кантынентальнай прававой сістэмы дуалістычнага разумення аўтарскага права, уключаючы ў яго як маёмасныя, так і немаёмасныя правы. Артыкул 982 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей – ГК) [2] устанаўлівае, што аўтарам вынікаў інтэлектуальнай дзейнасці належаць асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы.

Асабістыя немаёмасныя і маёмасныя аўтарскія правы ў адпаведнасці з арт. 1 ГК уваходзяць у прадмет рэгулявання грамадзянскага права, і, улічваючы адзіны аб'ект гэтых правоў – твор, ахопліваюцца агульным паняццем «аўтарскае права». А. П. Сяргееў называе дзяленне аўтарскіх правоў на асабістыя немаёмасныя і маёмасныя самай распаўсюджанай і ў той жа час самай спрэчнай класіфікацыяй [3, с. 193]. Аднак з такім сцвярджэннем у адносінах да беларускага заканадаўства цяжка пагадзіцца, паколькі аднясенне суб'ектыўных аўтарскіх правоў да катэгорыі або асабістых немаёмасных, або маёмасных замацавана нарматыўна ў артыкулах 15 і 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» (далей – Закон) [4].

Істотным адрозненнем маёмасных аўтарскіх правоў ад правоў асабістых немаёмасных з'яўляецца эканамічны змест першых [5, с. 23]. У гэтых адносінах справядлівае сцвярджэнне Э. П. Гаўрылава аб тым, што магчымасць атрымання ўзнагароджання ад ажыццяўлення правоў з'яўляецца крытэрыем размежавання асабістых немаёмасных і маёмасных правоў [6, с. 137].

Аднак вызначэнне зместу маёмасных аўтарскіх правоў уяўляе сабой сур'ёзную праблему як для тэорыі права, так і для заканатворчай практыкі. Праблематыка зместу маёмасных аўтарскіх правоў актыўна даследавалася ў працах савецкіх прававедаў. У ліку асноўных прац можна назваць публікацыі Э. П. Гаўрылава, М. У. Гардона, У. І. Сераброўскага, С. А. Чарнышовай і інш. Фарміраванне нацыянальнага заканадаўства ў постсавецкіх дзяржавах выклікала новую цікавасць вучоных да вывучэння прыроды маёмасных аўтарскіх правоў; пры гэтым адхіленая ў гады савецкай улады тэорыя выключных правоў з пачатку 90-х гг. мінулага стагоддзя зноў стала актуальнай і актыўна абмяркоўвалася ў працах пераважна расійскіх прававедаў; сярод асноўных сучасных даследаванняў можна назваць працы І. А. Блізняца, У. А. Дазорцава, В. А. Каляціна, А. П. Сяргеева.

У айчыннай навуцы грамадзянскага права праблематыка маёмасных аўтарскіх правоў з'яўляецца менш вывучанай; асобныя аспекты зместу маёмасных аўтарскіх правоў разглядаліся ў працах такіх аўтараў, як І. Латышаў, С. С. Лосеў, І. В. Папова, С. А. Сударыкаў. Пры гэтым уяўляюцца недастаткова даследаванымі такія фундаментальныя пытанні, як суадносіны паняццяў «маёмасныя аўтарскія правы» і «выключнае аўтарскае права», прававая прырода выключнага аўтарскага права і яго змест.

**Асноўная частка.** У адпаведнасці з нормай арт. 983 ГК уладальніку маёмасных правоў на вынік інтэлектуальнай дзейнасці належыць выключнае права правамернага выкарыстання гэтага аб’екта паводле свайго меркавання ў любой форме і любым спосабам. Гэтым самым заканадаўца адназначна вырашае пытанне аб тым, што тэрмін «выключнае» прымяняецца толькі да маёмасных аўтарскіх правоў. Аднак ці тоесныя гэтыя паняцці?

Асобныя даследчыкі ўраўноўваюць гэтыя паняцці, сцвярджаючы, што маёмасныя аўтарскія правы – гэта выключнае права на выкарыстанне твора [7, с. 44; 8, с. 211]. У асобных працах гаворыцца аб «дыхатаміі» паняццяў «выключнае права» і «маёмасныя правы» [9, с. 93]. Можна сказаць аб тым, што такія сцвярджэнні ў многім перадвызначаны тэрміналагічнай нявытрыманасцю, якая ўласціва дзеючаму Закону. Артыкул 16 Закона, які называецца «Маёмасныя правы», устанаўлівае, што аўтару (іншаму праваўладальніку) належыць выключнае права здзяйсняць ці дазваляць ажыццяўляць пералічаныя ў гэтым артыкуле дзеянні па выкарыстанні твора. Далей, у арт. 25 Закона гаворыцца аб тым, што маёмасныя правы могуць быць уступлены ці перададзены паводле аўтарскага дагавора, пры гэтым перадавацца могуць выключныя маёмасныя правы ці невыключныя маёмасныя правы.

З’яўляючыся, згодна з арт. 128 ГК, самастойным відам грамадзянскіх правоў, выключнае права забяспечвае законную манаполію яго ўладальніка ў адносінах пэўнага выніку інтэлектуальнай дзейнасці. Паводле сваёй прыроды выключнае права з’яўляецца правам маёмасным, паколькі яго здзяйсненне звязана з набыццём матэрыяльных даброт. Аднак выкарыстоўваць дадзеныя паняцці ў якасці сінонімаў нельга. Аналіз усяго тэксту Закона дазваляе сцвярджаць, што за аўтарамі асобных катэгорый твораў прызнаюцца дадатковыя правы маёмаснага характару: 1) у адпаведнасці з арт. 17 Закона аўтары твораў выяўленчага мастацтва, літаратурных і музычных твораў у кожным выпадку публічнага перапродажу твораў і рукапісаў маюць права атрымліваць ад прадаўца частку даходу, атрыманага ад продажу (права пераходу); 2) у адпаведнасці з п. 3 арт. 18 Закона аўтары аўдыявізуальных твораў і твораў, увасобленых у фанаграмах, маюць права атрымліваць узнагароджанне за ўзнаўленне іх твораў у асабістых мэтах. Абодва гэтыя правы не даюць аўтару магчымасці ўплываць якім-небудзь чынам на выкарыстанне твора, але даюць магчымасць атрымліваць пэўны даход ад такога выкарыстання. Значыць, такія правы, як права пераходу і права на атрыманне ўзнагароджання за ўзнаўленне твора ў асабістых мэтах, якія маюць бясспрэчна маёмасны характар, не адносяцца да катэгорыі выключных.

З праведзенага кароткага аналізу можна зрабіць вывады аб тым, што паняцці «маёмасныя аўтарскія правы» і «выключнае аўтарскае права» суадносяцца як агульнае і прыватнае, пры гэтым да катэгорыі «маёмасныя аўтарскія правы» побач з выключным аўтарскім правам адносяцца і іншыя правы маёмаснага характару, названыя ў Законе.

Цяпер звернемся да аналізу выключнага аўтарскага права. Даючы агульную характарыстыку любому выключнаму праву, у тым ліку выключнаму аўтарскаму праву, трэба звярнуць увагу на ўласцівыя яму дзве формы здзяйснення: пазітыўную і негатыўную. Першая, пазітыўная, прадугледжвае магчымасць упаўнаважанага суб’екта здзяйсняць пэўныя станоўчыя дзеянні па выкарыстанні аб’екта права; другая, негатыўная, азначае дзеючую ў адносінах усіх іншых асоб забарону ажыццяўлення дзеянняў, якія складаюць змест выключнага права. Гаворачы аб патэнтным праве, расійскі цывіліст пачатку XX ст. А. А. Піленка падкрэсліваў прэвалюючае значэнне забараняючага элемента для выключных правоў. Паводле яго меркавання, «...пазітыўная магчымасць фабрыкацыі ёсць не юрыдычнае паняцце, а эканамічная функцыя прававога інстытута забароны» [10, с. 35]. Думка аб двух праяўленнях выключнага аўтарскага права была выказана ў свой час Б. Н. Гарадзецкім, які пісаў: «Выключнасць аўтарскага права выяўляецца ў двух яго баках: пазітыўным і негатыўным. Да першага адносіцца права выпускаць твор і выкарыстоўваць яго ўсімі дазволенымі спосабамі, уключаючы права на атрыманне аўтарскай узнагароды за перадачу правоў на выкарыстанне твора іншай асобе. Негатыўны бок аўтарскага права заключаецца ў забароне ўсім асобам і арганізацыям без дазволу аўтара здзяйсняць у адносінах да яго твора ўсе тыя дзеянні, правы на якія законам дадзены самому аўтару» [11, с. 22].

На жаль, гэтыя думкі не знайшлі патрэбнага развіцця ні ў савецкай, ні ў постсавецкай навуцы. У той жа час уяўляецца, што разуменне гэтых двух праяўленняў выключнага права

(пазітыўнага і негатыўнага) неабходна для ўсведамлення асноўных прынцыпаў яго здзяйснення. На першы погляд можа падацца, што негатыўны складнік з’яўляецца ўсяго толькі адваротным бокам пазітыўнага, дазваляючы вызначыць змест выключнага права «ад зваротнага» – пры дапамозе пералічэння дзеянняў у адносінах аб’екта выключных правоў, здзяйсненне якіх усім трэцім асобам забаронена. Аднак аналіз дагаворных адносін наконт выключных правоў дазваляе казаць аб тым, што выключнае права, якое перадаецца па дагаворы, можа як мець, так і не мець у сваім саставе негатыўны складнік; адпаведна асоба, якая атрымала выключнае права паводле дагавора, або мае магчымасць гэта права абараняць, або не мае.

У самым агульным выглядзе змест права на выкарыстанне твора ў літаратуры вызначаюць як выключнае права аўтара выкарыстоўваць твор у любой форме і любым спосабам. А. П. Сяргееў вызначае гэта права як магчымасць аўтара самому вырашаць усе пытанні, звязаныя з даваннем трэцім асобам доступу да твора і яго выкарыстаннем [3, с. 212]. Як права выкарыстання аб’екта ў любой форме і любым спосабам выключнае права вызначана ў арт. 983 ГК.

Аднак у Законе Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» пытанне зместу выключнага аўтарскага права вырашаецца інакш. Згодна з арт. 16 Закона, аўтару ў адносінах да яго твора належыць выключнае права здзяйсняць ці дазваляць наступныя дзеянні:

– узнаўленне твора;

– распаўсюджванне арыгінала ці экзэмпляра твора пры дапамозе продажу ці іншай перадачы права ўласнасці;

– пракат арыгіналаў ці экзэмпляраў камп’ютарных праграм, баз даных, аўдыявізуальных твораў, нотных тэкстаў музычных твораў і твораў, увасобленых у фанаграмах, незалежна ад прыналежнасці права ўласнасці на арыгінал ці экзэмпляры ўказаных твораў;

– імпарт экзэмпляраў твора, уключаючы экзэмпляры, зробленыя з дазволу аўтара ці іншага ўладальніка аўтарскіх правоў;

– публічны паказ арыгінала ці экзэмпляра твора;

– публічнае выкананне твора;

– перадача твора ў эфір;

– іншая перадача твора для ўсеагульнага ведама;

– пераклад твора на іншую мову;

– пераробка ці іншая перапрацоўка твора [4].

Вызначэнне выключнага права на твор у выглядзе пераліку спосабаў такога выкарыстання заканамерна выклікае пытанне аб характары дадзенага права – ці з’яўляецца яно адзіным правам, ці складаецца з пералічанага ў Законе набору спосабаў выкарыстання, кожны з якіх, у сваю чаргу, з’яўляецца самастойным выключным правам, у сувязі з чым іх сукупнасць павінна абазначацца тэрмінам «выключныя аўтарскія правы».

Аналізуючы дадзены ў Законе пералік дзеянняў, якія ўтвараюць права аўтара на выкарыстанне твора, многія айчынныя даследчыкі выказваюць меркаванне аб тым, што змест права на выкарыстанне твора павінен зводзіцца толькі да вышэйпералічаных правамоцтваў. Так, І. В. Папова сцвярджае, што пералік маёмасных правамоцтваў, якія раскрываюць змест выключнага права на выкарыстанне, з’яўляецца вычарпальным [12, с. 21]. Такой жа пазіцыі прытрымліваецца С. С. Сударыкаў, сцвярджаючы, што «...спіс маёмасных правоў, замацаваных заканадаўча, з’яўляецца вычарпальным» [8, с. 213].

Артыкул 16 Закона ўстанаўлівае, што аўтару належыць выключнае права здзяйсняць вычарпальным чынам пералічаныя спосабы выкарыстання твора, арт. 26 Закона выкарыстоўвае тэрміны «спосабы выкарыстання твораў» і «канкрэтныя правы, якія перадаюцца па дагаворы» ў якасці сінонімаў. Артыкул 983 ГК ужывае тэрмін «выключнае права», хоць у арт. 984 ГК заканадаўца гаворыць аб перадачы па дагаворы «выключных правоў». Напрошваецца вывад аб тым, што беларускае заканадаўства ў даследуемай сферы не вылучаецца вытрыманасцю тэрміналогіі і ў адносінах да аднаго і таго ж аб’екта выкарыстоўвае два тэрміны – выключнае права і выключныя правы.

У адпаведнасці з арт. 983 ГК аўтару належыць выключнае права выкарыстання твора ў любой форме і любым спосабам. Калі дапусціць, што ўказаныя ў арт. 16 Закона дзеянні па выкарыстанні твора пэўнымі спосабамі носяць характар самастойных выключных правоў, то аб’ём

права на выкарыстанне твора павінен быць абмежаваны толькі сукупнасцю гэтых названых у Законе спосабаў. Такое тлумачэнне будзе супярэчыць норме арт. 983 ГК аб праве выкарыстоўваць *любым* спосабам, без указання, што слова «любыя» значыць «любыя, пералічаныя ў законе».

Аналіз гісторыі развіцця аўтарскага права паказвае, як з развіццём тэхнічных сродкаў змяняўся змест права на выкарыстанне твора і як у законах аб аўтарскім праве з'яўляліся ўпамінанні ўсё новых і новых спосабаў выкарыстання. Мы не можам нават прыблізна назваць тыя спосабы давядзення твораў да публікі, якія могуць з'явіцца ў будучым, і менавіта таму заканадаўца вызначае змест права на выкарыстанне твора ў самым агульным выглядзе, прызнаючы за аўтарам права выкарыстоўваць яго любымі спосабамі, вядомымі ў цяперашні момант, і тымі, якія з'явяцца ў будучым.

Такім чынам, лагічна несупярэчлівым можа быць толькі прызнанне за аўтарам адзінага выключнага права на выкарыстанне твора, пры гэтым пералічаныя ў арт. 16 Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» дзеянні будуць з'яўляцца магчымымі варыянтамі здзяйснення гэтага права.

Дзеля справядлівасці хацелася б адзначыць, што гэта думка неаднаразова выказвалася ў літаратуры, і некаторыя даследчыкі раней прапаноўвалі замацаваць за аўтарамі агульнае права на распараджэнне творам [6, с. 134], што ў далейшым знайшло адлюстраванне ў арт. 135 Асноў грамадзянскага заканадаўства Саюза ССР і рэспублік 1991 г. [13]. Аднак у Законе Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежнах правах» гэта ідэя зазнала вядомыя трансфармацыі, што і выклікала пэўныя праблемы з тлумачэннем зместу права на выкарыстанне твора.

Звяртаючыся да замежнага вопыту вызначэння зместу выключнага аўтарскага права, у першую чаргу трэба звярнуцца да заканадаўчай практыкі суседніх краін. Расійскія вучоныя, характарызуючы нормы часткі чацвёртай Грамадзянскага кодэкса Расійскай Федэрацыі, прысвечаныя аўтарскаму праву, адзначаюць, што заканадаўца зыходзіць з канцэпцыі існавання адзінага і недзялімагаа выключнага права на твор, якое дазваляе яго ўладальніку выкарыстоўваць твор у любой форме і любым спосабам, які не супярэчыць закону [14, с. 72]. Яшчэ да ўвядзення ў дзеянне ў 2008 г. норм часткі чацвёртай ГК Расійскай Федэрацыі такі пункт погляду выказаў А. П. Сяргееў, адзначыўшы, што пералік канкрэтных аўтарскіх правамоцтваў, які канкрэтызуе прызнаваемае за аўтарам права на выкарыстанне твора «ў любой форме і любым спосабам» ахоплівае толькі тыповыя выпадкі выкарыстання твораў і не носіць вычарпальнага характару; любыя іншыя спосабы выкарыстання твораў, як існуючыя сёння, так і тыя, якія могуць з'явіцца ў далейшым, павінны прымяняцца толькі са згоды аўтара і яго правапераемнікаў [3, с. 213]. Менавіта пазіцыя А. П. Сяргеева ўяўляецца ў найбольшай ступені адпавядаючай літары і духу дзеючага расійскага заканадаўства аб аўтарскім праве.

Што тычыцца тэрміналогіі, уяўляюцца цікавымі нормы заканадаўства аб аўтарскім праве Рэспублікі Польшча. Артыкул 17 Закона аб аўтарскім праве і сумежных правах ад 4 лютага 1994 г. [15], уключаны ў раздзел «Эканамічныя правы», устанаўлівае, што «...аўтару належыць выключнае права выкарыстоўваць твор усімі формамі эксплуатацыі, а таксама права на атрыманне ўзнагароджання ў абмен на выкарыстанне твора»; арт. 50 прыводзіць прыкладны пералік «сфер эксплуатацыі твора», які практычна аналагічны таму, што змяшчаецца ў арт. 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах». Менавіта ў якасці адзінага выключнага права разглядаюць права на выкарыстанне твора польскія вучоныя [16, с. 36; 17, s. 194]. Хацелася б падкрэсліць, што ўжытая ў польскім заканадаўстве канструкцыя ў выглядзе «сфер эксплуатацыі» ўяўляецца вельмі ўдалым юрыдычным рашэннем, якое дазваляе лагічна несупярэчліва вызначыць змест выключнага аўтарскага права і магчымыя варыянты яго здзяйснення.

З тэарэтычнага пункту погляду галоўная мэта вызначэння асобных аўтарскіх правамоцтваў – не пералічэнне ўсіх магчымых варыянтаў выкарыстання твора, а выдзяленне грамадска значных спосабаў і ўстанаўленне абавязку карыстальніка атрымліваць асобны дазвол аўтара на кожны такі від выкарыстання твора. У сувязі з гэтым заслугоўвае ўвагі выказаная В. А. Каляціным ідэя арыентацыі на аўдыторыю, якая можа ўспрымаць твор пры тым ці іншым спосабе выкарыстання. Кожны спосаб выкарыстання твора пэўным чынам абмяжоўвае аўдыторыю, якая ўспрымае твор [18, с. 62]. Менавіта гэта абмежаванне вызначае яго практычнае значэнне, калі ўкараненне новай тэхналогіі ніяк не змяняе склад успрымаючай аўдыторыі, то гэта павінна быць

нейтральна для аўтарскага права і не павінна ўплываць на сістэму правамоцтваў. Зыходзячы з гэтай пасылкі, В. А. Каляцін прапаноўвае звесці правамоцтвы па выкарыстанні твора да трох асноўных: права давання твора для непасрэднага ўспрымання фіксацыі твора і двум правам, якія ахопліваюць пашырэнне такога доступу – праву давання пры дапамозе матэрыяльных носьбітаў і праву давання твора пры дапамозе нематэрыяльных носьбітаў [18, с. 63]. Гэтыя тры правамоцтвы будуць ахопліваць адпаведна: адкрыццё доступу да твора для непасрэднага ўспрымання і пашырэнне доступу да твора за кошт давання носьбітаў твора – матэрыяльных і эфемерных.

Аднак ці будзе дастаткова такога вызначэння зместу выключных аўтарскіх правоў? Фармальна-лагічна – так, паколькі яно ахоплівае ўсе магчымыя сферы здзяйснення права на выкарыстанне твора. З практычнага ж пункту погляду такога вызначэння зместу выключнага аўтарскага права будзе недастаткова. Задача заканадаўцы заключаецца ў тым, каб, выдзеліўшы грамадска значныя спосабы выкарыстання твора, прапанаваць іх зацікаўленым бакам (аўтару і асобе, якая жадае выкарыстоўваць твор) з тым, каб яны маглі замацаваць у дагаворы ўмову аб магчымых спосабах выкарыстання твора, і гэта ўмова не патрабавала б у далейшым дадатковага тлумачэння і не выклікала б спрэчак паміж бакамі дагавора. Такім чынам, асноўная мэта заканадаўцы пры вызначэнні зместу права на выкарыстанне твора заключаецца ў тым, каб даць мадэль для магчымых здзелак па выкарыстанні твора. Як пры гэтым пазбегнуць праблем, звязаных з магчымым абмежавальным тлумачэннем зместу выключнага аўтарскага права і звядзення яго толькі да ўказаных у законе канкрэтных спосабаў выкарыстання? Адказ просты: вядомыя ў цяперашні час спосабы выкарыстання павінны замацоўвацца ў законе як прыватныя выпадкі агульнага права на выкарыстанне твора «ў любой форме і любым спосабам». Пералік спосабаў выкарыстання твора ў арт. 16 Закона трэба прызнаць заснаваным на нормах міжнародных дагавораў, якія дзейнічаюць для Беларусі і адлюстроўваюць асноўныя, сутнасна значныя сферы выкарыстання твораў. Аднак гэты пералік павінен быць вызначаны як адкрыты з указаннем на іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора.

Асаблівае месца сярод маёмасных аўтарскіх правоў займае права на аўтарскі ганарар. У адпаведнасці з п. 3 арт. 16 Закона [4] аўтар мае права на аўтарскую ўзнагароду за кожны від выкарыстання твора. Дастаткова доўга ў літаратуры аўтарскую ўзнагароду разглядалі ў якасці асаблівай формы заработнай платы. Вядомы цывіліст А. С. Іофэ проста атаясамліваў аўтарскі ганарар з аплатай працы, аргументуючы гэта тым, што права на атрыманне ганарару ў аўтара ўзнікае толькі пасля таго, як аўтар распарадзіцца творам і ўступіць наконт гэтага ў праваадносіны з іншай асобай [19, с. 35]. Сярод пануючага доўгі час меркавання аб працоўным характары аўтарскага ўзнагароджання выдзялялася сцвярджэнне У. А. Дазорцава аб тым, што мастацкая творчая дзейнасць з'яўляецца, па сутнасці, формай дробнатаварнай вытворчасці, а аўтарская ўзнагарода – цаной за продаж твора [20, с. 160], у сувязі з чым аўтар падвяргаўся бязлітаснай крытыцы за неразуменне «асаблівага нетаварнага характару аўтарскіх адносін у СССР». Толькі станаўленне рыначных адносін і адмова ад ідэалагічных дагматаў дазволілі даследчыкам постсавецкага аўтарскага права прызнаць таварны характар прадукту творчасці і пагадзіцца з меркаваннем У. А. Дазорцава, выказаным яшчэ напрыканцы 60-х гг. XX ст.

Асаблівую пазіцыю займаў У. Л. Чарткоў, называючы права на аўтарскі ганарар адным з правамоцтваў аўтара разам з правам на імя, на недатыкальнасць і інш. [21, с. 88]. Развіваючы гэтую думку, І. В. Савельева сцвярджала, што самастойнае маёмаснае правамоцтва аўтара на атрыманне ўзнагароджання, якое ўваходзіць у склад суб'ектыўнага аўтарскага права, узнікае з моманту стварэння твора як абсалютнае права і рэалізуецца ў адносных праваадносінах наконт выкарыстання твора [22, с. 93]. Аналагічных поглядаў прытрымліваюцца і асобныя сучасныя даследчыкі [8, с. 212; 23, с. 507]. Аднак з такім сцвярджэннем нельга пагадзіцца. Калі прызнаваць права на атрыманне аўтарскай узнагароды ў якасці самастойнага аўтарскага правамоцтва, то неабходна прызнаваць магчымасць яго самастойнага здзяйснення як суб'ектыўнага грамадзянскага права, уключаючы магчымасць яго знаходжання ў абароце. Спробы ўявіць форму магчымага самастойнага здзяйснення права на аўтарскі ганарар з неабходнасцю прыводзяць да высновы, што гэта права здзяйсняецца ў рамках дагавора аб выкарыстанні твора і мае характар сустрэчнага дазволу з боку асобы, якая атрымлівае права выкарыстання твора. Прызнаваемае заканадаўствам Беларусі і шэрагам замежных краін права аўтара і іншых праваўладальнікаў атрымліваць

узнагароджанне за выкарыстанне ахоўваемых твораў у асабістых мэтах не з’яўляецца аўтарскім узнагароджаннем у прамым сэнсе слова. Гэта ўзнагарода выплачваецца вытворцамі і (ці) імпарцёрамі гука- і відэазапісваючага абсталявання і чыстых носьбітаў для запісу, аднак выплачваецца не аўтарам, а арганізацыям, якія кіруюць маёмаснымі правамі аўтараў на калектыўнай аснове, якія ў сваю чаргу размяркоўваюць яе паміж сваімі членамі, кіруючыся рэйтынгамі папулярнасці аўтараў. Такім чынам, адсутнічае непасрэдная сувязь паміж выкарыстаннем твора і атрыманнем яго аўтарам указанага ўзнагароджання, што дае некаторым даследчыкам падставу і называць такія зборы альбо «падаткам на карысць аўтараў» [24, с. 12], альбо «кампенсацыйнымі выплатамі» [14, с. 99].

Найбольш аргументавана несамастойны характар права на аўтарскі ганарар даказаў Э. П. Гаўрылаў. Паводле яго меркавання, права на атрыманне аўтарскага ўзнагароджання не з’яўляецца самастойным, паколькі ўзнікае не само па сабе, а ў сувязі з пэўным спосабам выкарыстання твора [6, с. 137]. Аналагічных поглядаў прытрымліваецца А. П. Сяргееў, сцвярджаючы, што кожнае з аўтарскіх правамоцтваў на асобныя віды выкарыстання твора непарыўна звязаны з правам аўтара на атрыманне ганарару; у абстрактным выглядзе, па-за сувяззю з якім-небудзь канкрэтным спосабам выкарыстання твора, права на ўзнагароду не існуе [3, с. 228]. Такім чынам, можна зрабіць вывад аб тым, што пераважным у сучаснай навуцы грамадзянскага права становіцца разуменне аўтарскага ганарару як сустрэчнага задавальнення за магчымасць выкарыстоўваць твор, якая даецца аўтарам трэцяй асобе, пры гэтым права на ўзнагароджанне вызначаецца як абавязковае права патрабавання, якое ўзнікае на падставе не фармальнага складу, а дагавора з трэцяй асобай наконт выкарыстання твора [25, с. 59].

**Заключэнне.** Даследаванне асноўных праблем, звязаных з вызначэннем прававой прыроды і зместу маёмасных аўтарскіх правоў, дазваляе зрабіць наступныя вывады.

1. Паняцце «выключнае аўтарскае права» адносіцца толькі да права выкарыстання твора і па сваім змесце не тоеснае паняццю «маёмасныя аўтарскія правы»; выключнае аўтарскае права з’яўляецца часткай больш шырокага паняцця «маёмасныя аўтарскія правы».

2. Змест пазітыўнага складніка выключнага аўтарскага права можна вызначыць як магчымасць выкарыстоўваць твор у любой форме і любым спосабам. Пры гэтым змест выключнага права не вычэрпваецца тымі спосабамі выкарыстання твора, якія пералічаны ў арт. 16 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб аўтарскім праве і сумежных правах».

3. Для таго каб нормы аўтарскага заканадаўства набылі гнуткасць і аўтаматычна распаўсюджвалі дзеянне выключнага права аўтара на тыя новыя сферы, якія могуць з’явіцца з развіццём тэхналогій выкарыстання твораў, пры дапрацоўцы праекта новага Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» [26] прапануецца ўлічыць наступныя прапановы:

а) замацаваць наступнае азначэнне зместу маёмасных аўтарскіх правоў: «Аўтару ў адносінах яго твора ці іншаму праваўладальніку належыць выключнае права на твор, а таксама іншыя маёмасныя правы ў выпадках, устаноўленых сапраўдным Законам»;

б) пры вызначэнні зместу выключнага права на твор пералік магчымых спосабаў яго выкарыстання дапоўніць пазіцыяй: «іншыя магчымыя спосабы выкарыстання твора».

4. Права на атрыманне аўтарскай узнагароды не з’яўляецца самастойным маёмасным правам аўтара, а носіць характар сустрэчнага давання ў рамках абавязацельных адносін наконт выкарыстання твора.

Ад аўтарскага ўзнагароджання патрэбна адмяжоўваць кампенсацыйныя выплаты, прадугледжаныя заканадаўствам за выкарыстанне асобных відаў твораў у асабістых мэтах, якое здзяйсняецца без згоды праваўладальніка.

## Літаратура


1. С е р е б р о в с к и й, В. И. Вопросы советского авторского права / В. И. Серебровский. – М.: Изд-во АН СССР, 1956. – 283 с.

2. Гражданский кодекс Республики Беларусь: Закон Респ. Беларусь от 7 декаб. 1998 г., № 218-З // Ведамасці Нац. Сходу Рэсп. Беларусь. – 1999. – № 7–9. – Арт. 101.

3. С е р г е е в, А. П. Право интеллектуальной собственности в Российской Федерации /А. П. Сергеев. – М.: Теис, 1996. – 704 с.

4. Об авторском праве и смежных правах: Закон Респ. Беларусь, 16 мая 1996 г., № 370-XIII // Ведамасці Вярхоўн. Савета Рэсп. Беларусь. – 1996. – № 20. – Арт. 366.
5. Г о р д о н, М. В. Советское авторское право /М. В. Гордон. – М.: Госюриздат, 1955. – 232 с.
6. Г а в р и л о в, Э. П. Содержание субъективного авторского права /Э. П. Гаврилов // Сов. государство и право. – 1977. – № 8. – С. 134–138.
7. С т е п а н о в а, О. А. Передача исключительных прав по авторскому договору /О. А. Степанова // Вестн. Моск. ун-та. Сер. 11. Право. – 1997. – № 6. – С. 102–106.
8. С у д а р и к о в, С. А. Интеллектуальная собственность /С. А. Судариков. – М.: Изд-во деловой и учебной литературы, 2007. – 800 с.
9. Б и ч у р и н, А. Проект закона «Об авторском праве и смежных правах»: поиск баланса интересов продолжается /А. Бичурин // Юрист. – 2010. – № 8. – С. 89–94.
10. П и л е н к о, А. Право изобретателя. Привилегии на изобретения и их защита в русском и международном праве. Историко-догматическое исследование: в 2 т. /А. Пиленко. – СПб.: Тип. Стасюлевича, 1902. – Т.1. – 495 с.
11. Г о р о д е ц к и й, Б. Н. Справочник по авторскому праву для редакционно-издательских работников / Б. Н. Городецкий, Б. М. Розовская. – М.; Л.: Гизлегпром, 1948. – 108 с.
12. П а п о в а, І. В. Асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы аўтара твора навукі, літаратуры і мастацтва / І. В. Папова // Весці Нац. Акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 1998. – № 3. – С. 17–24.
13 Основы гражданского законодательства Союза ССР и республик: Приняты Верхов. Советом СССР, 31 мая 1991 г. // Ведомости Съезда нар. депутатов СССР и Верхов. Совета СССР. – 1991. – № 26. – Ст. 733.
14. Право интеллектуальной собственности: учеб. / И. А. Близнец, Э. П. Гаврилов, О. В. Добрынин [и др.]; под ред. И. А. Близнеца. – М.: Проспект, 2010. – 960 с.
15. Poland. Law on Copyright and Neighboring Rights of February 4, 1994 // Industrial Property and Copyright. – 1995. – № 3.
16. Н а в р о ц к и й, Б. Размышления по поводу нового польского закона об авторском праве и смежных правах, принятого 4 февраля 1994 г. /Б. Навроцкий // Бюл. по автор. праву. – 1995. – Т. 28. – № 2. – С. 34–41.
17. K a r p o w i c z, A. Autor – Wydawca: Poradnik prawa autorskiego / A. Karpowicz – Warszawa: Wyd-wo Nauk. PWN, 1994. –363 s.
18. К а л я т и н, В. О. Структура авторского права использования произведения: актуальные проблемы / В. О. Калятин // Журн. рос. права. – 2000. – № 2. – С. 60–70.
19. И о ф ф е, О. С. Основы авторского права /О. С. Иоффе. – М.: Знание, 1969. – 127 с.
20. Д о з о р ц е в, В. А. Природа вознаграждения за изобретательские предложения // Уч. зап. / Всесоюз. науч.-исслед. ин-т сов. законодательства. – М., 1968. – Вып.14. – С. 158–163.
21. Ч е р т к о в, В. Л. Авторское вознаграждение /В. Л. Черков // Сов. государство и право. – 1985. – № 3. – С. 87–93.
22. С а в е л ь е в а, И. В. Правовое регулирование отношений в области художественного творчества. – М.: Изд-во Моск. гос. ун-та, 1986. – 141 с.
23. П о п о в а, И. В. Комментарий // Интеллектуальная собственность: в 2 т. / Сост. И. В. Попова; под ред. В. Ф. Чигира. – Минск: Амалфея, 1997. – Т.1: Авторское право и смежные права. – С. 468–545.
24. К о с т а, Э. Д. «Потенциальное авторское право» в связи с частной записью произведений /Э. Д. Коста // Бюл. по автор. праву. – 1986. – Т. 19. – № 1. – С. 6–16.
25. М и р о ш н и ч е н к о, М. А. Сингулярное правопреемство в авторских правах / М. А. Мирошниченко. – СПб.: Изд-во Р. Асланова «Юридический центр Пресс», 2005. – 275 с.
26. Проект Закона Республики Беларусь «Об авторском праве и смежных правах» // Национальный правовой Интернет портал Республики Беларусь / Компьютерный банк данных проектов Законов Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// www. pravo. by/kbdpz/text. asp? RN= 2010023001. – Дата доступа: 19.11.2010.

*S. S. LOSEU*

**INTELLECTUAL PROPERTY RIGHTS IN THE CIVIL LAW OF THE REPUBLIC OF BELARUS**

## Summary

The article deals with basic theoretical problems associated with the determination of the content of the intellectual property economical rights.

After analyzing of the relations between concepts «property rights of authors» and «exclusive copyright», the author concludes that these concepts are close related both in general and in details with the category of «property copyright». Also it is close to other rights of property character, presented in the Law of the Republic of Belarus «On Copyright and Related Rights».

The content of exclusive copyright shall be defined as rights to use a work in any form or by any means. In this case the positive component of the exclusive right is not limited to the ways of using a work that are listed in Article 16 of the Law «On Copyright and Related Rights». The author also formulates some suggestions that could be taken into account when finalizing the new draft Law «On Copyright and Related Rights».

## *ЭКАНОМІКА*

*УДК 630*945.14:339.9*

*П. Г. НІКІЦЕНКА, В. Л. ПАЧЭКІН*

# НАВУКОВЫЯ АСНОВЫ ІНФАРМАЦЫЙНАЙ БЯСПЕКІ ЗНЕШНЯЙ ЭКАНАМІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Інстытут эканомікі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 09.11.2010)*

Інфармацыйная бяспека (ІБ) знешняй эканамічнай дзейнасці (ЗЭД) – гэта абароненасць інфармацыйных сістэм і інфармацыйных рэсурсаў знешнеэканамічнай дзейнасці ад знешніх і ўнутраных пагроз, якія перашкаджаюць эфектыўна выкарыстоўваць інфармацыю грамадствам, дзяржавай, прадпрыемствамі, асобнымі прадпрымальнікамі.

Абароненасць інфармацыі ў сучасных умовах становіцца важнейшым элементам нацыянальнай бяспекі дзяржавы.

Пытанні інфармацыйнай бяспекі распрацоўваюцца ў працах такіх вядомых вучоных і спецыялістаў, як Ю. М. Батурын, І. Л. Бачыла, А. Л. Балыбердзін, Г. В. Бялоў, В. Галацэнка, В. А. Герасіменка, Л. П. Ганчарэнка, А. А. Грушко, А. П. Дастанка, В. І. Заўгародні, С. К. Кляйменаў, В. А. Капылоў, Е. С. Куцэнка, У. А. Лабуноў, А. П. Лявонаў, В. Н. Лапацін, В. П. Мельнікаў, М. У. Мяснікові, Г. Г. Маньшын, П. Г. Нікіценка, Т. Л. Партыко, А. М. Петракоў, І. І. Папоў, У. В. Пузікаў, Р. С. Сядзегаў, А. М. Сянько, А. М. Сухадольскі і інш.

Найбольш актыўна і плённа распрацоўваюць тэорыю і метадалогію бяспекі інфармацыі эканамісты некаторых краін, якім была прысуджана Нобелеўская прэмія па эканоміцы. Сярод іх амерыканскія эканамісты Дж. Ч. Харманы, Дж. Ф.-малодшы Нэш, У. Вікры, Дж. Акерлоф, М. Спенс, Дж. Сцігліц, брытанскі эканаміст Дж. Мірліс, нямецкі эканаміст Р. Сэлтэн. Праблему бяспекі інфармацыі ў тым ці іншым аспекце і аб’ёме даследавалі Нобелеўскія лаўрэаты па эканоміцы К. Эроу, Р. Эбертон-малодшы і інш.

Інфармацыйная бяспека разглядаецца міжнароднай супольнасцю як адна з прыярытэтных дзяржаўных задач. Гэта ярка прадэманстравалі ўдзельнікі Міжнароднага форуму па забеспячэнні інфармацыйнай бяспекі, які адбыўся ў Маскве ў 2005 г. На ім прысутнічалі вядучыя эксперты больш чым з 50 краін, якія падкрэслілі, што сістэмы забеспячэння бяспекі павінны разглядацца як неад’емная састаўная частка інфармацыйна-тэлекамунікацыйных сістэм. Пытанні забеспячэння інфармацыйнай бяспекі з’яўляюцца комплекснымі, іх рашэнне патрабуе аб’яднання намаганняў і арганізацыі ўзгодненых мерапрыемстваў з боку органаў дзяржаўнай улады, сілавых структур, навуковых установ, аператарскіх кампаній. Для ўзгодненага развіцця нарматыўных, юрыдычных, тэхналагічных і арганізацыйных элементаў кібербяспекі важным фактарам з’яўляецца міжнароднае супрацоўніцтва.

Форум сфармуляваў наступныя асноўныя напрамкі ўдасканалення ІБ:

1) далейшае ўдасканаленне заканадаўства ў сферы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі, распрацоўка адзінага прававога паняційнага апарату, падыходаў да яго прававога рэгулявання;

2) кансалідацыя намаганняў аператараў і праваахоўных органаў па аператыўным рэагаванні на дзеянні злачынцаў. Неабходнасць адміністрацыйнага акрэслення базавага ўзроўню забеспячэння бяспекі аператарамі сувязі і прыняцця яго ў якасці адной з умоў аператарскай дзейнасці;




Мал. 1. Фактары, якія вызначаюць прыярытэтнасць і першачарговасць распрацоўкі навуковых асноў інфармацыйнай бяспекі ЗЭД

3) забеспячэнне далейшага развіцця тэорыі інфармацыйнай бяспекі інфакамуканікацыйных сістэм;

4) падрыхтоўка спецыялістаў у галіне сучасных інфармацыйных тэхналогій і тэхналогій забеспячэння інфармацыйнай бяспекі.

Зроблены намі аналіз асаблівасцей і вывучэнне стану сучаснай інфармацыйнай бяспекі даюць магчымасць вызначыць тэндэнцыі і сфармуляваць прыярытэтнасць і першачарговасць распрацоўкі навуковых асноў у галіне інфармацыйнай бяспекі ЗЭД (мал. 1).

Акрамя таго, патрэбна распрацоўка навукова-метадалагічных і метадычных асноў ІБ, якія вызначаюцца ўжо склаўшыміся фактарамі развіцця (мал. 2).

Разнастайнасць праблем дазваляе вызначыць лагічны і ўзаемазвязаны ланцуг напрамкаў даследавання ІБ. З іх трэба даследаваць існуючыя і перспектыўныя напрамкі і віды дзейнасці органаў кіравання ў галіне інфармацыйных сістэм і забеспячэння ІБ з мэтай іх сістэматызацыі і аналізаваць базавыя; выбраць адэкватныя для развіцця і рашэння праблемы ІБ дадзенай галіны ведаў; абгрунтаваць і распрацаваць найбольш дапушчальныя (прымальныя) канцэпцыі ІБ, якія ўлічваюць дзеючыя і перспектыўныя асаблівасці развіцця сацыяльна-эканамічных і іншых зносін, асабліва рыначных, якія патрабуюць першачарговага рэгулявання; сфарміраваць тэарэтычныя прынцыпы і падыходы да рашэння праблем, звязаных з канцэпцыямі інфармацыйнага забеспячэння, ІБ і інш.

Можна сфармуляваць прынцыпы распрацоўкі навуковых асноў забеспячэння ІБ. Да іх мы адносім наступныя прынцыпы:

пераходу да шырокага разумення зместу інфарматыкі і ІБ;

шырокага выкарыстання сістэмных метадаў;

**Фактары, якія абумоўліваюць неабходнасць распрацоўкі метадычных асноў інфармацыйнай бяспекі ЗЭД**

1. Наяўнасць шэрагу роднасных навуковых напрамкаў, звязаных з інфармацыяй і інфамацыйнымі працэсамі, якія бурна развіваюцца, але ўсё больш адыходзяць адзін ад аднаго ў спецыялізацыі, асабліва ў галіне эканамічнай бяспекі

2. Вялікая нявызначанасць разумення зместу ІБ ЗЭД і, як вынік, адсутнасць тэрміналогіі і паняційнага апарату, узгодненых па ўсіх напрамках ІБ

3. Разнастайнасць метадалагічных падыходаў да разглядання ІБ ЗЭД

4. Адсутнасць у існуючых напрамках забеспячэння ІБ дастаткова поўнай і несупярэчлівай канцэпцыі фарміравання паняційнага апарату ЗЭД

5. Неабходнасць уліку існуючай метадалагічнай базы стварэння, развіцця, сістэматызацыі зместу ІБ ЗЭД, які ўключае камунікатыўны, семіятычны і іншыя аспекты

6. Яшчэ не склаўшаяся адзіная агульнапрызнаная інфармацыйная тэорыя як інтэгральная сукупнасць ведаў аб існуючых канцэпцыях, інфармацыйных працэсах, метадалагічных пазіцый асноўнага аб'екта рэгулявання бяспекі ЗЭД

7. Недастатковая прапрацоўка з сістэмных пазіцый праграмы навуковых даследаванняў у разглядаемай прадметнай галіне; класіфікацыя інфармацыйных сістэм, іх ахова і забеспячэнне ІБ ЗЭД

8. Небходнасць забеспячэння эфектыўнай аховы інфармацыі ЗЭД на аснове адзінай метадалогіі і прававой базы; відазмяненні пастаноўкі праблем ІБ ЗЭД на аснове распазнавання і неатаясамлення абагульненага паняцця інфарматызацыі з састаўнымі кампанентамі ЗЭД (камп'ютарызацыя, навуковая камунікацыя, аўтаматызацыя, сучасная тэлекамунікацыя, перадача даных і інш.)

Мал. 2. Фактары, якія абумоўліваюць неабходнасць распрацоўкі метадычных асноў інфармацыйнай бяспекі ЗЭД

актыўнага забеспячэння рэалізацыі ў найбольш поўным аб'ёме дзеючай заканадаўчай базы;

першачарговага рашэння задач выбару базавай канцэпцыі інфарматызацыі і ІБ з улікам развіцця прыкладных пытанняў;

уліку поўнай рэалізацыі нарматыўнай прававой базы падтрымкі асноўных відаў дзейнасці асобы, грамадства і дзяржавы;

комплекснага, узаемазвязанага і дыферэнцыраванага ўліку гуманітарных, сацыяльна-эканамічных, светапоглядных, маральна-псіхалагічных, этычных аспектаў з аспектамі забеспячэння ІБ.

Пералічаныя прынцыпы мэтазгодна ўлічваць пры распрацоўцы навуковых асноў развіцця і практычнага стварэння сістэм забеспячэння ІБ у сістэме ЗЭД.

Трэба зазначыць, што на інфармацыйную бяспеку Рэспублікі Беларусь значна ўплываюць рэформы на сучасным этапе развіцця.

Узніклі новыя фактары, якія неабходна ўлічваць пры ацэнцы становішча ІБ і вызначэнні ключавых праблем у гэтай галіне. Усю сукупнасць фактараў можна падзяліць на палітычныя, эканаміныя і арганізацыйна-тэхнічныя (мал. 3).

У сучасны момант практычна адсутнічае вытворчасць канкурэнтаздольнай прадукцыі мікраэлектроннай прамысловасці, тэлекамунікацыйнага абсталявання і сродкаў вылічальнай тэхнікі, у выніку чаго залежнасць развіцця беларускай інфармацыйнай інфраструктуры ад па-




Мал. 3. Асноўныя палітычныя фактары, якія ўплываюць на распрацоўку навуковых асноў інфармацыйнай бяспекі ЗЭД

ставак замежных інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій значна перавышае крытычны ўзровень. Важнейшыя арганізацыйна-тэхнічныя фактары прадстаўлены на мал. 4.

Усе пералічаныя фактары ствараюць пагрозу бяспекі. Сродкам нейтралізацыі значнай іх часткі з’яўляюцца эфектыўная нарматыўная прававая база, здольная рэгуляваць зносіны ва ўсіх сферах інфармацыйнага грамадства, і кіруючая роля дзяржавы ў пабудове комплекснай сістэмы інфармацыйнай бяспекі.

Імклівае ўкараненне камп’ютарных тэхналогій і тэлекамунікацый у грамадскую дзейнасць апярэджвае тэмпы развіцця сацыяльных і прававых адносін у інфармацыйным грамадстве. Ва ўсім свеце ўзрастае колькасць заканадаўчых калізій, звязаных з інфармацыйнай сферай. Чалавецтва ўпершыню сутыкнулася з сітуацыяй, калі шырокамаштабная інфарматызацыя спрыяла ўзнікненню новых адносін у грамадстве, а існуючая заканадаўчая база не адказвае ўзнікаючым рэаліям.

З’явіліся новыя праблемы, звязаныя з кіберзлачынствам, інфармацыйнай бяспекай, лічбавай няроўнасцю. Для вырашэння гэтых праблем неабходна ў першую чаргу ўдасканаленая заканадаўчая база ў галіне інфарматызацыі і тэлекамунікацый.

Заходнія краіны звяртаюць асаблівую ўвагу на інфармацыйную бяспеку, выдаткі на барацьбу з інфармацыйнымі злачынствамі няўхільна растуць.

У выніку даследаванняў, якія былі праведзены Інстытутам камп’ютарнай бяспекі і ФБР ЗША, устаноўлена, што 85 % рэспандэнтаў сутыкаліся з праблемамі камп’ютарнай бяспекі (2004 г.). Сярэднія страты ад аднаго камп’ютарнага злачынства склалі 450 000 дол., а максімальныя – 10 млрд дол. Бюджэтнае фінансаванне, якое накіроўвалася на забеспячэнне патрэбнасцей інфармацыйнай бяспекі, штогод павялічвалася на 15–20 % [17].

Усё гэта вымушае краіны сур’ёзна займацца пытаннямі фарміравання і ўдасканальваць сістэмы аховы інфармацыі. Так, у ЗША да гэтага часу прынята больш за 540 заканадаўчых актаў па ахове інфармацыі, адказнасці за яе выдаванне і камп’ютарныя злачынствы.




Мал. 4. Галоўныя эканамічныя фактары, якія вызначаюць неабходнасць распрацоўкі навуковых асноў інфармацыі ЗЭД

Глабальная інфарматызацыя грамадства, укараненне новых інфармацыйных тэхналогій патрабуюць удасканалення гэтага працэсу і, як вынік, падрыхтоўкі спецыялістаў у дадзенай галіне. Разам з неабходнасцю навучання асновам інфармацыйнай бяспекі спецыялістаў з эканамічнай адукацыяй не менш востра стаіць пытанне падрыхтоўкі юрыстаў, якія валодаюць ведамі і ўменнем у гэтай галіне. Гэта пацвярджаюць узнікаючыя ў дадзены час цяжкасці ў правядзенні расследаванняў новых, прычым усё больш небяспечных злачынстваў у інфармацыйнай сферы.

Неабходнай мерай з'яўляецца і распрацоўка сістэм забеспячэння інфармацыйнай бяспекі знешняй эканамічнай дзейнасці кожнай краіны на розных узроўнях, паколькі яны павінны задаволіць і галоўную патрэбнасць у ахове інфармацыі пры рашэнні сацыяльна-эканамічных і знешнепалітычных праблем.

Сфармулюем паслядоўнасць, якой трэба прытрымлівацца пры ацэнцы ўзроўню і распрацоўцы рэкамендацый па ўдасканаленні арганізацыйна-эканамічнага механізма забеспячэння аховы ЗЭД экспартнаарыентаваных прадпрыемстваў.

1. Выяўляецца існуючая стадыя жыццёвага цыкла прадпрыемства і яго канкурэнтная рыначная стратэгія. Мэта этапу – вызначэнне першачарговых і ранжыраваных па важнасці паказчыкаў, якія складаюць эканамічную бяспеку экспартнаарыентаваных прадпрыемстваў (ЭАП) і іх каэфіцыентаў.

2. На аснове атрыманых экспартных ацэнак вызначаюцца парогавыя і фактычныя значэнні гэтых паказчыкаў, неабходныя для забеспячэння эканамічнай бяспекі канкрэтнага АЭП, якое знаходзіцца на дадзенай стадыі жыццёвага цыкла і выкарыстоўвае акрэсленую канкурэнтную рыначную стратэгію.

3. На аснове паказчыкаў, якія складаюць эканамічную бяспеку, па дыяграме вызначаецца адзіны крытэрый забеспячэння бяспекі ЗЭД дадзенага прадпрыемства.

4. На аснове маніторынгу адзінага крытэрыю эканамічнай бяспекі прадпрыемства на працягу часу праводзіцца ацэнка ўзроўню забеспячэння ЗЭД бяспекі прадпрыемства.

5. Выдаецца заключэнне аб найбольш слабых звёнах ЗЭД у сістэме забеспячэння эканамічнай бяспекі прадпрыемства і прагноз яе ўзроўню на бліжэйшую перспектыву, а таксама распрацоўваюцца рэкамендацыі па павышэнні ўзроўню бяспекі ЗЭД.

У рыначнай эканоміцы інфармацыя з'яўляецца каштоўным таварам і падпарадкоўваецца законам таварна-грашовых адносін. Неправамернае авалоданне чужымі інфармацыйнамі рэсурсамі з мэтай іх выкарыстання з'яўляецца найбольш небяспечнай формай нядобрасумленнай канкурэнцыі. Ахова камерцыйнай тайны – важная ўмова атрымання прадпрыемствам максімальнага прыбытку, прадухілення банкруцтва. Эканамічная бяспека прадпрыемства не можа быць забяспечана, калі гэтую задачу не будуць вырашаць калектывы прадпрыемстваў (фірм), якія усведамляюць непарыўнасць сваіх асабістых інтарэсаў з інтарэсамі дадзенага прадпрыемства (фірмы).

Наогул ахова інфармацыі ў эканамічнай сферы – надзвычай важны від дзейнасці. Дастаткова зазначыць, што ў свеце сярэдняя велічыня страт ад аднаго банкаўскага крадзяжу ацэньваецца ў 9 тыс. дол. Штогадовыя страты ад камп'ютарных злачынстваў у ЗША і Заходняй Еўропе дасягаюць 140 млрд дол.

На думку амерыканскіх спецыялістаў, зняцце сістэм аховы інфармацыі з камп'ютарных сетак прывядзе да спусташэння 20 % сярэдніх кампаній на працягу некалькіх гадзін, 40 % сярэдніх і 16 % буйных кампаній пацерпяць крах праз некалькі дзён, 33 % банкаў «лопнуць» за 2–5 гадзін, 50 % – праз 2–3 дні [1].

Праблема аховы інфармацыі мае шматвяковую гісторыю. Так, на заранку чалавечай цывілізацыі ўцечка інфармацыі аб забітым маманце магла пакінуць без харчу першабытнае племя. З развіццём грамадства ўдасканальваліся і спосабы здабывання неабходнай інфармацыі. Да IV в. да н. э. Усход значна апярэдзіў Захад у майстэрстве разведкі. Сунь-Цзы пісаў: «Тое, што называюць прадбачаннем, не можа быць атрымана ні ад духаў, ні ад багоў... ні падлікамі. Яно павінна быць дабыта ад людзей, якія знаёмы са станам праціўніка».

Жаданню знаходзіць канфідэнцыяльную інфармацыю заўсёды супрацьпастаўлялася жаданне процілеглага боку абараніць гэтую інфармацыю, таму гісторыя развіцця сродкаў і метадаў разведкі – гэта і гісторыя развіцця сродкаў і метадаў аховы інфармацыі. Трэба зазначыць, што спосабы аховы інфармацыі, якія з'явіліся яшчэ ў старажытныя часы, па сваёй сутнасці не змяніліся і да нашага часу, удасканальвалася толькі тэхніка іх рэалізацыі. Напрыклад, такі спосаб аховы, як утойванне самога факта наяўнасці інфармацыі альбо стэнаграфія, прайшоў у сваім развіцці некалькі этапаў – ад утойвання носьбіта гэтай інфармацыі да «растварэння» тэксту ў другім выглядзе паведамлення. У Старажытным Рыме паведамленне, напісанае на дошцы, утойвалі ад чужога вока такім шляхам: залівалі воскам. У Старажытнай Грэцыі галілі раба, пісалі паведамленне на яго галаве, а калі валасы адрасталі, адпраўлялі з даручэннем да адрасата. У Сярэдневякоўе прыдумалі тайнапіс і паведамленні хавалі пры дапамозе нябачных хімічных сродкаў. У сучасных умовах шырокае прымяненне знайшлі такія стэнаграфічныя метады, як утойванне зместу паведамленняў у малюнках, тэле- і аўдыёсігналах, галаграфічных выявах.

Паралельна развіваліся метады шыфравання і кадзіравання (крыптаграфія), гісторыя якіх пачынаецца з моманту ўзнікнення пісьменства ў Старажытным Егіпце і Кітаі.

Працэс развіцця сродкаў і метадаў аховы інфармацыі можна падзяліць на тры адносна самастойныя перыяды на аснове дзялення эвалюцыі відаў носьбітаў інфармацыі [2].

***Першы перыяд*** вызначаецца пачаткам асэнсаваных і самастойных сродкаў метадаў аховы інфармацыі і звязаны са з'яўленнем магчымасці фіксацыі інфармацыйных паведамленняў на цвёрдых носьбітах, г. зн. з вынаходніцтвам пісьменства. Адначасова з магчымасцю захавання і перамяшчэння даных узнікла праблема, як захаваць у тайне канфідэнцыяльную інфармацыю, якая ўжо існуе асобна ад яе крыніцы. З гэтай нагоды практычна разам са з'яўленнем пісьменства ўзніклі такія метады, як ахова інфармацыі і яе ўтойванне.

Па сцвярджэнні некаторых спецыялістаў, крыптаграфія – равесніца егіпецкіх пірамід. У дакументах старажытных цывілізацый – Індыі, Егіпта, Месапатаміі – ёсць звесткі аб сістэмах і спосабах састаўлення шыфраваных лістоў (пісем). У старажытных рэлігійных кнігах Індыі адзначаецца, што сам Буда ведаў некалькі дзясяткаў спосабаў пісьма, сярод якіх былі шыфры перастаноўкі (па сучаснай класіфікацыі). У славутым падручніку Ватсьяны аб майстэрстве кахання («Камасутра») сярод 64 майстэрстваў, якімі павінна валодаць жанчына, на 45-м месцы ўпамінаецца тайнапіс у выглядзе шыфру простай замены.

Адзін з самых старых шыфраваных тэкстаў знойдзены ў Месапатаміі (XX ст. да н. э.). Ён уяўляе сабой гліняную таблічку і змяшчае рэцэпт прыгатавання паліва ў ганчарнай вытворчасці, у якім ігнараваліся некаторыя галосныя і зычныя, а замест іх ужываліся лічбы.

***Другі перыяд*** (прыкладна з сярэдзіны XIX ст.) характарызуецца з'яўленнем тэхнічных сродкаў апрацоўкі інфармацыі і магчымасцю захавання і перадачы паведамленняў з дапамогай такіх носьбітаў, як электрычныя сігналы і электрамагнітныя палі (напрыклад, тэлефон, тэлеграф, радыё). Узніклі праблемы аховы ад так званых тэхнічных каналаў уцечкі (пабочныя выпраменьванні, навядзенне і інш.). З'явіліся спосабы шыфравання паведамленняў у рэальным маштабе часу (у працэсе перадачы па тэлефонных і тэлеграфных каналах сувязі) і г. д. Акрамя таго, дадзены перыяд – гэта перыяд актыўнага развіцця тэхнічных сродкаў разведкі, якія ў шмат разоў павялічваюць магчымасці вядзення прамысловага і дзяржаўнага шпіянажу. Сёння такімі сродкамі з'яўляюцца відэакамера, якая можа быць уманціравана ў шруб, а таксама «жучок», змешчаны ў шарыкавай ручцы. Велізарныя страты прадпрыемстваў і фірм садзейнічалі навукова-тэхнічнаму прагрэсу ў стварэнні новых і ўдасканаленні старых сродкаў і метадаў аховы інфармацыі.

***Трэці перыяд*** прыходзіцца на эпоху масавай інфарматызацыі і характарызуецца найбольш інтэнсіўным развіццём гэтых метадаў. З гэтай нагоды гісторыя найбольш інтэнсіўнага развіцця праблемы аховы інфармацыі звязана з укараненнем аўтаматызаваных сістэм апрацоўкі інфармацыі і вымяраецца перыядам больш чым у 40 гадоў. У 1960-я гг. на Захадзе з'явілася мноства адкрытых публікацый па розных аспектах аховы інфармацыі. Гэта ў першую чаргу было выклікана ўзрастаючымі фінансавымі стратамі фірм і дзяржаўных прадпрыемстваў ад злачынстваў у камп'ютарнай сферы.

Так, у штогоднім дакладзе ФБР (ЗША) паведамлялася, што за 1997 г. ад проціпраўнай дзейнасці замежных спецслужбаў амерыканскія ўладальнікі інтэлектуальнай уласнаці панеслі страты, якія перавышалі 300 млрд дол.

Згодна з вывадамі заходніх экспертаў, уцечка 20 % камерцыйнай інфармацыі ў 60 выпадках з 100 прыводзіць да банкруцтва фірмы.

Узрастаюць фінансавыя страты і ад вірусных атак на камп'ютарныя сеткі. Так, запушчаны праз электронную пошту Інтэрнэт (май 2000 г.) вірус «Ilove you» вывеў са строю звыш 5 млн камп'ютараў і нанёс страты звыш 10 млрд дол.

У Рэспубліцы Беларусь таксама даўно і пасляхова займаюцца праблемамі аховы інфармацыі. Аднак празмерная закрытасць усіх работ па ахове інфармацыі, якія ў асноўным сканцэнтраваны ў асобных сілавых ведамствах, адсутнасць рэгулярнай сістэмы падрыхтоўкі прафесіяналаў у гэтай галіне і магчымасці шырокага абмену вопытам прывялі да некаторага адставання ў асобных напрамках інфармацынай бяспекі, асабліва ў забеспячэнні камп'ютарнай бяспекі.

Напрыканцы 2000 г. інтарэс да разглядаемых праблем рэзка павялічыўся. Сёння ёсць усе падставы сцвярджаць, што ў Рэспубліцы Беларусь склалася айчынная школа аховы інфармацыі, якая мае свае адметныя асаблівасці. Разам з рашэннем прыкладных праблем аховы вялікая ўвага ўдзяляецца фарміраванню развітога навукова-метадалагічнага базісу для рашэння ўсёй сукупнасці адпаведных задач на рэгулярнай аснове. Прынцыпова важным з'яўляецца той факт, што беларускія вучоныя і спецыялісты, хаця па аб'ектыўных прычынах і адсталі ў распрацоўцы некаторых спецыялізаваных метадаў і сродкаў аховы (асабліва ў галіне эканамічнай і камп'ютарнай бяспекі), на дадзеным этапе ўносяць істотны ўклад у развіццё асноў тэорыі аховы інфармацыі. Гэтаму садзейнічаюць рост інтарэсу да гэтай праблемы ў вышэйшай школе, асабліва ў БДУІР і НАН Беларусі. Намаганнямі гэтых дзвюх устаноў былі закладзены асновы тэарэтычных і метадалагічных падыходаў да рашэння праблемы.




Мал. 5. Важнейшыя арганізацыйна-тэхнічныя фактары, якія неабходна ўлічваць пры распрацоўцы навуковых асноў інфармацыйнай бяспекі ЗЭД

Безумоўна, з узнікненнем праблемы аховы інфармацыі змяніліся як уяўленні аб яе сутнасці, так і метадалагічныя падыходы да яе вырашэння. Адным з важнейшых напрамкаў, які мае найбольшую самастойнасць, з'яўляецца забеспячэнне ІБ, асабліва знешняй эканамічнай дзейнасці на розных узроўнях.

Важнае значэнне мае арганізацыйна-эканамічнае і прававое забеспячэнне інфармацыйнай бяспекі, якое ўяўляе сабой дзейнасць органаў дзяржаўнай улады па распрацоўцы і рэалізацыі арганізацыйна-эканамічных механізмаў выканання сукупнасці нарматыўных прававых актаў, якія рэгламентуюць практычную дзейнасць па ахове інфармацыі на розных узроўнях грамадства і дзяржавы.

Узнікла патрэбнасць рашэння першачарговых задач (мал. 5 і 6).

З развіццём рыначных адносін узнік новы від нацыянальнай бяспекі – бяспека бізнесу. Яго ўплыў на забеспячэнне нацыянальнай бяспекі становіцца вызначальным. Бяспека бізнесу з'яўляецца важнейшай умовай устойлівасці палітычнага і эканамічнага развіцця краіны і вызначае яе становішча ў сістэме міжнароднай бяспекі. Уключэнне гэтага віду бяспекі ў структуру нацыянальнай бяспекі з улікам развіцця працэсаў дэмакратызацыі, розных відаў інтэграцыі, эканамічнай, інфамацыйнай і экалагічнай глабалізацыі непазбежна патрабуе стварэння адзінай цэнтралізаванай сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі краіны.

Бяспека бізнесу – становішча аховы прадпрымальніцкай дзейнасці ад уплыву складанага комплексу ўнутраных і знешніх, рэальных і патэнцыяльных рызык з рознай ступенню небяспечнасці прычынення шкоды асобе, грамадству, навакольнаму асяроддзю, бізнесу. Аналіз крыніц такіх рызык і прыняцце рашэнняў аб неабходных папераджальных і кампенсуючых дзеянняў заснаваны на выкарыстанні сістэмных метадаў эканоміка-матэматычных і другіх навук.

Ва ўмовах інтэнсіўнага развіцця глабалізацыі, перыядычнага (цыклічнага) праяўлення сусветных фінансавых крызісаў задача стварэння сістэмы забеспячэння бяспекі бізнесу – гэта прыярытэтная дамінанта сістэмы нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Можна меркаваць, што ніжнім узроўнем і першасным варыянтам мадэлі сістэмы бяспекі бізнесу з'яўляецца бяспека прадпрымальніцкай дзейнасці на ўзроўні асобнага прадпрыемства, якая забяспечыць устойлівае развіццё бізнесу.

Арганізацыйны элемент гэтай сістэмы – менеджмент бяспекі бізнесу, які ўваходзіць у структуру кіравання прадпрыемствам. Прапануемая аўтарамі канцэпцыя простая па зместу і яе рэалізацыі.




Мал. 6. Першачарговыя задачы забеспячэння інфармацыйнай бяспекі ў Рэспубліцы Беларусь

Узаемасувязь нацыянальнай бяспекі і развіцця бізнесу дастаткова відавочна, а бяспека бізнесу натуральным чынам уваходзіць у сферу інтарэсаў прадпрымальнікаў. Існуе, аднак, думка, што разглядаемую канцэпцыю могуць рэалізаваць спецслужбы краіны. Неабходна пазбавіцца ад такіх памылак.

Як справядліва падкрэслівае Г. В. Бялоў [2], аб эфектыўнасці спецслужбаў па забеспячэнні нацыянальнай бяспекі краіны прынята меркаваць па ступені свабоды і абароненасці асобы, грамадства, навакольнага асяроддзя, тэрытарыяльнай цэласнасці і стабільнасці канстытуцыйнага ладу ад уздзеяння складанага комплексу ўнутраных і знешніх, рэальных і патэнцыяльных пагроз. Думкі па гэтай праблеме заўсёды былі і будуць неаднязначнымі, а ў большасці выпадкаў не на карысць спецслужбаў па вельмі многіх суб’ектыўных і аб’ектыўных прычынах. Адна з галоўных прычын – закрыты характар дзейнасці спецслужбаў і недастатковае разуменне грамадзянамі ступені бяспекі розных пагроз і сэнсу розных катэгорый бяспекі. Тым не менш грамадзяне краіны вераць у тое, што іх інтарэсы і бяспека забяспечваюцца дзяржаўнай сістэмай нацыянальнай бяспекі.

Рыначныя эканамічныя адносіны павінны непазбежна ўнесці кардынальныя змены ў мэты і задачы, метады і сродкі, у арганізацыйныя структуры нацыянальнай бяспекі краіны. Звязаны гэтыя змяненні з тым, што ў структуры відаў бяспекі з’явіўся новы від – бяспека бізнесу, які становіцца дамінуючым. З гэтай нагоды патрэбны апераджальная падрыхтоўка новай канцэпцыі нацыянальнай бяспекі краіны, распрацоўка стратэгіі і прыняцце дзяржаўнай праграмы яе рэалізацыі з цэлым комплексам прававых, інфармацыйных, эканамічных арганізацыйных і другіх мерапрыемстваў. Гаворка ідзе аб стварэнні адзінай цэнтралізаванай сістэмы забеспячэння нацыянальнай бяспекі, у якой бяспека бізнесу – асноўная яе кампанента. Гэту задачу аўтары разглядаюць на ніжэйшым іерархічным узроўні сістэмы – на ўзроўні асобнага прадпрыемства ў рыначнай эканоміцы. Прапаноўваецца ўнесці ў структуру кіравання розных тыпаў прадпрыемстваў менеджмент бяспекі бізнесу, які ўзаемадзейнічае з маркетынгам і рознымі відамі менеджменту прадпрыемства і каардынуе іх дзейнасць.

Карысць і непазбежнасць стварэння такіх аналітычных структур у складзе менеджменту розных арганізацый уяўляюцца дастаткова відавочнымі і своечасовымі, а сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне менеджменту бяспекі бізнесу, на думку аўтараў, неабходна.

## Літаратура

1. А с а н о в и ч, В. Я., М а н ь ш и н, Г. Г. Информационная безопасность: анализ и прогноз информационного воздействия / В. Я. Асанович, Г. Г. Маньшин. – Минск: Амалфея, 2006. – 204 с.

2. А с т а х о в, А. М. Искусство управления информационными рисками / А. М. Астахов. – М.: ДМК Пресс, 2010.

3. Б е л о в, Г. В. Информационные технологии предпринимательства / Г. В. Белов. – М.: Академкнига, 2005. – 432 с.

4. В о р о н ц о в а, Л. В., Фролов, Д. В. История и современность информационного противоборства / Л. В. Воронцова, Д. В. Фролов. – М.: Горячая линия – Телеком, 2006. – 192 с.

5. Г а в р и л е н к о, В. Г., Никитенко, П. Г. Экономическая безопасность / В. Г. Гавриленко [и др.] // Деловой энцикл. словарь. – 2-е изд. – Минск: Право и экономика, 2005. – 760 с.

6. Г е р а с и м е н к о, В. А. Основы защиты информации / В. А. Герасименко, А. А. Малюк. – М.: МИФИ, 1997. – 537 с.

7. Г р у ш о, А. А., Тимонина, Е. Е. Теоретические основы защиты информации / А. А. Грушо. – М.: Изд. агентства «Яхтсмен», 1996.

8. Информационная безопасность открытых систем: учеб. для вузов: в 2 т. Т. 1. – Угрозы, уязвимости, атаки и подходы к защите / С. В. Запечников, Н. Г. Милославская [и др.]. – М.: Горячая линия – Телеком, 2006. – 536 с.

9. К а с т е л ь с, М. Информационная эпоха: экономика, общество, культура / М. Кастельс; пер. с англ. – М.: ГУ ВШЭ, 2000.

10. К о з л о в, В. Е. Теория и практика борьбы с компьютерной преступностью / В. Е. Козлов. – М.: Горячая линия – Телеком, 2002. – 336 с.

11. К н я з е в, С. Н. Основы концепции национальной безопасности Республики Беларусь: учеб. пособие / С. Н. Князев. – Минск, 2004.

12. К н я з е в, С. Н., Г у л я к е в и ч, А. В. Национальная безопасность Республики Беларусь: Курс лекций / С. Н. Князев, А. В. Гулякевич. – Минск, 2005.

13. Концепция Национальной стратегии устойчивого социально-экономического развития Республики Беларусь на период до 2020 г. // Национальная концепция по устойчивому развитию Республики Беларусь. – Минск, 2003. – 112 с.

14. К о ч н е в, А. В., П е т р а к о в, М. В. Информационная безопасность Республики Беларусь и новые реалии информационного общества // Национальная безопасность Республики Беларусь: современное состояние и перспективы. – Минск, 2003.

15. К у з н е ц о в, И. Н. Бизнес – безопасность / И. Н. Кузнецов. – М.: Дашков и К*, 2007. – С. 112.

16. М а л ю к, А. А. Информационная безопасность: концептуальные и методологические основы защиты информации: учеб. пособие для вузов / А. А. Малюк. – М.: Горячая линия – Телеком, 2004. – 280 с.

17. М а н о й л о, А. В., Лысенко, А. И., Фролов Д. Б. Государственная информационная политика в условиях информационно-психологической войны / Манойло [и др.]. – 2-е изд., стереотип. – М.: Горячая линия – Телеком, 2006. – 541 с.

18. М е л ь н и к о в, В. В. Защита информации в компьютерных системах / В. В. Мельников. – Финансы и статистика: Электроинформ, 1997.

19. М е л ь н и к о в, В. П. Информационная безопасность: учеб. пособие для сред. проф. образования / В. П. Мельников, С. А. Клейменов, А. М. Петраков; под ред. С. А. Клейменова. – М.: Академия, 2005. – 336 с.

20. М я с н и к о в и ч, М. В., П о л о н и к, С. С., П у з и к о в, В. В. Управление системой обеспечения экономической безопасности / М. В. Мясникович, С. С. Полоник [и др.]. – Минск: Право и экономика, 2006. – 380 с.

21. Н и к и т е н к о, П. Г. Проблемы экономической безопасности Беларуси / П. Г. Никитенко [и др.]. – Минск, 2001.

22. Основные положения методики оценки экономической безопасности Республики Беларусь. Результаты оценки / П. Г. Никитенко, В. Н. Ермашкевич, Г. Т. Кулаков и др. // Перспективы интеграции на рубеже тысячелетий: материалы междунар. практ. конф. – Минск, 2001.

23. Основы информационной безопасности: учеб. пособие для вузов / Е. Б. Белов, В. П. Лось, Р. В. Мещеряков, А. А. Шелупанов. – М.: Горячая линия – Телеком, 2006. – 544 с.

24. О с т а п е н к о, Г. А. Информационные операции и атаки в социотехнических системах: учеб. пособие для вузов / Г. А. Остапенко; под ред. чл.-кор. РАН В. И. Борисова. – М.: Горячая линия – Телеком, 2007. – 134 с.

25. П р о х о д а, А. Н. Обеспечение Интернет-безопасности. Практикум: учеб. пособие для вузов / А. Н. Прохода. – М.: Горячая линия – Телеком, 2007. – 180 с.

26. П у р с, Г. Экономическая безопасность страны. Как ее обеспечить / Г. Пурс // Финансы, учет, аудит. – 1999. – № 10.

27. Основы правового обеспечения защиты информации / С. Н. Сёмкин, А. Н. Сёмкин. – М.: Горячая линия – Телеком, 2008.

28. С е н ь к о, А. Н. Система обеспечения экономической безопасности промышленного комплекса Республики Беларусь: методология формирования и механизм реализации / А. Н. Сенько. – Минск: Академия управления при Президенте Республики Беларусь, 2008.

29. Теория и практика обеспечения безопасности / под ред. П. Д. Зегжды. – М.: Яхтсмен, 1996.

30. У р с у л, А. Д. Путь в ноосферу. Концепция выживания и безопасности развития цивилизации / А. Д. Урсул. – М., 1990.

31. Ц и р л о в, В. Л. Основы информационной безопасности: краткий курс / В. Л. Цирлов. – Ростов – н/Д.: Феникс, 2008. – 253 с.

32. Ш и в е р с к и й, А. А. Защита информации: проблемы теории и практики / А. А. Шиверский. – М.: Юристъ, 1996. – 112 с.

33. Экономическая безопасность предприятия (фирмы) / В. Б. Зубик, Д. В. Зубик, Р. С. Седегов, А. Абдула; под ред. Р. С. Седегова, М. И. Плотницкого, А. С. Головачева. – Минск: Вышэйш. шк., 1998. – 391 с.
34. Экономическая безопасность и экономическая политика: учеб. пособие / А. В. Бондарь, В. Н. Ермашкевич, С. Н. Князев, Е. Г. Моисеенко; под ред. А. В. Бондаря, С. Н. Князева. – Минск: БГЭУ, 2007. – 423 с.
35. B e l l, D., La P a d u l a, L. Secure Computer System: Mathematical Foundation, ESD – TR – 73 – 278. V.1. MITRE Corporation.
36. L e n d w e h r, C., H e I t m e y e r, C., Me L e a n, J. A security models for military message system. ACM transactions of computer systems, 1984.
37. L e n d w e h r, C. Formal models for Computer Security // ACM Computing Surveys. – 1984. – Vol.13. – N 3.
38. M i l l e n, J. Resource allocation model of denial of service // IEEE symposium on research in security and privacy, 1992.
39. Y u, C. - F., G l I g o r, V. A specification and verification method for preventing denial of service // IEEE transaction on software engineering, 1990.
40. ISO/IEC 27001:2005 RU Информационные технологии – Методы обеспечения безопасности – Системы управления информационной безопасностью – Требования [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http:// gtrust. ru/show_good. php? idtov= 1030.
41. BS 7799 – 3:2006 RU Системы управления информационной безопасностью – Руководство по управлению рисками информационной безопасности [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gtrust.ru/show_good.php?idtov= 1031.
42. BS ISO/IEC 27005:2008 RU Информационные технологии – Методы обеспечения безопасности – Управление рисками информационной безопасности [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://gtrust.ru/show_good.pnp?idtov=l137.
43. A l a n C a l d e r & S t e v e W a t k I n s. Information Security Risk Management for ISO 27001/ISO 17799. – IT Governance Publishing, 2007 [Electronic resource]. – Mode of access: http://gtrust.ru/show_good.php?idtov=1254.

*P. G. NIKITENKO, V. L. POCHEKIN*

**SCIENTIFIC FUNDAMENTALS OF INFORMATION SECURITY IN THE EXTERNAL ECONOMIC ACTIVITY**

## Summary

In conditions of the globalization processes intensification the security problems of international economic relations have been accentuated sharply. The necessity has been appeared to enlarge studies of the external economic activity security scientific fundamentals at different levels.

The central role in this system has been kept by information security. It is considered to be one of priority tasks. The article gives an analysis and an overview of studies in the sphere of information security. Economic and political factors which determining the necessity to intensify investigations and to create security scientific fundamentals have been discussed. Directions of further studies along with their order and priority have been formulated.

*УДК 334.012.64/.65.001.76:303.4(476)*

*В. А. САФОНАВА*

# МЕТАДЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ІДЭНТЫФІКАЦЫІ І ФАРМІРАВАННЯ КЛАСТАРАЎ У МАДЭЛІ САЦЫЯЛЬНА-ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*Інстытут эканомікі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 28.02.2010)*

Адным з найбольш важных прыярытэтаў дзяржаўнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь у цяперашні час з'яўляецца перавод эканомікі на інавацыйны шлях развіцця, паколькі актывізацыя інавацыйнай дзейнасці дазволіць узняць узровень канкурэнтаздольнасці нацыянальнай эканомікі, а таксама пераадолець негатыўныя наступствы сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу.

У Рэспубліцы Беларусь у кіраванні інавацыйнай дзейнасцю выкарыстоўваецца галіновы падыход, які не садзейнічае інавацыйнаму абнаўленню нацыянальнай эканомікі. Узровень навукаёмістасці валавога ўнутранага прадукту (ВУП) Рэспублікі Беларусь (па методыцы краін АЭСР) у 2008 годзе склаў 0,75% (у 2007 годзе – 0,97%). Па методыцы краін АЭСР рэкамендуемым з'яўляецца ўзровень навукаёмістасці ВУП ад 2% і вышэй, а паказчык навукаёмістасці ВУП ніжэй за 1% ацэньваецца як крытычны [1, с. 16]. Таму неабходна шукаць новыя падыходы да арганізацыі і кіравання інавацыйнай дзейнасцю ў краіне.

У сусветнай практыцы кластарны падыход зарэкамендаваў сябе як адзін з найбольш эфектыўных спосабаў кіравання інавацыямі. Працэс кластарызацыі – аб'ектыўны працэс, выкліканы глабалізацыяй. Ён развіваецца ва ўсім свеце і садзейнічае паскарэнню развіцця інавацыйных працэсаў у нацыянальных эканоміках. У кластарных структурах, якія эфектыўна функцыянуюць, паскараецца інавацыйны працэс, а ва ўдзельнікаў кластара развіваюцца такія перавагі, як успрымальнасць да інавацый, рацыяналізацыя бізнесу, апярэджваючы рост вытворчасці і г. д. Паспяховымі прыкладамі рэалізацыі кластарнага падыходу з'яўляецца Сіліконавая даліна ЗША, кластары высокіх тэхналогій Германіі (Мюнхен, Гамбург, Дрэздэн), кластар лічбавай апрацоўкі сігналаў у Бельгіі, дацкі кластар бесправадной сувязі NorCOM, лясны, металургічны і энергетычны кластары Фінляндыі, Цэнтр французскай шкляной вытворчасці (даліна Брэсле) і іншыя [2].

Згодна з тэорыяй Майкла Портэра, кластар – гэта група геаграфічна суседніх узаемазвязаных кампаній і звязаных з імі арганізацый, якія дзейнічаюць у пэўнай сферы і ўзаемадапаўняюць адна адну [3, с. 258].

Асноўнымі элементамі кластара з'яўляюцца адукацыя, навука і вытворчасць. У сферы адукацыі вядзецца падрыхтоўка даследчых, інжынерных, эканамічных кадраў, спецыялістаў працоўных прафесій і г. д. Навука займаецца правядзеннем фундаментальных даследаванняў, выкананнем прыкладных даследаванняў і эксперыментальных распрацовак. Значны аб'ём навуковых ведаў знаходзіцца ў сферы прыкладной навукі, у патэнтах, у канструктарскіх распрацоўках і інш. Вытворчасць выпускае інавацыйную прадукцыю і ўжывае высокія тэхналогіі.

Кластар адрозніваецца наяўнасцю развітой інавацыйнай інфраструктуры, што ўключае тэхнапарк або інавацыйна-тэхналагічны цэнтр, цэнтры сертыфікацыі, ліцэнзавання, маркетынгу, абароны інтэлектуальнай уласнасці і г. д., якія забяспечваюць камерцыялізацыю вынікаў навуковых даследаванняў, распрацовак, адукацыйных паслуг і іх тэхналагічны трансфер.

Узаемадзеянне ўсярэдзіне кластара ажыццяўляецца з дапамогай гарызантальных (дадатковыя вырабы і паслугі, выкарыстанне падобных спецыялізаваных працэсаў, тэхналогій ці інсты-

тутаў) і вертыкальных сувязей (ланцугі пакупак і продажаў). Менавіта ад узаемадзеянняў усярэдзіне кластара, ад здольнасці яго ўдзельнікаў эфектыўна выкарыстоўваць унутраныя і мабілізаваць знешнія рэсурсы залежыць канкурэнтаздольнасць усяго кластара [4].

Галоўнай асаблівасцю кластара з'яўляецца інавацыйнасць. Ён уключае ў сябе ўвесь інавацыйны ланцужок (ад генерацыі навуковых ведаў і фарміравання на іх аснове бізнес-ідэй да рэалізацыі таварнай прадукцыі на традыцыйных ці новых рынках збыту) [4]. Кластарная структура прыводзіць да стварэння «сукупнага інавацыйнага прадукту» – асаблівай формы інавацыі. Аб'яднанне ў кластар на аснове вертыкальнай інтэграцыі фарміруе не спантанную канцэнтрацыю разнастайных навуковых і тэхналагічных вынаходніцтваў, а пэўную сістэму распаўсюджання новых ведаў і тэхналогій. Пры гэтым самай важнай умовай эфектыўнай трансфармацыі вынаходніцтваў у інавацыі, а інавацый – у канкурэнтныя перавагі з'яўляецца фарміраванне сеткі ўстойлівых сувязей паміж усімі ўдзельнікамі кластара [5].

Для Рэспублікі Беларусь кластарны падыход з'яўляецца дастаткова новым. Адной з метадычных праблем фарміравання кластарных структур у Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца ацэнка патэнцыялу кластарызацыі, ідэнтыфікацыя і структураванне кластараў, вылучэнне «ядра» кластара. Аналіз літаратурных крыніц [6–14] паказаў, што не існуе адзінай метадалогіі для ідэнтыфікацыі кластараў, з дапамогай якой можна вызначыць межы кластараў і іх спецыфічныя параметры (эфектыўнасць, канкурэнтаздольнасць, інавацыйнасць).

Такім чынам, вышэйсказанае вызначае актуальнасць гэтага даследавання і яго запатрабаванасць у эканамічнай навуцы.

Для рашэння задачы ідэнтыфікацыі кластараў існуе мноства прылад: ад простых вымярэнняў спецыялізацыі (напрыклад, з дапамогай каэфіцыентаў лакалізацыі) да працэдур, заснаваных на аналізе матрыц міжгаліновага балансу [6, с. 62].

Большасць вядомых методык ідэнтыфікацыі кластараў зыходзяць з двух асноўных падыходаў. У першым, які ўмоўна можна назваць «зверху-ўніз», выкарыстоўваецца прынцып ідэнтыфікацыі кластара, які засноўваецца на яго галіновай прыналежнасці, г. зн. вядзецца пошук прасторавых лакалізацый вытворчасці, арыентаваных на спецыфічны від эканамічнай дзейнасці. Другі падыход выкарыстоўвае методыку, якая ўмоўна называецца «знізу-ўверх», дзе кластары ідэнтыфікуюцца на канкрэтна выбранай тэрыторыі, зыходзячы з прысутнасці ўнутры яе лакальных галін-лідараў. Усе іншыя падыходы да вызначэння эканамічных кластараў, так ці інакш, вар'іруюцца паміж двума вышэйзгаданымі [6–8].

Можна вылучыць чатыры асноўныя метадычныя падыходы да ідэнтыфікацыі кластараў: аналіз меркаванняў экспертаў; даследаванне каэфіцыентаў лакалізацыі; аналіз матрыц міжгаліновага балансу (прадуктовы або інавацыйны абмен); сеткавы аналіз [6–8].

Першы метад вызначэння кластараў прадугледжвае выкарыстанне экспертных ацэнак і часта выкарыстоўваецца пры мікрааналізе вытворчых кластараў. Перавагай дадзенага метаду з'яўляюцца адносна нізкія выдаткі і дэтальная інфармацыя аб практыцы вядзення бізнесу, ланцужку дабаўленага кошту, наяўнай інвестыцыйнай мадэлі, патэнцыяльных магчымасцях. На нашу думку, недахопам метаду экспертных ацэнак з'яўляецца адсутнасць дастатковай сістэматычнасці даследаванняў, што не дазваляе рабіць глыбокія абагульненні. Пагроза скажэння інфармацыі пры выкарыстанні гэтага метаду асабліва моцная, бо даследчык пачынае свой аналіз, ужо маючы папярэдняе меркаванне пра найбольш важныя сектары эканомікі, галоўныя суб'екты і характар эканамічных сувязей [7].

Наступны метад ідэнтыфікацыі кластараў – даследаванне каэфіцыентаў лакалізацыі. Каэфіцыент лакалізацыі разлічваецца, напрыклад, як удзельная вага галіны I у сукупнай колькасці занятых у рэгіёне ў адносінах да удзельнай вагі гэтай жа галіны ў агульнай колькасці занятых па краінах у цэлым. Каэфіцыент лакалізацыі, роўны 1, сведчыць, што дадзены рэгіён мае тую ж удзельную вагу галіны I па паказчыку занятасці, што і краіна ў цэлым. Каэфіцыент лакалізацыі, большы за 1,25, азначае, што можна казаць пра пачатак спецыялізацыі рэгіёна на дадзеным канкрэтным сектары эканомікі. Таксама можна разлічыць каэфіцыент лакалізацыі па паказчыках аб'ёму вытворчасці прадукцыі, паказчыках аб'ёму экспарту і імпарту прадукцыі [11].

Традыцыйнае выкарыстанне каэфіцыентаў лакалізацыі дае, на жаль, мала інфармацыі пра рэгіянальныя прамысловыя і інавацыйныя кластары. Гэта чыста галіновы метад аналізу і таму ён нічога не паведамляе пра ўзаемазалежнасць разнастайных сектараў эканомікі. Даследаванне кластараў з дапамогай толькі каэфіцыентаў лакалізацыі ўяўляе сабой просты галіновы аналіз прамысловасці. Гэты метад мэтазгодна выкарыстоўваць у сукупнасці з іншымі метадамі.

Трэці метад ідэнтыфікацыі кластараў прадугледжвае аналіз матрыц міжгаліновага балансу (прадуктовы абмен або інавацыйны абмен). Такія матрыцы апісваюць патокі прадуктаў або інавацый паміж вытворцамі і спажыўцамі. Прынцыповая перавага выкарыстання матрыц міжгаліновага балансу (прадуктовы або інавацыйны абмен) заключаецца ў акцэнце на сапраўдную інавацыйную або прадуктавую ўзаемасувязь і ўзаемадзеянне галін. Недахопам такіх матрыц з'яўляюцца высокія выдаткі па зборы інфармацыі і статыстычных даных (асабліва матрыц інавацыйнага ўзаемадзеяння), а таксама складанасці з канцэптуальным абгрунтаваннем даследаванняў [7].

Пры аналізе матрыц міжгаліновага балансу (прадуктовы і інавацыйны абмен) могуць быць выкарыстаны наступныя метады: галоўных кампанент, фактарны аналіз, тэорыя графаў, шматмерны статыстычны кластарны аналіз.

На нашу думку, некаторыя рэгіёны настолькі невялікія па сваіх памерах або змяшчаюць так мала галін, што прымяненне міжгаліновых балансаў там не апраўдана. Сувязі паміж сектарамі могуць быць выяўлены вымярэннем затрат і продажаў на аснове аналізу графічных сетак (чацвёрты метадычны падыход да ідэнтыфікацыі кластараў). Такі аналіз дазваляе апісаць міжсектарныя сувязі і можа прымяняцца разам з агульнымі статыстычнымі данымі пра развіццё рэгіянальнай прамысловасці [7]. Найбольш аб'ектыўнымі данымі для сеткавага аналізу з'яўляюцца даныя інавацыйнага міжгаліновага балансу, хаця пры гэтым таксама выкарыстоўваюцца даныя апытанняў рэгіянальных экспертаў і іншая якасная інфармацыя пра сувязі паміж галінамі. Перавагай метаду графічнага сеткавага аналізу з'яўляецца візуальнае ўяўленне ўзаемасувязей, а галоўным недахопам – інтэрпрэтацыя выяўленых складаных сувязей [7].

Большасць краін камбінуе розныя метады аналізу кластараў, каб пераадолець абмежаванні ў выкарыстанні адзінага метаду, паколькі разнастайныя метадалогіі адказваюць на розныя пытанні і забяспечваюць розныя віды інфармацыі [14].

Прызнаючы значнасць вышэйзгаданых метадаў даследавання кластараў, неабходна адзначыць, што існуюць пэўныя цяжкасці для іх прымянення ў Рэспубліцы Беларусь. Праблема ідэнтыфікацыі кластараў у нашай краіне натыкаецца не столькі на метадычны інструментарый даследавання, колькі на інфармацыйную базу і неабходныя для гэтага паказчыкі.

У дадзеным артыкуле намі прапаноўваецца метадычны падыход да ідэнтыфікацыі і фарміравання кластара. Прапанаваны метадычны падыход прадугледжвае рэалізацыю чатырох этапаў (малюнак).

*Першы этап*. Фарміруецца інфармацыйны масіў для правядзення даследавання (анкетныя даныя пра пастаўшчыкоў і пакупнікоў, суб'ектаў інфраструктуры, даныя пра вытворчую і інавацыйную дзейнасць галін і прадпрыемстваў).

Затым, на аснове аналізу сабраных даных, ацэньваецца патэнцыял кластарызацыі. Патэнцыял кластарызацыі – гэта наяўнасць магчымасці кааперавання прадпрыемстваў разнастайных галін і інфраструктурных арганізацый, якія знаходзяцца на тэрыторыі рэгіёна, у эфектыўны вытворчы (або інавацыйны) ланцужок, а таксама магчымасці аб'яднання іх канкурэнтных пераваг і выкарыстання гэтых пераваг для павышэння канкурэнтаздольнасці рэгіёна [11, с. 78]. Пад рэгіёнам будзем разумець краіну, вобласць, раён, горад. Для ацэнкі патэнцыялу кластарызацыі неабходна падзяліць галіны эканомікі Рэспублікі Беларусь на групы па ступені развіцця інавацыйнай дзейнасці і вылучыць галіны, у якіх інавацыйная дзейнасць адбываецца найбольш інтэнсіўна. Для гэтых мэтаў найбольш эфектыўна выкарыстоўваць метады шматмернага аналізу, якія з'яўляюцца колькасным інструментам даследавання сацыяльна-эканамічных працэсаў, што апісваюцца вялікай колькасцю характарыстык (кластарны аналіз, таксаномія, распазнаванне воб-




Метадычны падыход да ідэнтыфікацыі і фарміравання кластара (уласная распрацоўка)

разаў, фактарны аналіз). На нашу думку, метад кластарнага аналізу мае шэраг пераваг у параўнанні з таксаноміяй, распазнаваннем вобразаў, фактарным аналізам, паколькі ён дазваляе класіфікаваць аб’екты не па адным параметры, а па цэлым наборы прыкмет. Акрамя таго, кластарны аналіз у адрозненне ад большасці матэматыка-статыстычных метадаў не накладвае ніякіх абмежаванняў на від разглядаемых аб’ектаў і дазваляе браць пад увагу мноства зыходных даных практычна адвольнай прыроды. Таму тыпалогію галін прапануецца будаваць з дапамогай метаду кластарнага аналізу [15] па наступных паказчыках інавацыйнай дзейнасці:

– колькасць інавацыйна актыўных прадпрыемстваў у галіне;
– бягучыя затраты на тэхналагічныя інавацыі;
– капітальныя затраты на тэхналагічныя інавацыі;
– колькасць выкарыстаных перадавых вытворчых тэхналогій;
– колькасць патэнтаў на вынаходніцтва;
– доля інавацыйнай прадукцыі ў аб’ёме адгружанай прадукцыі на экспарт;
– доля інавацыйнай прадукцыі ў аб’ёме адгружанай прадукцыі.

Атрыманыя ў працэсе разлікаў метадам кластарнага аналізу вынікі дазваляюць выявіць «кропкі росту», г. зн. вызначыць галіны, якія валодаюць найбольшым інавацыйным патэнцыялам і маюць магчымасць стварэння кластараў.

Затым праводзіцца аналіз сувязей паміж галінамі, якія валодаюць найбольшым інавацыйным патэнцыялам, і іншымі галінамі на аснове разліку каэфіцыентаў поўных затрат, выкарыстоўваючы даныя табліц «затраты-выпуск».

Паралельна неабходна правесці ацэнку забяспечанасці кадрамі галін, якія валодаюць найбольшым інавацыйным патэнцыялам, вылучыць асноўныя навуковыя напрамкі, па якіх на сённяшні дзень праводзіцца найбольшая колькасць распрацовак.

Такім чынам, на дадзеным этапе ацэньваецца магчымасць стварэння кластараў.

*Другі этап.* Вылучаецца «ядро» кластара, якое складаюць кампаніі-вытворцы асноўнай прадукцыі кластара. Гэтыя фірмы маюць вузкую спецыялізацыю, геаграфічна блізкія адна да адной, паміж імі ўжо існуе ўзаемадзеянне, яны маюць наладжаныя сувязі на знешніх рынках. Вакол «ядра» кластара функцыянуюць астатнія ўдзельнікі. Такія, як, напрыклад, аўтавытворцы

ў кластарах аўтамабілебудаўніцтва, фермерскія гаспадаркі і вытворцы віна ў аграпрамысловых кластарах, вытворцы абутку ў абутковых кластарах, вытворцы станкоў у станкабудаўнічых кластарах і г. д. [16]. «Ядро» кластара, як правіла, утвараюць прадпрыемствы, якія маюць моцныя канкурэнтныя пазіцыі на сусветным або, па меншай меры, на нацыянальным рынку. У процілеглым выпадку, неканкурэнтаздольным будзе і ўвесь кластар [14].

Для выяўлення арганізацый-ініцыятараў стварэння кластара («ядро» кластара) вызначаюцца асноўныя вытворцы прадукцыі галіны (або ўзаемазвязаных галін) і адбываецца выбар сярод іх найбольш паспяховых. Верагоднымі ініцыятарамі («ядро» кластара) стварэння кластарнай структуры будуць моцныя прадпрыемствы адпаведнай галіны эканомікі, у якіх высокая доля ў аб'ёме вытворчасці прадукцыі галіны і тэмп росту аб'ёму вытворчасці прадукцыі прадпрыемства большы за тэмп росту аб'ёму вытворчасці прадукцыі галіны. Выяўленне «ядра» кластара з'яўляецца зыходнай кропкай у распрацоўцы мадэлі кластара.

Важнае значэнне для паспяховага развіцця кластара маюць пастаўшчыкі сыравіны, кампанентаў, камплектуючых, абсталявання і інш. Асноўныя пастаўшчыкі вызначаюцца на падставе аналізу інфармацыі, атрыманай з дапамогай анкетавання. Высвятляецца цесната сувязі паміж пастаўшчыкамі і «ядром» кластара. Для гэтага выкарыстоўваецца каэфіцыент цеснаты сувязі, які вызначаецца па наступнай формуле:

$$Кцс=АПкл/АПа,$$

дзе Кцс – каэфіцыент цеснаты сувязі; АПкл – аб'ём вытворчасці пастаўшчыка для «ядра» кластара, млн руб.; АПа – агульны аб'ём вытворчасці пастаўшчыка, млн руб.

Каэфіцыент цеснаты сувязі можа прымаць значэнне ад 0 да 1. Для ўключэння арганізацыі ў кластар значэнне каэфіцыента Кцс паміж ёю і «ядром» кластара павінна быць не менш 0,08 [17, с. 96].

На аснове інфармацыі, атрыманай метадам Дэльфі, выяўляюцца суб'екты інфраструктуры, якія ствараюць умовы для вытворчасці прадукцыі, і спажыўцы асноўнай прадукцыі.

Такім чынам, структураванне кластара ажыццяўляецца на аснове вызначэння сувязей паміж «ядром» і іншымі ўдзельнікамі кластара (пастаўшчыкамі, інфраструктурай, навуковымі і адукацыйнымі ўстановамі, спажыўцамі).

*Трэці этап.* Распрацоўваецца механізм забеспячэння рэалізацыі кластарнага падыходу, які ўключае ў сябе арганізацыйнае, фінансава-эканамічнае і інфармацыйнае забеспячэнне функцыянавання кластара. Гэты механізм дазволіць эфектыўна кіраваць інавацыйнай дзейнасцю ў кластары.

Арганізацыйнае забеспячэнне кластара заключаецца ў распрацоўцы арганізацыйнай структуры кіравання кластарам, вызначэнні напрамкаў узаемадзеяння ўдзельнікаў кластара, стварэнні органа кіравання, які забяспечвае падтрымку кластараў, забяспечвае даследаванне кластараў, каардынуе дзейнасць удзельнікаў.

Фінансава-эканамічнае забеспячэнне прадугледжвае вызначэнне крыніц фінансавання праекта кластарызацыі, інавацыйных праектаў кластара і інфраструктуры кластара.

Распрацоўка інфармацыйнага забеспячэння кластара дазволіць наладзіць інфармацыйныя патокі паміж суб'ектамі кластара, г. зн. вызначыць, як будзе адбывацца абмен данымі і інфармацыяй.

Паколькі дзяржава з'яўляецца паўнапраўным суб'ектам эканамічных адносін, неабходна асобна вызначыць ролю дзяржавы ў працэсе арганізацыйнага, фінансава-эканамічнага і інфармацыйнага забеспячэння функцыянавання кластара.

*Чацвёрты этап.* Ацэньваецца выніковасць функцыянавання кластара, а таксама ажыццяўляецца распрацоўка асноўных кірункаў па яго далейшым развіцці.

Выніковасць функцыянавання кластара можна ацаніць з боку прадпрыемстваў-удзельнікаў кластара, а таксама наступстваў для эканомікі ў цэлым.

Неабходна адзначыць, што стварэнне і функцыянаванне кластарнай структуры мае сэнс перш за ўсё пры атрыманні рэальнага эфекту ад узаемадзеяння, г. зн. эфект ад узаемадзеяння

ўдзельнікаў кластара павінен перавышаць суму эфектаў дзейнасці кожнага асобнага ўдзельніка. Таму асаблівую ролю ў ацэнцы функцыянавання кластарнай структуры адыгрывае так званы сінергетычны эфект, пад якім разумеюць узрастанне эфектыўнасці дзейнасці ў выніку інавацыйнай інтэграцыі ўдзельнікаў кластара ў адзіную сістэму. У якасці выніку ацэнкі сінергетычнага эфекту з'яўляецца адпаведная рознасць значэнняў выбранага паказчыка (прыбытак ад рэалізацыі прадукцыі, выручка ад рэалізацыі прадукцыі, даходы ад аперацыйнай і пазарэалізацыйнай дзейнасці і іншыя паказчыкі). Выгада ад сінергетычнага эфекту ацэньваецца з улікам мэтаў стварэння кластара.

На практыцы пры ацэнцы выніковасці функцыянавання кластара могуць узнікаць цяжкасці (адсутнасць статыстычных паказчыкаў дзейнасці кластара), таму пажаданымі кірункамі яе ацэнкі з'яўляецца ацэнка канкурэнтаздольнасці кластара ў параўнанні з канкурыруючымі вытворцамі, якую можна вымяраць доляй прадукцыі кластара на рынку, і ацэнка канкурэнтаздольнасці прадукцыі кластара.

Такім чынам, у артыкуле прапанаваны метадычны падыход да ідэнтыфікацыі і фарміравання кластарнай структуры, які ўключае чатыры асноўныя этапы і дазваляе ажыццявіць выбар відаў вытворчай дзейнасці на пэўнай тэрыторыі, якія валодаюць патэнцыялам фарміравання кластараў, структураванне кластара, вылучыць «ядро» кластара.

На дадзены момант у Рэспубліцы Беларусь не рэалізаваны ніводны праект па стварэнні кластараў. Кластарызацыя з'яўляецца перспектыўным кірункам павышэння эфектыўнасці інавацыйнай дзейнасці ў краіне. Напрыклад, у Рэспубліцы Беларусь кластарны падыход можа быць паспяхова выкарыстаны як інструмент інавацыйнага развіцця прамысловага комплексу. Таму на сучасным этапе аб'ектыўным патрабаваннем з'яўляецца актывізацыя дзеянняў па стымуляванні развіцця новых форм арганізацыі вытворчасці і кааперацыі – кластараў.

## Літаратура


1. О состоянии и перспективах развития науки в Республике Беларусь по итогам 2008 года: Аналитический доклад / И. В. Войтов [и др.]. – Минск: ГУ «БелИСА», 2009 г. – 184 с.

2. European Commission. Enterprise and Industry Directorate – General. Final report of the expert group on enterprise clusters // Сайт European Commission [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://ec.europa.eu/enterprise/entrepreneurship/support_measures/cluster/final_report_clusters_en. pdf. – Дата доступа: 10.01.2009.

3. П о р т е р, М. Конкуренция / М. Портер; пер. с англ. – М.: Издательский дом «Вильямс», 2005. – 608 с.

4. Б и р ю к о в, А. В. Преимущества современных инновационных кластеров / А. В. Бирюков // Сайт «Морские вести» [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http: www.morvesti.ru. – Дата доступа: 10.11.2009.

5. Я л о в, Д. А. Кластерный подход как технология управления региональным экономическим развитием / Д. А. Ялов // Сайт журнала «Компас промышленной реструктуризации» [Электронный ресурс]. – 2007. – Режим доступа: http:www.compass-r.ru/st.html. – Дата доступа: 10.01.2009.

6. М а р к о в, Л. С. Кластеры: формализация взаимосвязей в неформализованных производственных структурах / Л. С. Марков, М. А. Ягольницер; Ин-т экономики и организации промышленного производства. Сибирское отд-ние Рос. акад. наук. – Новосибирск: ИЭООП СО РАН, 2006. – 194 с.

7. B e r g m a n, E. M. Industrial and regional clusters: concepts and comparative applications/ E. M. Bergman, E. J. Feser // Regional Research Institute [Электронный ресурс]. – 1999. – Режим доступа: http://www.rri.wvu.edu/WebBook. – Дата доступа: 12.01.2009.

8. М а р к о в, Л. С. Управление эффективностью функционирования региональных высокотехнологичных кластеров /Л. С. Марков // Регион: экономика и социология. – 2007. – № 2. – С. 20–35.

9. С у с п и ц ы н, С. А. Измерения и анализ пороговых значений в региональных кластерах / С. А. Суспицын // Регион: экономика и социология. – 2007. – № 1. – С. 69–87.

10. Л а р и н а, Н. И. Кластеризация как путь повышения международной конкурентоспособности страны и регионов / Н. И. Ларина, А. И. Макаев // ЭКО. – 2006. – № 10. – С. 2–27.

11. В и н о к у р о в а, М. В. Конкурентоспособность и потенциал кластеризации отраслей экономики Иркутской области / М. В. Винокурова // ЭКО. – 2006. – № 12. – С. 73–92.

12. М а р к о в, Л. С. Измерение эффективности функционирования кластера информационных технологий / Л. С. Марков, М. А. Ягольницер // Регион: экономика и социология. – 2006. – № 1. – С. 155–171.

13. Инновационный потенциал научного центра: методологические и методические проблемы анализа и оценки / В. И. Суслов. – Новосибирск: Сибирское науч. изд-во, 2007. – 276 с.

14. T h e o, J. A. R o e l a n d t, P i m den H e r t o g. Cluster Analysis & Cluster-Based Policy in OECD-countries various approaches, early results & policy implications/ Theo J. A. Roelandt, Pim den Hertog // Report by the Focus Group on:

Industrial clusters. The Hague Utrecht, May 1998 [Electronic resource]. – Mode of access: http:// oecd. org/daf/corporate. – Date of access: 14.10.2009.

15. К у н д ы ш е в а, Е. С. Математическое моделирование в экономике: учебное пособие / Е. С. Кундышева; под науч. ред. проф. Б. А. Суслакова. – 2-е изд. – М.: Издательско-торговая корпорация «Дашков и К°», 2006. – 352 с.

16. Н е с к о р о м н а я, Е. Е. Кластер – эффективный инструмент повышения конкурентоспособности экономики региона / Е. Е. Нескоромная // Материалы докладов XV Междунар. конф. студентов, аспирантов и молодых ученых «Ломоносов» / отв. ред. И. А. Алешковский, П. Н. Костылев, А. И. Андреев [Электронный ресурс]. – М.: МАКС Пресс, 2008. – 1 электрон. опт. диск (CD-ROM). – Режим доступа: http://www.lomonosov-msu.ru/2008/.

17. Я ш е в а, Г. А. Кластерный подход в повышении конкурентоспособности предприятий / Г. А. Яшева. – Витебск: Витебск. гос. технолог. ун-т, 2007. – 301 с.

*O. A. SAFONOVA*

**METHODICAL ASPECTS OF CLUSTER IDENTIFICATION AND FORMATION IN THE SOCIAL AND ECONOMIC DEVELOPMENT MODEL OF THE REPUBLIC OF BELARUS**

## Summary

In this work the methodical approach to formation and identification of clusters has been offered.

The offered methodical approach includes following 4 stages:

1) analysis and estimation of conditions to the cluster creation;
2) modeling of the cluster structure development;
3) methodical maintenance of the cluster effective functioning;
4) estimation of the cluster functioning efficiency.

## *ГІСТОРЫЯ*

*УДК 947.6:371*

*А. А. ЗЯБКО*

# АДНОСІНЫ БЕЛАРУСКАГА НАСТАЎНІЦТВА ДА ВОІНСКАГА АБАВЯЗКУ НАПЯРЭДАДНІ І Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

*(Паступіў у рэдакцыю 15.06.2010)*

Першая сусветная вайна з’явілася пераломнай падзеяй у жыцці еўрапейскіх народаў. Пасля яе на палітычнай карце Еўропы пачалося фарміраванне нацыянальных дзяржаў тых нацый, якія ў да-ваенны час знаходзіліся ў складзе буйнейшых імперый кантынента – Расійскай і Аўстра-Венгерскай. Для Беларусі, на тэрыторыі якой разгарнуліся баявыя дзеянні і насельніцтва якой аказалася падзелена фронтам на дзве часткі, сусветная вайна таксама стала лёсавызначальным рубяжом. З гэтай прычыны айчынная і замежная гістарычная навука праяўляе цікавасць да падзей таго часу.

Неабходна адзначыць, што ў савецкі перыяд падзеі вайны вывучаліся ў кантэксце падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкай рэвалюцыі, таму многія аспекты наогул не разглядаліся ў навуковай літаратуры. Пасля распаду СССР спектр даследаванняў пашырыўся, гісторыкі, у тым ліку і беларускія, пачалі больш актыўна і дэталёва вывучаць перыяд 1914–1918 гг. Але, нягледзячы на гэта, многія аспекты да сённяшняга часу не знайшлі адлюстравання ў навуковых працах. Так, неабходна правесці больш глыбокае вывучэнне такога аспекта, як успрыманне вайны рознымі сацыяльнымі групамі, іх адносіны да яе. У гэтых абставінах праблема даследавання адносін настаўніцтва беларускіх губерняў да ваеннага абавязку і вайны з’яўляецца актуальнай і патрабуе далейшай распрацоўкі.

Мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца вызначэнне характару адносін беларускага настаўніцтва да воінскага абавязку напярэдадні і ў гады Першай сусветнай вайны, а таксама іх адносіны да самой вайны. Для рэалізацыі дадзенай мэты быў пастаўлены шэраг задач: даследаванне «Статута аб воінскім абавязку» для выяўлення характару льгот, якія мелі настаўнікі, вызначэнне ўздзеяння сялянскага менталітэту на настаўнікаў і ўплыву ідэй беларускага нацыянальнага руху на іх адносіны да вайны.

Перш чым разгледзець праблему адносін настаўнікаў беларускіх губерняў да воінскага абавязку і да вайны, важна звярнуць увагу на такія аспекты, як узровень адукаванасці насельніцтва і палітыка царскай адміністрацыі ў сферы адукацыі на гэтых тэрыторыях. Неабходна ўказаць, што адзначаны ўзровень сярод насельніцтва Расійскай імперыі быў дастаткова нізкі, гэта ў поўнай меры адносіцца і да беларускіх губерняў. Так, напрыклад, у Мінскай губерні на 1 студзеня 1914 года ў школах навучалася 180933 чалавекі пры насельніцтве каля 3 мільёнаў. Колькасць настаўнікаў была 6160, што складала 0,2% насельніцтва губерні; на 100 вучняў прыходзілася 3 настаўнікі [1, с. 65]. У іншых беларускіх губернях назіралася аналагічная сітуацыя. Неабходна таксама дадаць, што школьная адукацыя не магла ахапіць усіх дзяцей школьнага ўзросту, што бачна на прыкладзе Віленскай губерні, дзе ў 1912 годзе толькі 43,5% дзяцей вучыліся ў школах, пры гэтым дзяўчынак было ў 2 разы менш, чым хлопчыкаў [2, с. 88]. Колькасць насельніцтва расла хутчэй, чым адкрываліся школы, а пасля пачатку вайны сітуацыя толькі пагоршылася. Школы проста не маглі прымаць вучняў з прычыны сваёй перапоўненасці, што значна абмяжоў-

вала адукаванасць насельніцтва. Пачатак вайны летам 1914 года прывёў да скарачэння і так невялікай колькасці школ па той прычыне, што многія з іх былі заняты пад шпіталі або на іншыя ваенныя патрэбы. Так, ва ўсёй Віленскай навучальнай акрузе пад шпіталі было занята 29 будынкаў навучальных устаноў [3, с. 53].

Асноўная маса школ, якія размяшчаліся на тэрыторыі беларускіх губерняў, былі пачатковымі. Школы і навучальныя ўстановы на Беларусі падзяляліся на два тыпы: свецкія і царкоўныя [4, с. 14]. Да 1914 года колькасць свецкіх пачатковых школ складала 4784 установы, дзе вучыліся 304745 вучняў, а колькасць царкоўнапрыходскіх школ і школ граматы – 2643 пры 130900 навучэнцах. Колькасць сярэдніх навучальных устаноў дасягала 122, дзе атрымоўвалі адукацыю 31328 чалавек [5, с. 410].

Падрыхтоўкай настаўнікаў для школ на тэрыторыі беларускіх губерняў займаліся навучальныя ўстановы свецкага характару, якія былі падначалены Міністэрству Народнай асветы, і царкоўнага, якія належылі да ведамства Св. Сінода. Сярод свецкіх навучальных устаноў рыхтавалі педагагічныя кадры настаўніцкія інстытуты, семінарыі, а таксама настаўніцкія курсы, якія арганізоўваліся пры навучальных установах. Настаўніцкія інстытуты існавалі ў Вільні, Віцебску, Магілёве і Мінску, прычым апошні быў адкрыты ў 1914 годзе. Агульная колькасць навучэнцаў у іх на 1 студзеня 1915 года складала 274 чалавекі, з якіх 220 былі выхадцамі з сялянскага саслоўя [6, с. 17].

Што тычыцца настаўніцкіх семінарый, то на тэрыторыі беларускіх губерняў іх было 9, дзе праходзілі падрыхтоўку 883 навучэнцы, абсалютная большасць якіх паходзілі з сялян [6, с. 57]. Пры 9 навучальных установах былі арганізаваны адна- і двухгадовыя педагагічныя курсы, дзе навучаліся 355 чалавек, з якіх 258 мелі сялянскае паходжанне [6, с. 78].

Да настаўніцкіх навучальных устаноў, якія падпарадкоўваліся царкоўнаму ведамству, адносіліся царкоўна-настаўніцкія школы, другакласныя школы, а таксама настаўнікаў рыхтавалі на дадатковых курсах пры другакласных школах. На 1913 год у беларускіх губернях налічвалася 2 царкоўна-настаўніцкія школы, 31 другакласная школа і 5 другакласных школ мелі дадатковыя курсы. У азначаных установах праходзілі падрыхтоўку 2226 чалавек, з якіх 90% навучалася ў другакласных школах [7, с. 24–26]. Дадзеныя ўстановы рыхтавалі настаўніцкія кадры пераважна для царкоўна-прыходскіх школ [8, с. 57]. Настаўнікамі маглі працаваць выпускнікі духоўных семінарый, акрамя таго, частка настаўнікаў рыхтаваліся ў вышэйшых навучальных установах па-за межамі Беларусі з прычыны адсутнасці тут універсітэтаў [4, с. 18].

Наогул жа, сітуацыя з настаўнікамі на тэрыторыі беларускіх губерняў была складанай з-за іх недахопу і нізкай кваліфікацыі значнай часткі педагогаў. Шмат настаўнікаў, асабліва ў пачатковых школах царкоўнага ведамства, не мелі спецыяльнай педагагічнай адукацыі [8, с. 50].

Пры вызначэнні адносін настаўніцтва да воінскай павіннасці і да ваеннай службы спачатку неабходна звярнуцца да зместу «Статута аб воінскай павіннасці», у прыватнасці, да раздзелаў, у якіх рэгуляваліся адтэрміноўкі і льготы па адукацыі. Аднак перш чым прааналізаваць артыкулы азначанага дакумента, цікавым будзе звярнуцца да працы аднаго з буйнейшых даследчыкаў перыяду 1914–1918 гг. М. Галавіна, які ўказвае, што льготы па адукацыі для настаўнікаў і выкладчыкаў прыводзілі да іх «амбюскіравання» (ад фр. embusque – той, хто акапаўся у тыле, «тылавы пацук»). Гэта ў сваю чаргу фарміравала адмоўныя адносіны да воінскай службы і негатыўныя адносіны да вайны. Дадзеная сітуацыя, на думку М. Галавіна, выклікана тым, што значна паўплывала на змест і характар «Статута» патрэбнасць расійскай эканомікі ў адукаваных кадрах у мірны час. Пры гэтым на другі план адсоўвалася праблема недастатковай забяспечанасці арміі адукаванымі людзьмі, і калі ў арміі мірнага часу гэта адчувалася не так востра, то з пачаткам вайны гэта праблема стала адной з ключавых [9, с. 48–49]. Неабходна дадаць таксама, што асабліва цяжкае становішча было з афіцэрамі вучэбных часцей, якія адказвалі за баявую падрыхтоўку навабранцаў, а таксама з унтэр-афіцэрамі, якія падчас баявых дзеянняў павінны былі на месцы забяспечваць выкананне загадаў камандавання і непасрэдна кіраваць ніжнімі чынамі ў баі. У дадзеных абставінах можна пагадзіцца з М. Галавіным, што такі характар ваеннага заканадаўства зніжаў якасць расійскіх войскаў за кошт змяншэння колькасці адукаваных кадраў у арміі, але, на нашу думку, «амбюскіраванне» сярод інтэлігенцыі, у тым ліку настаўнікаў і вы-

кладчыкаў, было выклікана комплексам прычын, сярод якіх ільготы па адукацыі займаюць не асноўнае месца. Гэта, у прыватнасці, адносіцца да беларускіх губерняў, дзе не было ўніверсітэтаў, выкладчыкі якіх вызваляліся ад воінскага абавязку. Мясцовыя настаўнікі і навучэнцы настаўніцкіх навучальных устаноў маглі разлічваць толькі на адтэрміноўку ад службы, што і было адлюстравана ў Статуце [10, с. 34].

Згодна з Агульным палажэннем «Статута» ў рэдакцыі 1915 года, які заснаваны на змесце «Статута» 1874 г. з дапаўненнямі 1912 года, да выканання воінскага абавязку прызываліся маладыя людзі, якім споўнілася 20 гадоў па стану на 1 студзеня таго года, у які адбываецца прызыў (арт. 12). Тэрмін службы для пяхоты і артылерыі, акрамя коннай, вызначаўся ў 18 гадоў, з якіх 3 гады і 3 месяцы абавязковай ваеннай службы і 14 гадоў і 9 месяцаў у запасе (арт. 20). Аднак ва ўмовах ваеннага часу тэрмін службы вызначаўся «дзяржаўнай неабходнасцю», г. зн. мог доўжыцца больш, у залежнасці ад абставін вайны (арт. 27). Для кавалерыі і іншых відаў войскаў тэрмін службы быў больш працяглым, чым у пяхоце [10, с. 9–12].

Што тычыцца льгот па адукацыі, то іх можна падзяліць на наступныя тыпы: адтэрміноўка прызыву для завяршэння адукацыі, скарачэнне тэрміну службы, поўнае вызваленне ад воінскай павіннасці [10, с. 28, 30, 35].

У дачыненні да настаўнікаў навучальных устаноў, якія знаходзіліся на тэрыторыі беларускіх губерняў, неабходна ўказаць на тое, што яны мелі сярэднюю адукацыю і маглі карыстацца льготай па скарачэнні тэрміну службы, прадугледжанай артыкулам 86. Згодна з ім, пры ўмове адбыцця воінскай павіннасці ў любым відзе сухапутных войск, яны служылі 3 гады і 3 месяцы на абавязковай ваеннай службе [10, с. 30]. Такім чынам, бачна, што скрачэнне тэрміну службы закранала толькі тых, хто быў залічаны ў кавалерыю, конную артылерыю і пагранічную варту. Пры тым, што асноўная маса навабранцаў накіроўваліся ў пяхоту і артылерыю, дадзеная льгота не мела вялікага значэння для выпускнікоў устаноў, дзе рыхтавалі настаўнікаў.

На больш значныя скарачэнні тэрміну службы мелі права настаўнікі, калі яны выкладалі ў навучальных установах на штатных пасадах. У артыкуле 102 «Статута» адзначаецца, што такія асобы маюць права на скарачэнне тэрміну абавязковай ваеннай службы да 2 гадоў, пры ўмове, што яны адпрацавалі на дадзенай службе не менш 5 гадоў [10, с. 35]. Таксама ў якасці часовай меры да снежня 1917 года для выпускнікоў настаўніцкіх навучальных устаноў, якія працавалі на вучэбнай пасадзе ў навучальных установах не ніжэй двухкласнага пачатковага вучылішча, прадугледжвалася скарачэнне тэрміну абавязковай службы да 1 года [10, с. 36]. Гэтыя і іншыя льготы па адукацыі сведчаць, што расійскае ваеннае заканадаўства было падпарадкавана ідэі забеспячэння адукаванымі людзьмі ў першую чаргу цывільных устаноў, што адмоўна адбілася на ўзброеных сілах, асабліва ў ваенны час, калі востра паўстала праблема недахопу кадраў для падрыхтоўкі навабранцаў.

З іншага боку, той факт, што настаўнікі ў мірны час праходзілі скарочаны тэрмін службы, уплываў на фарміраванне адмоўных да яе адносін. Многія ўспрымалі яе як бюракратычную перашкоду, якая пазбаўляла магчымасці займацца асноўнай дзейнасцю, і імкнуліся хутчэй адбыць гэтую «непрыемную» павіннасць. Так, напрыклад, у кнізе Д. П. Оськіна «Запіскі салдата», якая мае аўтабіяграфічны характар, на гэты конт можна знайсці наступнае: «Военная служба всегда казалась мне чем-то вроде тюрьмы. Я никак не мог привыкнуть к мысли, что на меня наденут солдатскую шинель и я превращусь в «серую скотинку». Когда волостной писарь Егоров сказал мне, будто сельские учителя освобождаются по закону от призыва, я сразу воспрянул духом и решил воспользоваться этой льготой». Але далей аўтар адзначае, што новая рэдакцыя «Статута аб воінскай павіннасці», па якім з восені 1913 года вызваляліся толькі тыя настаўнікі, што адпрацавалі на пасадзе не менш пяці гадоў, прывяла да таго, што «усилия целого года пропали даром» [11, с. 13]. У такіх умовах частка настаўнікаў не выказвала жадання да выканання воінскай павіннасці і актыўна імкнулася скарыстаць тыя льготы, якія даваліся ім заканадаўствам. У далейшым пасля пачатку вайны іх адносіны да воінскага абавязку ў асноўным не змяніліся. Гэта прывяло да таго, што многія маладыя настаўнікі, якія падпадалі пад мабілізацыйны ўзрост, не імкнуліся трапіць у дзеючую армію і пры магчымасці вярталіся на месцы працы. Так, падчас мабілізацыі з навучальных устаноў па падрыхтоўцы настаўнікаў было накіравана ў армію 25 вы-

хаванцаў, з якіх 17 было вернута ў той жа год па запыце Міністэрства Народнай Асветы [6, с. 34]. Пры гэтым настаўніцкія кадры ў большасці выпадкаў траплялі ў лік ратнікаў апалчэння, або запасныя палкі, г. зн. не накіроўваліся непасрэдна на перадавыя лініі [3, с. 53]. Па меры зацягвання вайны сітуацыя з адносінамі да службы толькі пагаршалася, што прыводзіла да ўхілення маладых настаўнікаў ад воінскай павіннасці. Так, у цыркуляры па крымінальным вышуку ад 21 чэрвеня 1916 года адзначаецца: «В. К. Шнаркевич – кр. Новогрудского уезда, Городейской волости, 19 л., бывший ученик Несвижской учительской семинарии, разыскивается за уклонение от воинской повинности» [12, л. 252].

Неабходна адзначыць, што пад уплывам патрыятычнай прапаганды некаторыя настаўнікі выказалі жаданне накіравацца ў дзеючую армію, нягледзячы на магчымасць застацца на штабных пасадах або наогул вызваліцца ад службы. Так, напрыклад, у некралозе, прысвечаным настаўніку народнага вучылішча ў Быхаўскім павеце, адзначаецца: «... Призванный по мобилизации в ряды действующей армии и охваченный глубоким порывом искреннего патриотическаго чувства, отказался от предложенной ему его военным начальством должности в канцелярии или обозе и испросил себе назначение в строевую службу...» [13, с. 47]. Трэба сказаць, што колькасць такіх выпадкаў была невялікая.

Але, на нашу думку, льготай па адукацыі можна толькі часткова патлумачыць той факт, што значная частка настаўнікаў адносіліся да вайсковай службы абыякава або наогул адмоўна, што ва ўмовах вайны садзейнічала фарміраванню сярод іх антываенных настрояў. Прычыны дадзенай з'явы ляжаць больш глыбока і цесна звязаны з асаблівасцямі менталітэту асобных слаёў насельніцтва, якія пражывалі на тэрыторыі беларускіх губерняў.

З пункту гледжання сацыяльнай стратыфікацыі, настаўнікі навучальных устаноў з'яўляюцца прадстаўнікамі інтэлігенцыі, пры гэтым у адносінах да беларускіх губерняў гэта ў значнай ступені беларуская нацыянальная інтэлігенцыя. Яны мелі пэўны ўзровень адукацыі, які дазваляў арыентавацца ў грамадска-палітычным жыцці краіны, у тым ліку ўспрымаць ідэі нацыянальнага адраджэння. Нельга не ўлічваць і той факт, што ў большасці выпадкаў настаўнікі, асабліва ў ніжэйшых навучальных установах, былі выхадцамі з сялянскага саслоўя. З гэтага вынікае, што для іх былі характэрны рысы сялянскага менталітэту, у тым ліку і адносіны да вайны і ваеннай службы. Неабходна дадаць, што будучы найбольш шматлікай катэгорыяй беларускай інтэлігенцыі, настаўнікі, асабліва вясковыя, як правіла, былі негатыўна настроены ў адносінах да царскіх улад і прытрымліваліся сацыялістычных поглядаў [14, с. 98]. Будучы выхадцамі з простага народа і працуючы ў сялянскім асяроддзі, яны добра ведалі быт і жыццё вясковых жыхароў, што ўплывала на фарміраванне іх поглядаў на расійскае самадзяржаўе, якія нават царскія ўлады вызначалі як негатыўныя [4, с. 72].

Што тычыцца сялян, то абавязковую ваенную службу большасць з іх успрымалі як павіннасць, якую вымушаны былі адбываць. На гэты конт у кнізе Д. П. Оськіна можна знайсці: «... Две недели между призывом и явкой пролетели незаметно. Все эти дни пришлось выслушивать упреки матери – зачем добровольно пошел на военную службу, может быть, достался бы дальний жребий...» [11, с. 15]. Неабходна дадаць, што паступленне ў армію на некалькі гадоў забірала з сям'і працаздольнага мужчыну, а гэта для невялікай сялянскай сям'і магло быць адчувальным. У дадзенай сітуацыі такія адносіны да ваеннай службы з боку родзічаў і суседзяў прыводзілі да аналагічнага ўспрымання яе і часткай настаўнікаў, якія не выказвалі жадання служыць у імператарскай арміі.

Пасля аб'яўлення вайны адносіны асноўнай масы сялянскага насельніцтва да ваеннай службы карэнным чынам не змяніліся, нягледзячы на некаторы патрыятычны ўздым, які назіраўся ў гарадах. Неабходна адзначыць, што дадзеная акалічнасць знаходзіць пацвярджэнне і ў данясеннях мясцовых улад, якія датычацца правядзення мабілізацыі ў асобных паветах. Так, Гарадоцкі ўездны ісправнік у сваім рапарце аб падзеях мабілізацыі 19 ліпеня (ст. стылю) 1914 года адзначае, што ніжнія чыны і ратнікі апалчэння падчас пагромаў вінных крам адносіліся «... совершенно равнодушно к угрозам действия и даже оружия, заявляя, что «умирать на родине даже еще и лучше»...» [15, л. 276]. Агульны настрой трывожнасці і чакання не мог не паўплываць на ўспрыманне настаўнікамі Першай сусветнай вайны.

Але ў той жа час наяўнасць адукацыі давала магчымасць больш крытычна ацэньваць абставіны і рэагаваць на іх. Важна адзначыць, што для сялян была характэрна «тутэйшасць», калі іх светапогляд абмяжоўваўся звычайна ўласнымі праблемамі і не выходзіў за межы свайго павета. Пакуль ваенныя дзеянні разгортваліся ў найбольш заходніх Прывісленскіх губернях, яны ўспрымаліся як нешта далёкае, і толькі пасля нямецкага наступлення 1915 года вайна атрымала больш акрэсленыя формы для сялянскай свядомасці. Але пры гэтым дамінавала ўспрыманне вайны як яшчэ адной дадатковай павіннасці, якая спаганялася з сялян у форме павелічэння рэквізіцый і пашырэння фартыфікацыйных работ, што выклікала ў іх незадавальненне [16, л. 195; 17, л. 5]. Толькі тая частка сялян, якія вымушаны былі пакінуць свае дамы і стаць бежанцамі, убачылі сапраўдныя жахі вайны.

Што тычыцца настаўнікаў, то для многіх з іх вайна ў першую чаргу была сусветнай падзеяй, якая зрабіла ўплыў на развіццё ўсёй Імперыі. Дадзеныя адносіны асабліва былі характэрнымі для тых настаўнікаў, хто з’яўляўся прыхільнікам ідэй беларускага нацыянальнага адраджэння. У гады вайны дзеячы беларускага нацыянальнага руху гуртаваліся вакол рэдакцыі газеты «Наша ніва», якая бачыла сваю аўдыторыю ў асяроддзі беларускіх сялян і вясковай інтэлігенцыі [18, с. 43, 78]. Пры гэтым неабходна ўлічваць той факт, што значную частку апошняй складалі настаўнікі, якія выйшлі з сялянскага саслоўя. Менавіта яны мелі адпаведны ўзровень адукацыі не толькі для ўспрымання ідэй, якія адлюстроўваліся на старонках газеты, але і для распаўсюджвання іх сярод мэтавай аўдыторыі «Нашай нівы» – сялян. У гэтых умовах ідэі «Нашай нівы» значна паўплывалі перш за ўсё на свядомасць настаўнікаў, асабліва вясковых, што ў сваю чаргу адлюстравалася на іх адносінах не толькі да вайны, але і да ваеннай службы.

Аналізуючы адносіны газеты «Наша ніва» і беларускага нацыянальнага руху да сусветнай вайны, можна заўважыць, што яны насілі антываенны характар. Гэта яскрава бачна ў шэрагу артыкулаў, якія з’явіліся ў газеце ў 1914–1915 гадах. Так, напрыклад, у артыкуле «Першы месяц вайны», надрукаваным у «Нашай ніве» ў жніўні 1914 года, адзначаецца: «Прынесла вайна мала чаго вясёлага, хіба толькі тое, што людзі добра глянулі ёй у вочы і добра пазналі, што такое агульна чалавечае няшчасце, якое, каб не варочалася ніколі...» [14, с. 87]. Відавочна, што антываенны характар публікацый выклікаў сярод яе чытачоў, у першую чаргу інтэлігенцыі і настаўнікаў, негатыўныя адносіны да сусветнай вайны і тых, хто яе развязаў і вядзе. У такіх умовах антываенны характар, які насіў беларускі нацыянальны рух, уплываў на значную частку настаўніцтва, асабліва вясковага, і выклікаў адмоўныя адносіны да воінскага абавязку і непасрэдна вайны. Пры гэтым апошняя ўспрымалася імі пераважна як з’ява сусветнага маштабу, якая выклікала разбурэнні і гібель мільёнаў людзей не толькі ў Расійскай імперыі, але і ва ўсім свеце.

У гэтых умовах антываенная пазіцыя, якой прытрымлівалася газета «Наша ніва», зрабіла значны ўплыў на беларускае вясковае настаўніцтва, якое ў сваю чаргу даносіла антываенныя ідэі да сялян. Пры гэтым у некаторых выпадках настаўнікі адкрыта заклікалі сялян да невыканання воінскага абавязку. Так, напрыклад, у справе Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення па абвінавачванні настаўніка школы граматы Т. Мішчанкі адзначаецца: «Т. Я. Мищенко – учитель грамоты из крестьян д. Ламы, Полоцкого уезда, Витебской губернии, белорус ... ныне рядовой 136-го пехотного запасного батальона, обвиняется в агитаци в с. Чайках, среди собравшихся крестьян на ярмарку, призывая их к неуплате повинностей и неисполению воинской повинности...» [19, л. 1].

Такім чынам, адносіны беларускага настаўніцтва да ваеннай службы і вайны не могуць характарызавацца як станоўчыя. Значная колькасць настаўнікаў і навучэнцаў настаўніцкіх навучальных устаноў не імкнуліся трапіць у склад дзеючай арміі. Прычыны дадзенай з’явы заключаліся не толькі ў характары зместу расійскага воінскага статута, дзе змяшчаўся шэраг ільгот для настаўнікаў. Нягледзячы на магчымасць адтэрміноўкі абавязковай ваеннай службы для настаўніцкіх кадраў, якая прадугледжвалася «Статутам аб воінскай павіннасці», яна была важным, але не асноўным фактарам, які выклікаў адмоўныя адносіны значнай колькасці настаўнікаў з беларускіх губерняў да ваеннай службы і вайны ў цэлым. Галоўныя прычыны ўказанай з’явы знаходзяцца ў сферы менталітэту і цесна звязаны з узроўнем адукацыі.

Іншымі словамі, значная колькасць беларускіх настаўнікаў, асабліва вясковых, па паходжанні былі сялянамі, і ў гэтых умовах у іх светапоглядзе прысутнічалі элементы сялянскага менталітэту, што адлюстроўвалася і на ўспрыманні імі воінскага абавязку. Для сялян ваенная служба была павіннасцю, якую яны выконвалі без ахвоты. З пачаткам вайны іх адносіны не змяніліся, а пазней пачалі набываць антываенны характар. У такіх умовах дадзеныя абставіны ўплывалі на негатыўнае ўспрыманне настаўнікамі ваеннай службы, а пазней і вайны.

У той жа час значная частка беларускага настаўніцтва падтрымлівала ідэі беларускага нацыянальнага руху, якi ў той час канцэнтраваўся вакол газеты «Наша ніва». Апошняя ў сваю чаргу займала антываенную пазіцыю, што адлюстроўвалася на адносінах настаўнікаў з беларускіх губерняў да Першай сусветнай вайны як глабальнай катастрофы, якая вядзе да разбурэнняў і гібелі вялікай колькасці людзей.

## Літаратура


1. Обзор Минской губернии за 1913 год / Издание Минского губернского статистического комитета. – Минск: Губернская типография, 1914. – 72 с.
2. Обзор Виленской губернии за 1912 год. – Вильна: Губернская типография, 1913. – 100 с.
3. Отчет о состоянии учебных заведений и учреждений Виленского учебного округа за 1914 год. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1915.
4. С н а п к о ў с к а я, С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С. В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 1998. – 192 с.
5. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2008. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 519 с.
6. Отчет попечителя Виленского учебного округа о состоянии учительских институтов и учительских семинарий за 1914 год. – Вильна: Типорафия А. Г. Сыркина, 1915.
7. Церковные школы Российской империи к 1913 году. Статистические сведения. – СПб.: Синоидальная типография, 1914. – 29 с.
8. К р а в ц о в, А. И. Педагогическое образование в Белоруссии в дооктябрьский период / А. И. Кравцов // Ученые записки. Минский пед. ин-т иностранных языков. – 1958. – Вып. 1. – С. 3–63.
9. Г о л о в и н, Н. Н. Военные усилия России в Мировой войне / Н. Н. Головин. – М.: Жуковский: Кучково поле, 2001. – 434 с.
10. Свод законов Российской империи: издание 1915 года. – Петроград: Государственная типография, 1915. – Т. 4: Устав о воинской повинности. – 1915. – 293 с.
11. О с ь к и н, Д. П. Записки солдата / Д. Оськин. – М.: Федерация, 1929. – 160 с.
12. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Фонд 2499. – Воп. 1. – Спр. 300. Переписка с Департаментом Полиции и уездными исправниками о разыскиваемых лицах.
13. Народное образование в Виленском учебном округе: приложение к Циркуляру по Виленскому учебному округу. – 1915. – № 6. – Вильна: Типография А. Г. Сыркина, 1915. – 80 с.
14. Ц у б а, М. В. Беларускі нацыянальны рух у перыяд паміж дзвюма дэмакратычнымі рэвалюцыямі (1907–1917 гг.) / М. В. Цуба. – Брэст: Лаўроў, 2003. – 195 с.
15. НГАБ. – Фонд 1416. – Воп. 3. – Спр. 20193. Рапорты уездных исправников о происшествиях по Витебской губернии за июль месяц 1914 г.
16. НГАБ. – Фонд 1416. – Воп. 3. – Спр. 20257. Наряд на рабочих и подвод для фортификационных работ (август–декабрь 1915).
17. НГАБ. – Фонд 1416. – Воп. 3. – Спр. 20414. Переписка о самовольном уходе рабочих с лесных работ (июнь–ноябрь 1916).
18. У н у ч а к, А. У. «Наша ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906–1915 гг.) / А. У. Унучак. – Мінск: Беларус. навука, 2008. – 184 с.
19. НГАБ. – Фонд 2499. – Воп. 2. – Спр. 25. Дело о производстве дознания по обвинению бывшего учителя школы грамоты в д. Ламы, Александровской вол., Полоцкого уезда Мищенко Т. Я. в агитации крестьян д. Чайки той же волости, Себежского уезда к неуплате податей и неисполению воинской повинности.


*A. A. ZYABKO*

**BELARUSSIAN TEACHERS ATTITUDE TO THE MILITARY SERVICE BEFORE AND DURING THE YEARS OF THE FIRST WORLD WAR**

## Summary

The article deals with the problem of Belarusian teachers attitude to the military service in Russian imperial army and their perception of the First World War. Author has pointed out the reasons, which called the negative attitude of teachers from Belarusian provinces to the military service. It has been determined how ideas of the Belarussian national movement have influenced on the teacher's perception the First World War.

*УДК 930. 2 (476)*

*А. Э. ФІРЫНОВІЧ*

# «ЖАНОЧЫ ФАКТАР» У ПАЎСТАННІ 1863–1864 гг.: ІНФАРМАЦЫЙНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ БЕЛАРУСКІХ АРХІВАСХОВІШЧАЎ

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 07. 05. 2010)*

Даследаванне паўстання 1863–1864 гг. – адна з самых цікавых і складаных праблем гісторыі Беларусі XIX ст. – уваходзіць у сферу інтарэсаў не толькі гісторыкаў, але і літаратараў, філосафаў, палітолагаў, рэжысёраў і мастакоў. Нягледзячы на шматгадовае і markdown рознабаковае вывучэнне тэмы, многія яе пытанні застаюцца дыскусійнымі. Гістарыяграфічны аналіз паказвае, што асабліва багатымі на супярэчлівыя канцэпцыі з’яўляюцца нацыянальны і сацыяльны аспекты праблемы. Сукупнасць ацэнак у плане нацыянальнай матывацыі кіраўнікоў і сацыяльнай базы ўдзельнікаў разыходзіцца ад успрымання паўстання 1863–1864 гг. як «польскай шляхецка-клерыкальнай смуты» да «беларускага нацыянальна-вызваленчага або сялянска-рэвалюцыйнага руху» [26; 31].

Вызначаная расстаноўка прыярытэтаў не толькі сама па сабе патрабуе глыбокай навуковай распрацоўкі на шырокай базе крыніц, але і пакідае за межамі праблемнага кола некаторыя іншыя яго сутнасныя праявы. Так, гендэрны фактар як прадмет даследавання ўвогуле выпаў з поля зроку навукоўцаў. У беларускай і замежных гістарыяграфіях няма спецыяльных прац, якія б асвятлялі ўдзел жанчын у падзеях 1863–1864 гг. Можна толькі казаць пра ступень прысутнасці гэтага сюжэта ў працах, прысвечаных паўстанню 1863–1864 гг. [21]. Праўда, у апошнія гады беларускімі, расійскімі і асабліва польскімі даследчыкамі пачалося выданне мемуарных і эпісталярных сведчанняў [22; 23; 29]. Зыходзячы з гэтага, мэтай артыкула з’яўляецца аналіз інфармацыйнага патэнцыялу дакументальнага комплексу беларускіх архівасховішчаў у раскрыцці ступені прысутнасці «жаночага фактару» ў гістарычных рэаліях 1863–1864 гг.

Айчынныя архівасховішчы змяшчаюць значную колькасць дакументальных звестак, якія адлюстроўваюць такія важныя моманты, як ролю прадстаўніц слабага полу ў палітычнай дзейнасці пачатку 60-х гг. XIX ст. непасрэдна на тэрыторыі Беларусі, наяўнасць разнастайных форм іх антыўрадавай барацьбы, матывацыю актыўнасці, віды і ступень пакаранняў.

«Жаночы фактар» улічвалі і паўстанцкае кіраўніцтва, і ўрад Расійскай імперыі. Выразнае разуменне першымі ролі жанчыны як апоры, памагатай і аднадумцы для мужчыны ў нялёгкай справе барацьбы за волю Радзімы ілюструе адозва «Літвінкі і Русінкі!». У ёй з асаблівай сілай гучаць словы закліку да прабуджэння жаночай ініцыятыўнасці і падтрымкі: «Какая мать, сестра, жена, подруга, коханка, дочь – не найдет пути к сердцу мужчины её любящаго? Воодушевите же их! воспламените, увлеките их! Вам будет вся честь и слава безсмертная! отчизна Вам будет обязана особою благодарностию...» [25, арк. 93]. Звароты да маці, жонак, дачок і сясцёр сустракаюцца таксама ва ўскоснай агітпрадукцыі – песнях, вершах, малітвах («Народны гімн», «Гімн у памяць загінуўшых у Варшаве 27 лютага 1861 г.» і г. д.) [25, арк. 59–60].

З іншага боку, прадстаўнікі царскай адміністрацыі спрабавалі нейтралізаваць дзейнасць стэрэатыпа жанчыны-натхняльніцы, што яскрава бачна з іх распараджальнай і справаздачнай дакументацыі. У паведамленні дзяжурнага штаб-афіцэра Віцебска ад 27 ліпеня 1864 г. звяртаецца ўвага на дзейнасць полек-каталічак, якія адважна адпраўляюць сваіх мужчын у атрады, пастаянна моляцца за іх і не сумняваюцца ў перамозе, што надае сілы паўстанцам, а ў змешаных шлюбах поўнасцю апалячваюць рускіх мужоў [5, арк. 2]. Таму па загаду міністра ўнутраных спраў ад

14 жніўня 1864 г. № 8827 шлюбы паміж рускімі афіцэрамі, чыноўнікамі і мясцовымі каталічкамі ставіліся пад кантроль урада, а аднаканфесійныя (праваслаўны-праваслаўная) заахвочваліся дадатковым службовым адпачынкам [5, арк. 3].

Прасачыць колькасць асоб жаночага полу, датычных да паўстання 1863–1864 гг., вельмі складана, бо статыстычныя даныя такога плана адсутнічаюць. Некаторыя дакументы змяшчаюць алфавітныя спісы асуджаных і пакараных па палітычных справах за 1863–1865 гг., спісы высланых ва ўнутраныя губерні Расійскай імперыі, маёмасныя ведамасці канфіскаваных зямель з указаннем іх уладальнікаў. У спісах сустракаюцца і жаночыя прозвішчы. Гэтыя крыніцы нельга разглядаць як абсалютна аб'ектыўныя, бо іх большасць не раскрывае прычыны пакарання і кранае толькі землеўласніц, прадстаўніц памешчыцка-дваранскага саслоўя. Так, «Списки лицам, причастным к делам по мятежу, предназначенными военными судами к административным взысканиям и отправленным на жительство в отдаленные губернии, имущество коих подлежит секвестру» за перыяд з 1 мая 1864 г. да 1 лютага 1865 г.* сведчаць, што з агульнай колькасці асуджаных з беларуска-літоўскіх зямель (299 чалавек) доля жанчын складала каля 9,7%, або 29 асоб [4, арк. 20–118] (табліца). Калі параўнаць з колькасцю жаночага насельніцтва на гэтай тэрыторыі ў 1863 г. (каля 1 млн 800 тыс. жыхарак), то атрымоўваецца зусім невялікая лічба – усяго 0,002% [3]. Але трэба ўлічваць, што гэтыя даныя паказваюць толькі колькасць пакараных заможных абывацелек. Зразумела, яна некалькі павялічыцца пры далучэнні сюды беззямельных і немаёмных прадстаўніц іншых саслоўяў, а таксама ўвогуле непрыцягнутых да адказнасці.

**Колькасны склад жанчын, прыналежных да спраў паўстання 1863–1864 гг., прызначаных ваенна-палявымі судамі да адміністрацыйных спагнанняў і адпраўленых на жыхарства ў аддаленыя губерні, маёмасць якіх падлягала секвеструзаперыяд з 1 мая 1864 г. да 1 лютага 1865 г.**

| Губерня | 1 мая – 1 чэрвеня 1864 г. | | | 1 ліпеня – 1 жніўня 1864 г. | | | 1 жніўня – 1 верасня 1864 г. | | | 1 верасня – 1 кастрычніка 1864 г. | | | 1 кастрычніка 1864 г. – 1 лютага 1865 г. | | | 1 мая 1864 – 1 лютага 1865 г. | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Колькасць асуджаных | У т. л. жанчын | % | Колькасць асуджаных | У т. л. жанчын | % | Колькасць асуджаных | У т. л. жанчын | % | Колькасць асуджаных | У т. л. жанчын | % | Колькасць асуджаных | У т. л. жанчын | % | Колькасць асуджаных | У т. л. жанчын | % |
| Віленская | 19 | 7 | 37 | 23 | 2 | 9 | 5 | 1 | 20 | 37 | – | 0 | 7 | – | 0 | 91 | 10 | 11 |
| Віцебская | 4 | 3 | 75 | 4 | – | 0 | 7 | 1 | 14 | 3 | – | 0 | – | – | 0 | 18 | 4 | 22 |
| Гродзенская | 8 | 2 | 25 | 18 | 4 | 22 | 12 | 2 | 17 | 5 | – | 0 | 23 | 1 | 4 | 66 | 9 | 14 |
| Магілёўская | 7 | – | 0 | 18 | 1 | 6 | – | – | 0 | 12 | – | 0 | 4 | – | 0 | 41 | 1 | 2 |
| Мінская | 5 | 1 | 20 | 27 | 1 | 4 | 6 | 1 | 17 | 35 | 2 | 8 | 10 | – | 0 | 83 | 5 | 6 |
| Усяго | 43 | 13 | 30 | 90 | 8 | 7 | 30 | 5 | 16 | 92 | 2 | 2 | 44 | 1 | 2 | 299 | 29 | 10 |

З а ў в а г а: Складзена па алфавітных спісах са справы «Дело о лицах, принимавших участие в политических беспорядках по здешней губернии 13 мая 1864 – 21 апреля 1867 г.» // НГАБМ. – Фонд 1416. – Воп. 4. – Спр. 11416. – Арк. 20–118.

У фондах павятовых следчых камісій, канцылярый губернатараў НГАБ у г. Мінску і НГАБ у г. Гродне маецца дастаткова шырокае кола спраў, распачатых над жанчынамі за палітычную нядобранадзейнасць, на што неабходна звярнуць увагу пры комплексным вывучэнні гісторыі паўстання 1863–1864 гг. З вылучанага комплексу крыніц (судовыя заключэнні, паказанні арыштаваных, паведамленні, рапарты і справаздачы адміністрацыі Расійскай імперыі) вынікае, што роля натхняльніцы была неадзінай функцыяй, якую яны выконвалі.

Грамадзянскія губернатары і ваенныя начальнікі ў сваіх паведамленнях, рапартах прыводзяць даволі шмат фактаў самага простага спосабу ўдзелу і асабліва папулярнага сярод жанчын – дэмаршу. Ён выяўляўся праз нашэнне рэвалюцыйных знакаў і адзення, спяванне забароненых гімнаў, прысутнасць на жалобных набажэнствах. Асноўнымі відамі вопраткі былі чорныя сукенкі і капялюшыкі з белымі султанкамі, спражкі з выявамі злучанага герба Польшчы і ВКЛ, пераламанага крыжа ў цярновым вянку. Некаторыя асаблівым спосабам падстрыгалі сабе валасы. За такія прычоскі былі аштрафаваны жонка паручніка Яланцова і жонка прапаршчыка Пазнанскага [5, арк. 3].

* Храналагічныя рамкі спісаў вызначаны перыядам ажыццяўлення этапавання асуджаных яшчэ ў 1863 – першай палове 1864 г. высылкай у аддаленыя губерні Расійскай імперыі.

Распаўсюджанасць дэмаршаў на тэрыторыі Беларусі пацвярджае наяўнасць забараняючага іх распараджэння Віленскага Ваеннага, Ковенскага, Гродзенскага і Мінскага генерал-губернатара з падпарадкаваннем Віцебскай і Магілёўскай губерняў ад 12 чэрвеня 1863 г. Згодна з гэтым дакументам, за жалобны ўбор пры затрыманні першы раз з жанчыны спаганялі штраф у памеры 25 руб. серабром, за другі – 50, на трэці раз – арышт, а іх мужоў звальнялі са службы [7, арк. 2]. Жанчыны, у сваю чаргу, ішлі на хітрасць. Яны нашывалі каляровыя паскі на чорныя сукенкі, насілі хустачкі з такімі ж стужачкамі, завязвалі іх абавязкова пад падбародак. Выглядала ўсё як бы маскарад насуперак уладзе. Падобнае фразёрства стала зачэпкай для абвінавачвання ў «спачуванні мецяжу» магілёўскай дваранкі Аляксандры Рагоўскай, бо яна была апранута «в траурное платье серого цвета с каймой обшитою внизу синего Польского цвета, шерстяную мотиль и при черном уборе головы» [7, арк. 66]. Таму распараджэннем генерал-губернатара М. М. Мураўёва ад 4 лістапада 1863 г. усталёўваліся правілы для жаночай вопраткі: чорныя капялюшы патрабавалі ўпрыгожваць кветкамі, сукенкі – каляровымі пацеркамі і стужкамі. Чорныя вуалі, пальчаткі, шалі, белыя і чорныя пер'і забараняліся ўвогуле. Каптуры маглі быць чорныя на любой падкладцы, але толькі не на белай. Ужыванне спалучэння чорнага і белага лічылася рэвалюцыйным сімвалам [30, арк. 100].

Асноўную масу ў патрыятычных набажэнствах таксама складалі прадстаўніцы слабага полу. Эмацыянальная ўзрушанасць была настолькі вялікай, што яны не баяліся прысутнай паліцыі, якая закрывала і вартавала касцёлы. Як успамінае Марыя Казерадская, прыйшоўшыя маці з дзецьмі кленчылі перад зачыненымі дзвярыма, маліліся і спявалі «Яшчэ Польшча не загінула» і «З дымам пажараў» [29]. У мемуарах Гелены Скірмунт ёсць звесткі, што яны спецыяльна заходзілі на хоры, сяброўка іграла ў час імшы на аргане матывы патрыятычных песень, хаця спяваліся рэлігійныя, а па начах шылі жалобныя харугвы [22].

Пашыранай падставай у прыцягненні да судовай адказнасці жанчын было захаванне і распаўсюджванне імі забароненай літаратуры. Прычым ступень пакарання вар'іравалася ад наладжвання паліцэйскага кантролю да ссылкі. За дваранкамі Бабруйскага павета сёстрамі Палінай і Юзэфай Нарэвіламі быў усталяваны таемны нагляд за наяўнасць у іх доме тэкстаў вершаў і песні, якія пакінуў ім «палітычны злачынец» Гарбачэўскі. На думку паліцыі, гэта пацвярджала «расположение их к нынешним беспорядкам» [8]. У памешчыцы Кудзіновіч за знойдзеныя ў яе кнігі і брашуры антыўрадавага зместу канфіскавалі маёнтак Відагошчы. Дваранка Аршанскага павета Багуміла Вайцяхоўская была выслана ў Сібір за неаднаразовае захоўванне ў сябе рэвалюцыйных пракламацый, папер рэвалюцыйнага ўрада, інструкцый, тапаграфічных карт заходніх губерняў, чыстых бланкаў з пячаткамі Магілёўскага і Віцебскага ваяводства і подпісам Людвіга Сякеры [9].

Пад татальны кантроль трапляла асабістая перапіска. Па словах Марыі Казерадскай, рэвізіі дамоў праводзіліся штодня, асабліва ў асоб, за якімі вялося назіранне. Забіралася ўся хатняя літаратура, асабістыя лісты ад родных і блізкіх. Любое выказванне магло стаць падазроным і даказаць яго бязвінны сэнс было немагчыма [29]. Так, сёстры Парадоўскія і іх сяброўка дваранка Кобрынскага павета Аляксандра Дубнякова, аштрафаваныя на 100 руб., абвінавачваліся ў непрыхільнасці да Расійскага ўрада за ўжыванне пры апісанні бягучых падзей фразы: «когда была баталия, то после того москали сожгли одно поместье, награбив все, что было, продавали на базаре, но даже и жиды и те не хотели ничего покупать» [10, арк. 7]. У лістах памешчыцы Яўгеніі Бельскай да тытулярнага саветніка Міхаіла Касоўскага палітычна нядобранадзейнымі падаліся жандару словы аб поспехах і перажываннях за Замойскага, які ездзіў у Пецярбург [12]. Са следчай справы дваранкі Кацярыны Шэлюты бачна, што канфіскацыя маёмасці была здзейснена за распаўсюджванне ёю палітычна абуральных вершаў і лістоў, а менавіта «Гутаркі старога дзеда». Кацярына Шэлюта прыходзіла па справах да суседзяў і непрыкметна пакідала скруткі папер: у прыстава Вартпоўскага – на канапе, у габрэя Юдкі Каплана – на каміне і г. д. Таксама знайшлі ў яе лісты наступнага зместу: «Г-жа Екатерина, спешу уведомить Вас, что я получил письмо от любезного нашего узника через верные руки, пишет много интересных вещей, касающихся наших общих дел; благодарит за попечение, которое Вы ему оказали, просит Вас быть спокойною и там есть польские сердца. При свидании сообщу много вещей для общей радости поляков.

Писать этого нельзя. Остаюсь другом до гроба» [11, арк. 82]. З гэтага вынікае, што дваранка Кацярына Шэлюта вяла больш шырокую дзейнасць. Пры рэгулярных вобысках у жаночых пакоях сустракаліся не толькі забароненая літаратура і карэспандэнцыя, а таксама партрэты, фотаздымкі, часцей за ўсё Касцюшкі, порах і зброя. Напрыклад, ва ўладальніцы карчмы ў г. Кобрыне Хухлінскай выявілі сталовую бялізну з малюнкамі Касцюшкі, якую яна набыла ад памешчыцы Мальчэўскай [13]. А ў дваранкі Бакіноўскай на двары пад калодаю апынулася 1¼ фунта свінцу, якія, па яе словах, утрымлівала без усякай зламыснай мэты. Прыслуга ж сцвярджала, што гаспадыня давала яго «нейкім панам». Віцебская купчыха 2-й гільдыі Віта Гірысава Вітэнберг наклікала на сябе недавер павелічэннем у два разы з восені 1863 г. закупкі сякер, іх кошту і змяненнем форм. Сама яна патлумачыла гэта адкрыццём новай лаўкі ў Полацку. Аднак сялянепастаўшчыкі ўказвалі на яе сакрэтныя дзеянні, устанавіць якія дакладна не ўдалося. Тавар арыштавалі, а за купчыхай усталявалі паліцэйскі нагляд [20].

Рапарты мясцовых ваенных начальнікаў сведчаць пра жанчын-кур'ерак, сувязных, інфарматарак і агітатарак. Дзве дачкі Слуцкага павятовага скарбніка Расудоўскага праходзілі па справе агітацыі радавога Арлоўскага пяхотнага палка Дзяніса Конуса. Сустрэўшы яго на дарозе і даведаўшыся, што ён з Царства Польскага, казалі, каб браў сваю стрэльбу і бег да сваіх братоў у лес. Калі ж ён адмовіўся, то атрымаў пагрозу, што «придется держать ответ перед Богом за не оказанную помощь братьям, которых в лесу очень много» [18, арк. 11]. Дваранка Полацкага павета Марыя Свіршчэўская ў час жніва прыходзіла да сялян і, паказваючы ім нейкую кнігу, казала: «вот простой мужик Яська пишет, что если все крестьяне пойдут на защиту Польши и будут стараться освободить ее из-под власти России, то в то время не будут платить податей, а также и отбывать рекрутской повинности и все будут пользоваться дворянскими правами и помещики подарят им землю, которою ныне крестьяне пользуются» [2, с. 522]. Размова не дала станоўчага эфекту, бо сяляне шмат чаго не зразумелі, і таму Марыі Свіршчэўскай прысудзілі ўсяго штраф у памеры 50 руб.

Даволі прыцягальнымі для абывацелек былі разважанні ў вузкіх колах пра лёс Радзімы. Дваранка г. Полацка Чашніцкая ў гасцях часта гутарыла з жонкамі чыноўнікаў, службоўцаў аб паўстанні, наведвала дамы сем'яў палітычных арыштантаў, аказвала ім матэрыяльную дапамогу [15]. Павел Агароднікаў, член рэвалюцыйнага Камітэта Арміі і Афіцэраў, у сваім дзённіку ўспамінае прозвішча нейкай Драінскай, якая пісала палітычным вязням лісты і інфармавала, што новага ў справе вызвалення роднай зямлі [23]. Судоваму разгляду падвяргалася перапіска палітычнага арыштанта Беляковіча з сялянкай яго былога маёнтка Разаліяй Насевічавай. Разалія выступала пасрэднікам паміж ім і братам Аркадзіем у грашовых справах і перасылцы карэспандэнцыі астатнім родным, што доўгі час не выклікала недаверу з боку ўлад [16].

Згодна з паказаннямі членаў паўстанцкіх атрадаў ваенна-следчым камісіям, патрыёткі нярэдка выконвалі функцыю забеспячэнцаў. Яны дастаўлялі ў атрады правіянт і адзенне. Марыя Казерадская ўзгадвае, што ў чэрвені 1863 г. «цэлы дзень і ноч пані і паненкі і мы, дзеці, правялі на кухні, ляпілі пірагі, выраблялі пляцкі і абаранкі, пяклі хлеб і булкі. Залівалі бутлі з кавай і малаком, смятанай, мёдам, півам, рыхтавалі папяросы і тытунь, каб пазбавіць гэта ад кацапаў... Разам з пані Вандай садзілі на воз інваліда, якога апраналі ў маскоўскі мундыр і адвозілі ўсё» [29, с. 116]. Павел Агароднікаў выказваў у сваіх мемуарных запісах падзяку пані Радзіцкай, якая мела знаёмых жандараў у Мадленскай крэпасці і перасылала вязням раз у два тыдні чыстую бялізну [22]. Дваранка Юлія Баранская і дзве яе дачкі падазраваліся ў нарыхтоўцы правіянту для «мяцежнікаў», жонка двараніна Лепельскага павета Міхаіла Сталыгвы – у падрыхтоўцы бялізны для паўстанцкага атрада, да якога належалі яе браты Драздовічы. Такое ж абвінавачванне выстаўлялася дачцэ лясніка Кобрынскага павета Канарскага. Памешчыцу Ізабелу Цеханавецкую выслалі ў Варонежскую губерню за нарыхтоўку правіянту, свінцу і пораху, падрыхтоўку коней для атрада Траўгута [17].

Звестак аб удзеле жанчын са зброяй у руках не выяўлена. Аднак існавалі выпадкі членства жанчын у ваенных атрадах у якасці сясцёр міласэрнасці. Так, Стэфан Брукчынскі ўспамінае пані Цвекаву, якую сам бачыў у агні падчас бою, «яна выцягвала раненых, сама складала іх на павозкі і прабіралася да рускіх дактароў пасля бітвы, даставала патрэбныя лекі» [1, с. 193]. Нярэдка дапа-

мога сясцёр міласэрнасці, якая была дазволена афіцыйнымі ўладамі (праца ў шпіталях, дапамога службоўцам астрога ў прыгатаванні ежы, мыцці бялізны), насіла дваякі тайны характар. Дзяўчына Воінава працавала ў Гродзенскім шпіталі Ромера, на свой страх і рызыку пад прозвішчамі гарадскіх жыхароў лячыла параненых паўстанцаў [24, арк. 34]. У Пінскім павеце сястра міласэрнасці, памешчыца Цэліна, не проста клапацілася пра ежу арыштантаў, а з кожным сваім прыходам падбухторвала вязняў да ўнутрытурэмных маніфестацый. Прычым яе дзейнасць як прычына бунтаў доўгі час не заўважалася ваенным начальнікам [19, арк. 60].

Аказвалася і проста маральная дапамога вязням, ссыльным з боку патрыятычна настроеных дваранак, памешчыц. Параўнаць яе можна з акцыямі дабрачыннасці. Дачка харкаўскага памешчыка М. Смольская добраахвотна прыехала ў Нарым, месца ссылкі палітычных арыштантаў 1863–1864 гг., для арганізацыі вольнага часу зняволеных [21]. Памешчыца Пінскага павета скульптарка Гелена Скірмунт дачыненне да падзей 1863–1864 гг. выказала ў сваіх творах – крыжах з сімволікай аб'яднанай Польшчы і Літвы. Але ж і такія дзеянні маглі прывесці да пакарання. Дваранку Ватрашэўскую асудзілі на адзін год хатняга арышту за збор грошай на сімвалічны алтар у памяць аб былой моцы Айчыны [22].

Многія маладыя дзяўчаты суправаджалі вязняў пры перавозцы іх з аднаго месца зняволення ў другое. Такія ўспаміны змяшчаюцца ў дзённіку Марыі Казерадскай, калі ў верасні 1863 г. «вывозілі партыю вязняў і пані Хана ўбралася ў шэрую сукенку і грубыя боты, узяла кій і ўвязала галаву хусткай і яшчэ з дзвюма іншымі панямі правялі партыю за Днепр» [29, с. 140]. Пра суправаджэнне вязняў з Магілёва ў Оршу згадвае ў сваіх лістах і дачка надворнага Магілёўскага саветніка Людвіка Шышкова Сафія. Іх сумесны шлях склаў 26 кіламетраў і салдаты не маглі нічога зрабіць [27, арк. 62].

Кіраўнікі паўстання разлічвалі на палітычную актыўнасць жанчын у арганізацыйнай дзейнасці. Паводле судовых паказанняў двараніна Станіслава Сільвестровіча і Сігізмунда Урублеўскага, кіраўніцтва стварыла «Камітэт жанчын». Па інструкцыі ён уключаў начальніка павета, рэферэнта апекі, старшыню-жанчыну і пяць членаў жаночага полу. У «Заключэнні Ваенна-Палявога Аўдытарыяту» пералічваюцца, запісаныя са слоў абвінавачанага Сільвестровіча, абавязкі членаў арганізацыі: «собирать складки в деньгах с женщин, живущих в уезде и наблюдать за тем, чтобы всякая, принадлежащая к складке, имела кроме того приготовленное белье для шаек. Деньги ... целью их было вспомоществование бедных семейств, из которых один или более членов ушло в шайку» [28, арк. 74]. У Гродзенскім камітэце пасаду старшыні займала спадарыня Ромер. Затым яе змяніла жонка былога абавязковага члена Загаду Грамадскага Прызрэння Юзафа Багаткі. У Гродзенскай следчай камісіі памешчыца Гродзенскага павета Алена Паняхвіцкая праходзіла па справе вярбоўкі людзей у атрады, Тэафілія Свярбжынская – за ўтрыманне ў маёнтку «мяцежнай паштовай станцыі», а Тэафілія Малакоўская – нават як начальнік акругі [24, арк. 43].

Са справаздач ваенных губернатараў бачна, што многія жанчыны далучаліся прадстаўнікамі царскай адміністрацыі да ўдзельнікаў паўстання за дзейнасць сваіх мужоў, сыноў. Напрыклад, памешчыцу Свентаржыцкую пазбавілі яе маёнтка Чаркасы ў Мінскім павеце за палітычную актыўнасць мужа. Зыходзячы з агульнай сістэмы карных мер урада Расійскай імперыі, знаходзіліся і іншыя падставы для праследавання па палітычных матывах: Юзэфіна Макавецкая – за пераезд атрада праз яе маёнтак, памешчыца Эмілія Грабніцкая – за аднаразовае частаванне паўстанцаў, памешчыца Чачотава – за ўжыванне польскай мовы ў краме, памешчыца Лянгейм – за навучанне дзяцей граматыцы па польскіх падручніках, сялянка Агаф'я Барысава – за нараканні на праваслаўную веру і г. д. [24].

Такім чынам, выяўленая калекцыя архіўных матэрыялаў валодае даволі шырокай факталагічнай базай па тэме. Асабліва інфарматыўныя ў гэтым плане следчыя справы і паведамленні губернатараў. У іх найбольш поўна прасочваюцца формы ўдзелу, матывы, абгрунтаванне прызначанага пакарання. Рапарты і справаздачы змяшчаюць звесткі апісальнага характару: хто (прозвішча) і за што (сутнасць віны) прыцягнуты да адказнасці. На жаль, у беларускіх архівасховішчах амаль не прадстаўлены крыніцы аб колькасным, нацыянальным і сацыяльным складзе ўдзельніц паўстання.

Зыходзячы з крытычнага аналізу вылучанага дакументальнага збору, можна прыйсці да высновы аб відавочным дачыненні жаночай часткі насельніцтва да падзей 1863–1864 гг. Аднак ступень актыўнасці і ўсведамленне жыццёвых рэалій былі неадназначнымі. Адны з іх са спачуваннем, добраахвотна рознымі спосабамі выказвалі сваю салідарнасць і дапамагалі паўстанцам. Іншыя, пад уплывам карнай палітыкі ўрада Расійскай імперыі, цураліся ўсякіх праяў палітычнай дзейнасці, з бояззю і перасцярогай адносіліся да ўзброенай барацьбы мужоў, сыноў і братоў. Таму лагічна адзначыць у жаночым асяродку дзве катэгорыі: а) непасрэдныя ўдзельніцы і б) другарадныя. Непасрэдныя адносіны вылучаліся праз наступныя формы: а) дэмарш і фразёрства; б) кур'ерства; в) агітацыю; г) укрывальніцтва і канспірацыю; д) матэрыяльнае забеспячэнне антыўрадавага руху; е) медыцынскую апеку ў шпіталях і атрадах; ж) дабрачыннасць; з) членства ў паўстанцкіх арганізацыях. Самымі пашыранымі былі першыя пяць. Другарадны характар адлюстроўваўся часцей за ўсё праз прыпісванне прыналежнасці да «палітычных беспарадкаў» за антыўрадавую дзейнасць сваякоў, ужыванне польскай мовы і нацыянальнай сімволікі. Як правіла, супраць іх выкарыстоўваліся эканамічныя спагнанні (секвестр і канфіскацыя маёмасці, штрафы), прычым градацыя ступені цяжкасці пакарання не абгрунтоўвалася. Зразумела, што заангажаванасць жанчын у падзеях 1863–1864 гг. нельга назваць масавай. Але ва ўмовах агульнага недаверу і татальнага кантролю грамадства, жорсткай карнай палітыкі наяўнасць вышэйадзначаных форм жаночага ўдзелу ў паўстанні 1863–1864 гг. сведчыць аб тым, што яны не засталіся раўнадушнымі і абыякавымі да палітычнай сітуацыі ў краі ў пачатку 60-х гг. XIX ст.

### Літаратура


1. B r u k c z y ń s k i, S. Moje wspomnienie / S. Brukczyński. – Warszawa; Kraków: Gebethner i Wolff, 1908. – 225 s.

2. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии: сб. документов / редкол.: В. Дьяков (отв. ред.) [и др.]. – М.: Наука, 1965. – 586 с.

3. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэд. кал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 4: Беларусь у складзе Расійскай імперыі (канец XVIII–пачатак XX ст.) / М. Біч [і інш.]. – 2005. – 518 с.

4. Дело о лицах, принимавших участие в политических беспорядках по здешней губернии 13 мая 1864 – 21 апреля 1867 г. // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Мінску (НГАБМ). – Фонд 1416. – Воп. 4. – Спр. 11416.

5. Дело по предписанию командующего войсками Виленского военного округа об офицерах Витебского батальона внутренней стражи, женящихся на польках // НГАБМ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31449.

6. Дело о запрещении русским чиновникам жениться на польках // Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродне (НГАБГ). – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 417.

7. Дело о запрещении населению Могилевксой губернии носить траурную одежду и различные революционные знаки // НГАБМ. – Фонд 2001. – Воп. 2. – Спр. 25.

8. Дело об установлении негласного надзора полиции за дворянками Бобруйского уезда Юзефе и Полине Наревиллах // НГАБМ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1618.

9. Дело по предложению главного военного губернатора г. Витебска и Витебского гражданского губернатора, об исполнении конфирмации главного начальника края над политическими преступниками // НГАБМ. – Фонд 1416. – Воп. 4. – Спр. 11377.

10. Дело об аресте девиц Парадовской Марии и Дубняковой Александры за сочувствие польскому восстанию // НГАБГ. – Фонд 1. – Воп. 31. – Спр. 79.

11. Дело по обвинению дворянки Екатерины Шелюто в подбрасывании писем политического характера // НГАБГ. – Фонд 581. – Воп. 1. – Спр. 480.

12. Дело об установлении полицейского надзора за участниками восстания 1863 г., жителями Кобринского у. // НГАБГ. – Фонд 714. – Воп. 3. – Спр. 14.

13. Дело об обыске жены содержателя трактира в Кобрине Хухлинской на предмет обнаружения настольного белья с портретом Костюшки // НГАБГ. – Фонд 1. – Воп. 6. – Спр. 1282.

14. Дело о дворянке Марии Свирщевской, обвиняемой в распространении брошюры противоправительственного характера // НГАБМ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31558.

15. Дело о дворянках Чашницкой и Яковицкой, судимых за хранение прокламаций // НГАБМ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31594.

16. Дело о крестьянке Розалии Носевичевой, ведущей переписку с политическим преступником Беляковичем // НГАБМ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31578.

17. Дело о лишении всех прав состояния и ссылке на жительство в Томскую губ. помещика Цехановецкого с женой Изобеллой за участие в восстании 1863 г. // НГАБМ. – Фонд 3256. – Воп. 2. – Спр. 52.

18. Дело по обвинению дочерей Слуцкого уездного казначея Рассудовского в агитации рядового Орловского пехотного полка Конуса // НГАБМ. – Фонд 295. – Воп. 1. – Спр. 1592.

19. Дело по обвинению чиновников присутственных мест Пинского уезда в сочувствии и содействии восстанию // НГАБМ. – Фонд 296. – Воп. 1. – Спр. 52.
20. Дело по отношению Начальника Тверской губернии об арестованных в г. Ржеве заказанных Витебскою купчихою товарах // НГАБМ. – Фонд 1430. – Воп. 1. – Спр. 31692.
21. Ж и ж и н а, С. Г. История одной шкатулки / С. Г. Жижина // Революционная ситуация в России 1859–1861 гг.; редкол. М. В. Нечкина [и др.]. – М.: Наука, 1963 г. – с. 165–174.
22. З а л е с к і, Б. Ф. З жыцця літвінкі / Б. Ф. Залескі. – Мінск: Выд-ва В. Хурсіка, 2009. – 338 с.
23. O g o r o d n i k o w, P. Dziеnnik więźnia, 1862–1863 \ P. Ogorodnikow. – Warszawa: Państwowe Wydawnictwo naukowe, 1986. – 599 s.
24. Переписка Гродненского гражданского губернатора со следственной комиссией // НГАБГ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 36.
25. Письма генерала Мейера П. А. Валуеву и минскому архиепископу (черновики). Ноты польских религиозных песен, воззвания, статьи (черновики, копии, выписки) // НГАБМ. – Фонд 1418. – Воп. 2. – Спр. 1.
26. Повстанческое движение в Гродненской губернии 1863–1864 гг.: сб. документов / редкол.: Д. В. Карев (отв. ред.) [и др.]. – Брест: Академия, 2006. – 404 с.
27. Сведения вдовы Надворного советника Людвиги Людвиговой Шишко // НГАБМ. – Фонд 1418. – Воп. 1. – Спр. 13.
28. Сознания и чистосердечные признания политических преступников во всех делах и преступлениях // НГАБГ. – Фонд 3. – Воп. 1. – Спр. 40.
29. Ś w i d e r s k a, M. Dziеnnik małej patriotki (Maryjki Bohowityn Kozieradzkiej), 1860–1865 / M. Świderska. – Tarnowa: J. Pisz. – 193 s.
30. Циркуляры, постановления и инструкции виленского генерал-губернатора и минского гражданского и военного губернатора // НГАБМ. – Фонд 1527. – Воп. 1. – Спр. 1.
31. Я н о ў с к а я, В. В. Беларускія землі ў палітычных падзеях канца XVIII–XIX ст.: калейдаскоп гістарыяграфічных контраверсій / В. В. Яноўская, А. М. Філатава // Российские и славянские исследования. – 2008. – № 3. – С. 177–190.

*A. E. FIRYNOVICH*

**«FEMININE FACTOR» IN THE REVOLT OF 1863–1864: INFORMATION POTENTIAL OF BELARUSIAN ARCHIVE DEPOSITARIES**

## Summary

In the article the information potential of domestic archive documentary materials have been discussed concerning to revelation of the «feminine factor» in events of 1863–1864 on Belarus territory. On the ground of educed sources the statistical analysis of women involvement into the revolt of 1863–1864 has been made and ways of women political activity have been investigated along with kinds and extent of punishment for antigovernment activities presented in 60’s years of the XIX century. In elucidation of this problem the special attention has been paid to the specific of local origin sources.

*УДК 94 (476–15) «1921/1939»*

*А. Л. РАДЗЮК*

# БЕЛАРУСКІЯ КААПЕРАТЫВЫ Ў ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ (1921–1939 гг.): СУЧАСНЫ СТАН ДАСЛЕДАВАННЯ ПРАБЛЕМЫ

*Інстытут гісторыі НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 06.07.2010)*

18 сакавіка 1921 г. у Рызе быў падпісаны мірны дагавор паміж РСФСР і УССР, з аднаго боку, і Польшчай – з другога. Паводле яго ўмоў этнічна адзіная тэрыторыя Беларусі была падзелена на дзве часткі, якія ўвайшлі ў склад розных дзяржаў. На абшарах усходняй часткі паўстала Беларуская ССР, якая ў 1922 г. стала адной з краін-заснавальніц СССР. У сваю чаргу Заходняя Беларусь апынулася ў складзе Польшчы.

Перыяд, калі заходняя частка Беларусі знаходзілася ў складзе ІІ Рэчы Паспалітай, быў надзвычай насычаны разнастайнымі падзеямі ў грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным і культурным жыцці краю. Яго гісторыя стала прадметам шматлікіх даследаванняў як беларускіх, так і замежных навукоўцаў. Але, нягледзячы на вялікі пласт прац, якія так ці інакш закранаюць заходнебеларускую тэматыку, некаторыя аспекты гісторыі гэтага перыяду вымагаюць больш пільнага і грунтоўнага разгляду, карэкціроўкі тых ці іншых ацэнак і падыходаў пры аналізе пэўных працэсаў, падзей, дзейнасці палітычных партый і грамадскіх арганізацый, гістарычных персаналій. Да такіх аспектаў, свайго роду «белых плямаў» у гісторыі краю, безумоўна, можна аднесці тэму функцыянавання беларускіх кааператываў. Між тым некаторыя бакі адзначанай праблемы часам закраналіся ў працах прадстаўнікоў як айчыннай, так і замежнай гістарыяграфіі.

На пачатку 1920-х гг. заходнебеларускія землі знаходзіліся ў вельмі цяжкім эканамічным становішчы. Мінулае ваеннае ліхалецце пакінула спаленыя хаты і зруйнаваныя гаспадаркі. Як трапна заўважыў беларускі гісторык з Беласточчыны Я. Мірановіч, «большасць жыхароў сваё новае жыццё ў новай дзяржаве пачынала з адбудовы гаспадарчых будынкаў і жыллёвых памяшканняў» [1, с. 137]. У асяроддзі беларускай нацыянальнай інтэлігенцыі пачаўся цяжкі працэс пошукаў выйсця са складанай эканамічнай сітуацыі. Некаторыя з дзеячаў бачылі яго ў паступальнай і мэтанакіраванай папулярызацыі ідэі кааперацыі, якая, па іх перакананні, мусіла не толькі дапамагчы беларускаму насельніцтву выйсці з крызісу і палепшыць яго матэрыяльнае становішча, але і абараніць беларускую нацыянальную меншасць ад польскага эканамічнага нацыяналізму. Для дасягнення гэтай мэты неабходна было стварыць тэарэтычную базу, паказаць насельніцтву выгоды ад удзелу ў кааператывах, адлюстраваць развіццё і папулярнасць ідэі кааперацыі ў свеце.

Адным з першых заходнебеларускіх дзеячаў, які зрабіў канкрэтныя захады ў гэтым кірунку, быў І. Канчэўскі. Яшчэ ў 1921 г. ён прапанаваў увесці для выкладання ў школе дысцыпліну пад назвай «Кааперацыя» і нават пачаў рабіць адпаведны дапаможнік [2]. Паводле перакананя гэтага вядомага беларускага дзеяча, філосафа і кааператара, выкладанне прадмета павінна было выхаваць дзейнага і актыўнага грамадзяніна, навучыць не толькі фармальнаму разуменню жыцця, але і самому жыццю. Некаторыя месцы ў праграме курса, распрацаванай І. Канчэўскім, займала гісторыя кааператыўнага руху на тэрыторыі Беларусі. У 1924 г. у Вільні пабачыла свет кніга «Заходняя Беларусь: зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры і мастацтва Зах. Беларусі», у якой, сярод іншых, быў змешчаны артыкул вышэйадзначанага аўтара «З мінуўшчыны коопэ-

рацыі ў Віленшчыне» [3]. У ім І. Канчэўскі зрабіў грунтоўны агляд развіцця кааперацыі ў Вільні і Віленскім краі ў перыяд з 1910 па 1915 г. Паводле заўвагі рэдактара зборніка, гэты артыкул у задумцы аўтара павінен быў стаць толькі першай часткай больш шырокай працы, прысвечанай развіццю кааперацыі на Беларусі. Але, на вялікі жаль, заўчасная смерць І. Канчэўскага не дазволіла рэалізаваць запланаванае.

Яшчэ адным яскравым даследчыкам кааперацыі і беларускага кааператыўнага жыцця Заходняй Беларусі пачатку 1920-х гг. з'яўляўся С. Чыжэўскі. У гэты час ён узначальваў Віленскі кааператыўны саюз, актыўна выступаў у беларускай прэсе са шматлікімі артыкуламі на кааператыўную тэматыку. У 1921 г. ён выдаў тры брашуры: «Коопэратары» [4], «Першыя крокі ўраду спажывецкага таварыства (коопэратыва)» [5] і «У аб'яднаньні моц і іншыя апавяданьні з жыцьця беларускіх коопэратываў» [6], якія ў асноўным мелі на мэце папулярызацыю кааперацыі і насілі перадусім агітацыйны характар. Таму гэтыя працы часам маюць меншае навуковае значэнне, чым некаторыя, хоць і невялікія, але глыбока аналітычныя прэсавыя артыкулы згаданага аўтара.

Новым крокам у развіцці тэорыі кааперацыі ў Заходняй Беларусі стала праца А. Більдзюкевіча «Асновы грамадзкай гаспадаркі» [7]. У гэтым грунтоўным падручніку проста і лагічна выкладзены базісныя канцэпцыі тагачаснай эканомікі. Паводле меркавання М. Казлоўскага, «чысціня мовы, выдатны стыль, даходлівая логіка мыслення, закладзеная ў кнігу, ставяць яе ў лік найлепшых дасягненняў беларускай эканамічнай думкі пачатку мінулага стагоддзя» [8, с. 120]. У межах прадстаўленай праблематыкі асабліва важна тое, што ў свой падручнік А. Більдзюкевіч уключыў самастойны раздзел, прысвечаны тэорыі кааперацыі. і хоць гэты раздзел не змяшчае канкрэтных звестак аб гісторыі развіцця кааперацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, ён у поўнай ступені адлюстроўвае тагачаснае значэнне кааперацыі для беларускага грамадства і кааператыўныя погляды беларускай інтэлігенцыі, што робіць вывучэнне дадзенай працы надзвычай карысным.

У 1928–1929 гг. энергічную працу па пашырэнні кааператыўнага руху праводзіў выпускнік кааператыўна-гандлёвых курсаў (якія, дарэчы, узначальваў А. Більдзюкевіч) А. Васіленя. Ён стаў аўтарам дзвюх невялікіх прац: «Залажэньне спажывецкага каапэратыву на вёсцы» [9] і «Спажывецкі каапэратыў і праца ў ім» [10], якія змяшчаюць неабходныя рэкамендацыі па арганізацыі спажывецкіх кааператываў. Таксама А. Васіленя з практычнага боку аналізуе польскае кааператыўнае заканадаўства і прыводзіць канкрэтныя прыклады ўдалага існавання беларускіх спажывецкіх кааператываў ва ўмовах дзяржаўнага ўціску.

Напрыканцы перыяду знаходжання заходнебеларускіх зямель пад уладай Польшчы выйшла яшчэ адна агульнатэарэтычная праца, галоўным прадметам якой сталі канцэптуальныя праблемы кааперацыі – «Аграрна-кааператыўная палітыка будучыні» [11]. Яе аўтар, Ф. Акінчыц, вялікую ўвагу надаваў праблемам узаемадзеяння дзяржавы з кааператыўнымі арганізацыямі, глыбока прааналізаваў працы найбольш вядомых у той час тэарэтыкаў кааперацыі (Ш. Фур'е, Р. Оўэна, М. Туган-Бараноўскага і інш).

Усяго ў Заходняй Беларусі за перыяд 1921–1939 гг. пабачылі свет 26 прац на эканамічную тэматыку [12, с. 299], 8 з іх непасрэдна папулярызавалі ідэю кааперацыі. У асноўнай масе яны былі напісаны дзеячамі асабіста заангажаванымі ў кааператыўным руху (С. Чыжэўскім, А. Васіленяй), таму найперш з'яўляюцца каштоўнымі як крыніцы. Гэтыя працы, у сваёй большасці, выконвалі агітацыйную фунцыю і не мелі выразных навуковых акцэнтаў, але некаторыя з іх закранаюць агульнатэарэтычныя праблемы кааперацыі (працы А. Більдзюкевіча, Ф. Акінчыца). Што да звестак, якія непасрэдна датычацца гісторыі развіцця кааперацыі ў Заходняй Беларусі, то тут яны носяць ускосны і бессістэмны характар.

Польская міжваенная гістарыяграфія не выяўляла вялікай цікавасці да даследавання беларускай праблематыкі ў ІІ Рэчы Паспалітай. Між тым у працах польскіх навукоўцаў можна знайсці некаторы агульны факталагічны матэрыял, які закранае развіццё той ці іншай формы кааперацыі ў Польшчы. Так, у працы В. Бароўскага «Kredyt rolniczy w Polsce» [13] ёсць асобны раздзел, які прысвечаны крэдытнай кааперацыі ў 1921–1926 гг. У ім аналізуецца гісторыя польскіх кааператыўных рэвізійных саюзаў, спецыфіка іх дзейнасці, у тым ліку і на абшары чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў. Развіццю кааперацыі, перадусім спажывецкай, прысвечаны артыкулы Ф. Дамброўскага ў выданні «Kalendarz Spółdzielczy na rok 1927» [14–16]. Даследчык разглядае

асноўныя тэндэнцыі ў польскім кааператыўным руху на пачатку 1920-х гг., паказвае некаторыя аспекты арганізацыйнага жыцця найбуйнейшых польскіх рэвізійных саюзаў (асобны артыкул прысвечаны «Саюзу спажывецкай кааперацыі Польшчы» [16]), параўноўвае дзейнасць т. зв. «дзікіх» кааператываў і кааператываў, уваходзячых у склад пэўных рэвізійных саюзаў.

У цэнтр увагі некаторых даследаванняў польскіх вучоных трапляла і Заходняя Беларусь. Напрыклад, В. Арміцкі у манаграфіі «Zycie gospodarcze kresów wshodnich Rzeczypospolitej Polskiej» вельмі скрупулёзна разгледзеў розныя бакі гаспадарчага жыцця беларускіх зямель у складзе II Рэчы Паспалітай [17]. Закрануў даследчык і праблемы кааператыўнага жыцця, у тым ліку прааналізаваў гісторыю малачарскай кааапераціі, прывёў цікавыя статыстычныя даныя, што датычацца арганізацыі і развіцця малачарства на этнічна беларускіх тэрыторыях. У артыкуле ў Я. Завады і Б. Маскаліка «Spółdzielczość na Ziemiach Wshodnich» [18] аналізуецца кааператыўны рух на ўсходніх абшарах польскай дзяржавы (Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна). Пры гэтым даецца параўнаўчая характарыстыка колькасна-якасных паказчыкаў у розных раёнах, прыводзяцца звесткі аб шчыльнасці кааператыўнай сеткі на тэрыторыі беларускіх ваяводстваў. На жаль, аналіз аўтарамі суадносін кааператыўных арганізацый розных нацыянальнасцей фактычна ігнаруе існаванне беларускіх кааператываў.

Асобнае месца ў вывучэнні грамадска-палітычнага жыцця беларусаў у II Рэчы Паспалітай займае падрыхтаваны афіцэрамі 2-га аддзела Генеральнага штаба польскага войска «Кароткі нарыс беларускага пытання» [19]. Сярод закранутага польскімі аналітыкамі кола праблем пэўнае месца займае і беларуская кааперацыя. Так, у кантэксце агульнай беларускай палітычнай гісторыі 1920-х гг. некаторае месца адведзена такім арганізацыям, як Віленскі кааператыўны саюз і Беларускі кааператыўны банк.

Першыя крокі савецкіх навукоўцаў на шляху гістарычнага асэнсавання грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця Заходняй Беларусі пад уладай Польшчы датуюцца сярэдзінай 1920-х гг. У 1925 г. выйшаў у свет зборнік «Заходняя Беларусь», дзе быў змешчаны артыкул А. Смоліча «Сялянства Заходняй Беларусі» [20]. У ім даследчыкам былі прааналізаваны асноўныя кірункі эканамічнай палітыкі Польшчы на беларускіх землях і яе ўплыў на матэрыяльнае становішча сялянства. Але, нягледзячы на пэўную актуалізацыю даследавання Заходняй Беларусі, уласна праблемы беларускага кааператыўнага жыцця ў краі не разглядаліся нават у спецыялізаваных эканамічных працах [21].

Пачынаючы з 1929 г. практычна ўсе даследаванні, якія закраналі тэматыку жыцця беларусаў у II Рэчы Паспалітай, праводзіліся пад эгідай камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры Акадэміі навук БССР. Гэтая ж установа на працягу 1930-х гг. займалася выданнем усіх кніг і брашур па пазначанай праблеме. Большасць з іх былі прысвечаны дзейнасці левардыкальных арганізацый і фактычна не закраналі праблемы беларускага кааператыўнага руху. Адным з рэдкіх выключэнняў з'яўляецца праца «Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине»(1935 г.) [22]. У ёй, пры разглядзе грамадскай і гаспадарчай дзейнасці БХД і Цэнтрасаюза, узгадваюцца некаторыя практычныя крокі дадзеных арганізацый па развіцці ўласнай сістэмы кааператыўных арганізацый. Аднак гэтая кніга не была пазбаўлена шэрагу хібаў, якія ў цэлым былі характэрны для ўсёй тагачаснай савецкай гістарычнай літаратуры – агітацыйнага характару выкладання матэрыялу, аднабакова-тэндэнцыйнай ацэнкі падзей і працэсаў. Усё гэта, разам з суцэльным недахопам дакументальных матэрыялаў (іх большасць да 1939 г. знаходзілася ў Польшчы), не спрыяла фарміраванню аб'ектыўнай гістарычнай карціны жыцця беларускага насельніцтва ў II Рэчы Паспалітай.

У 1938 г. Камінтэрн распусціў кампартыю Польшчы разам з яе састаўнымі часткамі, у ліку якіх знаходзілася і КПЗБ. У выніку гэтых падзей, непасрэдным наступствам якіх сталі рэпрэсіі супраць заходнебеларускіх камуністаў, на пэўны час было накладзена табу на асвятленне палітычнага жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы. А з улікам таго, што беларускія кааператыўныя арганізацыі былі шчыльна звязаны з нацыянальна-вызваленчым рухам, іх вывучэнне таксама не пазбегла гэтай негалоснай забароны.

Такое становішча фактычна захоўвалася да часоў «адлігі». У перыяд з 1938 па 1956 г. адзінай працай, у якой закраналася праблема кааперацыі ў Заходняй Беларусі, была кніга Я. Найдзюка

«Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі» [23]. У ёй аўтар падкрэсліў цяжкае становішча беларускіх кааператываў, якія знаходзіліся пад моцным ціскам як польскіх уладаў, так і гаспадарчых арганізацый. Пры гэтым Я. Найдзюк заўважыў, што да 1922 г. беларускія кааператывы мелі досыць шырокія магчымасці развіцця (відавочна, гэтыя звесткі датычацца ў першую чаргу Віленшчыны, якая ў той час уваходзіла ў склад т. зв. «Сярэдняй Літвы»).

Крытыка культу асобы Сталіна на XX з'ездзе КПСС распачала новы этап у распрацоўцы праблемы. У шматлікіх працах гісторыкі закраналі разнастайныя бакі грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча Заходняй Беларусі. Але галоўная ўвага адводзілася дзейнасці левардыкальных арганізацый, працоўнаму і сялянскаму руху. Між тым, у кантэксце адзначанага кола пытанняў, навукоўцы часам аналізавалі і дзейнасць беларускіх кааператываў. Так, у манаграфіі У. А. Палуяна «Беларуская сялянска-рабочая грамада» [24] разглядаецца дзейнасць Беларускага кааператыўнага банка (БКК), яго месца ў арганізацыйнай структуры БСРГ. Аўтар таксама прыводзіць надзвычай карысныя даныя аб агульным грашовым абароце банка, колькасці ўкладчыкаў. Падобная інфармацыя змешчана і ў напісанай ім у сааўтарстве з І. У. Палуянам манаграфіі «Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг.» [25]. Невялікі агляд гісторыі БКК, з акцэнтам на яго практычную дзейнасць, зрабіў і А. А. Сарокін [26]. У 1966 г. з'явілася грунтоўная калектыўная праца «Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.)» (аўтары А. М. Мацко, М. С. Арэхва, Т. І. Прытыцкая, І. П. Хаўратовіч, І. В. Царук) [27]. У ёй знайшлі адлюстраванне не толькі дзейнасць КПЗБ, але і яе стасункі з іншымі тагачаснымі партыямі і арганізацыямі, у тым ліку і з лаяльнымі да камуністаў кааператывамі. Разам з тым аўтары даследавання імкнуліся падкрэсліць заангажаванасць беларускіх нацыянальных дзеячаў незалежнай і паланафільскай арыентацыі ў польскім кааператыўным руху. Але, нягледзячы на пэўныя поспехі, панаванне ў дзяржаве камуністычнай ідэалогіі не дазваляла поўна і аб'ектыўна паказаць усе бакі жыцця насельніцтва Заходняй Беларусі. Гэта ў поўнай меры датычылася і асвятлення гісторыі беларускіх кааператываў, дзейнасць многіх з якіх мела «неадназначную» палітычную афарбоўку.

Пры разглядзе гісторыі вывучэння беларускай кааперацыі ў II Рэчы Паспалітай у 1960-я гг. асобна трэба вылучыць неапублікаваны артыкул «Да гісторыі беларускай коопэрацыі» [28], які стаіць у баку ад савецкай гістарыяграфічнай традыцыі. Яго аўтар – А. Клімовіч – быў адным з самых актыўных прадстаўнікоў заходнебеларускага кааператыўнага руху. Зведаўшы рэпрэсіі, ён у 1956 г. вярнуўся ў Вільню, дзе ў 1966 г. напісаў згаданае даследаванне. У ім А. Клімовіч прасачыў развіццё беларускай кааперацыі ў Заходняй Беларусі з 1920 па 1939 г., зрабіў аналіз польскага кааператыўнага заканадаўства (у прыватнасці, параўнаў законы 1920 і 1934 гг.). Гаворачы аб законе 1934 г., аўтар давёў яго выразную скіраванасць супраць нацыянальных меншасцей і паказаў яго негатыўныя наступствы для беларускай кааперацыі. У асноўным артыкул грунтаваўся на ўласных успамінах аўтара, таму ён з'яўляецца каштоўным у першую чаргу як крыніца. Разам з тым, глыбокі аналітычны характар тэксту на фоне слабай распрацоўкі прадстаўленай тэмы надае гэтай працы вялікае гістарыяграфічнае значэнне.

У 70–80-я гг. XX ст., дзякуючы намаганням новага пакалення даследчыкаў, беларуская гістарычная навука ўзбагацілася цэлым шэрагам прац па гісторыі Заходняй Беларусі. Праўда, у асвятленні дзейнасці беларускіх кааператываў працягвалі панаваць старыя тэндэнцыі. Праблема па-ранейшаму знаходзілася на перыферыі ўвагі даследчыкаў, а дзейнасць беларускіх кааператываў закраналася толькі ўскосна і мела ўрывачны характар.

Пэўны ўклад у распрацоўку праблемы зрабіў У. Ф. Ладысеў, які ў сваіх працах надаў некаторую ўвагу гісторыі кніжнага кааператыва «Сяўба» [29; 30]. Даследчык прааналізаваў ролю КПЗБ пры стварэнні кааператыва, адлюстраваў задачы арганізацыі. Асобнае месца было адведзена культурна-асветніцкай дзейнасці «Сяўбы» і спробам КПЗБ надаць кааператыву масавы характар.

З распадам СССР і з'яўленнем незалежнай Рэспублікі Беларусь беларуская гістарыяграфія ўступіла ў новую фазу свайго развіцця. Даследчыкі атрымалі магчымасць больш поўна і шматбакова паказаць тыя ці іншыя аспекты жыцця беларусаў у міжваеннай Польшчы. Паступова з'явіўся цэлы пласт работ, для якіх быў характэрны ўсебаковы аналіз сацыяльна-эканамічнага і палітычнага становішча заходнебеларускіх зямель. Узрасла цікавасць даследчыкаў і да гісторыі

беларускага кааператыўнага руху. У шматтомнае выданне «Энцыклапедыя гісторыі Беларусі» былі ўключаны шэраг артыкулаў, прысвечаных заходнебеларускім кааператыўным дзеячам (А. Більдзюкевічу [31], А. Каўшу [32], А. Клімовічу [33]), а таксама беларускай кааператыўнай і гаспадарчай перыёдыцы (артыкулы «Беларуская Борць» [34], «Самапомач» [35], Саха» [36]). Між тым, у вялікім артыкуле «Кааперацыя» [37] С. Ходзіна гісторыя развіцця кааперацыі ў Заходняй Беларусі нават не закранаецца.

Вядомы беларускі краязнавец М. Казлоўскі ў сваіх гістарычна-біяграфічных нарысах апісаў жыццё і дзейнасць А. Більдзюкевіча і А. Клімовіча [38]. Пры напісанні нарысаў даследчык выкарыстоўваў не толькі гістарычную літаратуру і тагачасную перыёдыку, але і матэрыялы з разнастайных архіўных і музейных збораў, вусныя сведчанні непасрэдных удзельнікаў падзей 20–30-х гг. XX ст. Таму нарысы М. Казлоўскага з'яўляюцца ў пэўнай ступені ўнікальнай крыніцай ведаў пра жыццёвы шлях згаданых дзеячаў.

Грашовы абарот кааператываў у Заходняй Беларусі разглядаецца ў працах В. Калясінскага [39; 40]. Аўтарам прыводзяцца некаторыя звесткі аб агульнай колькасці кааператываў у Заходняй Беларусі, паказваецца роля металічных бонаў у фінансавай сістэме II Рэчы Паспалітай. Дзейнасці польскіх вайсковых кааператываў на тэрыторыі Заходняй Беларусі прысвечаны артыкул Т. Васіленкі [41]. У артыкуле А. Вашкевіча [42] пры аналізе крыніц фінансавання БХД згадваецца Беларускі кааператыўна-прамыслова-земляробчы банк, дзейнасць якога, зрэшты, не прынесла хадэкам значных фінансавых прыбыткаў.

Змястоўны фактаграфічны матэрыял, які датычыцца гісторыі кааперацыі да 1917 г., змяшчае вучэбны дапаможнік «Кооперативное движение в Беларуси (эпоха капитализма)» [46] Х. Ю. Бейлькіна. Яго аналіз дазваляе прасачыць генетычную сувязь заходнебеларускай кааперацыі з папярэднім перыядам.

Вялікі ўклад у вывучэнне праблемы зрабілі беларускія эканамісты [43;44]. У 2004 г. пад эгідай Інстытута эканомікі НАН Беларусі выйшла праца «Экономическая мысль в Западной Беларуси в 1921–1939 гг.» (аўтары В. М. Бусько, Б. С. Вайцяшэнка, С. І. Якімчанка) [45]. У ёй змешчаны асобны раздзел, прысвечаны развіццю тэорыі кааперацыі ў Заходняй Беларусі. На шырокім фоне пануючых у той час канцэпцый і поглядаў вядучых эканамістаў на кааператыўны рух даследчыкі грунтоўна прааналізавалі асноўныя працы прадстаўнікоў беларускай эканамічнай думкі: А. Більдзюкевіча, Ф. Акінчыца, С. Чыжэўскага і інш. Увогуле, працы эканамістаў шмат у чым дапаўняюць веды, назапашаныя гісторыкамі, і дапамагаюць глыбей зразумець сутнасць самой кааперацыі і яе формаў.

Некалькі грунтоўных даследаванняў з'явіліся ў гэты час у Польшчы. У першую чаргу тут неабходна адзначыць працы К. Гамулкі [47; 48]. Аналіз дзейнасці беларускіх гаспадарчых арганізацый у міжваеннай Польшчы дазволіў даследчыцы зрабіць выснову, што слабасць беларускіх кааператываў была выклікана, з аднаго боку, палітыкай польскіх улад, якія баяліся, што кааператывы могуць стаць фінансавай базай беларускага нацыянальнага руху, з другога – няздольнасцю беларускай інтэлігенцыі заахвоціць беларускае сялянства да ўдзелу ў кааператывах. Працы К. Гамулкі, якія выкананы на высокім метадалагічным узроўні з выкарыстаннем багатага і змястоўнага архіўнага матэрыялу, сталі значным укладам у распрацоўку праблемы.

Цэлы шэраг цікавых даследаванняў у 90-я гг. XX – пачатку XXI ст. быў зроблены прадстаўнікамі беластоцкай гістарычнай школы. Я. Мірановіч у невялікім артыкуле «Беларускія гаспадарчыя арганізацыі ў Польшчы (1920–1921)»* [49] лаканічна прасачыў асноўныя моманты развіцця кааперацыі ў Заходняй Беларусі, прааналізаваў няўдачы кааператыўнага руху ў пэўных рэгіёнах краю. Гэты ж гісторык звярнуў увагу на дзейнасць беларускага кааператыва «Пламень» у Беластоку ў 1937 г. і на яго прыкладзе разгледзеў палітыку санацыйных уладаў у дачыненні да беларускіх грамадскіх арганізацый [50]. Р. Высоцкі прааналізаваў беларускі кааператыўны рух на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ў 1919–1939 гг. [51]. Сярод іншага, гісторык зрабіў падлікі колькасці беларускіх спажывецкіх кааператываў у рэгіёне і колькасці іх сяброў. Ю. Туронак прасачыў працу Віленскага саюза кааператываў на пачатку 20-х гг. XX ст. у кантэксце жыццёва-

* Відавочна, пазначаныя ў назве артыкула храналагічныя межы памылковыя, бо ў тэксце Я.Міраноўіча разглядаецца развіццё гаспадарчых арганізацый у Польшчы з 1920 па 1939 г.

га шляху В. Іваноўскага [52]. Гаспадарчы аспект дзейнасці Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры закранаўся ў працах М. Мароз [53; 54].

Вялікую карысць для вывучэння прадстаўленай тэмы маюць працы па праблемах кааперацыі іншых нацыянальных меншасцей ІІ Рэчы Паспалітай [55; 56]. Асабліва важным выглядае аналіз украінскага кааператыўнага руху [57–61], бо культурная блізкасць, падабенства сацыяльнай структуры беларусаў і ўкраінцаў дазваляюць правесці некаторыя паралелі. Да таго ж беларускія і ўкраінскія кааператывы існавалі ва ўмовах негатыўнага стаўлення польскай дзяржавы, таму вымушаны былі вырашаць падобныя праблемы. Але пры гэтым узровень іх арганізацыйнага развіцця значна адрозніваўся. Аналіз прычын такіх разыходжанняў дазволіць лепш зразумець працэсы, што мелі месца ў беларускім кааператыўным руху.

Такім чынам, нягледзячы на адзначаныя вышэй дасягненні, у беларускай гістарыяграфіі няма спецыяльных даследаванняў па тэме дзейнасці беларускіх кааператываў у Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.). Абсалютная большасць прац закранае праблему толькі ўскосна і фрагментарна. У невялікіх артыкулах прадстаўнікоў польскай гістарычнай навукі (К. Гамулкі, Я. Мірановіча, Р. Высоцкага) дадзеная тэма асветлена толькі часткова. Таму на сённяшні дзень відавочна наспела неабходнасць комплекснага разгляду і аналізу дзейнасці і ўмоў функцыянавання беларускіх кааператыўных арганізацый, іх ролі ў гаспадарчым і грамадска-палітычным жыцці беларусаў міжваеннай Польшчы.

### Літаратура


1. М і р а н о в і ч, Я. Беларускія гаспадарчыя арганізацыі ў Польшчы (1920–1921) / Я. Мірановіч // Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы ІІІ Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снежня 2000 г.) Рэкал.: Э. Дубянецкі (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 137–141.
2. К а н ч э ў с к і, І. Накідкі думак аб выкладанні ў школе асноў кааперацыі / І. Канчэўскі // Аддзел рукапісаў бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (АР НАНБ). – Фонд 23. – Воп. 1. – Спр. 26.
3. К а н ч э ў с к і, І. З мінуўшчыны коопэрацыі ў Віленшчыне / І. Канчэўскі // Заходняя Беларусь: зборнік грамадзкае мысьлі, навукі, літэратуры і мастацтва Зах. Беларусі. – Вільня: Друкарня Віленскага Вытворчагаі Коопэратыву, 1924. – С. 133–141.
4. Ч ы ж э ў с к і, С. Коопэратары / С. Чыжэўскі. – Вільня: Друкарня кооп. Т-ва «Друк», 1921. – 16 с.
5. Ч ы ж э ў с к і, С. Першыя крокі ўраду спажывецкага таварыства (коопэратыва) / С. Чыжэўскі. – Вільня: Друкарня кооп. Т-ва «Друк», 1921. – 30 с.
6. Ч ы ж э ў с к і, С. У аб'яднаньні моц і іншыя апавяданьні з жыцьця беларускіх коопэратываў / С. Чыжэўскі. – Вільня: Выд. аўтара, 1921. – 34 с.
7. Б і л ь д з ю к е в і ч, А. Асновы грамадзкай гаспадаркі / А. Більдзюкевіч. – Вільня: Выд. аўтора, 1926. – 175 с.
8. К а з л о ў с к і, М. Адам / М. Казлоўскі // Куфэрак Віленшчыны. – 2002. – № 1. – С. 115–122.
9. В а с і л е н я, А. Залажэньне спажывецкага каапэратыву на вёсцы / А. Василеня. – Вільня: Выд. аўтара, 1929. – 16 с.
10. В а с і л е н я, А. Спажывецкі каапэратыў і праца ў ім / А. Васіленя. – Вільня: Выд. аўтара,1928. – 35 с.
11. А к і н ч ы ц, Ф. Аграрна-кааператыўная палітыка будучыні / Ф. Акінчыц. – Вільня, 1936. – 36 с.
12. Т у р о н а к, Ю. Беларуская кніга ў міжваеннай Польшчы 1921–1939 / Ю. Туронак // Мадэрная гісторыя Беларусі. – Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2006. – С. 278–322.
13. B a r o w s k i, W. Kredyt rolniczy w Polsce / Ze wstępem W. Glinki / W. Barowski. – Warszawa, 1927. – 79 s.
14. D ą b r o w s k i, F. Spółdzielczość w Polsce / F. Dąbrowski // Kalendarz Spółdzielczy na rok 1927. – Warszawa: Druk T. Dobrzańskiego, 1927. – S. 112–116.
15. D ą b r o w s k i, F. Stan organizacyjny spółdzielni spóżywców w Polsce / F. Dąbrowski // Kalendarz Spółdzielczy na rok 1927. – Warszawa: Druk T. Dobrzańskiego, 1927. – S.116–122.
16. D ą b r o w s k i, F. Związek Spółdzielni Spóżywców Rzeczypospolitej Polskiej / F. Dąbrowski // Kalendarz Spółdzielczy na rok 1927. – Warszawa: Druk T. Dobrzańskiego, 1927. – S. 123–127.
17. O r m i c k i, W. Zycie gospodarcze kresów wshodnich Rzeczypospolitej Polskiej / W. Ormicki. – Krakow: «Orbis», 1929. – 308 s.
18. Z a w a d a, J., M o s k a l i k, B. Spółdzielczość na Ziemiach Wshodnich / J. Zawada, B. Moskalik // Rocznik Ziem Wshodnich / Kalendarz na rok 1937. – Warszawa: Wydawnictwa zarządu głównego towarzystwa razwoju Ziem Wschodnich, 1936. – S. 110–133.
19. Кароткі нарыс беларускага пытаньня. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2009. – 396с.
20. С м о л і ч, А. Сялянства Заходняй Беларусі / А. Смоліч // Заходняя Беларусь: Зборнік. – Мінск: ДВБ, 1925. – С. 31–42.
21. Кооперацыя, яе сутнасьць, роля, віды і формы ў капіталістычных краінах, у СССР і ў БССР. – Мінск: Беларускае дзяржаўнае выд-ва, 1928. – 68 с.
22. Политические партии в Польше, Зап. Белоруссии и Зап. Украине / С. Скульский [и др.]; Бел. Акад. наук, Комис. по изучению Зап. Белоруссии; под ред. С. Скульского. – Минск: Изд-во Белорусской АН, 1935. – 335 с.

23. Н а й д з ю к, Я. Беларусь учора і сяньня: Папулярны нарыс з гісторыі Беларусі. Выд. друг., пашыранае / Я. Найдзюк. – Мінск, 1944. – 304 с.

24. П а л у я н, У. А. Беларуская сялянска-рабочая грамада / У. А. Палуян. – Мінск: Навука і тэхніка, 1967. – 223 с.

25. П о л у я н, В. А., П о л у я н, И. В. Революционное и национально-освободительное движение в Западной Белоруссии в 1920–1939 гг. / В. А. Полуян, И. В. Полуян. – Минск: Госиздат БССР, 1962. – 223 с.

26. С о р о к и н, А. А. Освободительное и революционное крестьянское движение в Западной Белоруссии / А. А. Сорокин. – Минск: Изд-во БГУ, 1970. – 172 с.

27. Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921–1939 гг.) / Под ред. А. Н. Мацко и В. Е. Самутина. – Минск: Беларусь, 1966. – 420 с.

28. К л і м о в і ч, А. Да гісторыі беларускай коопэрацыі / А. Климович // АР НАНБ. – Фонд 5. «Клімовіч Адольф Юстынавіч». – Воп. 1. – Спр. 7.

29. Л а д ы с е ў, У. Ф. КПЗБ – арганізатар барацьбы за дэмакратычныя правы і свабоды (1934–1938) / У. Ф. Ладысеў. – Мінск: БДУ імя У. І. Леніна, 1976. – 167 с.

30. Л а д ы с е ў, У. Шлях да свабоды. З гісторыі рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1919–1939 гг. / У. Ф. Ладысеў. – Мінск: Полымя, 1978. – 132 с.

31. Л і с, А. Більдзюкевіч Адам Іосіфавіч / А. Ліс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 2: Усвея-Яшын; Дадатак / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 2001. – С. 344.

32. Л і с, А. Коўш Аляксандр / А. Ліс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4: Кадэты – Ляшчэня / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1997. – С. 254.

33. К а х а н о ў с к і, Г. Клімовіч Адольф / Г. Каханоўскі // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4: Кадэты – Ляшчэня / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1997. – С. 199–200.

34. С а л а м е в і ч, І. У. «Беларуская Борць» / І. У. Саламевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 1: А–Беліца / Рэдкал.: М. В. Біч і інш. – Мінск: БелЭН, 1993. – С. 368.

35. Л і с, А. Самапомач / А. Ліс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузелі-Усая / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 2001. – С. 216.

36. Л і с, А. Саха / А. Ліс // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 6. Кн. 1: Пузелі-Усая / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 2001. – С. 234.

37. Х о д з і н, С. Кааперацыя / С. Ходзін // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 3: Гімназіі-Кадэнцыя / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мінск: БелЭН, 1996. – С. 512–514.

38. К а з л о ў с к і, М. Галасы разбуджаных птушак: Гістарычна-біяграфічныя нарысы, роздумы над кнігамі, літаратурныя партрэты / М. Казлоўскі. – Мінск: Логвінаў, 2006. – 334 с.

39. К о л е с и н с к и й, В. Монеты и бумаги кооперативов как часть денежного хозяйства на территории Западной Беларуси в 1920–1939 гг. / В. Колесинский // Культура Гродзенскага рэгіёну: праблемы развіцця ва ўмовах поліэтнічнага сумежжа: Зб. навук. прац / Адк. рэд. А. М. Пяткевіч. – Гродна: ГрДУ, 2003. – С. 237–240.

40. К о л е с и н с к и й, В. Платежные боны кооперативов Западной Беларуси в 1920–1939 годах/ В. Колесинский // Банкаўскі Веснік. – 2003. – № 25. – С. 59–62.

41. В а с и л е н к о, Т. Деятельность военных кооперативов 6-го батальона саперов и 9-го обозного дивизиона / Т. Василенко // Славянскі свет: міжэтнічныя адносіны на мяжы трэцяга тысячагоддзя: Зб. матэрыялаў міжнар. навук.-практ. канф. студэнтаў і аспірантаў ВНУ, 16–17 лістапада 2001 г. – Брэст: БДУ імя А. С. Пушкіна, 2002. – С. 208–210.

42. В а ш к е в і ч, А. Грошы для партыі. Фінансаванне партыйнай дзейнасці Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (1921–1939 гг.) / А. Вашкевіч // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2007. – № 28. – С. 69–81.

43. С а х а р о в а, Д. Б. История и теория кооперативного движения: учеб. пособие / Д. Б. Сахарова, И. С. Котов. – 2-е изд., испр. – Минск: Новое знание, 2009. – 279 с.

44. К о т о в, И. С. История потребительской кооперации Республики Беларусь. Текст лекций для студентов всех специальностей кооперативных вузов / И. С. Котов. – Гомель: ГКИ, 1997. – 28 с.

45. Экономическая мысль в Западной Беларуси в 1921–1939 гг. / В. Н. Бусько, Б. С. Вайтешенко, С. И. Якимченко, под ред. П. Г. Никитенко. – Минск: Право и экономика, 2004. – 158 с.

46. Б е й л ь к и н, Х. Ю. Кооперативное движение в Беларуси (эпоха капитализма) / Пособие для студентов всех специальностей / Х. Ю. Бейлькин. – Гомель: ГКИ, 1998. – 80 с.

47. G o m ó ł k a, K. Białorusini w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka. – Gdańsk: Politechnika Gdańska, 1992. – 179 s.

48. G o m ó ł k a, K. Białoruskie instytucje życia gospodarczego w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1997. – N. 8. – S. 90–98.

49. М і р а н о в і ч, Я. Беларускія гаспадарчыя арганізацыі ў Польшчы (1920–1921) / Я. Мірановіч// Нацыянальныя пытанні: Матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снежня. 2000 г.); рэдкал.: Э. Дубянецкі (гал. рэд.) і інш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – С. 137 –141.

50. M i r o n o w i c z, E. Białorusiny i ukraińcy w polityce obozu piłsudczykowskiego / E. Mironowicz. – Białystok: Trans Humana, 2007. – 293 s.

51. W y s o c k i, R. Spółdzielczość bialoruska na terenie województwa białostockiego w latach 1919–1939 / R. Wysocki // Białostocczyzna. – 1996. – N. 1. – S. 39–47.

52. Т у р о н а к, Ю. Вацлаў Іваноўскі і адраджэньне Беларусі / Ю. Туронак // Мадэрная гісторыя Беларусі. – Вільня: Ін-т беларусістыкі, 2006. – С. 140–256.

53. M o r o z, M. Bialoruski Instytut Gospodarki i Kultury w północno-wschodnich województwach Drugiej Rzeczypospolitej / M. Moroz // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 2000. – № 14. – S. 125–147.

54. M o r o z, M. «Krynica»: Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu / M. Moroz. – Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2001. – 230 s.
55. G r ö s h e l, C. Causes and Applications of anti-Semitism in Interwar Polish Cooperatives / C. Gröshel // Cooperatives in ethnic conflicts / edited by Torsten Lorenz. – Berlin: BWL, 2006. – S.283–306.
56. D ą b r o w s k i, R. Działalność spoleczno-gospodarcza mniejszości narodowych w II Rzeczypospolitej / R. Dąbrowski. – Szczecin: Wyd-wo Naukowe US, 1990. – 278 s.
57. В і с и н а, Т. М. Ліквідація кооперативного руху на Волині в 30-х роках ХХ ст. / Т. М. Вісина // Науковий вісник ВДУ ім. Лесі Українки. Історичні науки. № 5. – Луцьк: Ред.-вид. відділ «Вежа» ВДУ, 2001. – С. 156–160.
58. В і с и н а, Т. М. Інкорпорація українських кооперативів Волині в систему польських ревізійних союзів. / Т. М. Вісина // Науковий вісник ВДУ ім. Лесі Українки. Історичні науки. № 11. – Луцьк: Ред.-вид. відділ «Вежа» ВДУ, 2001. – С. 54–60.
59. В і с и н а, Т. М. Українська кооперація в Польщі напередодні Другої світової війни / Т. М. Вісина // 1939 рік в історичній долі України і українців. Матеріали Міжнародної наукової конференції 23–24 вересня 1999 р. – Львів: Видавничий центр ЛНУ імені Івана Франка, 2001. – С. 67–70.
60. M o k l a k, J. The Ukrainian Cooperative Movement in the Second Polish Repablic. A Contribution to the History of Economic Nationalism and National Minorites / J. Moklak // Cooperatives in ethnic conflicts / edited by Torsten Lorenz. – Berlin: BWL, 2006. – S. 307–342.
61. F i l a r, T. Ukraiński ruch spółdzielczy w II Rzeczypospolitej i polityka wobec niego władz polskich / T. Filar // Zeszyty Nawkowe Akademii Ekonomicynej w Krakowe. – 2000. – № 548. – S. 75–81.

*A. L. RADZYUK*

**BELARUSIAN COOPERATIVE SOCIETIES IN WESTERN BELARUS (1921–1939): CURRENT STATE OF THE PROBLEM RESEARCH**

## Summary

This article is devoted to the history of studies of Belarusian cooperatives activity in Western Belarus when it was a part of Poland. Main tendencies of studies in different historical periods have been traced. Research works of Belarusian and foreign historians dealing with the problem of Belarusian cooperative movement in the 2nd Polish Republic have been analyzed.

Performed analysis has shown that nowadays national historiography lacked special investigations in this field.

Most of the scientific works have been touched problems of Belarussian cooperatives by implication only. Representatives of Polish historical science have given some more attention to this problem.

## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК 784.036(476)*

*А. В. СЕМІКАВА*

# ВАКАЛЬНАЕ ЭСТРАДНАЕ МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ: ЭТАПЫ СТАНАЎЛЕННЯ І РАЗВІЦЦЯ Ў XX СТАГОДДЗІ

*Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў*

*(Паступіў у рэдакцыю 25.05.2010)*

Эстраднае мастацтва Беларусі – значны кампанент культурнага жыцця краіны, каштоўны пласт яе мастацкіх дасягненняў. Да ліку самых яркіх форм эстрады належыць вакальнае эстраднае мастацтва, якое дзякуючы сродкам масавай інфармацыі і камунікацыі заняло значнае месца ў жыцці сучаснага чалавека, асабліва моладзі. Склаліся і прадуктыўна развіваюцца разнастайныя формы і жанры сучаснай вакальнай эстрады, з аднаго боку, пераемныя ад універсальных традыцый эстраднай культуры, з другога – новыя і ўнікальныя, народжаныя ў асяроддзі новых тэхнічных магчымасцей сучасных канцэртных залаў, тэлебачання, Інтэрнэт.

Аднак менавіта эстрадная песня сёння апынулася ў цэнтры бурных дыскусій як эстэтычны аб’ект, як сродак выхавання моладзі, а таксама як спосаб прэзентацыі краіны за мяжой, паказчык яе ўзроўню развіцця. Красамоўным прыкладам актуалізацыі цікавасці да тэмы вакальнай эстрады з’яўляецца арганізацыя серыяльных тэлевізійных шоу «Еўрафэст», «Песня для Еўрабачання» і «Музычны суд», на якіх ажыццяўляўся адбор вакальна-эстрадных нумароў для прадстаўніцтва Беларусі на міжнародным конкурсе эстраднай песні «Еўрабачанне».

Абмеркаванні і крытычныя выступленні па пытаннях якасці сучаснай вакальнай эстрады, на жаль, вядуцца на эмпірычным узроўні і не падмацоўваюцца навуковай аргументацыяй. Прычыны гэтага з даўніх часоў караняцца, з аднаго боку, у паблажлівым стаўленні да лёгкіх жанраў з боку музычна-тэатральнай крытыкі і прэсы, з другога – у «імгненнасці» існавання эстраднага нумара, яго актуальнасці «тут і цяпер», якая перашкаджала фіксацыі артэфактаў эстраднага мастацтва аж да з’яўлення сродкаў гука- і відэазапісу.

Сёння, калі культурай назапашаны велізарны матэрыял і вопыт, а эстрадная песня выйшла ў лік лідараў сярод усіх формаў эстраднага мастацтва, наспела неабходнасць усебаковага аналізу вакальнага жанру на эстрадзе ва ўсіх яго гістарычных і жанравых праявах. Гістарычны агляд вакальнага жанру і формаў яго сцэнічнага ўвасаблення на расійскай і беларускай эстрадзе, ажыццёўлены ў дадзеным артыкуле, дапаможа вызначыць кульмінацыйныя вяршыні і, наадварот, крызісныя этапы развіцця жанру, пазначыць далягляды яго развіцця.

Вытокі эстраднага мастацтва бяруць пачатак з глыбокай старажытнасці, з скамароства, мастацтва еўрапейскіх вандроўных артыстаў, масавых гарадскіх свят і іншых відаў творчасці лаканічнай формы і забаўляльнай функцыі. Аднак аб фарміраванні паняцця «эстрада» ў яго сучасным значэнні можна казаць пачынаючы з сярэдзіны XIX стагоддзя. Прыблізна ў гэты час тыпізаваўся шэраг асноўных жанраў эстраднага мастацтва (шляхам адмежавання ад масіву бытавых масавых жанраў альбо шляхам «тэатралізацыі» і «абмасаўлення» акадэмічных канцэртных жанраў), адбылося ўсведамленне спецыфікі мастацтва эстрады і спецыфікі яго адрознення ад мастацтва акадэмічнага. Ключавымі адметнымі момантамі эстрадных формаў мастацтва сталі: 1) выяўлены забаўляльны характар; 2) абавязковае прыўнясенне элементаў тэатралізацыі

ў выкананне музычных, размоўных, танцавальных і г. д. нумароў; 3) крышталізацыя эстраднага нумара з усімі ўласцівымі яму прыкметамі (лаканічнасць, мабільнасць, імправізацыйнасць) у якасці асноўнай адзінкі эстраднага прадстаўлення.

Звесткі аб дарэвалюцыйным перыядзе развіцця эстрады ў Расійскай імперыі, у тым ліку адкрыцці эстрадных устаноў у дарэвалюцыйным Мінску, садова-паркавай і кафэшантаннай эстрадзе, агляд найбольш значных падзей і характарыстыка творчасці найбольш яркіх дзеячаў змяшчаюцца ў артыкулах А. Кугеля, апублікаваных у 1900-х гадах у часопісе «Тэатр і мастацтва» [5]. Галіна так званых лёгкіх жанраў шырокага гістарычнага перыяду – ад кірмашовых забаў да эстрадных тэатраў тыпу кабарэ і мюзік-холаў разглядае С. Кліцін [3; 4]. Расійскай забаўляльнай культуры XVIII-XIX стагоддзяў прысвечана кніга К. Уваравай [11]. Змястоўны факталагічны матэрыял па тэме станаўлення эстрадных мастацтваў да XX стагоддзя змяшчаецца ў публікацыях Н. Зоркай [2], Д. Залатніцкага (гл. артыкулы ў энцыклапедыі – [16]), І. Несцьева [6], З. Шыбекі і С. Шыбекі [13], Т. Шчарбаковай [14; 15], у энцыклапедыі «Эстрада ў Расіі. XX стагоддзе. Лексікон» [16], калектыўных зборніках артыкулаў [7; 8].

Дзякуючы гэтым і іншым даследаванням захаваліся імёны найбольш яркіх выканаўцаў свайго часу – куміраў публікі, заканадаўцаў масавых музычных густаў, нярэдка пачынальнікаў таго ці іншага кірунку, выканальніцкага стылю, жанру. Адным з самых яркіх спевакоў на рускай эстрадзе пачатку XX стагоддзя быў Саша Давыдаў (1850–1911) – легендарны выканаўца рамансаў. У гісторыі эстрады яму належыць заслуга ў прыўнясенні ў выкананне раманса драматургічнай распрацоўкі, пачатак культуры сцэнічнага ўвасаблення вакальнага жанру на эстрадзе. «В зале раздались всхлипывания. Разрастались рыдания. Кого-то вынесли без чувств. Кто-то с громким плачем выбежал из ложи», – так апісваў журналіст У. Дарашэвіч уражанне публікі ад удзелу Давыдава ў спектаклі «Цыганскія песні і рамансы ў асобах» маскоўскага тэатра «Эрмітаж» з выкананнем рамансаў «Пара гнядых», «Плач» і «Ночанька» [7, с. 38–39].

Як аб буйных з’явах расійскай эстрады пачатку XX стагоддзя трэба казаць аб творчасці Н. Вяльцавай, В. Панінай, Н. Абухавай. Акцёрскае майстэрства, прыўнесенае спявачкамі ў выкананне раманса, дагэтуль прымушае асацыіраваць іх імёны з іх рэпертуарам. Паказальныя назвы выдадзеных на пачатку XX стагоддзя спеўнікаў: «Цыганские романсы, петые А. Д. Вяльцевой» (Масква, 1905), «“Лебединая песня” и другие цыганские песни, петые В. Паниной» (Масква, 1907).

У сувязі з цяжкасцямі па ўзнаўленні факталогіі гісторыі беларускай эстрады да XX стагоддзя ў аснову метадалогіі даследавання можа легчы рэканструяванне карціны беларускага музычнага гарадскога побыту па аналогіі з хронікай эстрады Расійскай імперыі. У гэты час эстраднае жыццё краіны дасягае неверагоднай інтэнсіўнасці і разнастайнасці. І. Несцьеў адзначае ўсплёск новых жанраўтваральных працэсаў, звязаны з узаемадзеяннем розных нацыянальных і сацыяльных культур: «Исконно национальные жанры, бытовавшие в России, соседствовали с импортным искусством французских шансон и заокеанских синкопированных танцев» [6, с. 20]. Эстрадныя жанры дыферэнцыраваліся ў адпаведнасці з саслоўным падзелам публікі: зоркі выступалі ў дарагіх рэстаранах, на падмостках дваранскіх клубаў (адны з іх з’яўляліся на эстрадзе ў салонным фрачным уборы, іншыя ў модным абліччы «галётнікаў-абадранцаў»), а папулярныя хоры «лапцюжнікаў», куплетысты, балалаечнікі абслугоўвалі дэмакратычную публіку летніх паркаў і манежаў, кірмашовых і садовых забаў. У беларускіх губернях асабліва папулярнымі былі выступленні хораў пад кіраўніцтвам У. Тэраўскага, П. Яблонскага. Вядома, што пасля рэвалюцыі хор Тэраўскага ўвайшоў у трупу БДТ-1, звесткі аб чым змяшчаюцца ў дакументах з архіва НАРБ [17], але актыўна працягваў выступаць і самастойна.

Рэвалюцыя 1917 года пазначыла рэзкі перелом ва ўсіх сферах культуры і пачатак новага гістарычнага этапу іх развіцця.

***Першы паслярэвалюцыйны перыяд*** развіцця эстрады Беларусі можна ўмоўна падзяліць на два этапы. *1917–1920-я гады* – час стварэння новых формаў эстраднай культуры: тэатраў рэвалюцыйнай сатыры; харавых і іншых самадзейных калектываў; масавай песні. Стыхійна нараджаюцца (або адраджаюцца) новыя відовішчныя формы – канцэрты-мітынгі, масавыя выступленні на плошчах. Песні рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, а таксама маршавыя песні аб будаўніцтве новага свету становяцца на чале эстраднага рэпертуару.

Рэпертуар жа, папулярны да рэвалюцыі (цыганскі раманс, салонны раманс, шансанеткі), падпадае пад забарону, накладзеную ўказамі Аб'яднанай тэатральнай управы БССР па кантролі за рэпертуарам [18]. Напрыклад, раманс «Выхожу один я на дорогу» быў адхілены за «містычны характар», а раманс «Пара гнядых», па меркаванні Л. Лебядзінскага, узнаўляў брудны быт мінулага з яго адносінамі да жанчыны як да ўцехі. Палажэнні аб ідэалагічнай «чужароднасці» і «шкоднасці» гэтага жанру абгрунтоўваліся ў артыкулах правадыроў пралетарскай музыкі – членаў РАПМ Л. Лебядзінскага, Д. Жытомірскага, У. Белага, Н. Чэмберджы, М. Каваля, Ю. Келдыша. Рэзалюцыя Першай канферэнцыі па пытаннях музычнай палітыка-асветніцкай працы (1926), што заклеймавала «цыганшчыну», «бульваршчыну», «музычны самагон», стала, на самай справе, пачаткам кампаніі супроць вялікага рэпертуарнага пласта вакальнай эстрады.

Задачай эстрады аб'яўляецца палітычная агітацыя сродкамі тэатра. Эпіцэнтр эстраднага жыцця перамяшчаецца ў тэатральныя (самадзейныя і прафесійныя) калектывы. Так, з паведамлення кіраўніка Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатра У. Галубка ў Галоўпалітасвету дазнаёмся:

*«Пасьля працы трупы ў Гомлі, трупа перакачавала ў м. Быхаў, дзе працавала у працягу 8-мі дзён, было дадзена 7 спэктакляў і 2 канцэрты. Пры чым трупа прыймала ўдзел у дзень 10/VII (вызваленне Беларусі ад белапалякаў). Быў дадзен дармовы канцэрт у гэты вечар.*

*Досыць значную працу трупа зрабіла у г. Шклове, а затым на фабрыцэ «Спартак», дзе было дадзена 10 спэктакляў і 2 канцэрты, пры чым 2 спэктаклі былі дармовыя для рабочых фабрыкі. Надзвычайна вялікую ўвагу звярталі на Беларускі тэатр рабочыя фабрыкі «Спартак» у Шклове, бо не хацелі трупу адпушчаць.*

*З 25/VII трупа працуя у м. Копысі, а затым з 1/VIII перакачуя ў г. Лепель. (26/VII.1926. Копысь)»* [19].

Эстрадны канцэрт заняў значнае месца ў рэпертуары тэатра рэвалюцыйнай сатыры. Першы Тэатр рэвалюцыйнай сатыры быў адкрыты 7 лютага 1920 года ў Віцебску. На чале тэатра стаў М. А. Разумны – акцёр, які раней працаваў у эстрадным тэатры «Крывое люстэрка». Ігралі штодня, часам па некалькі спектакляў у дзень, у частках рэгулярнага войска, у працоўных раёнах, у вёсках, у Віцебску – у памяшканні кінатэатра «Рэкорд» на Смаленскай вуліцы. Праграмы складаліся з некалькіх нумароў і доўжыліся ад трыццаці хвілін да гадзіны з паловай.

Значнае месца ў выступленнях віцебскага тэрэўсата займалі палітпрыпеўкі, якія ўключаліся ў так званыя «палітсатыры»: «Каўчэг Тэрэўсата», «Ліст Ллойд Джорджу», «Полька», «Палітмазурка», «Пятлюра і Польшча». Палітсатыры – гэта тып эстраднай пародыі на Антанту, тэатралізаванае відовішча са спевамі, гаворкай і танцамі. «На сцену выходили три или четыре представителя Антанты, например Черчилль, Пуанкаре, Келлог, – распавядаў Пустынін, – одетые в соответствующие костюмы; они танцевали, пели куплеты, грозили большевикам ... Куплеты и танцы хорошо принимались аудиторией» [8, с. 120].

Вясной 1920 года віцебскі тэрэўсат гастраляваў у Маскве. Выступленні прайшлі паспяхова, і тэатр застаўся ў сталіцы. Разам з шэрагам новых артыстаў (Л. Уцёсаў, У. Тапаркоў, І. Гораў і інш.) у трупу прыйшоў Д. Гутман, які пазней стаў адным з вядомых рэжысёраў эстрады.

Віцебскі Тэатр рэвалюцыйнай сатыры можна лічыць прамым папярэднікам «Сіняй блузы», якая, у сваю чаргу, аказала сур'ёзны ўплыў на фарміраванне айчыннай эстрады.

Уплыў эстэтыкі тэрэўсатаў выяўляецца ў жанры масавай песні, якая на доўгія гады стала вядучым эстрадным вакальным жанрам і выціснула з эстрады ўсе іншыя формы. Разам са зменай жанраў ссоўваецца і акцэнт у сінтэзе кампанентаў эстраднага нумара. Калі ў 1920-я гады пры ўсёй стракатасці рэпертуару працягвала, як і ў пачатку стагоддзя, дамінаваць культура саліста-выканаўцы, то са сцвярджэннем масавай песні ў 1930-я гады значэнне асобы выканаўцы нівеліруецца, і пануючае становішча займае сама песня.

***Наступны этап*** развіцця эстрады Беларусі – *1930-я гады* – адзначаны ўзмацненнем ролі прафесійнага кампазітара ў стварэнні твораў эстраднага мастацтва. У пошуках новага стылю, які адказвае запытам часу, кампазітары засноўваліся на багатых традыцыях народна-песеннай творчасці, лепшых рэвалюцыйных гімнах, песнях грамадзянскай вайны, а таксама вопыце рускай кампазітарскай школы XIX стагоддзя. У песенным жанры актыўна працавалі кампазітары І. Любан, Н. Сакалоўскі, М. Чуркін, Р. Пукст, Я. Цікоцкі.

Прафесіяналізацыі культуры эстрадна-песеннай творчасці спрыяла ўзнікненне Саюза кампазітараў Беларусі, а таксама заснаванне Беларускай дзяржаўнай філармоніі (1937) і адкрыццё ў ёй Эстраднага бюро (у 1939 годзе вылучана ў аб'яднанне «Белдзяржэстрада»). Да 1941 года Белдзяржэстрада мела два аддзяленні (у Брэсце і Беластоку) і два эстрадныя аркестры. У гэты час пашыраецца практыка выступленняў мабільных эстрадных брыгад. Сярод папулярных тэматычных праграм – «Вобраз Леніна і Сталіна ў мастацтве і літаратуры», «Сталінскае племя», «Моладзь краіны Саветаў», «Я – грамадзянін Савецкага Саюза», «Песні народаў СССР», «Песні савецкіх кампазітараў».

Хоць у цэлым да эстрады захоўвалася некалькі паблажлівае стаўленне афіцыйнай крытыкі, фактам прызнання яе ўзроўню можна лічыць правядзенне Першага Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады (1939), лаўрэатам якога ў галіне эстрадных спеваў стала К. Шульжэнка з песняй «Запіска» (М. Бродскі, П. Герман).

***Ваенныя гады*** не прынята вылучаць у асобны перыяд развіцця мастацтва, бо ўсе сілы краіны былі мабілізаваны на барацьбу з ворагам, а не на культурныя здзяйсненні. Аднак менавіта ў гады Вялікай Айчыннай вайны эстрадная песня з рэпертуару франтавых канцэртных брыгад была надзвычай запатрабаваная і актыўна развівалася. Яе жанравая разнастайнасць узбагацілася ваеннай тэмай, а таксама цэлым суквеццем выдатных лірычных песень, якія да сённяшняга дня застаюцца любімымі і запатрабаванымі публікай.

Пастановай Савета Народных камісараў БССР № 14 ад 04.01.1946 года [20] аднаўляецца праца Беларускай дзяржаўнай эстрады. Ідуць пошукі форм працы і работа па стварэнні калектываў: тэатра «Вадэвіль», ансамбля аперэты (абодва хутка расфарміраваны па кадравых прычынах), тэатра ілюзій «Маргамакс», ансамбля драмы і камедыі і інш. Пасля непрацяглай стадыі стабілізацыі пачынаецца ***другі этап*** развіцця вакальнай эстрады Беларусі (1950–1960-я гады), які адзначаны канцэптуальнай накіраванасцю ва ўсіх канцэртных формах творчасці эстрады.

У творча-вытворчым і рэпертуарным плане працы Белдзяржэстрады на 1954–1955 гг. [23] значацца тры штатныя тэматычныя брыгады, у якіх працуюць артысты-вакалісты В. Гаскарава і А. Кардымон (сола і дуэт), У. Ліснеўская, П. Аверчанка (музычная эксцэнтрыяда), Н. Наследнік, У. Кобленц. У рэпертуарным плане артыстаў Белдзяржэстрады на першае паўгоддзе 1959 года ўжо фігуруюць 14 вакалістаў, сярод якіх – яркі выканаўца Эдуард Міцуль з песнямі Ю. Семянякі, М. Фрадкіна, Біксіо, Тургеля ў рэпертуары [22].

Пытанні рэпертуару, выканальніцкай інтэрпрэтацыі, сцэнічнага вырашэння канцэртаў, удзелу ў конкурсах, гастрольных паездках і дзяржаўных святочных мерапрыемствах абмяркоўваліся на пасяджэннях мастацкага савета на чале з мастацкім кіраўніком «Белдзяржэстрады» народнай артысткай БССР В. Мальковай. Захаваныя пратаколы пасяджэнняў мастацкага савета Белдзяржэстрады сведчаць пра рост патрабаванняў да якасці працы артыстаў. Так, у адказ на заяву Ф. Фаменкі аб устанаўленні яму тарыфнай стаўкі вакаліста, мастацкі савет прымае рашэнне: «предложить тов. Фоменко подзаняться с аккомпаниатором тов. Жезмером и режиссером Потехиным и после просмотра можно будет установить ему ставку 980 рублей» [21].

Эстрадныя брыгады Канцэртна-эстраднага бюро Белдзяржфілармоніі рыхтавалі свае праграмы на працягу некалькіх месяцаў. Для таго, каб праграма была дапушчана на сцэну, ёй было неабходна набыць станоўчыя водгукі шасці мастацкіх саветаў (некаторыя з іх налічвалі ў сваім складзе да 60 чалавек). Праграму абмяркоўвалі і зацвярджалі спачатку ў малым і вялікім мастацкім саветах Канцэртна-эстраднага бюро, затым у малых і вялікіх мастацкіх саветах Белдзяржфілармоніі, і, нарэшце, у рэпертуарнай калегіі і вялікім мастацкім савеце Міністэрства культуры. Зацвярджэнне праграмы ва ўсіх інстанцыях праходзіла па шматлікіх пазіцыях: рэпертуар, наяўнасць твораў беларускіх аўтараў, карыснасць для гледача, выхаваўчыя і ідэалагічныя функцыі кожнай песні, яе мастацкія, забаўляльныя, эмацыянальныя якасці і г. д. Асабліва дбайна адсочваліся тэксты песень: кожная фраза павінна была мець дасканалую форму і зразумелы, па магчымасці, пазітыўны змест.

Усебаковы кантроль за функцыянаваннем эстрадных калектываў і выканаўцаў, вызваленне ад якога сёння ўспрымаецца як адно з дэмакратычных дасягненняў, на самай справе меў значную станоўчую функцыю. Ён стрымліваў выхад на вялікую сцэну непрафесійных выканаўцаў ці

недапрацаваных нумароў, прымушаў артыстаў эстрады ўдасканальваць прафесійнае майстэрства на працягу ўсяго творчага жыцця, працягваючы работу з рэжысёрамі, педагогамі па вакале, балетмайстрамі.

На жаль, многія каштоўныя набыткі ў арганізацыі і функцыянаванні сістэмы эстраднага мастацтва мінулага сёння страчаны.

У выніку наладжвання сістэмы вытворчасці і кантролю ў галіне эстраднага мастацтва ўдасканальваецца якасць і пашыраецца стылявая разнастайнасць вакальнай эстрады. Перыяд «адлігі» і VI Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў у Маскве (1957 г.) дазваляюць загучаць са сцэны прыйшоўшым з захаду рытмам свінга, твісту, рок-н-рола і г. д. Багаццю і разнастайнасці рэпертуару эстрадных праграм таго часу могуць пазайздросціць сучасныя слухачы: гэта песні народаў СССР, беларускія народныя песні, масавыя песні грамадзянскай і палітычнай скіраванасці, ваенна-патрыятычныя песні, эстрадныя песні, старадаўнія рускія рамансы.

У 1959 годзе на падставе Пастановы Савета Міністраў БССР № 252 ад 13.04.1959 г. і загада Міністэрства культуры БССР № 148 ад 20.04.1959 г. Белдзяржэстрада была ўведзена ў склад філармоніі ў якасці канцэртна-эстраднага бюро. Кваліфікаваныя рэжысёры і настаўнікі па спевах, балетмайстары і канцэртмайстары ўзялі шэфства над эстраднымі артыстамі і ў сумеснай рабоце дасягнулі значнага павышэння мастацкага ўзроўню працы.

Вялікі ўклад у развіццё беларускай эстрады гэтага перыяду зрабілі вакалісты В. Кучынскі, стваральнікі ВІА «Арбіта-67» Н. Багуслаўская і І. Каплан, І. Вішнеўская, М. Шуманскі, У. Юневіч, І. Веселі, Э. Міцуль, А. Святлова, Ф. Севасцьянаў, В. Вуячыч, В. Шутава, З. Кульпа, рэжысёры эстрады Б. Ямпольскі, З. Гурыч.

У 1970–1980-я гады адзначаюцца вялікія змены ў жанравай і стылявой палітры эстрады, што дазваляе вылучыць ***трэці этап*** развіцця эстраднага вакальнага мастацтва. Узрастае роля індывідуальнай аранжыроўкі, у стварэнні якой удзельнічаюць тэхнічныя навінкі; зараджаецца рок-культура; шырокае распаўсюджанне атрымлівае тэлевізійная эстрада.

Нягледзячы на «жалезную заслону», савецкаму слухачу ўдаецца пазнаёміцца з творчасцю груп «Бітлз», «Ролінг стоунз», «Крыдэнс». На змену культуры масавай песні або саліста-вакаліста цвёрда прыходзіць культура вакальна-інструментальнага ансамбля. Вядомай асобай беларускай эстрады становіцца Уладзімір Мулявін і ансамбль «Песняры», для якіх характэрна індывідуальнае злучэнне беларускага фальклору і інструментальнага рока, тыпова купалаўскія выявы «беларускіх мужыкоў» [1].

ВІА «Песняры» распачаў сваю працу ў складзе філармоніі ў 1969 годзе. Хутка адзін за другім ствараюцца іншыя ВІА рознай стылявой арыентацыі: «Верасы» пад кіраўніцтвам В. Раінчыка (з 1973 года), ВІА пад кіраўніцтвам У. Бадзярава (з 1973 года), «Чараўніцы» пад кіраўніцтвам Г. Лятынскага (з 1974 года), «Праспект», рок-група «Сузор'е» пад кіраўніцтвам У. Пучынскага (з 1977 года, у складзе БДФ – з 1980 года), «Тоніка» пад кіраўніцтвам А. Эскіна, пасля В. Вуячыча і шмат іншых. На базе Гомельскай абласной філармоніі ў 1974 годзе пачаў работу ансамбль «Сябры» пад кіраўніцтвам А. Ярмоленкі.

Менавіта ў вышэйназваных ВІА пачалі сваю творчасць многія сённяшнія лідары эстраднай песні. Кожнаму з гэтых калектываў быў уласцівы свой непаўторны стыль, свая вобразная і тэхналагічная палітра, сваё кола аўтараў. Назіраецца значнае пашырэнне рэпертуару за кошт аўтарскай песні (песні У. Высоцкага і А. Длускага ў рэпертуары ансамбля «Сейф-пасаж»), а таксама рок-музыкі. У творчасці «Песняроў» адбываецца станаўленне жанру рок-оперы.

На самы высокі ўзровень выходзіць крытыка па праблемах эстрады, ад якой застаецца адзін крок да пачатку яе сур'ёзнага мастацтвазнаўчага вывучэння. Няхай яшчэ і з аблічальным адценнем на пачатку 1980-х гадоў на старонках часопіса «Савецкая музыка» разгортваецца дыскусія, распачатая выступленнем старшыні СК СССР Ц. Хрэннікава на VI з'ездзе кампазітараў. У дакладзе «Вялікая місія савецкай музыкі», апублікаваным у першым нумары часопіса за 1980 год, ён казаў аб хвалюючых тэндэнцыях у развіцці вакальнага жанру на сучасным этапе, аб праблеме маральна-эстэтычных каштоўнасцей. Было адзначана, што, нягледзячы на жанравае багацце савецкай масавай музычнай культуры і трывалае зліццё вялікіх грамадзянскіх тэм з «асабістай, асобаснай інтанацыяй іх увасаблення», у эстрадным мастацтве існуе небяспечная спакуса

«пафранціць» адпрацаваным прыёмам, які раней ці пазней прывядзе да штампа. Па словах прамоўцы, «при слушании иных опусов популярных композиторов возникает ощущение отлично налаженной звуковой индустрии, когда убожество мелодии автор пытается скрыть в записи специальными акустическими эффектами. Требование же одухотворенности, благородства содержания равно применимо и к так называемому легкому жанру, как и ко всем другим жанрам советской музыки» [12, с. 16]. Спецыялізаваным выданнем, прысвечаным эстраднаму мастацтву Савецкага Саюза, стаў часопіс «Советская музыка и цирк».

Сімптаматычнай з'явай, акрэсліўшай мяжу паміж суседнімі перыядамі развіцця эстраднага мастацтва, стала масавая культура 1980-х гадоў. Адначасова з росквітам творчасці ВІА, у большасці сваёй «афіцыйна ўхваленай», пазначылася ўзмацненне «пратэстнай» сферы, цэнтрам якой стала рок-культура (не выпадкова назвай адной з расійскіх рок-груп стала абрэвіятура АВІА, што значыла «анты-ВІА»). Рок-музыка як разнавіднасць тэатральна-відовішчнага канцэртнага мастацтва, безумоўна, можа быць аднесена да віду вакальнай эстрады, нягледзячы на яе дэманстратыўнае адмежаванне ад іншай часткі эстраднай музыкі (так званай папулярнай) і вымушаны ўход часткі рок-выканаўцаў у андэграўнд. Аднак пэўны працэнт рокераў усё ж упісаўся ў працуючую філарманічную сістэму. У Беларусі пакаленне рок-музыкантаў было прадстаўлена групамі «Вішус крусэйд», «Мроя», «Унія», «Крама», «Уліс», «NRM», «Палац», пазней – групамі «Крамбамбуля», «Ляпіс Трубяцкой», «Цягні-штурхай» і інш.

З падзеннем жалезнай заслоны (1989) і распадам СССР (1991) пачынаецца ***сучасны этап*** развіцця эстраднага мастацтва Беларусі. У ім відавочныя дзве тэндэнцыі: канчатковы ўход часткі эстраднай культуры ў андэграўнд і, наадварот, выхад іншай часткі эстрадных выканаўцаў у сферу неабмежаванай папулярнасці з дапамогай узмоцненай прапаганды ў СМІ.

Дамінуючым фактарам у абнаўленні эстрадных жанраў становіцца камерцыялізацыя культуры. Прыбытак ад дзейнасці эстрадных артыстаў заўсёды быў значным, аднак у 1990-я гады меркантыльныя інтарэсы становяцца вырашальнымі ў «прасоўванні» эстраднага прадукту да спажыўца. Да неверагодных вышынь узрастае роля відовішча – шоу. З'яўляецца новая форма эстраднага прадстаўлення – гала-канцэрт адной «зоркі» з багатым і відовішчным антуражам. Як адзначае тэатразнаўца Т. Цецераўкова, «за ... превалированно-эстрадным вниманием к форме зачастую исчезает содержание, не возникает органичного единства формы и содержания» [9, с. 8].

У гэты час для песеннага жанру становяцца характэрнымі рысы шлягера, у апрацоўцы выкарыстоўваюцца дасягненні рок-музыкі, джаза. Неверагоднай папулярнасцю карысталіся песні Я. Глебава і І. Паліводы. Для творчага пошуку кампазітара Д. Еўтуховіча ўласцівыя сувязь нацыянальнага фальклору з сучаснай мовай эстраднай музыкі, а таксама прыцягненне новых сродкаў кампазітарскага пісьма і тэхнікі. Асабліва папулярныя песні А. Елісеенкава, якія гучаць на міжнародных фестывалях: «Славянскі базар» у Віцебску, «Шлягер-90» (Санкт-Пецярбург), «Вільнюс-93» і інш. Самыя яркія па нацыянальнай прыкмеце – эстрадныя песні Л. Захлеўнага: «Усе кветкі ліпеня» (сл. А. Жукава), «Пайду каля броду» (У. Карызна). Вядомыя меладычныя і выразныя песні Я. Іванова («Салаўіная рэчка» на сл. М. Знак), арыгінальныя па стылістыцы песні У. Будніка, У. Прохарава, У. Дамарацкага. Песням кампазітараў падарылі і працягваюць дарыць жыццё музычныя калектывы «Песняры», «Сябры», «Верасы», «Тэатр песні» (Я. Паплаўская і А. Ціхановіч), салісты Я. Еўдакімаў, Д. Смольскі, В. Дайнека, М. Скорыкаў і інш.

Эстрадная песня становіцца лідарам сярод эстрадных мастацтваў. Рост запатрабаванняў у колькасці і якасці вакальнай эстраднай прадукцыі ініцыюе цэлы шэраг сацыяльных вынікаў. Нараджаюцца новыя спецыяльнасці: аранжыроўшчыкі, піяр-менеджары, стылісты, іміджмэйкеры, дызайнеры, спецыялісты па камп'ютарнай графіцы і відэаэфектах, якія прама ці ўскосна ўдзельнічаюць у стварэнні эстраднага нумара. Нараджаюцца новыя мастацкія віды – відэакліп і медыякліп. Іншыя ж віды дзейнасці, наадварот, губляюць актуальнасць. Практыка стварэння фанаграмы з дапамогай электронных інструментаў і сродкаў пастуپова прыводзіць да скасавання ролі «жывога» інструментальнага гуку як выразнага сродку і важнага мастацкага кампанента вакальна-эстраднага нумара. Тэхнізацыя акампанементу аптымізуе працэс стварэння музычнага матэрыялу для эстрады, але выключае індывідуальную выканаўчую інтэрпрэтацыю, «клішыруе» аднастайны набор электронных інструментаў і прыёмаў іх выкарыстання. Адсутнасць эма-

цыянальнага і музычнага ўзаемадзеяння паміж салістам і групай суправаджэння часта прыводзіць да спрашчэння трактоўкі песні, ігнаравання законаў вакальнага выканальніцтва, а работа вакаліста нярэдка ператвараецца ў механічнае выкананне задачы «трапіць у такт», не адстаць ад электроннай «шарманкі».

З боку арганізацыі эстраднага жыцця Беларусі змены звязаны з чарговым перарэфармаваннем: канцэртна-эстраднае бюро Белдзяржфілармоніі пераходзіць на баланс Мінскканцэрта (прыказ МК БССР № 13 ад 24.01.1990), а ў 2005 годзе – да адасобленага структурнага падраздзялення «Белканцэрт», у якім працуюць шмат вядомых артыстаў-вакалістаў: Алеся (В. Ярмоленка), С. Герасімаў, І. Дарафеева і «Тэатр песні І. Дарафеевай», Дамініка (Ю. Барыла), Андрэй Хлястоў, Стэла (С. Карааглáнава), Влада (В. Здункевіч). З’явіліся музычныя прадзюсарскія цэнтры «Спамаш», «Арт студыя» А. Ціхановіча і Я. Паплаўскай, «НонСторРэкардс», «МюзікСтар».

Знамянальнай падзеяй стала адкрыццё ў Мінску ДТВУ Маладзёжны тэатр эстрады, мастацкім кіраўніком якога стаў дасведчаны эстрадны выканаўца, мастацкі кіраўнік папулярнага ВІА «Верасы» В. Раінчык. Галоўным рэжысёрам тэатра працуе В. М. Панін – вядомы пастаноўшчык эстрадных спектакляў, эстрадных відовішчаў для дзяцей, масавых свят, настаўнік некалькіх пакаленняў рэжысёраў эстрады, выпускнікоў БДУКіМ розных спецыяльнасцей Н. Осіпавай, М. Трацціяковай, К. Дабравольскага, І. Дарафеевай, артыстаў комік-шоу-групы «Доктар Гумар» і інш. Тэатр сканцэнтраваў пад сваім дахам самых вядомых сёння беларускіх эстрадных артыстаў: І. Афанасьеву, І. Абалян, В. Вронскую, Гюнеш (Г. Абасова), Жанэт (Ж. Бутерус), В. Плотнікаву, Аляксея Хлястова і г. д. У назве гэтага калектыву шчасліва злучыліся два найважнейшыя кампаненты эстраднага мастацтва – уласна музычны і тэатральны, што раскрывае самую сутнасць вакальнай эстрады як мастацтва тэатральна-відовішчнага, у якім «актерское мастерство и есть то объединяющее начало, которое связывает между собой все жанры эстрады» [9, с. 24].

Аднак нягледзячы на тое, што наладжваецца сістэма выхавання эстрадных артыстаў-вакалістаў і беларускія выканаўцы прымаюць удзел у спецыялізаваных конкурсах, маладым прадстаўнікам беларускай вакальнай эстрады трэба яшчэ шмат працаваць над прафесійным удасканаленнем, каб універсальны акцёр, які б аднолькава віртуозна валодаў вакальнай і акцёрскай тэхнікай, назаўжды не застаўся ў гісторыі мінулага стагоддзя.

Трэба адзначыць, што тэхнічны прагрэс, які значна палепшыў і палегчыў тэхналогію стварэння вакальна-эстраднага нумара, аказаў і негатыўны ўплыў на сучаснага эстраднага артыста. Аднойчы створаная фанаграма «плюс» дазваляе артысту больш не працаваць над вакальнай формай і нават не распявацца перад канцэртам, зводзіць да мінімуму яго жывую канцэртную практыку, не дазваляе выканаўцы на сцэне працягнуць работу над шліфоўкай твора, выплеснуць сваю энергію, праявіць здольнасць да імправізацыі, ператварае акт выступлення перад аўдыторыяй у сапраўдную руціну. Многія эстрадныя спевакі не маюць голасу, прыдатнага для выступлення перад масавай аўдыторыяй, не валодаюць інтанацыйна-тэмбравай палітрай голасу і методыкай работы над мастацкім вырашэннем твора, па-за завучаных танцавальных звязак дэманструюць пластычную бездапаможнасць. Гэтыя моманты патрабуюць пільнай увагі артыста і яго «каманды», бо яны, на жаль, больш не падлягаюць абмеркаванню і ўздзеянню з боку афіцыйных мастацкіх органаў.

Адзіным, ад чаго цесна залежала эстраднае мастацтва на ўсіх этапах развіцця і працягвае залежыць у цяперашні час, застаецца запатрабаванне аўдыторыі. Але менавіта на сучасным этапе, ва ўмовах надзвычайнай камерцыялізацыі эстраднай культуры, мэта эстрады – задаволіць патрэбы публікі – становіцца вырашальнай. У працэсе дасягнення гэтай мэты фарміруецца новае паняцце, якое вызначае жыццяздольнасць эстраднага прадукту ў барацьбе за спажыўца – «фармат».

Гэтае слова гучыць зараз адусюль, ім актыўна карыстаюцца ўдзельнікі эстраднага жыцця, але яно застаецца ў большай ступені «фантомам», чым зразумелай дэфініцыяй. Тэрмін «фармат», які этымалагічна бярэ пачатак ад слова «форма» і тым самым дэманструе свае глыбокія карані ў мастацтвазнаўстве, закліканы зафіксаваць ступень актуальнасці выканаўцы і яго адпаведнасць самым актуальным запатрабаванням публікі. Разважаючы над зместам гэтага паняцця, прыходзім да высновы, што пад словам «фармат» разумеецца **сфарміраваны на перакрыжаванні**

**спажывецкага попыту і творчага прапанавання пэўны эстрадны *тыпаж*, які ўяўляе сабой комплекс музычных** (рэпертуар) **і візуальных** (сцэнічны вобраз і сцэнічныя паводзіны) **кампанентаў, а таксама ў значнай ступені – анталагічных кампанентаў** – выкладзенага праз інтэрв'ю, свецкую хроніку і г. д. сацыяльнага стэрэатыпу, светапогляднага комплексу, прыкладу для пераймання.

«Трапіць у фармат» – значыць трапіць у адпаведнасць актуальнаму тыпажу, які мяняецца штодня. На сённяшні дзень склаліся некалькі запатрабаваных тыпажоў, у вобразе якіх працуюць (і нават «жывуць») эстрадныя артысты. У фармаце сёння «новая руская песня», прадстаўленая Н. Кадышавай і Н. Бабкінай, шансон, эратычная «жанчына-вамп» ці «рознакаляровае» жаночае трыо, «салодкія хлапчукі», брутальныя мужчыны альбо «надзейныя мужыкі» («Любэ», «Цягні-штурхай» і ўсе армейскія калектывы). Кожны з фарматных тыпаў з'явіўся дакладна ў адпаведнасці са з'яўленнем попыту на яго. і кожны з іх знікае разам са зніжэннем яго актуальнасці (як знікла цікавасць да вобраза «жанчыны-сяброўкі ля вогнішча з гітарай», наогул да каштоўнасцей «з мілым рай у шалашы»).

Кампаненты паняцця «фармат» звычайна працуюць паралельна, падмацоўваючы адзін адно (візуальны адпавядае музычнаму і г. д.). Але ў якасці мастацкага прыёму свядома выкарыстоўваюцца і іх супрацьлеглыя злучэнні, вынікам чаго становіцца парадыйна-фарсавы элемент («Ляпіс Трубяцкой», «Крамбамбуля»).

Вывучэнне зместу паняцця «фармат» неабходна з прычыны таго, што кожны эстрадны артыст абавязкова становіцца прыкладам для пераймання, кумірам для пэўнай, нярэдка вельмі шырокай, сацыяльнай групы.

Толькі з нядаўняга часу пачалося навуковае даследаванне гісторыі і тэорыі вакальнага эстраднага мастацтва Беларусі і фарміруецца яго ўспрыманне як асобнай галіны мастацтвазнаўства. Ідучы па шляху вядомых даследчыкаў савецкай эстрады Ю. Дзмітрыева, Е. Уваравай, С. Кліціна, І. Багданава, І. Шароева, беларускія мастацтвазнаўцы Н. Карчэўская, В. Брылон, Н. Бунцэвіч, А. Карпілава, Д. Падбярэзскі імкнуцца асэнсаваць феномен эстраднага мастацтва на нацыянальным матэрыяле. Мастацтва, якое сёння мае велізарны эстэтычны і мастацкі ўплыў на людзей, паступова становіцца прадметам сістэмнага навуковага вывучэння.

## Літаратура


1. Владимир Мулявин. Нота судьбы: Воспоминания, интервью, исследования / Ред.-сост. Л. Крушинская. – Минск: Маст. літ., 2004. – 446с.
2. З о р к а я, Н. М. На рубеже столетий. У истоков массового искусства в России в 1900–1910 гг. / Н. М. Зоркая. – М.: Наука, 1976.
3. К л и т и н, С. Эстрада. Проблемы теории, истории и методики / С. Клитин. – Л., 1987.
4. К л и т и н, С. С. Эстрадные заведения: Пятнадцать очерков для профессионалов-любителей / С. С. Клитин. – М.: Рос. нац. б-ка, 2004.
5. К у г е л ь, А. Р. Театральные портреты / А. Кугель. – Сб. ст. – Л.-М.: Искусство, 1967.
6. Н е с т ь е в, И. В. Звезды русской эстрады (Панина, Вяльцева, Плевицкая) / И. В. Нестьев. М.: Сов. композитор, 1974. – 175 с.
7. Очи черные: Старинный русский романс. – М.: Эксмо, 2004.
8. Русская советская эстрада. Очерки истории, 1917–1929 / Отв. ред. Е. Д. Уварова. – М.: Искусство, 1976. – 406 с.
9. Т е т е р е в к о в а, Т. И. Проблемы взаимодействия современного драматического театра и эстрады / Т. И. Тетеревкова. – [Электронный ресурс]: Дис. ... канд. искусствоведения: 17.00.01. – М.: РГБ, 2003. – 171 с.
10. У истоков развлекательной культуры России Нового времени XVIII-XIX вв.: [сб. ст.] / Гос. ин-т искусствознания; [ред.-сост. Е. В. Дуков]. – М.: Гос. ин-т искусствознания, 1996. – 252 с.
11. У в а р о в а, Е. Д. Как развлекались в российских столицах / Е. Д. Уварова. – СПб.: Алетейя, 2004. – 280 с.
12. Х р е н н и к о в, Т. Великая сила советской музыки / Т. Хренников // Советская музыка. – 1980. – № 1. – С. 2–23.
13. Ш и б е к о, З. В. Минск: Страницы жизни дореволюционного города / З. В. Шибеко, С. Ф. Шибеко. – Минск: Полымя, 1990. – 352 с.
14. Щ е р б а к о в а, Т. А. Музыка быта и русская профессиональная музыкальная культура XIX века: исследование / Т. А. Щербакова. – Минск: БГАМ, 2006. – 277 с.
15. Щ е р б а к о в а, Т. А. Цыганское музыкальное исполнительство и творчество в России / Т. А. Щербакова. – М.: Музыка, 1984. – 175с.
16. Эстрада в России. XX век. Лексикон. – М.: Рос. полит. энцикл. (РОССПЭН), 2000. – 784 с.

17. Вынікі азнаямленьня Камісіі НКАБ у складзе т. т. Даўгаполава, Красінскага і Рубенчыка з працай Беларускага Дзяржаўнага Тэатру // НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. Т. 1. – Спр. 1064. – Л. 79–80.
18. Основные положения Главлитпросвета РСФСР о театральной политике, протоколы // НАРБ. – Фонд 42. – Оп. 1. – Д. 1048. – Л. 86.
19. Паведамленьне У. Галубка ў Галоўпалітпрасьвет Н. К. А. // НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. Т.2 – Спр. 294. – Л. 106.
20. Приказы управления по делам искусств при СМ БССР. Устав и приказы Белгосэстрады по основной деятельности // БГАМЛИ. – Фонд 115. – Оп. 1. – Д. 1. – Л. 21.
21. Протокол № 4 художественного совета // БГАМЛИ. – Фонд 115.– Оп. 1. – Д. 36. – Л. 10.
22. Репертуарный план артистов Белорусской государственной эстрады на 1-е полугодие 1959 года // БГАМЛИ. – Фонд 115. – Оп. 1. – Д. 60. – Л. 1–3.
23. Творческо-производственный и репертуарный план работы Белорусской государственной эстрады на осенне-зимний сезон 1954–1955 гг. // БГАМЛИ. – Фонд 115. – Оп. 1. – Д. 30.– Л. 12–13.

*A. V. SEMIKOVA*

**VOCAL POPULAR ART OF BELARUS: STAGES OF FORMATION AND DEVELOPMENT IN XX CENTURY**

## Summary

The article presents an overview of the historical development of vocal popular genres in Belarus. Author highlights the major milestones in changes of genre and the style accents of popular vocal art in XX century and up to nowadays. There is an offer to differ periods in its development. Core set of artistic problems in the modern popular music has been emphasized. Current meaning of the actual concept of «format» has been formulated. Separation of scientific studies of the popular vocal art phenomenon from its practical role and significance in the modern mass culture has been shown.

*УДК 78.07*

*Ю. М. КЛІМОВІЧ*

# АНСАМБЛЕВАЕ МУЗІЦЫРАВАННЕ ЯК ВІД МУЗЫЧНА-ВЫКАНАЎЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

*Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка*

*(Паступіў у рэдакцыю 20.04.2010)*

Інавацыйныя працэсы, якія адбываюцца ў сучаснай сістэме адукацыі, робяць непасрэдны ўплыў і на сферу музычнай адукацыі. Значныя змены, якія адбыліся за апошнія гады ў сістэме агульнай музычнай адукацыі і выхавання, патрабуюць пошуку новых, аптымальных варыянтаў арганізацыі падрыхтоўкі музычна-педагагічных кадраў. У сувязі з гэтым асаблівай увагі патрабуюць як якасць музычнай адукацыі ў педагагічнай ВНУ, так і выбар форм арганізацыі навучальнага працэсу.

Выкарыстанне ансамблевага музіцыравання ў якасці адной з форм арганізацыі адукацыйнага працэсу пратрабуе перш за ўсё разумення яго сутнасці, прынцыпаў і тэарэтычнага абгрунтавання асноўных аспектаў, якія дадаюцца да развіцця музычнай культуры навучэнцаў. Таму ўзнікае неабходнасць удакладнення зместу паняцця «ансамблевае музіцыраванне», вызначэння яго жанравай прыналежнасці; абгрунтавання спецыфікі дадзенага віду выканаўчай дзейнасці, якая раскрывае яго творчы характар; выдзялення шэрагу выканальніцкіх навыкаў музыкантаў, неабходных падчас удзелу ў інструментальным ансамблі.

Што тычыцца тэарэтычнай распрацаванасці праблемы ансамблевага музіцыравання, то трэба адзначыць, што гэтая частка выканаўчага мастацтва становіцца прадметам музыказнаўчых даследаванняў толькі на пачатку мінулага стагоддзя. Аднак у апошні час да вывучэння многіх аспектаў ансамблевага выканальніцтва ўсё часцей звяртаюцца не толькі музыказнаўцы, але і педагогі. Даследаванню педагагічных магчымасцей ансамблевага музіцыравання прысвечаны працы А. У. Бычкова, Д. Г. Драгайцавай, Т. М. Лукашэвіч, А. П. Лук’янавай, І. А. Хвастовай і інш. У беларускай музычнай педагогіцы праблема ансамблевага музыцыравання не вывучана дастаткова глыбока, аднак некаторыя асаблівасці дадзенага віду выканальніцкай дзейнасці разглядаюцца ў публікацыях Л. Д. Дзедук, О. С. Сізко-Габрылян і інш.

Нягледзячы на наяўнасць значнай колькасці тэарэтычных даследаванняў у галіне ансамблевага музіцыравання, у цяперашні час у музычна-педагагічнай і музыказнаўчай літаратуры няма адзінага падыходу да вызначэння зместу і сутнасці дадзенага паняцця.

«Ансамбль» у перакладзе з французскага (ensemble) азначае разам, агульна. У выканаўчай практыцы гэты тэрмін звычайна мае два значэнні. У вузкім сэнсе ансамбль разглядаецца як зладжанае, злучнае гучанне ўсіх партый і музычнага твора ў цэлым. У больш шырокім сэнсе пад ансамблем разумеюць групу выканаўцаў, якія выступаюць сумесна.

Тэрмін «музіцыраванне» паходзіць ад нямецкага слова musizieren, якое мае два лексічныя значэнні: займацца музыкай (сумесна); іграць на музычных інструментах [11].

Уяўляецца істотным той момант, што сам тэрмін музіцыраванне азначае сумеснае выканальніцтва. Неабходна адзначыць і тое, што ў заходняй музычнай педагогіцы і музыказнаўстве да музіцыравання звычайна адносяць такія віды музычнай дзейнасці, як акампаніраванне, музычнае суправаджэнне, імправізацыя, творчае фантазіраванне на пэўную тэму [12].

Таму, улічваючы этымалогію тэрміна «музіцыраванне», мы будзем прытрымлівацца разумення яго як аднаго з відаў выканальніцкай дзейнасці, перш за ўсё, як уменне іграць на музыч-

ных інструментах. Аднак тут не трэба разумець выканальніцтва як тэхнічную інтэрпрэтацыю нотнага тэксту. На наш погляд, больш мэтазгодна ў адносінах да музіцыравання выкарыстоўваць паняцце «творчая выканальніцкая дзейнаць», якая прадугледжвае наяўнасць творчай фантазіі, крэатыўнасці, імправізацыйнасці ў працэсе выканання твора, паколькі пры развучванні і выкананні аднаго і таго ж твора кожны музыкант успрымае яго па-свойму, і таму пры раскрыцці мастацкага вобраза павінна праяўляцца індывідуальнасць выканаўцы, яго ўласнае разуменне аўтарскай задумы.

Творчы характар працэсу музіцыравання падкрэслівае ў сваім даследаванні Т. М. Лукашэвіч, якая ўводзіць паняцце «народнае інструментальнае музіцыраванне», што разумееца як «сродак выяўлення творчых магчымасцей з дапамогай ігравых навыкаў на музычным інструменце» [9, с. 22].

І. А. Хвастова выкарыстоўвае паняцце «аматарскае музіцыраванне», якое разглядаецца як «форма рэалізацыі сутнасных сіл асобы, а гэта значыць, яе самарэалізацыі з дапамогай непрафесійнай музычнай творчасці, якая на бескарыслівай аснове ажыццяўлялася ў свабодны час пад уплывам унутранай запатрабаванасці» [10, с. 27].

Такім чынам, большасць даследчыкаў вызначаюць музіцыраванне як творчую выканальніцкую дзейнасць, вынікам якой з'яўляецца рэалізацыя патэнцыяльных магчымасцей і здольнасцей асобы.

Раскрываючы сутнасць ансамблевага музіцыравання як віду музычна-выканальніцкай дзейнасці, неабходна звярнуць увагу на яго жанравую прыналежнасць. У сучасным музыказнаўстве яго прынята разглядаць ў якасці аднаго з жанраў камернай музыкі. Гэта тлумачыцца спецыфікай камернага ансамбля, якая вызначаецца невялікай колькасцю выканаўцаў, у адрозненне ад аркестра. Некаторыя даследчыкі, напрыклад Л. Г. Драгайцава, выдзяляюць жанравыя асаблівасці ігры, да якіх адносяць: адзінства дзеянняў музыкантаў, адзінства задум і адзінства выяўлення гэтай задумы; уменне выканаўцаў чуць агульнае гучанне ўсіх патрый; ансамблевае музіцыраванне набывае характар калектыўнай творчасці, якая вызначаецца арганічным зліццём індывідуальнасцей, утвараючы пры гэтым калектыўна-індывідуальны твар ансамбля.

Разглядаючы ансамблевае музіцыраванне ў кантэксце музычна-выканальніцкай дзейнасці, мы звяртаемся да аналізу сутнасці выканальніцкага мастацтва. З пункту погляду сучаснай эстэтыкі выканальніцтва з'яўляецца адным з відаў мастацкай дзейнасці, пры гэтым у розных відах мастацтва яно мае свае спецыфічныя характарыстыкі. У кантэксце музычнага мастацтва асаблівае значэнне набывае праблема ўзаемасувязі выканальніцкай і кампазітарскай дзейнасці. Большасць даследчыкаў вызначаюць другаснасць выканальніцтва ў адносінах да кампазітарскай творчасці (У. В. Ванслоў, Л. С. Гінзбург, Р. Здабноў і інш.). У. В. Ванслоў пад выкананнем разумее «мастацкую дзейнасць, якая ўяўляе ўзнаўленне раней напісанага твора, яго творчую інтэрпрэтацыю» [1, с. 261].

Даследчык адзначае, што ў працэсе выканальніцкага акта на аснове ўзнаўлення мастацкіх вобразаў, створаных кампазітарам, адбываецца стварэнне новага мастацкага твора. Такім чынам, дадзенае палажэнне падкрэслівае прадуктыўны, творчы характар выканальніцкай дзейнасці.

Л. С. Гінзбург сутнасць выканальніцкага мастацтва бачыць у асэнсаванні зместу твора і творчым яго ўзнаўленні з дапамогай сродкаў мастацкай выразнасці [2]. Аналізуючы творчую прыроду выканальніцкага майстэрства, даследчык прапануе выкарыстоўваць тэрмін «мастацкая інтэрпрэтацыя», які больш дакладна адлюстроўвае суадносіны творчасці кампазітара і выканаўцы.

А. Г. Гурэнка такасама звяртае ўвагу на другаснасць і творчцую сутнасць выканальніцтва, прапануючы наступнае азначэнне: «выканальніцкае мастацтва ёсць другасная, адносна самастойная мастацкая дзейнасць, творчы бок якой праяўляецца ў форме мастацкай інтэрпрэтацыі» [5, с. 41].

Р. Здабноў разглядае выканальніцтва як «своеасаблівы і якасна самастойны род мастацкай творчасці», які мае некаторыя спецыфічныя рысы. Сярод іх найбольш значнымі з'яўляюцца наступныя:

– другасны характар выканальніцтва;

– выкананне пераводзіць першасныя творы ў якасна новы стан рэальных гучанняў або дзеянняў;

– выкананне ёсць творчы працэс;

– маючы шэраг агульных якасцей, выканальніцтва ў канкрэтных відах мастацтва валодае спецыфічнымі асаблівасцямі [8].

Такім чынам, з прыведзеных вышэй азначэнняў відаць, што ў эстэтыцы сцвердзілася ўяўленне аб выканальніцкім мастацтве, і ў прыватнасці музычным, як творчай дзейнасці па ажыццяўленні мастацкіх вобразаў, створаных аўтарам. Творчы характар праяўляецца ў тым, што ў працэсе раскрыцця мастацкіх вобразаў выканаўца выяўляе свае пачуцці, думкі, уласныя адносіны да зместу твора, карыстаючыся пры гэтым пэўным наборам сродкаў выразнасці. Гэта значыць, што мастацкі вобраз «нараджаецца зноў», набываючы новыя якасці. Таму некаторыя музыказнаўцы, напрыклад Л. С. Гінзбург, Г. І. Гільбурд, характарызуючы выканальніцкі працэс, прапануюць выкарыстоўваць больш дакладны тэрмін – «мастацкая інтэрпрэтацыя».

Перш чым звярнуцца да аналізу сутнасці мастацкай інтэрпрэтацыі ў музычным мастацтве, неабходна разгледзець пытанне аб суадноснасці выканальніцкай і кампазітарскай творчасці і іх узаемасувязі. На розных гістарычных этапах развіцця музычнага мастацтва формы ўзаемадзейнасці кампазітарскага і выканальніцкага пачаткаў у дзейнасці музыкантаў-інструменталістаў былі неаднолькавыя. Калі ў XVII–XVIII стст. аўтар музычнага твора з'яўляўся і яго выканаўцам, то пазней, у працэсе развіцця музычнай культуры, кампазітарская творчасць аддзяляецца ад выканальніцтва. У сучаснай музыцы аб'яднанне кампазітарскага і выканальніцкага пачаткаў можна сустрэць у мастацтве імправізацыі ці ў народнай творчасці. У большасці выпадкаў выканаўца з'яўляецца «звяном», пасрэднікам паміж кампазітарам і слухачом.

Як адзначалася вышэй, эстэтычная тэорыя трактуе выканальніцкі працэс як другасны ў адносінах да творчасці кампазітара. Аднак гэта не зніжае мастацкай і эстэтычнай значнасці вынікаў дадзенага віду творчасці. Як адзначае А. Г. Гурэнка, паняцце «першаснасць» паказвае на тое, што дадзены від дзейнасці папярэднічае нечаму, а «другаснасць» азначае «нешта...памешчанае за» [5]. Такім чынам, кампазітар, адлюстроўваючы з'явы аб'ектыўнай рэчаіснасці, стварае мастацкія вобразы, а задача выканаўцы складаецца ў тым, каб правільна ўспрыняць гэтыя вобразы і, не скажаючы мастацкай ідэі твора, ажыццявіць іх. Таму выканальніцкая дзейнасць – гэта не толькі прачытанне нотнага тэксту, але і свайго роду працяг кампазітарскай творчасці: «творчы працэс не спыняецца са стварэннем твора, ён працягваецца ў выканальніцкім акце» [2, с. 152].

Асаблівасці суадносін першаснага і другаснага ў творчасці музычнага мастацтва ляжаць у аснове сутнаснай характарыстыкі такой эстэтычнай катэгорыі, як «мастацкая інтэрпрэтацыя». А. Г. Гурэнка, даследуючы спецыфіку мастацкай інтэрпрэтацыі, разглядае яе ў якасці крытэрыю, з дапамогай якой выканальніцкае майстэрства можна аддзяліць ад іншых відаў мастацкай самадзейнасці, і прапануе наступнае азначэнне: «пад мастацкай інтэрпрэтацыяй мы разумеем трактоўку прадукту першаснай мастацкай дзейнасці ў творчым працэсе выканання. Гэтая працэдура з'яўляецца часткай другаснай ... практычна-духоўнай актыўнасці людзей у галіне мастацтва» [5, с. 34–35]. Пры гэтым аўтар выяўляе групу прымет, якія адрозніваюць мастацкую інтэрпрэтацыю ад іншых яе відаў:

1) знешнія атрыбуты (суб'ект, пасрэднік-інтэрпрэтатар, прадукт выканальніцкай дзейнасці);

2) прыметы ўнутранага механізма (вывучэнне прадукту першаснай дзейнасці, стварэнне ўласнай канцэпцыі, выкананне).

Тую ж прыроду інтэрпрэтацыі ў мастацтве прапануе ўлічваць і Г. І. Гільбурд, называючы яе выканальніцкай інтэрпрэтацыяй, якая выяўляе сябе як «прадуктыўная дзейнасць па актуалізацыі мастацкай ідэі твора ў сферы выканальніцкага мастацтва» [3, с. 118].

У структуры дадзенага паняцця даследчык выдзяляе чатыры кампаненты: аб'ект інтэрпрэтацыі; суб'ект; працэдура, ці працэс інтэрпрэтацыі; прадукт гэтай дзейнасці. У якасці суб'екта выканальніцкай інтэрпрэтацыі Г. І. Гільбург разглядае твор, які гучыць як носьбіт мастацкай ідэі; суб'ектам з'яўляецца выканаўца як стваральнік твора выканальніцкага мастацтва. Цікавы падыход даследчыка да працэсу інтэрпрэтацыі, які ён характарызуе як «другасную адносна самастойную мастацкую дзейнасць па выяўленні ў прадукце першаснай творчасці і актуалізацыі ў творы выканальніцкага мастацтва правамернага варыянта мастацкай ідэі» [3]. Пад правамернасцю таго ці іншага варыянта выканання ў дадзеным выпадку неабходна разумець выбар такой выканальніцкай канцэпцыі, якая найбольш глыбока раскрывае мастацкі вобраз твора і выяўляе яго ідэю, а гэта значыць стварае прадукт мастацка-выканальніцкай дзейнасці, якім і з'яўляецца твор выканальніцкага мастацтва.

Паспяховасць у выбары той ці іншай інтэрпрэтатарскай канцэпцыі абумоўлена не толькі разуменнем мастацкай ідэі твора, але і ўзроўнем тэхнічнай падрыхтоўкі выканаўцаў.

Асновай ансамблевага выканання з'яўляюцца спецыфічныя навыкі музыкантаў, якія забяспечваюць дасканаласць і стройнасць выканання. Да такіх навыкаў адносяць перш за ўсё ўменне ансамбліста суадносіць сваю мастацкую індывідуальнасць, свой індывідуальніцкі стыль і тэхнічныя прыёмы з індывідуальнасцю, стылем і прыёмамі партнёра па ансамблі. Вядомы даследчык ансамблевага музіцыравання А. Готліб выдзяляе тры асноўныя прынцыпы, без якіх немагчыма тэхнічна граматнае ансамблевае выкананне:

– сінхроннае гучанне ўсіх партый, г. зн. адзінства тэмпу і рытму;

–ураўнаважанасць па сіле гучання, г. зн. адзінства дынамікі;

– узгодненасць штрыхоў усіх патрый, г. зн. адзінства прыёмаў і фразіроўкі.

Пад сінхроннасцю ансамблевага гучання разумеецца супадзенне самых дробных падоўжанасцей ва ўсіх выканаўцаў [4]. Прынцып сінхроннага гучання з'яўляецца асноўным у практыцы ансамблевага музіцыравання, бо самае нязначнае адхіленне ад тэмпу ці змяненне рытму адным з партнёраў прыводзіць да скажэння гарманічнай тканіны твора, парушэння голасавядзення. Таму для ансамблістаў вельмі істотна вызначыць пачатковы тэмп твора, а таксама сачыць за яго зменамі ў працэсе выканання і ўмець своечасова пераключыцца на новы тэмп. Аналізуючы рытмічны малюнак твора, неабходна ўлічваць рытмічныя адносіны паміж асобнымі партыямі. Правільнае адчуванне тэмпу і рытмічнага пульсу садзейнічае сінхроннаму ўступу і зняццю гуку, вытрымліванню паўз.

Дынаміка ў ансамблі набывае некалькі іншае значэнне, чым у сольным выкананні, што тлумачыцца living рознымі дынамічнымі здольнасцямі інструментаў, якія ўваходзяць у яго склад. Значэнне дынамічных адценняў асобнага выканаўцы напрамую залежыць і ад таго, выконвае ён вядучую партыю ці гарманічнае суправаджэнне. У сваім даследаванні А. Готліб звяртае ўвагу на тое, што ў працэсе ансамблевай ігры кожны дынамічны нюанс набывае тры значэнні:

1) унутры патрыі асобнага інструмента;

2) у ансамблі з партнёрам;

3) у агульным гучанні ўсяго ансамбля.

Штрыхі ў ансамблі таксама залежаць і ад штрыхоў асобных партый. Прычым тут мае значэнне як выкананне аднолькавых штрыхоў рознымі інструметамі, так і адначасовае гучанне розных штрыхоў. Аналізуючы асаблівасці прыёмаў выканання ў ансамблі, А. Готліб уводзіць такія паняцці, як «эквівалентныя штрыхі» і «комплексныя штрыхі». Пад эквівалентнымі аўтар разумее штрыхі, якія прымяняюцца на розных інструментах для дасягнення падобнага па характары гучання, а ў якасці комплексных разглядае суадносіны розных штрыхоў, якія гучаць адначасова. «Комплексы штрыхоў узнікаюць у тых выпадках, калі ў музычнай мове зліваюцца некалькі галасоў, кожны з якіх мае свой вобразна-эмацыянальны змест» [4, с. 87].

Гаворачы пра адзінства фразіроўкі, неабходна звярнуць увагу на наяўнасць сэнсавых і тэхнічных ліг. Іх функцыі могуць заўважна адрозніввацца. Калі тэхнічныя лігі ў партыях розных інструментаў могуць не супадаць, то супадзенне сэнсавых ліг ва ўсіх партыях павінна выконвацца, паколькі ад іх залежыць выяўленне зместу музычнага твора.

У якасці неабходнай умовы рэалізацыі дадзеных прынцыпаў ансамблевага музіцыравання А. Готліб разглядае наяўнасць у музыкантаў так званага ансамблевага слыху, які прадугледжвае развітое ўменне слухаць не толькі сябе ці партнёра, але і агульнае гучанне ансамбля. Такое ўменне А. Готліб называе «ансамблевай факусіроўкай слыху»: «Справа не толькі ва ўзаемным прыслухоўванні партнёраў адзін да аднаго і ў ясным разуменні функцый кожнай патрыі ў стварэнні мастацкага цэлага, а ў арганічным і непрырыўным слуханні агульнага гучання ў працэсе выканання» [4, с. 19].

Такім чынам, вывучэнне асноўных аспектаў ансамблевага музіцыравання ў кантэксце музычна-выканальніцкай дзейнасці дазваляе выдзеліць шэраг тэарэтычных палажэнннняў, якія з'яўляюцца асноўнымі.

1. Ансамблевае музіцыраванне, з'яўляючыся калектыўнай музычна-выканальніцкай дзейнасцю, адносіцца да жанру камернай музыкі. Гэта тлумачыцца наступнымі асаблівасцямі ансамбле-

вага выканальніцтва: невялікі склад выканаўцаў, кожную партыю выконвае толькі адзін музыкант, узгодненасць дзеянняў музыкантаў у працэсе станаўлення выканальніцкай інтэрпрэтацыі.

2. Сутнасць ансамблевага музіцыравання як віду выканальніцкай дзейнасці заключаецца ў творчым адлюстраванні мастацкіх вобразаў, створаных кампазітарам з дапамогай сродкаў мастацкай выразнасці.

3. Творчы характар ансамблевага музіцыравання праяўляецца ў форме мастацкай інтэрпрэтацыі кампазітарскай задумы і прадугледжвае прысутнасць імправізацыі ў працэсе выканання музыкі, што ў сваю чаргу садзейнічае рэалізацыі творчых здольнасцей музыкантаў.

4. Ігра ў ансамблі патрабуе ад выканаўцаў наяўнасці спецыфічных выканальніцкіх навыкаў, сярод якіх трэба выдзеліць: ансамблевы слых, навык сінхроннага выканання партый, уменне падтрымліваць інтанацыйны і дынамічны ансамбль.

5. У працэсе асваення ансамблевай тэхнікі неабходна падпарадкоўвацца асноўным прынцыпам сумеснага музіцыравання, да якіх адносяцца сінхроннасць гучання ансамблевых партый, адзінства дынамікі, адзінства штрыхоў і фразіроўкі.

Беручы пад увагу выдзеленыя палажэнні, а таксама асноўныя падыходы да разгляду сутнасці музіцыравання і ансамбля як групы выканаўцаў, мы прапануем наступнае азначэнне ансамблевага музіцыравання: «гэта від калектыўнай музычна-выканальніцкай дзейнасці, мэтай якой з'яўляецца развіццё творчых здольнасцей асобы музыканта ў працэсе стварэння мастацкай інтэрпрэтацыі твора».

## Літаратура


1. В а н с л о в, В. В. Что такое искусство / В. В. Ванслов. – М.: Изобраз. Искусство, 1989. – 328 с.

2. Г и н з б у р г, Л. О некоторых эстетических проблемах музыкального исполнительства / Л. Гинзбург // Эстетические очерки / Сост. и общ. ред. С. Х. Раппопорт. – Вып. 2. – М.: Музыка, 1967. – С. 149–190.

3. Г и л ь б у р д, Г. И. Исполнительское искусство – сфера проявления художественной идеи / Г. И. Гильбурд. – Томск: Изд-во Томск. ун-та, 1984. – 195 с.

4. Г о т л и б, А. Д. Основы ансамблевой техники / А. Д. Готлиб. – М., 1971. – 92 с.

5. Г у р е н к о, Е. Г. Исполнительское искусство: методологические проблемы: учеб. пособие / Е. Г. Гуренко. – Новосибирск: Изд-во НГК, 1985. – 88 с.

6. Д е д у к, Л. Л. Ансамблевое исполнительство – основа всестороннего развития музыканта / Л. Л. Дедук // Камерный ансамбль в системе музыкального образования. – Минск, 2002. – С. 3–8.

7. Д р а г а й ц е в а, Д. Г. Ансамблевое музицирование подростков в классе общего фортепиано как фактор развивающего обучения: в детской музыкальной школе: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.02 / Д. Г. Драгайцева. – М., 2005. – 153 с.

8. З д о б н о в, Р. Исполнительство – род художественного творчества / Р. Здобнов // Эстетические очерки / Сост. и общ. ред. С. Х. Раппопорт. – Вып. 2. – М.: Музыка, 1967. – С. 98–148.

9. Л у к а ш е в и ч, Т. Н. Педагогические традиции коллективного народного инструментального музицирования в учебных заведениях Чувашии: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01 / Т. Н. Лукашевич. – Чебоксары, 2005. – 217 с.

10. Х в о с т о в а, И. А. Социально-педагогические условия развития любительского музицирования в контексте культурной деятельности: дис. ... канд. пед. наук: 13.00.02 / И. А. Хвостова. – М., 2003. – 182 с.

11. Der Duden: in 10 Bd.; Bd. 8. Duden «Sinn – und sachverwandte Worter». – 2, neu bearb., erw. u. aktualisierte Aufl. – Mannheim, Wien, Zurich: Bibliographisches Institut, 1986.

12. Der Duden: in 10 Bd.; Bd. 10. Duden «Bedeutungsworterbuch». – 2, vollig neu bearb. u. erw. Auflage. – Mannheim, Wien, Zurich: Bibliographisches Institut, 1986.


*YU. M. KLIMOVICH*

**MUSICAL COMPANIES AS KIND OF MUSICAL ACTIVITY**

## Summary

This article is devoted to the analysis of company music in context of the musical-interpretative activity. Author has proposed various approaches to the comprehension of interpretative activity and music playing. Special attention has been given to the correlation between composer and performer creativity. Main characteristics and definition of the company music have been proposed, too.

*УДК 070.1:316.776.2:659.4.78*

*П. Л. СВЯРДЛОЎ*

# ПРАБЛЕМЫ АЎТАРСТВА Ў БЕЛАРУСКАЙ МУЗЫЧНАЙ ЖУРНАЛІСТЫЦЫ

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 22.12.2009)*

Музычнае мастацтва ўваходзіць у сферу даследавання самых розных навуковых дысцыплін. На пазнанне музыкі накіраваны як спецыяльныя навукі (музыказнаўства і шэраг напрамкаў мастацтвазнаўства), так і неспецыяльныя (эстэтыка, філасофія, псіхалогія, гісторыя, тэорыя камунікацыі). Паколькі апошнія не маюць магчымасці даследаваць музычнае мастацтва з яго спецыфічнага боку, яны засноўваюцца на агульных з іншымі з’явах, на тым, што аб’ядноўвае, а не на тых рысах, якія адрозніваюць.

Калі навукі, якія вывучаюць музычнае мастацтва, выкліканы да жыцця сіламі спазнання і, адпаведна, маюць гнасеалагічную прыроду, то карані музычнай крытыкі, без сумнення, аксіялагічныя, паколькі галоўная яе мэта – «вызначыць мастацкую вартасць, значнасць аб’екта» [1]. Журналістыка, што ў 1990-я выйшла з музычнай крытыкі, пераняла ад апошняй тэндэнцыю да расстаноўкі ацэнак. Журналісты, па магчымасці засноўваючыся на аб’ектыўных крытэрыях, паведамляюць аўдыторыям СМІ пра перавагі і недахопы музычных формаў, якія яны разглядаюць. Аднак прафесар Белдзяржуніверсітэта Т. Д. Арлова адзначае, што сучасныя мас-медыя часта абмяжоўваюць мастацкую крытыку простымі меркаваннямі, пазбягаючы адмысловай тэрміналогіі і настройваючыся «на павярхоўны эфект, поўны афектацыі» [2].

Журналістыка, арыентаваная на забеспячэнне чытачоў, слухачоў і гледачоў аб’ектыўнай інфармацыяй пра музыку і шоу-бізнес, вырашае таксама і гнасеалагічныя задачы. Трапнае апісанне музычных твораў немагчыма па-за вывучэннем іх асноўных уласцівасцей: псіхалагічных, фізічных, сацыяльна-камунікатыўных. Аднак вядомы прыклады, калі магчымасць журналісцкага пераасэнсавання плёну музычнай творчасці адмаўляецца ўвогуле. Фрэнк Заппа, адзін з выдатных амерыканскіх кампазітараў і выканаўцаў XX ст., сцвярджаў, што «... большая частка рок-журналістыкі – гэта людзі, якія не ўмеюць пісаць, якія бяруць інтэрв’ю ў тых, хто не ўмее распавядаць, для тых, хто не ўмее чытаць» [3].

Кажучы пра аксіялагічную і гнасеалагічную аснову музычнай журналістыкі, нельга не згадаць і трэці складнік яе прыроды – камунікацыйны, паколькі ў агульным выглядзе журналістыка – гэта не толькі збор і апрацоўка інфармацыі, але і яе распаўсюджванне. Інакш кажучы, паводле сваёй камунікацыйнай прыроды, музычная журналістыка забяспечвае цыркуляцыю ў грамадстве інфармацыі пра праявы аўдыяльнай культуры і падзеі шоу-бізнесу.

Сітуацыя ў сучаснай беларускай музычнай журналістыцы такая, што газетныя палосы, эфіры радыёстанцый і тэлеканалаў запаўняюцца, зыходзячы з зацікаўленасці не толькі ў ацэнцы музычнага матэрыялу, але і ў тым, каб данесці да масавага чытача, слухача і гледача тое ці іншае інфармацыйнае паведамленне. Эфектыўнасць распаўсюджанай інфармацыі вызначаецца не толькі яе аб’ектыўнасцю ці змястоўнасцю, але і тым, наколькі яна дзейсная ў стымуляцыі рэцыпіентаў да далейшых дзеянняў – такіх, як засваенне станоўчага іміджу, пазнанне, пакупка.

Найбольшую зацікаўленасць у рэалізацыі камунікацыйных магчымасцей беларускай музычнай журналістыкі выяўляюць не супрацоўнікі ці аўдыторыя СМІ, а спецыялісты па сувязях з грамадскасцю, якія «працуюць» на пэўных артыстаў, дыстрыб’ютарскія і гуказапісваючыя

кампаніі. У апошнія гады яны зрабіліся паўнапраўнымі суб'ектамі інфармацыйнага поля і пачалі аказваць сур'ёзны ўплыў на змест арт-журналістыкі. У артыкуле мы засяродзім увагу на характары, значэнні і магчымых наступствах гэтага ўплыву.

У беларускай музычнай журналістыцы змяняецца традыцыйная схема, паводле якой інфармацыя прасоўваецца ад адрасанта да адрасата па пэўным камунікацыйным канале, выкарыстанне якога магчыма дзякуючы наяўнасці ў адпраўшчыка паведамлення перадатчыка, а ў атрымальніка – прыёмніка, а таксама падабенству іх тэзаўрусаў. Раней аўдыторыя СМІ (рэцыпіенты) магла быць упэўнена, што адпраўшчыкамі паведамленняў, якія яна знаходзіць у прэсе, з'яўляюцца журналісты, чые імёны (ці творчыя псеўданімы) агучваюцца ці змяшчаюцца ў подпісе або цітрах. Але сёння ў ролі адрасантаў усё часцей выступаюць спецыялісты па сувязях з грамадскасцю, чые тэксты ў форме прэс-рэлізаў накіроўваюцца журналістам і без змен ці з нязначнымі, «касметычнымі» праўкамі транслююцца мас-медыя.

Прэс-рэліз прызначаны для таго, каб звярнуць увагу на падставу для навіны і паведаміць журналістам дагэтуль невядомыя, але неабходныя для стварэння аўтарскіх матэрыялаў факты. Аднак прырода прэс-рэліза дваісная. З аднаго боку, ён з'яўляецца паўфабрыкатам – «шкілетам», на які журналіст падчас збору і апрацоўкі інфармацыі павінен нарасціць «мяса». З іншага боку, прэс-рэлізы часта трапляюць да журналістаў у выглядзе матэрыялаў, аформленых для друку. Прэс-рэлізы маюць загаловак і ўступ, з якіх зразумела, пра што вядзецца гаворка далей. Факты ў іх выкладаюцца паслядоўна і ў публіцыстычным стылі.

У якасці прыкладу такога прэс-рэліза прывядзём тэкст, распаўсюджаны сярод беларускіх музычных журналістаў пры дапамозе электроннай пошты спецыялістам па сувязях с прэсай Л. Васілевіч:

*ОЛЬГА БАРАБАНЩИКОВА УВЛЕКЛАСЬ ВОДНЫМИ ЛЫЖАМИ*

*Всю прошлую неделю Ольга Барабанщикова постигала азы водного спорта для участия в проекте телеканала «Лад» «Великолепная семерка». В конкурентах у Ольги – певец Владимир Ухтинский, хозяйка фитнес-клуба «Багира» Наталья Новожилова, главный редактор газеты «Антенна» Сергей Малиновский, певица Виктория Алешко, солистка группы «Da Vinci» Ольга Рыжикова и ведущий «Белорусского времечка» Константин Юманов.*

*– В первые два дня мы вообще очень мало катались, потому что электротяга (риксон) была сломана: приходилось ездить за катером, – рассказывает Ольга Барабанщикова. – Преимущества риксона в том, что одновременно могут тренироваться все участники, а тут приходилось долго ждать своей очереди и за весь день каждому удавалось прокатиться по два раза. С катером сложнее стартовать: нужно подняться из воды, а это достаточно тяжело. С гордостью могу заявить, что в первый день я была единственной, кто без проблем встал из воды и ни разу не упал! Сейчас падаю, как правило, после седьмого круга. Падения бывают легкие и не очень, но то, что у меня все тело в синяках – это о чем-то говорит! Иногда во время падения можно удариться о лыжу или ручку, за которую держишься, – вот таким образом я набила себе «шишку». После тренировок у меня на руках огромные мозоли и руки трясутся так, что багажник машины закрываю только со второго раза...*

*Кстати, уже на шестой день тренировок Ольга Барабанщикова каталась на скорости 43 км/ч, пока остальные едва одолевали рубеж 36 км/ч.*

Трэба звярнуць увагу на тое, што факты, сабраныя ў прэс-рэлізе, а таксама тон іх выкладання вельмі суб'ектыўныя. Спецыяліст па сувязях з прэсай не зацікаўлены ў публікацыі негатыўнай інфармацыі пра артыста, з якім супрацоўнічае. Прыязнасць аўтара цытаты, якая змешчана вышэй, відавочная. Вольга Барабаншчыкава ў гэтым прэс-рэлізе паказана захопленай, годнай і гатовай самазабыўна працаваць над сабой, аддаючыся свайму захапленню. Аўтар тэксту выклікае ў чытачах спачуванне да траўмаў, якія атрымала артыстка, і павагу да мужнасці былой тэнісісткі, якая знаходзіла ў сабе сілы зноў і зноў уставаць на водныя лыжы. Паводле зместу прэс-рэліза, Вольга выглядае самай спартыўнай з прадстаўнікоў беларускага шоу-бізнесу – няхай не ўсіх, а толькі ўдзельнікаў праекта «Цудоўная сямёрка». Згодна з задумай Л. Васілевіч, гэта павінна падштурхнуць рэцыпіентаў дадзенага паведамлення да таго, каб ставіцца да Барабаншчыкавай з яшчэ большай сімпатыяй, а таксама адмежаваць іх ад уяўлення пра эстрадную артыстку як пра прадстаўніцу нездаровай багемы.

Праз тэндэнцыі, згаданыя вышэй, інфармацыя, якая змяшчаецца ў дадзеным прэс-рэлізе, была трансліравана некаторымі беларускімі мас-медыя без змен – цалкам ці фрагментарна. Ужо ўвечары таго дня, калі адбылася рассылка прэс-рэліза, інфармацыйнае паведамленне на яго падставе з'явілася ў рубрыцы «Калейдаскоп» на сайце Беларускага тэлеграфнага агенцтва. Вось вытрымка з гэтага матэрыялу:

*Бывшая теннисистка, белорусская исполнительница Ольга Барабанщикова встала на водные лыжи ради участия в проекте телеканала «Лад» «Великолепная семерка».*

*В первый день тренировок я была единственной из участников проекта, кто без проблем встал из воды на старте и ни разу не упал», – с гордостью заявила Ольга в беседе с корреспондентом БЕЛТА. Как отметила артистка, сейчас падения если и случаются, то только после седьмого круга и от усталости [4].*

Словы Вольгі Барабаншчыкавай, якія зафіксавала і распаўсюдзіла аўтар прэс-рэліза, карэспандэнт БЕЛТА (артыкул не падпісаны) прэзентаваў як інфармацыю, атрыманую падчас размовы непасрэдна з артысткай. Такім чынам, першы этап апасродкаванай камунікацыі, а разам з ім і ўплыў, які праз прэс-рэліз здзейсніў на журналіста спецыяліст па сувязях з прэсай, засталіся схаваныя ад чытачоў.

Толькі некаторыя медыя-праекты (напрыклад, інтэрнэт-выданне www.gazetaby.com) удакладнілі і пашырылі інфармацыю, што змяшчалася ў прэс-рэлізе, за кошт эксклюзіўных каментарыяў Вольгі Барабаншчыкавай і іншых удзельнікаў «Цудоўнай сямёркі» [5]. За наступныя некалькі дзён прэс-рэліз пра тое, як «былая тэнісістка, а цяпер спявачка» Вольга Барабаншчыкава «засвойвае водныя лыжы ў тэлепраекце «Цудоўная сямёрка», быў шырока растыражаваны беларускімі СМІ.

На нашую думку, у беларускай музычнай журналістыцы ўтварылася негатыўная тэндэнцыя да неналежнага выкарыстання прэс-рэлізаў. Адхіленне ад нормы заключаецца ў тым, што спецыяліст па сувязях з прэсай не называецца ў якасці крыніцы інфармацыі, якая распаўсюджваецца СМІ, хаця de facto з'яўляецца ёю. Фрагменты журналісцкіх матэрыялаў, запазычаныя з прэс-рэлізаў, афармляюцца без указання крыніцы – як аўтарскі тэкст, але не як цытаты. Падпісваючы матэрыялы, створаныя на аснове прэс-рэлізаў, сваімі прозвішчамі (псеўданімамі), журналісты «дзеляць» аўтарства са спецыялістамі па сувязях з прэсай. Аднак апошні атрымальнік медыятэксту – аўдыторыя СМІ – пра гэта не здагадваецца, бо ні подпіс пад артыкулам («адводка» або цітры радыё- і тэлесюжэта), ні яго змест не фіксуюць «дзяленне» аўтарства.

Такім чынам, набор пазітыўных фактаў пра артыста, які змяшчаецца ў прэс-рэлізе, чытач атрымлівае ад імя журналіста. Гэтыя тэксты ўспрымаюцца як аўтарскія: аб'ектыўнасць інфармацыі ў прэс-рэлізе пацвярджаецца аўтарытэтам журналіста і выдання, на старонках якога яна публікуецца. Згадаем тут яшчэ адзін прэс-рэліз, аформлены як журналісцкая нататка, і прасочым шлях, які ён прайшоў праз беларускую прэсу.

*ДЕБЮТОМ ГОДА СТАЛА ANNIE K. FERNANDEZ*

*На вручении премий белорусским артистам Pre-Party MTV Russian Music Awards победительницей в номинации «Дебют года» стала Annie K. Fernandez. Потенциальная принцесса R&B родилась в американском городе Бруклине, а с 4 лет живет в Беларуси. Музыкой начала заниматься с 3 лет. В 16 записала свою первую песню «Разгадай». Весной в эфире белорусского ТВ появился дебютный клип Annie K. Fernandez. Причем сценарием, режиссурой и монтажом клипа занималась сама Annie. Молодая и амбициозная Annie K. Fernandez привыкла все делать самостоятельно, без авторов музыки и текста, без режиссеров клипа, без музыкальных продюсеров. Сейчас 17-летняя Annie K. Fernandez – студентка I курса Минского государственного училища имени Глинки. Этой осенью девушка вернулась из Нью-Йорка, где на одной из студий Стэйтен Айленда (именно там начинала Марая Кэрри) записала новую песню «Everybody in da club», которую исполнила на вручении наград Pre-Party MTV Russian Music Awards.*

*– Это молодая девушка, которая делает себя сама. Такой проницательности и музыкальной подготовки я ни у кого из начинающих артистов не встречал! Она знает, как правильно подходить к творчеству, продвигать его, создавать красивую картинку и стильный имидж. Кроме того, на вручении премий нужно было представить модный нынче R&B, и никого лучше Annie K. Fernandez мы бы не нашли! Я считаю, что с выбором мы действительно не ошиблись: залу понравилось! После RMA многие напевали песню Annie «Everybody in da club», а это о чем-то говорит! – объяснил выбор MTV-Минск генеральный продюсер канала Валик Гришко.*

У гэтым прэс-рэлізе адсутнічае інфармацыя, якая характарызавала б маладую артыстку інакш, як са староннага боку. Аўтар тэксту называе Annie K. Fernandez «патэнцыяльнай прынцэсай R&B» (праўда, не тлумачыць, які сэнс укладваецца ў гэты няпэўны тытул), падкрэслівае яе самастойнасць і адзначае таленты, якія дапамаглі падчас здымак дэбютнага кліпа. Далей змешчаны хвалебны водгук прадзюсара тэлеканала «MTV-Мінск» В. Грышко, які кіраваў размеркаваннем прэмій.

На наступны дзень вытрымкі з прэс-рэліза, перакладзеныя на беларускую мову, склалі тэкст артыкула пра Annie K. Fernandez на сайце «Тузін гітоў» [6] – спецыялізаваным інтэрнэт-выданні, прысвечаным беларускай музыцы. Матэрыял, які змяшчаў, у тым ліку, словы Annie K. Fernandez і В. Грышко, узятыя ў двукоссі, быў падпісаны як рэдакцыйны. Ілюстрацыя да матэрыялу была запазычана з сайта www.gazetaby.com, журналісты якога ва ўласным артыкуле пра цырымонію «MTV Russian Music Awards» не палічылі за неабходнае пазначыць, што скарысталі адзін з чатырох фотаздымкаў, якія суправаджалі тэкст прэс-рэліза.

Яшчэ праз дзень прэс-рэліз быў даслоўна выкладзены ў рубрыцы «Забаўкі» на web-сайте аўтарытэтнага інфармацыйнага агенцтва «Interfax-Захад». Крыху пазней тэкст быў прадубліраваны сайтам «Музычнай газеты».

Згодна з «Адзіным кваліфікацыйным даведнікам пасад служачых», прэс-сакратар (спецыяліст па сувязях з прэсай) ажыццяўляе «збор і прафесійную падачу інфармацыі ў сродкі масавай інфармацыі, падрыхтоўку, распаўсюджванне і кантроль над публікацыяй матэрыялаў (прэс-рэлізы, паведамленні, заявы, інтэрв'ю і інш.)», а таксама «прапагандуе дзейнасць арганізацыі ў СМІ» [7]. У службовыя абавязкі прэс-сакратара не ўваходзіць «выдумванне» падстаў для навін і рассылка «фэйкавай» (ад англ. «fake» – падробка, фальшыўка) інфармацыі, як бы гэта ні было выгадна яго кліенту. Аднак доўгая адсутнасць у дзейнасці артыста прычын для зваротаў да прэсы падштурхоўвае спецыялістаў па сувязях з прэсай да стварэння містыфікацый.

Такія выпадкі не з'яўляюцца ў беларускай музычнай журналістыцы адзінкавымі. На жаль, нават самую абсурдную няспраўджаную інфармацыю журналісты часам трансфармуюць у артыкулы і публікуюць у СМІ.

Напрыклад, 2 снежня 2008 г. у рассылцы pr-менеджара кампаніі «Westrecords» А. Рогач з'явіўся прэс-рэліз пад назвай «Аголенае цела Уладзіміра Максімкова ўпрыгожыла вокладку нямецкага часопіса». Гаворка ў ім вялася пра здымкі эратычнага характара, якімі суправаджалася інтэрв'ю, нібыта дадзенае тэлевізійным рэжысёрам і прадзюсарам У. Максімковым нямецкаму часопісу «Freizeit Handelsblatt». Гэтую інфармацыю, якая не адпавядала рэчаіснасці, перадрукавалі агенцтвы «Interfax-Захад» і «БелаПАН». Прадстаўлены ў іх стужках як уласны, тэкст пра У. Максімкова быў передрукаваны шэрагам традыцыйных СМІ і інтэрнэт-медыя.

3 снежня 2008 г. газета «Вячэрні Мінск» апублікавала артыкул пад назвай «Паліна Смолава ляціць да Пола МакКартні» за подпісам Л. Крамень [8]. Гэты матэрыял быў заснаваны на прэс-рэлізе з рассылкі pr-менеджара А. Хадаронак. Гаворка ў абодвух тэкстах ішла пра тое, што беларуская артыстка Паліна Смолава атрымала магчымасць накіравацца ў Лондан для сумеснай працы з вядомым музыкантам, экс-вакалістам гурта «The Beatles» сэрам Джэймсам Полам МакКартні. Ніжэй змешчаны частка гэтага артыкула, даслоўна запазычаная з прэс-рэліза, а таксама ілюстрацыя, прыкладзеная да прэс-рэліза і таксама надрукаваная ў газеце «Вячэрні Мінск»:

*Во время визита Пола в Москву нынешней весной Смолова исполнила для лондонского гостя знаменитую композицию The Beatles «Yesterday» и тем самым очаровала его. Пол предложил нашей землячке встретиться у него в студии и обсудить возможность совместной работы. Как рассказала пресс-секретарь певицы Елена Селина, Полина лишь на два дня заглянула в Минск к родителям – перед тем, как отправиться в столицу Туманного Альбиона для записи пробного трека, работа над которым может продлиться несколько месяцев.*



Паліна Смолава адлятае да Пола МакКартні [8]

4 снежня 2008 г. артыкул са спасылкай на «Вячэрні Мінск» змясціў у рубрыцы «Калейдаскоп» самы папулярны беларускі інтэрнэт-рэсурс «TUT. BY» (каля 1 мільёна наведванняў за суткі). Наведвальнікі сайта звярнулі ўвагу на тое, што здымак, які ілюструе тэкст, – гэта фотамантаж. Неўзабаве ў Інтэрнэце былі знойдзены арыгінальныя фотаздымкі Пола МакКартні і Паліны Смолавай, злучаныя ў адзін для надання містыфікацыі праўдзівасці. 18 снежня з выкрывальным каментарыем з прычыны распаўсюджанага А. Хадаронак прэс-рэліза і ілюстрацыі выступіў Сцюарт Бэл, спікер Пола МакКартні [9].

Гэтыя прыклады сведчаць пра тое, што пры стварэнні аўтарскіх матэрыялаў на падставе прэс-рэлізаў супрацоўнікі СМІ не палічылі за неабходнае дапоўніць тэкст за кошт каментарыяў згаданых у ім медыйных персанажаў ці верыфікаваць яго. Вынікам кожнага падобнага звароту з’явілася б абвяржэнне інфармацыі. Але ў беларускіх журналістаў, якія пішуць пра шоу-бізнес, давер да прэс-сакратароў настолькі вялікі, што неабходнасць абавязковай праверкі інфармацыі, якая змяшчаецца ў прэс-рэлізах, імі не асэнсоўваецца.

Маштабы, якія ў айчыннай прэсе набывае перадрукоўка прэс-рэлізаў, праілюстраваны ў наступнай табліцы, якая з’яўляецца вынікам аналізу цэнтральных грамадска-палітычных выданняў («Беларусь Сёння», «Рэспубліка», «Звязда», «Вячэрні Мінск», «Аглядальнік») у перыяд з 2005 па 2009 г. У табліцы змяшчаюцца звесткі пра прадстаўнікоў асноўных напрамкаў папулярнай музыкі, якія найбольш часта згадваліся ў айчыннай прэсе: уласна поп-музыка («Крамбамбуля», «Цягні-Штурхай»), поп-рок («J: МОРС»), электра-поп («Atlantica»), фолк-мадэрн («Этна-трыа «Троіца»).

**Звесткі пра тэкставы масіў беларускай музычнай журналістыкі за 2005–2009 гг.**

| Назва калектыву | Агульная колькасць тэкстаў | З іх заснаваных на прэс-рэлізах |
|---|---|---|
| «Atlantica» | 45 | 14 (31,1%) |
| «J: МОРС» | 68 | 25 (36,8%) |
| «Аляксандра і Канстанцін» | 16 | 7 (47,75%) |
| «Крамбамбуля» | 106 | 33 (31,1%) |
| «Цягні-Штурхай» | 93 | 32 (34,4%) |
| «Этна-трыа «Троіца» | 17 | 0 (0%) |

Табліца паказвае, што колькасць тэкстаў, заснаваных на прэс-рэлізах, вагаецца ад 0% (артыкулы пра «Этна-трыа «Троіца») да 47,75% (матэрыялы пра дуэт «Аляксандра і Канстанцін»). Сярэдняя колькасць тэкстаў на аснове прэс-рэлізаў, надрукаваных аб шасці пералічаных вышэй выканаўцах, складае 30,17%. Інакш кажучы, цягам чатырох гадоў каля 1/3 матэрыялаў, якія з'яўляліся ў цэнтральных беларускіх газетах, былі заснаваны на прэс-рэлізах і змяшчалі элементы паўтораў.

Такім чынам, тыражаванне прэс-рэлізаў у мас-медыя з'яўляецца ў беларускай музычнай журналістыцы не выпадковасцю, а, хутчэй, тэндэнцыяй. У выключных выпадках «сляпое» тыражаванне прэс-рэлізаў прыводзіць да таго, што спажыўцы тэкстаў мас-медыя – чытачы, слухачы, гледачы – апынаюцца падманутымі разам з журналістамі.

У айчыннай прэсе ў цяперашні час адбываецца ўзаемапранікненне музычнай журналістыкі і public relations, адной з праяў якога і з'яўляецца некрытычнае тыражаванне прэс-рэлізаў у СМІ. Расійскі навуковец, доктар філалагічных навук А. П. Карачэнскі ўводзіць для тэкстаў, якія «прапануюцца аўдыторыі СМІ пад выглядам журналісцкіх публікацый», але створаны «пры вырашальным удзеле pr-структур», дэфініцыю «піярналістыка» [10].

Прадстаўнікі прэсы, апытаныя аўтарам артыкула, у якасці асноўнай прычыны такога становішча назвалі высокую запатрабаванасць арт-журналістыкі. Інакш кажучы, патрэба аўдыторыі беларускіх СМІ ў матэрыялах пра музыку і шоу-бізнес настолькі вялікая, што журналіст, які асвятляе гэты напрамак, не паспявае ствараць неабходную колькасць аўтарскіх матэрыялаў і вымушаны карыстацца запазычаннямі з прэс-рэлізаў. У якасці дадатковых прычын былі названы, з аднаго боку, параўнальна нізкі ўзровень ганарарнай стаўкі, што не адпавядае намаганням, якія журналіст выдаткоўвае на стварэнне аўтарскіх тэкстаў, а з другога – нізкі прафесійны ўзровень і этычная нясталасць маладых спецыялістаў, якія прыходзяць у музычную журналістыку.

Неналежнае выкарыстанне прэс-рэлізаў пагражае галіне крызісам даверу да зместу тэкстаў беларускай музычнай журналістыкі. Сённяшняя аўдыторыя СМІ не можа быць упэўнена ў тым, што атрымае праўдзівую інфармацыю пра музыку і шоу-бізнес, а менавіта – інфармацыю, якую сабралі і апрацавалі журналісты.

Запаўненне газетных палос, прысвечаных культуры, і эфіру музычных праграм інфармацыяй, якая змяшчаецца ў атрыманых журналістамі (ці рэдакцыямі) прэс-рэлізах, пазбаўляе журналісцкую дзейнасць аднаго з самых значных яе складнікаў, а менавіта – творчага. Публікуючы прэс-рэліз, журналіст не збірае і не апрацоўвае інфармацыю, а атрымлівае яе ў гатовым выглядзе, а пасля распаўсюджвае. Музычная журналістыка, якая ў класічным выглядзе з'яўляецца дзейнасцю па зборы, апрацоўцы і распаўсюджванні інфармацыі, трансфармуецца ў камунікацыю – абмен паведамленнямі паміж людзьмі, узяты ў сваёй знакавай форме. Галоўнай жа функцыяй музычнай журналістыкі робіцца фарміраванне лаяльнасці і павышанай цікавасці да творчасці ці асобы таго ці іншага артыста.

## Літаратура

1. К у р ы ш е в а, Т. А. Слово о музыке. О музыкальной критике и музыкальной журналистике. Очерки / Т. А. Курышева. – М.: Композитор, 1992. – С. 10.

2. О р л о в а, Т. Д. Некоторые аспекты методологии работы над текстами об искусстве / Т. Д. Орлова // Журналістыка – 2007: надзённыя праблемы. Перспектывы. Матэрыялы 9-й Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 6–7 снежня). Вып. 9 / Рэдкал.: С. В. Дубовік (адк. рэд.) і інш. – Мінск, 2007. – С. 393.

3. Lainaukset // Сайт Palasokeri. com || Ihmislaboratoorio [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: http:// www. palasokeri. com/modules. php? op=modload&name=Quotes&file=index. – Дата доступа: 26.09.2008.

4. Белорусская певица Ольга Барабанщикова встала на водные лыжи // БЕЛТА: новости, события, факты, комментарии [Электронный ресурс]. – 2007. – Режим доступа: http:// news. belta. by/ru/news/kaleidoscope/? id= 171954. – Дата доступа: 26.09.2008.

5. Ш а х н о в и ч, Т. И. Схватка на Птичи: Барабанщикова против Ухтинского / Т. И. Шахнович // Салідарнасць [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: http:// www. gazetaby. com/index. php? sn_nid= 8222&sn_cat= 41. – Дата доступа: 26.09.2008.

6. Annie K. Fernandez – адкрыццё беларускага R&B // Тузін гітоў. Слушны музычны партал [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: http:// music. fromby. net/article/848/. – Дата доступа: 26.09.2008.

7. Единый квалификационный справочник должностей служащих. Общие положения. Вып. 1 / Науч.-исслед. ин-т труда М-ва труда и соц. защиты Респ. Беларусь. – Минск, 2009. – С. 84.
8. К р е м е н ь, Л. Полина Смолова улетает к Полу МакКартни / Л. Кремень // Сайт газеты «Вечерний Минск» [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: http:// www. newsvm. com/news/30/53282. – Дата доступа: 17.03.2009.
9. Фото Смоловой с МакКартни оказалось подделкой // Телеграф [Электронный ресурс]. – 2008. – Режим доступа: http:// telegraf. by/showbiz/11039. html. – Дата доступа: 17.03.2009.
10. К о р о ч е н с к и й, А. П. Источники кризиса доверия. Главные причины недоверия к СМИ / А. П. Короченский // Библиотека центра экстремальной журналистики [Электронный ресурс]. – 2009. – Режим доступа: http:// www. library. cjes. ru/online/? a=con&b_id= 746&c_id= 10183. – Дата доступа: 10.09.2009.

*P. L. SVYARDLOU*

**AUTHORSHIP PROBLEMS IN BELARUSIAN MUSICAL JOURNALISM**

## Summary

The article is dedicated to the PR-manager's influence on the content of Belarusian musical publications. The musical journalism should be divided by the publication authorship into the true journalism and «journalism of press-releases». Journalism of press-releases has lost its creative part and became the simple communication between PR-manager and press.

## *ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА*

*УДК 882.6 (092) МЕЛЕЖ + 882.6–31.09*

*Я. А. ГАРАДНІЦКІ*

# СУБ'ЕКТНАСЦЬ СТРУКТУРЫ РАМАНА ІВАНА МЕЛЕЖА «ЗАВЕІ, СНЕЖАНЬ»

*Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 17.08.2010)*

Апошні раман славутай «Палескай хронікі» Івана Мележа ўяўляе сабой надзвычай цікавы аб'ект для даследавання з боку яго структуры. Раман «Завеі, снежань» лічыцца незавершаным, паколькі заўчасная смерць пісьменніка не дазволіла яму да канца ўвасобіць усе задумы, разгарнуць аповед у тым выглядзе, у якім ён уяўляўся аўтару. Многае, на жаль, засталося ў планах, чарнавых накідах, запісах. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што калі б лёс быў больш літасцівы да выдатнага майстра прозы, дадзены раман прадстаў бы ў значна больш пашыраным варыянце, у якім знайшлі б далейшы працяг многія сюжэтныя лініі, жыццёвыя калізіі герояў, выявіліся ў поўнай меры іх складаныя ўзаемаадносіны. Аднак і ў тым выглядзе, у якім ён існуе цяпер, раман «Завеі, снежань» прадстае цэласным і паводле сваёй унутранай логікі завершаным творам. Выяўленне гэтай структурнай цэласнасці і завершанасці з'яўляецца галоўнай мэтай нашага даследавання.

Раман «Завеі, снежань» – твор своеасаблівы, ён займае адметнае месца ў «Хроніцы» не толькі таму, што з'яўляецца яе завяршальнай часткай. У ім распрацаваныя пісьменнікам формы аповеду, заснаваныя на сумяшчэнні пунктаў гледжання апавядальніка і герояў, дасягаюць найбольшага развіцця. Праз іх выяўляецца драматызм адчуванняў мележаўскіх герояў, суадноснасць іх душэўнага стану з тэндэнцыямі і настроямі гістарычнай эпохі. У «Завеях, снежні» яшчэ ў большай ступені ў параўнанні з папярэднімі раманамі завастраецца ўвага на ўнутраным свеце галоўных герояў, на іх рэфлексіі ў адносінах да саміх сябе і навакольнага свету.

Гэта вызначальная асаблівасць «Завеяў, снежня» выяўляецца ў структурнай арганізацыі апавядальнай прасторы, у тым, якім чынам спалучаюцца ў тэксце рамана аўтарскія мастацкія інтэнцыі і аўтарскае бачанне з кругаглядам герояў. У нашай працы мы звернемся да аналізу структуры мележаўскага рамана з улікам спецыфікі суб'ектных адносін, высвятлення іх ролі ў фарміраванні мастацкага свету твора. У сувязі з гэтым існуе перш за ўсё неабходнасць вызначэння такога ключавога ў прапануемай метадалогіі паняцця, як *суб'ектная структура*.

Тэрмін *суб'ектная структура (суб'ектная арганізацыя)* упершыню ўвёў у літаратуразнаўчы ўжытак Б. Корман. Гэтым тэрмінам характарызуецца значэнне суб'ектаў, якія прымаюць удзел у стварэнні тэксту літаратурнага твора, выяўляецца іх уплыў на арганізацыю апавядальнай структуры. Суб'ектная структура твора проціпастаўляецца аб'ектнай структуры, для якой вылучэнне асобных суб'ектаў, суаднесеных з тым або іншым яе фрагментам, з'яўляецца не актуальным. Для аб'ектнай структуры ўласціва цэласнасць наратыву, выяўленне той надасабовай рухальнай сілы, якою прадвызначаецца характар спалучэння асобных элементаў тэксту. У ёй дамінуе пазіцыя аўтара-апавядальніка з яго «усёведаннем» і ўсёпранікальнасцю.

Зусім па-іншаму ажыццяўляецца аб'яднанне агульнай тэкставай прасторы ў творах з выразна абазначанай суб'ектнай структурай. Галасы герояў атрымліваюць тут, па сутнасці, такія ж правы, як і голас аўтара-апавядальніка. Вельмі многае ў гэтым напрамку зрабіў М. Бахцін, стварыўшы

тэорыю *поліфанічнага рамана*, для якога характэрна ўзаемапранікальнасць галасоў, пунктаў гледжання герояў і аўтара. Адзін з галоўных момантаў канцэпцыі М. Бахціна – прынцыповае раўнапраўе шматлікіх галасоў, якія ўтвараюць у сваёй цеснай пераплеценасці і актыўным узаемадзеянні апавядальную тканіну твора. Тут варта заўважыць, што *голас* у М. Бахціна з’яўляецца выяўленнем перш за ўсё асабовай характэрнасці аднаго з суб’ектаў аповеду, адметнасці яго кругагляду і светабачання.

Суб’екты наратыву падзяляюцца на дзве катэгорыі: *суб’екты маўлення* і *суб’екты свядомасці*. Тым самым ахопліваецца ўся сфера мысленча-моўнага працэсу, які не толькі спараджае той або іншы тэкст, але і адлюстроўваецца пэўным чынам у яго структуры. «Суб’ектная арганізацыя, – па словах Б. Кормана, – гэта суаднесенасць усіх урыўкаў тэксту, якія ўтвараюць дадзены твор, з суб’ектамі маўлення – тымі, каму прыпісаны тэкст (фармальна-суб’ектная арганізацыя), і суб’ектамі свядомасці – тымі, чыя свядомасць выражана ў тэксце (змястоўна-суб’ектная арганізацыя)» [1, с. 508]. Зразумела, што абазначанае ў структуры твора як прыналежнае да сферы свядомасці апавядальніка або героя не павінна абавязкова супадаць з тым, што выражаецца праз моўныя формы. Мысленне хоць і знаходзіць сваё выяўленне ў мове, аднак не можа быць цалкам з ёю атаясамлена. Таму, каб глыбей спасцігнуць своеасаблівасць мастацкага свету літаратурнага твора, патрэбна ўлічваць як характар узаемадзеяння мысліцельнага і вербальнага, так і спецыфіку кожнай з гэтых сфер.

Проза Мележа, і ў прыватнасці раман «Завеі, снежань», уяўляе сабой вельмі прыдатны аб’ект для даследавання кампазіцыйна-структурных суадносін і залежнасцей тэкставай прасторы твора. Выдатны беларускі празаік, асабліва ў познім перыядзе сваёй творчасці, выйшаў на кардынальна новы ўзровень выяўлення з дапамогай канструктыўна-выяўленчых магчымасцей аповеду складанасці і драматычнай напружанасці жыцця чалавека ў свеце, няпростасці яго ўзаемаадносін з іншымі людзьмі. Стылявая манера пісьменніка, у аснову якой была пакладзена няўласна простая мова аўтарскага аповеду, была скіравана на тое, каб як мага больш выразней і шматгранней раскрыць унутраны свет герояў, паказаць яго ў несупынным развіцці, у актыўных узаемадачыненнях з рэчаіснасцю.

Даследаванню асаблівасцей мележаўскага наратыву ў значнай ступені садзейнічае тое, што захаваліся сведчанні самога аўтара, яго глыбокія развагі над прыродай літаратурнай творчасці. У распараджэнні даследчыкаў маецца такое ўнікальнае выданне, як кніга «Жыццёвыя клопаты» (1975), якая змяшчае багаты фактаграфічны матэрыял, што датычыць пытанняў творчага працэсу. Перш за ўсё ў гэтым зборніку Мележа прыцягваюць увагу артыкулы, у якіх аўтар, грунтуючыся на ўласным творчым вопыце, прыводзіць цікавыя назіранні над сваёй працай над раманамі «Палескай хронікі», разважае аб заканамернасцях станаўлення індывідуальнага мастацкага стылю.

У артыкуле «Майстэрства – гэта імкненне» (1969) Мележ, азіраючыся на пройдзены шлях, адзначаў, што ў сваіх творах апошняга часу ён заўважае новыя якасці, якіх не існавала раней. Гэтыя змены ён звязваў перш за ўсё з *суб’ектывізацыяй* апавядальнай манеры, з тым, што «ў аб’ектыўнае апавяданне ўсё часцей пачала пранікаць суб’ектыўна-лірычная плынь» [2, с. 327]. Аўтар выкарыстоўвае традыцыйнае стылёва-жанравае азначэнне *лірычная плынь*, хоць у дадзеным выпадку ў яго, несумненна, укладваецца асаблівы сэнс. Па сваіх жанравых прыкметах творы Мележа, вядома, не могуць быць аднесены да ўласна лірычнай прозы. Пад узмацненнем лірычнага пачатку пісьменнік меў на ўвазе суб’ектывізацыю свету менавіта сваіх герояў.

Мележ разумеў, што для таго, каб паказаць знутры адчуванні і думкі герояў, недастаткова толькі аб’ектывізаванага, адстароненага аўтарскага апісання. Для гэтага патрэбна было дасягнуць значна больш цеснага яднання пазіцыі апавядальніка з кругаглядам героя. Мележ адзначае ў сваім артыкуле, што падобнае збліжэнне станавілася магчымым дзякуючы спалучэнню мовы аўтара і героя, падчас якога адбываўся працэс своеасаблівай інтэграцыі іх пунктаў гледжання. «Імкненне наблізіцца да героя патрабавала ў іншых выпадках як бы поўнага пераўвасаблення ў яго, – заўважае пісьменнік. – Тады аўтарская мова злівалася з суб’ектыўнай, унутранай мовай героя, на час нават зусім саступала ёй месца. Апавяданне непрыкметна для мяне набыло невядомы раней маім кнігам унутраны рух, дзе ўвесь час як бы адбывалася змена танальнасці апавядання» [2, с. 327].

Прыведзеныя вышэй думкі Мележа дакладна вызначаюць сутнасць тых змен у паэтыцы, якія адбываюцца ў сувязі з перамяшчэннем акцэнтаў ва ўзаемаадносінах аб'ектыўнага і суб'ектыўнага. Пры гэтым варта звярнуць увагу і на тое, што ў выказваннях пісьменніка выяўляецца адценне некаторага дапушчэння: некалькі разоў паўтараецца часціца *як бы*. І гэта натуральна, паколькі гаворка ідзе пра працэсы, што маюць ментальную прыроду, закранаюць адначасова псіхалагічную і моўную сферы. «Імкненне пранікнуць глыбей у чалавека» [2, с. 327], як адна з галоўных задач пісьменніка, павінна падмацоўвацца грунтоўным уваходжаннем у сферу яго моўнага быцця. Мележ, аналізуючы вынікі сваёй працы над двума першымі раманамі «Палескай хронікі», прыходзіць да вельмі істотнага адкрыцця. Ён знаходзіць дадатковыя і вельмі значныя магчымасці выяўлення ўнутранага свету герояў якраз у суаднесенасці спосабаў і прыёмаў арганізацыі моўнага матэрыялу, у яго структурнай кадыфікацыі.

Такім чынам, на подступах да свайго апошняга рамана Мележ апрача велізарнай падрыхтоўчай працы, той унутранай працы, якую ён называў другой, *ненапісанай* кнігай, займаўся яшчэ і глыбокім тэарэтычным асэнсаваннем творчага працэсу. Магчыма выказаць меркаванне, што дадзеная акалічнасць таксама зрабіла пэўны ўплыў на паэтыку «Завеяў, снежня», на канчатковае афармленне мастацкай сістэмы празаіка.

У рамане «Завеі, снежань» якраз у найбольш сканцэнтраваным выглядзе праявіліся прыкметы новага стаўлення пісьменніка да канструктыўных магчымасцей мастацкага слова, да выяўлення «шчыльнасці і дынамікі апавядання» [2, с. 332] у яго суаднесенасці з кругаглядам і светаадчуваннем герояў. Праз «унутраны рух» апавядальных структур аўтар імкнецца перадаць дыялектычную складанасць адносін чалавека і свету. «Суб'ектыўныя карціны рознага гучання» [2, с. 327] утвараюць у сваёй сукупнасці мастацкі свет, характэрнай адметнасцю якога з'яўляецца наяўнасць шматлікіх узаемапераходаў паміж асобнымі часткамі тэксту, што рэпрэзентуюць пункты гледжання аўтара-апавядальніка і герояў. Пры гэтым варта адзначыць, што «змена танальнасці апавядання» [2, с. 327] у рамане мае не самамэтны характар, яна заўсёды абумоўлена канкрэтнай сітуацыяй, неабходнасцю больш поўнага раскрыцця характараў.

Розная ступень набліжанасці апавядальніка да пазіцыі героя, пранікнення ў яго ўнутраны свет залежыць ад разнастайных перыпетый сюжэтнага развіцця, а таксама ад агульнай задумы аўтара, канцэптуальнай асновы твора. Залежыць яна і ад імкнення аўтара паказаць у творы «знешні свет, зрокавы і адчувальны» [2, с. 327], і ад яго жадання выказацца самому. Усё гэта разам стварае надзвычай своеасаблівую структурную паслядоўнасць разгортвання наратыву ў рамане «Завеі, снежань».

Адметнасць паэтыкі дадзенага рамана заўважаецца нават у яго назве, якая сінтаксічна адрозніваецца ад назваў папярэдніх раманаў. Сімвалічнасць у назвах *Людзі на балоце*, *Подых навальніцы* выяўляецца з дапамогай звычайных спалучэнняў слоў, у той час як у назве трэцяга рамана мае месца зусім іншая сістэма адносін: *пералік* аднародных членаў дае магчымасць абазначыць больш свабодную структурную залежнасць. Сінтаксічная незавершанасць гэтай назвы пэўным чынам адпавядае той наратыўнай мадэлі, якая рэалізуецца ў тэксце рамана.

Паколькі многае ў рамане «Завеі, снежань», у тым ліку і грамадска-палітычныя калізіі выяўляемай гістарычнай эпохі, праламляецца праз прызму ўзаемаадносін Ганны і Башлыкова, то ўскладненне мастацкага свету твора перш за ўсё адбілася на характары раскрыцця гэтых герояў. Паглыбленне ў іх свядомасць, а ў пэўнай ступені і ў падсвядомасць, дазваляе не толькі шматгранна выявіць іх душэўны стан, драматызм думак і перажыванняў, але і ўбачыць *іх вачыма* многія з'явы.

Варта таксама звярнуць увагу і на тое, ***як*** называюцца апавядальнікам гэтыя два асноўныя героі рамана: яна – заўсёды па імені, ён – па прозвішчу. Імя Башлыкова, Аляксей, згадваецца толькі Апейкам, у непасрэднай з ім размове. Памочнік жа сакратара Міша звяртаецца афіцыйна: Аляксей Іванавіч. У несупадзенні намінатыўных характарыстык закаханых выяўляецца своеасаблівасць аўтарскага падыходу. Тым самым падкрэсліваецца нераўназначнасць іх становішча ў соцыуме, спалучанасць іх свядомасці з рознымі жыццёвымі сферамі.

Сацыяльныя матывы трывала спляталіся з інтымнай тэмай і ў папярэдніх раманах Мележа, вызначаючы сабой драматызм асноўнай сюжэтнай лініі. Аднак у новым рамане ў сувязі з пашырэннем апавядальнай прасторы характар адносін асабовага і грамадскага стаў некалькі іншым.

Ускладнёнымі, апасродкаванымі шматлікімі сацыяльна-гістарычнымі акалічнасцямі, аказаліся ўзаемадачыненні паміж героямі, якія, імкнучыся да асабістага шчасця, вымушаны былі больш узважана сувымяраць свае намеры з агульнымі ўстаноўкамі і стэрэатыпамі мыслення, характэрнымі для таго часу.

У большай ступені збліжанымі, узаемаўзгодненымі паўстаюць у «Завеях, снежні» пазіцыі апавядальніка і герояў. Адбываецца ўзаемапранікненне ў тэкставай прасторы адзнак іх свядомасці і маўлення, што прыводзіць да стварэння складанай наратыўнай структуры. Аўтарскі аповед уключае ў сябе разнастайныя мадыфікацыі галасоў персанажаў, праявы іх пунктаў гледжання. Ужо звыклая для Мележа, добра ім распрацаваная апавядальная форма з дамінаваннем няўласна простай мовы значна ўзбагацілася новымі адценнямі.

Пачынаецца раман «Завеі, снежань», як і папярэднія творы цыкла, з аб’ектывізаванага аўтарскага апісання – выяўлення агульнай карціны прыроднага стану, характэрнага на момант пачатку дзеяння. Праўда, на гэты раз экспазіцыя вельмі сціслая, яна завяршаецца літаральна праз некалькі абзацаў шматкроп’ем, пасля чаго аўтар адразу звяртаецца да абставін жыцця Ганны ў новым для яе асяроддзі – глінішчанскай школе. Аднак перад тым, як паказаць гераіню ў канкрэтнай сітуацыі сюжэтнага дзеяння, апавядальнік расказвае пра тое, як яна наогул прывыкае да новага жыцця. Мінулы час, які выражаецца дзеясловамі незакончанага трывання, хоць і не звязаны з цяперашнім момантам, аднак усё ж такі не вельмі ад яго аддалены. Гэта падкрэсліваецца адразу пры пераходзе ад экспазіцыйнай часткі да асноўнага аповеду: «Далёка да позняга *ў гэтыя дні* світанку ўставала Ганна...» [3, с. 7] (вылучана мной. – *Я. Г.*).

Паглыбляючыся ў пачуцці і разважанні Ганны, перадаючы іх сваімі словамі, аўтар з дапамогай уводных сказаў пастаянна нагадвае аб тым, што аповед вядзецца з вонкавага ў адносінах да яе свядомасці пункту гледжання («увесь час помніла», «нагадвала яна сабе» [3, с. 9], «яна думала цвяроза», «хоць і ведала», «была і цяпер упэўнена» [3, с. 10] і г. д.). Разам з тым даволі часта ў мове апавядальніка сустракаюцца таксама і адзнакі, якія выяўляюць адчуванні гераіні больш непасрэдна, адсылаючы да канкрэтнай сітуацыі экзістэнцыйнага перажывання ёю тых або іншых момантаў жыцця. У такіх выпадках выразна гучыць яе ўласны голас, інтаніраваны эмацыянальнай узрушанасцю, рэфлексійнай засяроджанасцю.

Школа, у якой знайшла сабе прытулак Ганна, становіцца, пачынаючы з першых раздзелаў рамана, важным асяродкам, вакол якога аб’ядноўваюцца многія сюжэтныя лініі. Гэта адзін з самых актыўных цэнтраў сюжэтабудавання, у якім сыходзяцца важнейшыя вузлы дзеяння. Тыя, хто прыходзяць сюды або *заязджаюць*, прыносяць разам з сабой клопаты і трывогі, якімі жыве вялікі свет. Адсюль, як з часовага прыстанішча, Ганна глядзіць з трывожным хваляваннем у свет, шукаючы ў ім надзейнай апоры.

У гэтым локусе найбольш выразна выяўляецца цесная пераплеценасць інтымнай і грамадскай тэм, якая наогул з’яўляецца характэрнай рысай «Палескай хронікі». Тут Ганна ўпершыню сустракае Башлыкова. Сцэна іх знаёмства падаецца, дарэчы, праз успрыманне гераіні. Менавіта вачыма Ганны глядзім мы ў дадзеным выпадку на Башлыкова, бачым перш за ўсё тое, што ўражвае яе ў прыезджым кіраўніку. У гэтым эпізодзе аповед набывае прыкметы, характэрныя для свядомасці гераіні. «І от, мабыць, – успамінае пра тое, што пабачыў, пачуў, пахадзіўшы ў **нашай** гразі. От, мабыць, і гняце яго – у навінку. Гарадскі ж сам, відаць...» [3, с. 35] (тут і далей вылучана мной. – *Я. Г.*). У падобных развагах не застаецца, па сутнасці, нічога ад пазіцыі апавядальніка, хоць яны і не афармляюцца ў выглядзе простай мовы, прыналежнай гераіні.

Тут мы маем справу з такой разнавіднасцю простай мовай, якая прадстае ў сваёй іманентнай форме. Выразна абазначаны *размоўны* стыль выступае своеасаблівым носьбітам пункту гледжання гераіні, яе ўнутранага стану. У прыведзеным вышэй урыўку звяртае на сябе ўвагу акцэнтаванае выяўленне верагоднасці, няпэўнасці выказаных меркаванняў. Ганна, натуральна, не можа ведаць падрабязнасцей біяграфіі сакратара райкома, яна толькі здагадваецца пра некаторыя з іх, зыходзячы з агульнага ўражання, якое робіць на яе Башлыкоў.

Аўтар, арганізуючы аповед «ад імя» гераіні, выстройвае яго ў паслядоўнасць меркаванняў, з дапамогай якой перадаецца дынамічна-імпульсіўны характар плыні свядомасці Ганны. Сказы

вызначаюцца лаканізмам, сінтаксічнай незавершанасцю. «Гарадскі. Не з **нашых** балотных. Можна і не пытацца. Прысланы, пэўне, калектывы рабіць. Вучыць цёмных **нас** розуму... Граматны. Канешне. Не **нашага** поля ягада...» [3, с. 35]. Як бачым, адразу некалькі моўных характарыстык сведчыць пра суаднесенасць тэксту з унутраным светам гераіні. Значную ролю пры гэтым выконваюць займеннікі, першаасабовасць якіх недвухсэнсава ўказвае на тое, з чыйго пункту гледжання ў дадзеным выпадку вядзецца аповед. Апавядальнік з яго аб’ектывізаванай пазіцыяй, вядома, не мог бы выказвацца пра нейкія рэчы як пра н а ш ы.

Аднак, вызначаючы дадзены сегмент тэксту як адпаведны пункту гледжання гераіні, трэба мець на ўвазе ўсё-такі пэўную ўмоўнасць яго вылучэння. Паколькі яго межы не лакалізаваны фармальнымі прыкметамі простай мовы – двукоссямі, ён знаходзіцца ў больш блізкім судакрананні з іншымі сегментамі, дзе дамінуючым выступае пункт гледжання апавядальніка. Адразу пасля працытаванага вышэй фрагмента ідзе тэкст, які немагчыма ўжо з такой жа самай адназначнасцю аднесці да выяўлення пазіцыі т о л ь к і гераіні: «Штосьці і далёкае, адасоблівае, і разам – цікаўнае, прывабнае **было** ў гэтым – гарадскі, невядомы, і цікаўнае, і – дзіўна раўнівае: **што** от ён такі, граматны, гарадскі. Не **іх** поля ягада...» [3, с. 35].

Тут паступова выходзіць на першы план пункт гледжання апавядальніка – асобы, якая займае знешнюю ў адносінах да герояў пазіцыю, якая *расказвае* пра тое, што з імі адбываецца. Аб гэтым сведчаць выкарыстанне мінулага часу, г. зн. пэўнае дыстанцыяванне ад канкрэтнага сітуацыйнага моманту, а таксама ўскосная форма мовы аповеду. Самым жа бясспрэчным паказчыкам пункту гледжання апавядальніка з’яўляецца ў дадзеным выпадку выкарыстанне ім займенніка трэцяй асобы. Аўтар хутчэй за ўсё спецыяльна акцэнтуе ўвагу на прыёме кантраснага супрацьпастаўлення, вельмі блізка адзін ад аднаго змяшчаючы ў тэксце два люстрана антанімічныя выразы: «Не **нашага** поля ягада...» – «Не **іх** поля ягада...» Такім чынам дасягаецца, па сутнасці, двайны эфект: падкрэсліваецца цэласнасць наратыву, блізкасць пазіцый аўтара і персанажа, і разам з тым вылучаюцца ўсё ж такі ў, здавалася б, суцэльнай апавядальнай плыні асобныя, дамінуючыя ў пэўны момант, галасы, за якімі выразна паўстаюць яскравыя вобразы людзей з іх непаўторнай індывідуальнасцю.

Вельмі паказальнымі ў плане выяўлення складанай спалучанасці розных пунктаў гледжання з’яўляюцца трэці і чацвёрты раздзелы першай часткі рамана. У гэтых раздзелах абазначаюцца самыя істотныя, вузлавыя для развіцця сюжэту моманты. У свет Ганны пачынаюць усё больш настойліва ўваходзіць адзнакі гістарычнага часу, яе асабістыя адчуванні (завостранасць увагі на постаці Башлыкова) аказваюцца ў прамым сутыкненні з тым, чым жывуць іншыя людзі. Трэці раздзел пачынаецца такімі паказальнымі словамі: «Праз свае трывогі і клопаты Ганна, як пра далёкае і неабавязковае, чула, чым жыве сяло» [3, с. 28]. Фраза гэта вызначаецца сваёй амбівалентнасцю. Ёю адначасова сцвярджаецца і замкнёнасць Ганны на сваіх праблемах, і пазначаецца ўсё ж магчымасць выхаду з такога абмежаванага кола. Усім далейшым аповедам якраз пацвярджаецца рух гераіні ў гэтым напрамку, раскрываецца ў многім драматычнае спазнанне ёю праз уласны лёс супярэчнасцей гістарычнай эпохі.

Сімвалічным у гэтым плане з’яўляецца паказ сходу, на якім раённае кіраўніцтва імкнецца аднавіць у Глінішчах калгас. Гэта напружанае супрацьстаянне пададзена праз успрыманне Ганны. Знешне аб’ектывізаваны аповед увесь час карэктуецца пунктам гледжання гераіні. Пастаянна адчуваецца яе прысутнасць побач з выяўляемымі падзеямі, зацікаўленасць тым, што адбываецца. Ганна назірае за сходам з калідора, у якім таксама тоўпяцца глінішчанцы. Назіраючы быццам збоку, яна ў той жа час знаходзіцца сярод удзельнікаў, адчувае іх настрой, каменціруе ў думках выступленні. Асаблівая ўвага пры гэтым звяртаецца ёю (пакуль што падсвядома, міжволі) на паводзіны і словы Башлыкова.

Усіх, хто прыйшоў на сход, вядома, цікавіць, што скажа і як будзе паводзіць сябе ў дадзенай сітуацыі сакратар райкома. Ганна знаходзіцца *ўнутры* гэтага людскога наплыву, прасякнутая агульным з астатнімі памкненнем. «Вочы ўсіх – мноства вачэй – глядзелі толькі на яго. Перасталі дыміць у калідоры, падступілі да дзвярэй. Сціснуліся так, што нельга было варухнуцца. Ганне сцінала дыханне» [3, с. 58]. *Сціснуліся – сцінала...* З дапамогай суаднясення гэтых блізказначных і сугучных дзеясловаў перадаецца адчуванне з’яднанасці Ганны з іншымі, а таксама яднанне

знешняга і ўнутранага. Ганна глядзіць разам з усімі, і ў той жа час яна здольна да ўспрымання гэтай усеагульнай увагі са знешняга боку, пэўным чынам вылучаючы сябе з грамады.

Праз увесь аповед пра сход у глінішчанскай школе праходзіць выразна акцэнтаваны пункт гледжання Ганны. Апавядальнік увесь час спасылаецца на ўспрыманне гераіні, яе ўражанні, думкі і адчуванні. Такі падыход дае магчымасць аўтару паказаць адну з ключавых сцэн рамана больш шматпланава і аб'ектывізавана, з улікам жыццёвых пазіцый персанажаў.

Раман «Завеі, снежань», як і ўся «Палеская хроніка» Мележа ў цэлым, – прыклад майстэрскага выкарыстання пісьменнікам поліфанічных магчымасцей наратыву, складанага спалучэння разнастайных спосабаў выяўлення светапогляду аўтара і герояў.

## Літаратура

1. К о р м а н, Б. О. О целостности литературного произведения / Б. О. Корман // Известия Академии наук СССР. Серия лит. и яз. – 1977. – Том 36. – № 6.

2. М е л е ж, І в а н. Жыццёвыя клопаты: Артыкулы, эсэ, інтэрв'ю / Іван Мележ. – Мінск: Маст. літ., 1975.

3. М е л е ж, І в а н. Збор твораў: у 10 т. / Іван Мележ. – Мінск: Маст. літ., 1983. – Т. 7.

*Y. A. HARADNITSKI*

**STRUCTURE SUBJECTNESS OF IVAN MELEŻH'S NOVEL «SNOWSTORMS. DECEMBER»**

## Summary

Peculiarities of the narrative structure of the Ivan Meleż's novel «Snowstorms, December» have been analyzed in the article. Comparison and correlation of author's point of view with his hero's one have been regarded as the main way to the narrative structure differentiation. Linguistic forms of the points of view expression in the work of art have been studied. Multiformity of narrative means in the novel has been ascertained.

*УДК 82.0398 (= 161.3)*

*С. В. ШАМЯКІНА*

# СІСТЭМНАСЦЬ КАМПАНЕНТАЎ ЗМЯСТОЎНАЙ СТРУКТУРЫ РЭЧЫЎНЫХ ВОБРАЗАЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ БЕЛАРУСКІХ ЧАРАДЗЕЙНЫХ КАЗАК)

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

*(Паступіў у рэдакцыю 20.04.2010)*

Шмат якія даследчыкі літаратуры (Б. Тамашэўскі, В. Кожынаў, Ю. Лотман, Н. Валгіна, А. Фядотаў і інш.) размяжоўваюць вобразы па розных тыпах і відах. Напрыклад, да такога тыпу як вобразы-тропы адносяць некалькі відаў: эпітэты, параўнанні, метафары, метаніміі, гіпербалы і г. д. Вобраз-персанаж, вобраз-локус і вобраз-рэч відавочна вылучаюцца ў асобны тып.

Названыя тры віды вобразаў (персанажы, локусы і рэчы) вельмі блізкія па сэнсаваму напаўненню і структуры і ў той жа час істотна адрозніваюцца па многіх параметрах ад іншых відаў вобразаў, у прыватнасці ад вобразаў-тропаў. Вобразы-персанажы, локусы і рэчы па свайму асноўнаму катэгарыяльнаму значэнню суадносяцца з адзінкавымі, канкрэтнымі з’явамі матэрыяльнай рэчаіснасці – жывымі істотамі, аб’ектамі прасторы, прадметамі; у той час як вобразы-тропы выяўляюць адносіны паміж некалькімі аб’ектамі ці з’явамі (як мінімум двума), або паміж аб’ектам і яго часткай. Расійская даследчыца І. Раднянская наступным чынам вызначае структуру вобразаў-тропаў: яны могуць быць пабудаваныя па «прынцыпу метаніміі (частка ці прыкмета замест цэлага) або па прынцыпу метафары (асацыятыўныя адносіны розных аб’ектаў)» [6, с. 673].

Пад **вобразамі-персанажамі** мы разумеем дзеючых асоб твора – жывых істот, а таксама аб’екты і з’явы, што функцыянальна іх замяняюць, гэта значыць такія вобразы, якім у творы прыпісваецца ўласцівасць мыслення, адчування, дзейнасці. Да **вобразаў-рэчаў** адносім нелакалізаваныя ў прасторы аб’екты, якія магчыма перамясціць з месца на месца, персанажу ўзяць з сабою. А вось аб’екты, лакалізаваныя ў прасторы, са стабільным у ёй месцазнаходжаннем, мы называем **вобразамі-локусамі**. Гэта, па-сутнасці, вобразы прасторы, але не панарамныя малюнкі, як пейзаж, а адзінкавыя аб’екты. На падставе падобнай сэнсавай суаднесенасці дадзеных відаў вобразаў з канкрэтнымі з’явамі матэрыяльнай рэчаіснасці тып, у які мы аб’ядноўваем названыя тры віды, назавём **«рэчыўнымі (субстанцыяльнымі) вобразамі»**.

У тропаў, з аднаго боку, і персанажаў, локусаў, рэчаў – з другога, адносіны паміж зместам і формай, гэта значыць паміж сэнсам вобразаў і іх вербальнай абалонкай, – розныя. Вобразы-тропы даследчыкі прама называюць «слоўнымі вобразамі». Яны прысутнічаюць толькі ў слоўнай форме, у прыгожым пісьменстве. Між тым, рэчыўныя вобразы ёсць таксама ў жывапісе, у скульптуры; аб’екты ж архітэктуры і ёсць, самі па сабе, увасобленыя вобразы-локусы. Названыя віды вобразаў менш звязаныя са сваёй слоўнай абалонкай, для многіх з іх яна, па-сутнасці, – мастацкая дэталь, якую магчыма замяніць на іншую без страты (часам нават без істотнай змены) сэнсу. А вось слоўная форма, якою выражае сябе канкрэтны троп – адзіна магчымая і назаўсёды зададзеная для яго. Замяніўшы словы ў метафары, атрымаем зусім іншую метафару (ці ўвогуле бязглуздзіцу). Але пры гэтым сэнс пэўнага тропа часта магчыма зразумець па-за кантэкстам твора, у якім ён ужыты, у той час як сэнсавае напаўненне рэчыўнага вобраза робіцца бачным толькі ў кантэксце ўсяго твора. Такім чынам, вобразы-персанажы, локусы і рэчы маюць меншую залежнасць ад сваёй канкрэтнай вербальнай абалонкі і большую залежнасць ад кантэксту твора, чым вобразы-тропы.

І тропы, і рэчыўныя вобразы ў тэксце абазначаны пэўнымі лексемамі. Адны і тыя ж лексемы ў кантэксце канкрэтных твораў набываюць дадатковыя сэнсы. Вобраз-троп – гэта, як піша вядомы беларускі даследчык В. Рагойша, «слова ці моўны выраз, ужытыя ў пераносным значэнні»

[5, с. 325]. У словах, якімі абазначаны ў тэксце субстанцыяльныя вобразы, таксама прысутнічаюць прырашчэнні сэнсу. Слоўны мастацкі вобраз – гэта, з лінгвістычнага пункту погляду, слова з дадатковымі ці іншымі, у параўнанні з агульнанароднымі, лексічнымі значэннямі. Пра спецыфіку мастацкага вобраза ў параўнанні са слоўнікавым значэннем слова пісалі многія даследчыкі, у прыватнасці, слынны расійскі акадэмік В. Вінаградаў адзначаў адносна слова ў мастацкім творы, што «яго сэнсавая структура пашыраецца і ўзбагачаецца тымі мастацка-выяўленчымі прырашчэннямі сэнсу, якія развіваюцца ў сістэме цэласнага эстэтычнага аб'екта» [1, с. 50–51].

Зыходзячы з вышэйсказанага, розніца паміж тропамі і рэчыўнымі вобразамі – у якасці і колькасці дадатковых сэнсаў, якія і складаюць *змястоўную, сэнсавую структуру вобраза*. Звярнуўшыся да класічнай работы П. Палiеўскага «Унутраная структура вобраза», мы бачым, што ў вобразаў-тропаў структура даволі простая – складаецца, як правіла, з двух кампанентаў, паміж якімі ўстанаўліваюцца адносіны параўнання, супастаўлення, узаемаадлюстравання [3, с. 72–114]. Структура ж рэчыўных вобразаў, на нашу думку, з'яўляецца больш складанай, змяшчае ў сабе большую колькасць кампанентаў, і гэтыя кампаненты могуць уступаць паміж сабой у разнастайныя ўзаемасувязі.

Так, шматлікія прырашчэнні сэнсу, якія набывае слова, абазначаючы рэчыўны вобраз у мастацкім творы, на нашу думку, можна абагульніць у некалькі стабільных груп. Дадзеныя групы і будуць кампанентамі змястоўнай структуры рэчыўных вобразаў. Такім чынам, мы вылучаем наступныя кампаненты:

1) культурна-рэчаіснасны кампанент;
2) аўтарская ацэнка;
3) функцыянальна-мэтавы кампанент;
4) мастацкая дэталь.

Працэс складвання вобраза з падобнай структурай можна (з некаторым, непазбежным у навуцы, спрашчэннем) прадставіць наступным чынам: аўтар пры стварэнні мастацкага вобраза перапрацоўвае некаторыя жыццёвыя рэаліі і культурныя з'явы (адсюль – *культурна-рэчаіснасны кампанент*); надзяляе вобраз пэўнымі мэтамі і функцыямі, каб уключыць яго ў структуру тэксту, суаднесці з іншымі вобразамі (*функцыянальна-мэтавы кампанент*); прыўносіць пэўныя дэталі, каб надаць яму канкрэтнасць і непаўторнасць (*кампанент «мастацкая дэталь»*), і, у рэшце рэшт, ацэньвае, зыходзячы са сваіх аксіялагічных установак, этычных нормаў і бачання эстэтычнага ідэалу (*кампанент «аўтарская ацэнка»*).

У кожным відзе вобразаў (персанаж, локус, рэч) і ў кожным канкрэтным вобразе названыя структурныя элементы напаўняюцца розным зместам. Акрамя таго, большасць кампанентаў маюць у вобразе не адно, а некалькі праяўленняў. Атрымліваецца, што кожны кампанент структуры вобраза таксама з'яўляецца змястоўнай структурай, сістэмай нейкіх узаемазалежных элементаў (так, атам уваходзіць у малекулу, але сам уключае ў сябе элементарныя часцінкі).

Кампаненты змястоўнай структуры субстанцыяльных вобразаў, функцыянуючы ў творы, уступаюць у шматлікія ўзаемадзеянні паміж сабой. Змест рэчыўных вобразаў становіцца зразумелым толькі ў кантэксце ўсяго твора. З гэтага вынікае, што на складванне і разуменне вобраза накладваюць адбітак як стасункі паміж кампанентамі ўнутры вобраза, так і паміж кампанентамі дадзенага вобраза з кампанентамі іншых вобразаў. Мы мяркуем, што для рэчыўных вобразаў магчымы ўзаемадзеянні трох відаў:

1) паміж кампанентамі аднаго і таго ж вобраза;
2) паміж кампанентамі розных вобразаў аднаго віду (напрыклад, паміж двума персанажамі);
3) паміж кампанентамі вобразаў розных відаў (напрыклад, паміж персанажам і локусам).

Мы вылучылі тры віды рэчыўных вобразаў (персанажы, локусы і рэчы) і па чатыры кампаненты ў структуры кожнага з іх. Такім чынам, усяго відаў узаемадзеянняў паміж кампанентамі аднаго вобраза і кампанентамі розных вобразаў налічваецца 114.

Пакажам на прыкладах з беларускіх чарадзейных казак [8–9], якія ўзаемаадносіны ўзнікаюць паміж кампанентамі структуры рэчыўных вобразаў, прыняўшы наступныя ўмоўныя абазначэнні: КР – культурна-рэчаіснасны кампанент, АА – аўтарская ацэнка, ФМ – функцыянальна-мэтавы кампанент, МД – мастацкая дэталь. Адсюль віды сувязей маюць наступны выгляд:

а) *паміж рознымі кампанентамі аднаго вобраза*. Напрыклад, КР вобраза-рэчы 1 + МД рэчы 1 (матэрыял, з якога зроблена рэч, адначасова ўказвае на сувязь з рэальнымі з'явамі і з'яўляецца мастацкай дэталлю, якая характарызуе дадзеную рэч. Напрыклад, у казцы «Рак-царэвіч» дзяўчына, каб дайсці да свайго жаніха, павінна збіць тры жалезныя кіі. Жалеза як матэрыял, з якога зроблены кій, адначасова і ўказвае на сувязь з рэальным хімічным рэчывам, і ў якасці мастацкай дэталі характарызуе кій як вельмі трывалы); АА персанажа 1 + МД персанажа 1 (станоўчыя персанажы ў казках звычайна надзяляюцца прывабнай знешнасцю, добрымі рысамі характару); КР локуса 1 + МД локуса 1 (эпітэты, якія характарызуюць горы – Крышталёвая, Залатая, – могуць указваць на сувязь казачнага локуса з міфалагічным вобразам Сусветнай Гары);

б) *паміж аднолькавымі кампанентамі розных вобразаў аднаго віду*. Напрыклад, КР персанажа 1 + КР персанажа 2 (стасункі паміж казачнымі персанажамі пэўных сацыяльных колаў адпавядаюць рэальным гістарычным стасункам людзей дадзеных саслоўяў); АА персанажа 1 + АА персанажа 2 (аўтарская ацэнка другарадных персанажаў казкі выяўляецца праз іх узаемаадносіны з цэнтральным персанажам, які заўсёды ацэньваецца станоўча – гэта закон жанру); АА локуса 1 + АА локуса 2 (ацэнка локуса «свой» ці «чужы» залежыць ад таго, да якога «звышлокуса» належыць дадзены вобраз – да звычайнага свету ці да іншасвету);

в) *паміж рознымі кампанентамі вобразаў аднаго віду*. Напрыклад, АА локуса 1 + ФМ локуса 2 + АА локуса 3 («межавая функцыя» локуса «двор на мяжы іншага свету» праяўляецца праз узаемадзеянне з двума «звышлокусамі» – звычайным светам і іншасветам, якія маюць аўтарскую ацэнку «свой» і «чужы»);

г) *паміж аднолькавымі кампанентамі вобразаў розных відаў*. Напрыклад, АА персанажа 1 + АА локуса 1 (на локус можа пераходзіць ацэнка таго персанажа, які ў ім жыве. Напрыклад, хатка адмоўнага персанажа Бабы-Ягі-выкрадальніцы дзяцей з'яўляецца локусам, варожым для галоўнага героя); АА локуса 1 + АА персанажа 1 + АА рэчы 1 (станоўчым з'яўляецца той локус, дзе галоўны герой можа набыць карысныя для сябе рэчы);

д) *паміж рознымі кампанентамі вобразаў розных відаў*. Напрыклад, МД персанажа 1 + ФМ рэчы 1 (каб праверыць сваю моц, герой падкідвае ў неба булдаву; пры гэтым моц з'яўляецца для персанажа характаралагічнай мастацкай дэталлю, а булдава мае функцыю выпрабавання); МД рэчы 1 + КР ці ФМ персанажа 1 (валоданне рэччу з пэўнымі характарыстыкамі падкрэслівае міфалагічнае паходжанне персанажа ці яго асаблівыя функцыі. Напрыклад, валоданне залатымі рэчамі можа ўказваць на сувязь з салярнымі міфамі, бо залаты колер заўсёды асацыіраваўся з сонцам);

е) *паміж пэўным кампанентам аднаго вобраза і вобразам іншага віду цалкам*. Напрыклад, ФМ персанажа або локуса 1 + рэч 1 (валоданне пэўнай магічнай рэччу вызначае маёмасную функцыю персанажа, такая ж функцыя ў локуса – пры захоўванні ў ім рэчы); ФМ рэчы 1 + персанаж 1 (мэты рэчаў часта залежаць ад персанажаў, якія імі валодаюць – «дапамагаць герою», «дапамагаць антыгерою» і інш.); ФМ рэчы 1 + локус 1 (медны, срэбраны і залаты палацы могуць сцягвацца ў яечкі, што з'яўляюцца вобразамі-рэчамі з мэтай «замяняць сабою локус»);

ж) *паміж пэўнымі кампанентамі ўсіх вобразаў аднаго віду ў творы*. Напрыклад, культурнарэчаіснасныя кампаненты (а менавіта сувязь з міфалагічнымі вераваннямі) усіх вобразаў-локусаў у канкрэтнай казцы аб'ядноўваюць гэтыя вобразы ў адзіную сістэму. Дадзенае меркаванне грунтуецца на сучаснай тэорыі «леяў» – дарог-ліній, якімі злучаліся ў старажытнасці найбольш значныя ў сакральным плане месцы [2, с. 122–153]. Прастора ж у чарадзейнай казцы перарыўная, дыскрэтная – апісаны толькі найбольш значныя для сюжэта вобразы-локусы, а не шлях героя паміж імі [4, с. 48].

Паказаныя намі вышэй магчымыя віды сувязей паміж кампанентамі вобраза(аў) могуць выяўляць, на нашу думку, розныя віды адносін. Напрыклад, гэта могуць быць раўнапраўныя адносіны паміж элементамі сістэмы. Так, узаемадзеянне культурных кампанентаў персанажа Баба-Яга і локуса Хатка на курыных ножках у беларускіх чарадзейных казках (калі браць пад увагу даследаванні У. Пропа [4, с. 52–112]) стварае міфалагічны падтэкст названых вобразаў, звязаны з абрадам ініцыяцыі. Прычым нельга сказаць, што персанаж Баба-Яга – галоўны вобраз, а локус яму падначалены, – менавіта паводле свайго культурнага падтэксту яны раўнапраўныя, аднолькава значна ўказваюць на гістарычныя з'явы, што ляжалі ў іх аснове.

З другога боку, паміж кампанентамі структуры вобразаў могуць устанаўлівацца і адносіны іерархіі. Напрыклад, аўтарская ацэнка вобразаў-рэчаў у чарадзейных казках у многім залежыць ад сюжэтнай ролі вобраза-персанажа, з якім рэч звязана, а таксама яго ацэнкі (значыць, ад культурнага кампанента і аўтарскай ацэнкі персанажа). Калі рэч належыць і дапамагае галоўнаму герою казкі (які заўсёды станоўчы), то яна мае ацэнку «каштоўная», а калі адмоўнаму антыгерою – «шкодная».

Відавочна, што ў кожным вобразе закладзена нейкая ідэя. У дачыненні да нашай тэорыі аб структуры вобраза ўзнікае пытанне: у якім са структурных кампанентаў заключана канатацыя? Мы лічым, што ідэйны змест вобраза ствараецца якраз узаемадзеяннямі і ўнікальнымі спалучэннямі паміж сабой канкрэтных складнікаў усіх кампанентаў структуры. Акрамя аўтарскіх ідэй, свядома ўкладзеных пісьменнікам у вобраз, ёсць падставы гаварыць таксама пра індывідуальнае ўспрыманне чытачом канкрэтнага вобраза. Мы мяркуем, што структурнасць рэчыўных вобразаў накладвае адбітак на ўспрыманне іх чытачамі: кожны чалавек можа несвядома абраць адзін з кампанентаў (ці адно з праяўленняў пэўнага кампанента) галоўным, і ад гэтага будзе адштурхоўвацца яго разуменне астатніх кампанентаў, а таксама ўсяго зместу вобраза цалкам. Напрыклад, многія персанажы з адмоўнай аўтарскай ацэнкай у фальклоры і літаратуры маюць у той жа час асобныя прывабныя рысы знешнасці і паводзін, што з'яўляюцца мастацкімі дэталямі ў іх структуры. У выніку, калі ў свядомасці канкрэтнага чытача на першы план выходзіць аўтарская ацэнка дадзенага персанажа, то чытач успрымае яго негатыўна, калі ж яскравыя мастацкія дэталі – пазітыўна.

Структура рэчыўных вобразаў, на нашу думку, валодае прыкметамі нелінейнай аперыядычнай дынамічнай (або «хаатычнай») сістэмы. Па-першае, кампаненты структуры могуць уступаць у шматлікія і разнастайныя стасункі паміж сабой – гэта прыкмета нелінейнасці. Па-другое, працэс стварэння вобраза пісьменнікам (а тым больш працэс складвання фальклорнага вобраза пры групавым творчым акце) у многім носіць інтуітыўны, падсвядомы характар – немагчыма прадказаць, якім вобраз атрымаецца. Гэта прыкмета аперыядычнасці. І па-трэцяе, кожны чытач успрымае пэўны вобраз па-свойму – вобраз як бы працягвае далейшае сваё развіццё ў свядомасці чытачоў, што з'яўляецца паказчыкам дынамічнасці. Тэорыя хаосу, распрацаваная лаўрэатам Нобелеўскай прэміі І. Прыгожыным, у прыватнасці, тлумачыць бясконцую разнастайнасць з'яў і працэсаў у прыродзе і ў культуры. На нашу думку, яна можа патлумачыць і існаванне шматлікай колькасці разнастайных рэчыўных вобразаў, пры тым, што ўсе яны валодаюць аднолькавай структурай – даволі простай. Тое ж самае назіраецца і ў многіх іншых з'явах рэчаіснасці. Навуковец Іен Сцюарт дае наступнае вызначэнне хаосу: «Здольнасць простых мадэляў, якія не маюць унутраных выпадковых прыкмет, нараджаць у вышэйшай ступені нерэгулярныя паводзіны» [7, с. 11].

Такім чынам, персанажы, локусы і рэчы па свайму сэнсаваму напаўненню і змястоўнай структуры можна аднесці да аднаго тыпу вобразаў, які мы назвалі «рэчыўнымі (ці субстанцыяльнымі) вобразамі». Дадзеныя тры віды вобразаў вельмі падобныя паміж сабой па адзначаных параметрах, і ў той жа час істотна адрозніваюцца ад іншых тыпаў вобразаў, у прыватнасці – вобразаў-тропаў. Рэчыўныя вобразы маюць структуру з чатырох кампанентаў, якія ў сюжэце твора могуць уступаць паміж сабою ў разнастайныя стасункі. Праз іх узаемадзеянні ствараецца і выяўляецца агульны ідэйны змест канкрэтнага вобраза і ўсяго твора цалкам. Якасная і колькасная шматлікасць узаемадачыненняў паміж кампанентамі структуры рэчыўных вобразаў з'яўляецца прычынай існавання ў фальклоры і літаратуры бясконцай колькасці вобразаў дадзенага тыпу.

**Літаратура**

1. В и н о г р а д о в, В. В. О языке художественной литературы / В. В. Виноградов. – М.: Наука, 1959. – 328 с.

2. Е р м а к о в, С. Волшебные пути, по которым движутся духи / С. Ермаков // Мифы и магия индоевропейцев: Альманах. Вып. 3. – М.: Менеджер, 1996. – С. 122–153.

3. П а л и е в с к и й, П. В. Внутренняя структура образа / П. В. Палиевский // Теория литературы. Основные проблемы в историческом освещении. Образ, метод, характер; редкол.: Г. Л. Абрамович [и др.]. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1962. – 452 с.

4. П р о п п, В. Я. Исторические корни волшебной сказки / В. Я. Пропп; отв. ред. В. И. Еремина, Н. М. Герасимова. – Л.: Изд-во Ленингр. ун-та, 1986. – 366 с.
5. Р а г о й ш а, В. Тэорыя літаратуры ў тэрмінах: дапам. / В. Рагойша. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 2001. – 384 с.
6. Р о д н я н с к а я, И. Б. Образ / И. Б. Роднянская // Литературная энциклопедия терминов и понятий; под ред. А. Н. Николюкина. Ин-т науч. информ. по обществ. наукам РАН. – М.: НПК «Интелвак», 2003. – 1600 с.
7. С а р д а р, З., А б р а м с, И. Хаос без аспирина / З. Сардар, И. Абрамс. – М.; Ижевск: НИЦ «Регулярная и хаотическая динамика», Ин-т компьютерных исслед., 2006. – 180 с.
8. Чарадзейныя казкі: у 2 ч. / рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – Ч. 1. – 648 с. (АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць).
9. Чарадзейныя казкі: у 2 ч. / рэд. В. К. Бандарчык. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – Ч. 2. – 696 с. (АН БССР. Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Беларус. нар. творчасць).

*S. V. SHAMYAKINA*

**SYSTEM OF MATERIAL IMAGES SUBSTANTIAL STRUCTURE COMPONENTS (ON EXAMPLES OF THE BELARUSIAN MAGIC FAIRY TALES)**

## Summary

In the article author investigates the structure of the special type of artistic images which is material type concerning to characters, loci and things. The given type of images difference from images-tropes has been analyzed. Main attention has been given to components of material images substantial structure and system interrelations between them on examples of the Belarus magic fairy tales analysis of texts. Also problems of reader’s perception of images, creation of their general ideological contents have been studied in the article. Conception of the similarity of material images structure with chaotic systems has been presented, too.

## *МОВАЗНАЎСТВА*

*УДК 808.26.: 800.22*

*В. К. МАРОЗ*

# ЛЕТАПІСНЫЯ РОЗНАЧЫТАННІ ЯК АДЛЮСТРАВАННЕ ВАРЫЯНТНАГА ФОРМАЎЖЫВАННЯ Ў НАРМАТВОРЧЫХ ПРАЦЭСАХ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь*

*(Паступіў у рэдакцыю 30. 11. 2010)*

У беларускім пісьменстве старажытнага перыяду літаратурнасць мовы не рэгулявалася ўзорнымі тэкстамі, але з прычыны вялікай колькасці і актыўнага пашырэння рукапісаў і старадрукаў усталёўваліся моцныя традыцыі пісьма, на аснове якіх і выпрацоўваліся тагачасныя літаратурныя нормы. Як засведчылі лінгвістычныя даследаванні, беларускія летапісныя помнікі XV–XVI стст. у поўным аб'ёме адлюстравалі працэсы станаўлення пісьмова-літаратурнай формы мовы. У межах летапіснай традыцыі адбор нарматыўных сродкаў адбываўся ў адпаведнасці з агульнымі тэндэнцыямі развіцця старажытнай мовы – у кірунку вызвалення ад архаічных кніжнаславянскіх рыс і паступовага збліжэння з народнай мовай. Фанетычныя з'явы беларускай мовы ў асноўных сваіх рысах хоць і былі малапрыкметнымі ў помніках XV ст., сярод якіх «Летапісец вялікіх князёў літоўскіх» і спісы І беларускага зводу, але ў наступныя стагоддзі сталі набываць устойлівы характар і тым самым выступаць у якасці варыянтнай нормы.

Вялікая каштоўнасць беларускіх летапісаў у іх сінкрэтычным характары – спалучэнні арыгінальнага летапіснага тэксту з кампілятыўнымі матэрыяламі ці цытатамі-ўстаўкамі. Паўтаральнасць аднародных частак розных спісаў беларускіх летапісаў стварае рэальны механізм для адсочвання на працягу значнага гістарычнага перыяду якасных змен у старажытнай беларускай літаратурнай мове. У летапіснай мове варыянтнасць развівалася пад уплывам як унутрымоўных фактараў (шматлікія варыянты ўзнікалі ў выніку перапісвання тэкстаў у розныя гістарычныя перыяды рознымі аўтарамі), так і экстралінгвістычных, сярод якіх узаемадзеянне старажытнай беларускай кніжнай мовы з агульнаўсходнеславянскай, царкоўнаславянскай і польскай мовамі, вынікі другога паўднёваславянскага ўплыву, функцыянаванне старажытнай беларускай пісьмовай мовы як дзяржаўнай ва ўмовах паліглосіі, якая назіралася ў грамадскіх, палітычных і культурных сферах ВКЛ, пашырэнне ў XVI–XVIII стст. уплыву польскай мовы і інш. Тым самым варыянтнасць у летапіснай традыцыі дае ўяўленне пра нарматворчыя працэсы ў кантэксце агульнай плыні развіцця старажытнай беларускай мовы на працягу ўсёй яе гісторыі.

Варыянты на ўзроўні моўнай нормы ў арфаграфіі, фанетыцы, граматыцы, лексіцы і фразеалогіі паказваюць на цесную ўзаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць розных па сваіх генетычных вытоках фанетыка-граматычных сродкаў старажытнай беларускай мовы і выступаюць у мове як аб'ектыўная з'ява. Менавіта ў варыянтнасці адлюстроўваецца «стан дынамічнага развіцця літаратурнай мовы, яе функцыянальна-стылёвае разгалінаванне» [1, с. 14]. Моўныя варыянты рэалізуюцца ў канкрэтных разнавіднасцях слова, што абумоўлена комплексам унутраных і знешніх прычын: кантэкстным акружэннем моўнай адзінкі, сферай яе выкарыстання, суіснаваннем у межах аднаго тэксту архаічных элементаў і новых, уплывам дыялектных і запазычаных формаў, а таксама ўздзеяннем розных аналогій. У гістарычным мовазнаўстве варыянтнасць разглядаецца

як вынік моўнай эвалюцыі, узаемадзеяння шматлікіх унутрысістэмных фактараў і вывучаецца ў межах парадыгматыкі на ўзроўні лінейных камунікатыўных сувязей: «Вар'іраванне выступае натуральным станам мовы як канкрэтна-гістарычнай з'явы, адной з унутраных праяў літаратурнай мовы» [2, с. 9].

З варыянтнасцю ў мове непарыўна звязана праблема нарматыўнасці: норма пры яе адноснай устойлівасці знаходзіцца ў пастаянным руху, а ў яе межах найбольш устойлівыя кампаненты ўзаемакантактуюць са сваімі варыянтамі [3; 4]. Такім чынам, паняцце літаратурнай нормы не выключае варыянтнасці як механізма функцыянавання самой моўнай сістэмы з той прычыны, што паралелізм моўных адзінак у ролі функцыянальных элементаў новага і старога прыводзіць да парадыгматычнай множнасці, якая і спараджае з'яву варыянтнасці [5]. У старажытнай мове варыянтнасць выступала як неабходны этап перакампаноўкі элементаў моўнай сістэмы, яе стылістычнага ўзбагачэння і прызнаецца фактарам пазітыўнага ўплыву на развіццё літаратурна ўнармаванай мовы. З улікам адноснай няўстойлівасці літаратурных нормаў дaграматычнага перыяду варыянтамі можна лічыць усе суадносныя паводле семантыкі, граматычнага значэння і функцыянальнага прызначэння элементы тэксту, якія фармальна не супадаюць у аднолькавых фрагментах розных спісаў аднаго помніка.

Супастаўленне асобных фрагментаў па ўсіх наяўных спісах летапісаў дазваляе выявіць варыянтныя моўныя з'явы і забяспечыць ім лінгвістычную кваліфікацыю з улікам рознаўзроўневай прыналежнасці, вызначыць лакалізацыю варыянтаў, суаднесці атрыманыя характарыстыкі з функцыянальна-стылістычнымі ўласцівасцямі тэкставых фрагментаў. Гэта дазваляе прасачыць развіццё асобных паказчыкаў літаратурна-пісьмовай мовы на працягу ўсяго старажытнага перыяду і даказаць устойлівасць літаратурных нарматыўных працэсаў, якія адбываліся. Да прыкладу, па наяўных розначытаннях розных спісаў «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх» можна назіраць моўныя змены сінхроннага і эвалюцыйнага характару. Як адлюстраванне варыянтных напісанняў у арыгінальнай частцы «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх» па Акадэмічным, Віленскім, Слуцкім і Супрасльскім спісах быў выяўлены даволі разнастайны спектр розначытанняў.

Адзначаючы варыянтнасць пісьмовага адлюстравання фанетычных асаблівасцей беларускай мовы ў арыгінальнай частцы «Летапісца», неабходна падкрэсліць, што ва ўстаўных частках гэтага летапіснага фрагмента фанетычныя розначытанні маюць больш разнастайны характар: мае месца зацвярдзенне шыпячых і *р*: *к Орши приходил/ przichodzil* (Сл., Супр., Акад., Еўр., Рум., Крас., Рач., Альш., Бых.) – *к Оршы приходил* (Арх.) – *к Оръшы прыходил* (Рач.) – *k Orszy chodył* (Бых.); тэндэнцыя на адлюстраванне спалучэння *ія* (*ыя*) у корані запазычаных слоў: *над хрестианы* (Віл.) – *над хрестяны* (Супр.) – *над християны* (Сл., Акад., Арх.) – *християном* (Рум.) – *над хрестьяны* (Крас.) – *над хрестияны* (Рач.) – *nat krescyani* (Альш.); спарадычнае праяўленне дзекання: *приходил* (Сл., Супр., Акад., Еўр., Рум., Крас., Бых.) – *przichodzil* (Альш.); паказ цекання: *над хрестияны* (Рач.) – *nat krescyani* (Альш.); паралельнае ўжыванне цвёрдых і мяккіх заднеязычных на канцы асновы адносных прыметнікаў і ўказальных займеннікаў: *смоленскыи* (Віл.) – *смоленскы* (Супр.) – *смоленьскии* (Сл., Акад.) – *смоленскии* (Арх., Еўр., Рум., Крас., Рач.) – *smolinski* (Альш.) – *smolenski* (Бых.), *такых мук* (Віл.) – *таких мук* (Арх., Еўр., Рум., Крас.) – *takych / takich męk* (Альш., Бых.); аглушэнне звонкіх зычных перад глухімі: *над хрестияны* (Рач.) – *nat krescyani* (Альш.); *под Витебьском* / *Витебьскомь* / *Витебском* / *Witebskom* (Віл., Сл., Акад., Арх., Супр., Рум., Крас., Бых.) – *под Витепском* / *Vitepskiem* (Еўр., Альш.).

Надзвычай стракаты спектр фанетыка-арфаграфічных варыянтаў назіраецца пры перадачы ў «Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх» уласных назоўнікаў: напісанне назвы *Орша* без прыстаўнога і з прыстаўным галосным: *ко Рши* (Віл.) – *к Орши* (Сл., Супр., Акад., Арх., Еўр., Рум., Крас., Рач., Альш., Бых.); чаргаванне пачатковых *о – а* як паказчык акання: *Антиох* (Віл., Акад., Арх., Еўр., Рум.) – *Онтиох* (Супр., Крас.) – *Онииxь* (Сл.) – *Анътиох* (Рач.) – *Antyoch* (Альш., Бых.); *я – е* як праяўленне гіпернармалізацыі пры спробах перадачы на пісьме якання: *Святослав / Святослав* / *Свяцьславль* / *Святослав / Swiatosław* (Віл., Супр., Сл., Еўр., Бых.) – *Светьслав / Светослав* / *Свѣтославль* / *Свѣтослав* / *Свѣтославль* / *Swętoslaw* (Акад., Арх., Рум., Крас., Рач., Альш.); паказ спалучэнняў галосных з *й* у сярэдзіне слова: *Улиан* / *Julian* (Віл., Бых.) – *Улъян / Ульянь* / *Улиян* (Супр., Сл., Крас., Рач., Акад., Арх., Еўр.), адлюстраванне *й* на пачатку слова: ***Улиан*** (Віл.) – ***Julian***

(Быx.). У летапісных глосах прысутнічае фанетычная варыянтнасць прыназоўнікаў *ко – к – ку*: ***ко*** *Рши приходил* (Віл.) – ***к*** *Орши приходил* (Супр.) – ***ku*** *Orssi przichodzil* (Альш.) і часціц *же/ж*: *яко* ***же*** (Віл., Супр., Акад., Акад.) – *яко* ***ж*** (Сл.).

Асобныя розначытанні ў летапісах маглі ўзнікаць у выніку аўтарскай матывацыі (*над**ѣ**яся – над**и**яся, прижєнеть – приж**и**неть, с**ѣ**дѣти – с**и**дѣти)* ці з'яўляюцца звычайнымі апіскамі перапісчыкаў (*оста**ви**ли – остали, на**и**деть – надеть, дадуть**ся** – дадутся, вою**чи** – вою**щи**, всклати – усла**кь**сти*). Таму яны не разглядаюцца ў якасці моўных варыянтаў. Шэраг розначытанняў праяўляе імкненне летапісцаў перадаць тыя фанетычныя працэсы, якія яны назіралі ў мове, але не мелі сталых навыкаў адлюстравання на пісьме: гэта гістарычныя чаргаванні зычных (*прие**ж**дивал – при**ѣзь**чиваль, прие**ж**дати / перее**ж**дати – прие**зь**дити, по**ш**леть – по**с**леть, стере**г**а – стере**ж**а*), з'явы асіміляцыі (*не **съш**едшимся – не**шош**едшимься*), падаўжэнне зычных (*кровипроли**ти**я / кровипроли**ть**я – кровопроли**т**я*). Такія, пераважна спарадычныя розначытанні, таксама не могуць разглядацца як праяўленне паралельнага варыянтнага выкарыстання ў летапіснай мове розных паводле паходжання формаў слоў. Частотныя ж з'явы летапіснай арфаграфіі выступаюць паказчыкамі нарматворчых працэсаў. Так, адвольнае ўжыванне па ўсім тэксце Супрасльскім летапісу *ь* на канцы слова (незалежна ад якасці папярэдняга зычнага) выклікала шматлікія розначытанні, у параўнанні з Нікіфараўскім спісам: *не руши**л** – не руши**ль**, не пошо**л** – не поше**ль**, пригна**л** – пригна**ль**, полюби**л**ся – полюби**ль**ся, учини**л** – учини**ль**, взя**л** – узя**ль**, забы**в** – забы**вь**, с**ѣл** – с**ѣль**, остерег**л** – остер**ѣ**г**ль**, не вчини**л** – не вчини**ль*** і інш. Такія розначытанні, наяўныя ў асобных тэкстах, ёсць усе падставы разглядаць як арфаграфічныя варыянты, выкліканыя другім паўднёваславянскім уплывам, паколькі перапісваліся яны пісцамі хутчэй за ўсё з украінскіх тэрыторый.

Як паказвае аналіз розначытанняў кампілятыўнай летапіснай часткі Нікіфараўскага і Супрасльскага летапісаў, адметныя асаблівасці тагачаснай беларускай літаратурнай мовы тут выступаюць ужо не як адзінкавыя з'явы, а набываюць заканамерны характар. Пашыраецца аканне ў такой ступені, што пра яго можна гаварыць як пра з'яву ўстойлівую: *С**о**л**о**монь* (Нік.) – *С**а**л**а**мон* (Супр.), *за польт**о**ры мили* (Нік.) – *за польт**а**ры мили* (Супр.), *и разб**о**л**ѣ**ся* (Нік.) – *и разб**а**лися* (Супр.), *п**о**волокы* (Нік.) – *п**а**волокы* (Супр.), *ис к**о**рабля* (*к**о**раблеи, к**о**рабли*) (Нік.) – *ис к**а**рабля* (*к**а**раблеи, к**а**рабли*) (Супр.), *б**о**гатырь* (Нік.) – *б**а**гатыр* (Супр.), *п**о**ганых* (Нік.) – *п**а**ганых* (Супр.), *к**о**руна* (Нік.) – *к**а**руна* (Супр.), *т**о**вар* (Нік.) – *т**а**вар* (Супр.), *р**а**збити* (Нік.) – *р**о**збити* (Супр.), *р**а**спусти* (Нік.) – *р**о**спусти* (Супр.); у тым ліку і праз напісанне *о* на месцы этымалагічнага *а*: ***А**враам* (Нік.) – ***О**врам* (Супр.), *Б**а**тый* (Нік.) – *Б**о**тыи* (Супр.), *в**а**рягы* (Нік.) – *в**о**ряги* (Супр.), *иерус**а**лимьскаго* (Нік.) – *ерус**о**лимского* (Супр.), *б**о**ранов* (Нік.) – *б**а**ранов* (Супр.), *м**о**завшаны* (Нік.) – *м**а**зовшаны* (Супр.), *50 п**а**лат* (Нік.) – *50 п**о**лат* (Супр.), *в п**о**лат**ѣ*** (Нік.) – *в п**о**лате* (Супр.). Паказчыкам якання ў абодвух спісах выступае напісанне пасля мяккіх зычных *е* на месцы этымалагічнага *я*: *пом**я**ну* (Нік.) – *пом**е**ну* (Супр.), *р**я**заньскаго* (Нік.) – *р**е**занского* (Супр.), *сент**е**бря* (Нік.) – *сент**я**бря* (Супр.), *Кост**я**нтин, с Кост**я**нтином* (Нік.) – *Кост**е**нтин, с Кост**е**нтиномъ* (Супр.) і інш. У арфаграфіі абодвух спісаў мае месца пераход *е* у *о*: поруч з традыцыйнымі напісаннямі тыпу *ч**е**тыры* сустракаецца *ч**о**тыри*, за вѣру *постр**а**да* (Нік.) – о вѣру *постр**е**да* (Супр.), *боч**о**к* меду (Нік., Супр.) і інш.

У параўнанні з Нікіфараўскім, устойлівай фанетычнай рысай Супрасльскага спіса выступае поўнагалоссе: *цариг**ра**дскаго* (Нік.) – *цариг**оро**дского* (Супр.), *оз**ло**ти* (Нік.) – *поз**оло**ти* (Супр.), ***Зла**ты **вра**та* (Нік.) – ***Золо**ты **вра**та* (Супр.) – ***Зла**тые **воро**та* (Супр.), ***Зла**тых **вра**т* (Нік.) – ***Зла**тых **воро**ть* (Супр.), *на **Зла**тых **вра**тѣх* (Нік.) – *на **Золо**тых **воро**тех* (Супр.), *в **сре**ду* (Нік.) – *в **сере**ду* (Супр.), ***гра**да* (Нік.) – ***горо**да* (Супр.), *д**ре**вляны* (Нік.) – *д**ере**вляны* (Супр.), *В**ла**димир* (Нік.) – *В**оло**димер* (Супр.).

Да паказчыкаў фанетызацыі правапісу ў Супрасльскім летапісе можна аднесці напісанне ў сярэдзіне слова спалучэння *ия* ці літары *я* на месцы спалучэнняў галосных *иа*: *у патри**а**рха* (Нік.) – *у патри**я**рха* (Супр.), *бог христи**а**неск* (Нік.) – *бог хрест**я**ньскы* (Супр.), *христи**а**ном* (Нік.) – *хрест**я**ном* (Супр.), *д**иа**волу* (Нік.) – *д**ия**волу* (Супр.), а таксама ўжыванне *ия* ці *я* на месцы пачатковага *иа* ва ўласных назоўніках: ***Иа**ков* (Нік.) – ***Ия**ков* (Супр.), ***Иа**кова* (Нік.) – ***Я**кова* (Супр.); у асобных выпадках спалучэнне *ия* сустракаецца і ў Нікіфараўскім спісе: *христ**ия**нь-*

*скыя* (Нік.) – *хресьт**я**нскыя* (Супр.), *кровопрол**ия**тели* (Нік.) – *кровопрол**и**тели* (Супр.), ***Я**кима* (Нік., Супр.). Розначытанні *иа – ия* маюць месца і ў канчатках: *в лод**иа**х* (Нік.) – *в лод**я**хъ* (Супр.), *Соф**иа*** (Нік.) – *Соф**ия*** (Супр.), *у Фот**иа*** (Нік.) – *у Фот**ия*** (Супр.), *Дмитр**иа*** (Нік.) – *Дм**ѣ**тр**ия*** (Супр.). Такая тэндэнцыя паказвае на адыход ад напісанняў, калі паводле марфалагічна-этымалагічнага прынцыпу інтэрвакальны галосны *й* прапускаўся ў спалучэннях галосных.

Фанетычнае падаўжэнне ў розначытаннях Нікіфараўскага і Супрасльскага спісаў, як і ў іншых беларускіх помніках, паказвалася ўскосна – замест напісання дзвюх літар на месцы падоўжаных выкарыстоўвалася адна: *У**ль**яну* (Нік.) – *У**л**яну* (Супр.), *по Крещен**ии*** (Нік.) – *по крещен**и*** (Супр.), *Въздвижен**ие*** (Нік.) – *Воздвижен**е*** (Супр.), *безъчислен**ы*** (Нік.) – *бесчислен**о*** (Супр.), *кровипроли**ти**я* (Нік.) – *кровопроли**т**я* (*Супр.*).

Розначытанні абодвух летапісаў даюць шматлікія паказчыкі пераходу *в – у* (*ў*): ***в** море* (Нік.) – ***у** море* (Супр.), *въбегоша **в** град* (Нік.) – *убегоша **у** город* (Супр.), ***в** Литву* (Нік.) – ***у** Литву* (Супр.), ***вз**ял* (Нік.) – ***уз**ял* (Супр.), ***в** поли* (Нік.) – ***у** поли* (Супр.), ***вз**яша* (Нік.) – ***уз**яша* (Супр.), ***в** малѣ дружинѣ* (Нік.) – ***у** мале дружине* (Супр.), *течеть **в** море* (Нік.) – *течеть **у** море* (Супр.), ***у** манастыри* (***во** манастыри*) (Супр.), ***у** святого Спаса* (Супр.). У Нікіфараўскім спісе паслядоўна вытрымліваецца традыцыйнае напісанне *в* у закрытых складах (акрамя напісання *Е**у**фимеи*). У Супрасльскім жа летапісе *в* у шмат якіх пазіцыях з'яўляецца праяўленнем гіпернармалізацыі: ***у** него, **у** них* (Нік.) – ***в** него, **в** них* (Супр.), *рыдание не**у**толимо* (Нік.) – *рыдание не**в**толимо* (Супр.), *по**у**чившися* (Нік.) – *по**в**чившися* (Супр.), *с **у**нучаты* (Нік.) – *со **в**нучаты* (Супр.), *а кто **у** него служил* (Нік.) – *а кто **в** него служил* (Супр.) і інш. Перадача пераходу *л* у *ў* назіраецца толькі ў асобных дзеяслоўных формах праз напісанне літары *в*: *жив лѣт 76* (Нік.) – *жи**ль** лѣт 76* (Супр.).

У розначытаннях па ўсім тэксце Нікіфараўскага і Супрасльскага спісаў паслядоўна адсочваецца зацвярдзенне шыпячых: *бы**шя**, я**шя**, поима**шя**, пожго**шя**, поби**шя**, пов**ѣ**до**шя**, р**ѣ**шя, взя**шя**, нач**я**ша, поч**я**лъся, избра**шя**ся, убоя**шя**ся, высла**шя**, вынесо**шя**, реко**шя**, сконча**шя**ся, сконч**я**ся* (Нік.) – *бы**ша**, я**ша**, поима**ша**, пожго**ша**, поби**ша**, поведо**ша**, ре**ша**, взя**ша**, нач**а**ша, поч**а**лься, избра**ша**ся, убоя**ша**, высла**ша**, вынесо**ша**, реко**ша**, искончашася, сконч**а**ша* (Супр.), *овощья* (Нік.) – *овъ**ща*** (Супр.), *ду**шя*** (Нік.) – *ду**ша*** (Супр.), *до Игнач**я** креста* (Нік.) – *до Игнач**а** креста* (Супр.), *ч**я**с* (Нік.) – *ч**а**с* (Супр.), *мч**я**ща* (Нік.) – *мч**а**ща* (Супр.) і інш. Шмат прыкладаў зацвярдзення *р*, што ў Супрасльскім летапісе мела некалькі варыянтаў адлюстравання: запіс слова без рэдукаванага *ь*: *Уго**рь**скую* (Нік.) – *Уго**р**скую* (Супр.), *Иго**рь*** (Нік.) – *Иго**р*** (Супр.), *богаты**рь*** (Нік.) – *богаты**р*** (Супр.); напісанне рэдукаванага *ъ* замест *ь*: *тфе**рь**ского* (Нік.) – *тфе**ръ**ского* (Супр.), *угорьскому* (Нік.) – *угоръскому* (Супр.); замена ётаваных галосных нёётаванымі: *у ца**ря*** (Нік.) – *у ца**ра*** (Супр.), *Иго**ря*** (Нік.) – *Иго**ра*** (Супр.), *створ**ю*** (Нік.) – *створ**у*** (Супр.); чаргаванне *и*/*ы*: *скр**и**пания* (Нік.) – *скыр**ы**пания* (Супр.); змешванне літар *ы*/*и* пасля цвёрдага *р*: *в Болгар**ы*** (Нік.) – *в Болгар**и*** (Супр.), *а*/*я*: *р**а**стляя* (Нік.) – *р**я**стляя* (Супр.), *мер**я*** (Нік.) – *мер**а*** (Супр.); *а*/*е*: *постр**а**да* (Нік.) – *постр**е**да* (Супр.); *ѣ*/*ы*: *стр**ѣ**лы* (Нік.) – *стр**ы**лы* (Супр.).

Спрашчэнне груп зычных мела адлюстраванне ў наступных словах: *че**стн**ыа кресты* (Нік.) – *че**сн**ы кресть* (Супр.), *радо**стн**ыма очима* (Нік.) – *радо**сн**ыма очима* (Супр.), *мно**жд**ество* (Нік.) – *мно**жь**ство – мно**ж**ество* (Супр.), *в оде**жд**ах* (Нік.) – *в оде**ж**ах* (Супр.), *к Поло**ть**ску* (Нік.) – *ко Поло**ць**ку* (Супр.). Аглушэнне і азванчэнне зычных выступае ў выглядзе розначытанняў пераважна ў прыстаўках (*безъчислены – бе**с**числено, **з**борную – **с**борную, **з**дѣлати – **с**делати*) і прыназоўніках (*бе**с** числа, **с** Киева, **ис** Киева, **ис** карабля, чре**с**/чере**с***). У абодвух спісах – Нікіфараўскім і Супрасльскім – аднолькава перадавалася спрашчэнне групы зычных у слове *Рожство*/*Ро**ж**ество*: *от Ро**ж**ества* (Нік.) – *от ро**ж**есьтва* (Супр.), *Ро**ж**ество* (Супр.); а таксама чаргаванне заднеязычных са свісцячымі зычнымі ў месным склоне: *на рецѣ* (Нік.), *на Волзѣ* (Супр.), *об едином в**ѣ**рсѣ* (Супр.). У адрозненне ад Нікіфараўскага спіса, правапіс Супрасльскага ўбірае ў сябе паказ зацвярдзення губных і губна-зубных зычных на канцы слова: *церков, кров, скорб* і інш. Наогул жа, відавочна, што аўтар Супрасльскага летапісу нашмат часцей адступаўся ад традыцыйнага пісьма на карысць з'яў тагачаснай жывой беларускай мовы і тым самым забяспечваў мэтанакіраваную рэдактарскую праўку тэксту.

З прычыны некадыфікаванасці арфаграфічнай нормы неаднастайна перадаваліся на пісьме ўласныя назвы: *Пин**е**ск, Пинск, Pi**n**sk*; *Витеб**е**ск, Витеб**ъ**скь, Wite**b**sk*; *Нар**а**монт, Нар**и**монт, На-*

*рымунт, Narymont*; *Володимер, Wołodymir*; *Волынскую, Волыньскую, Wołynskyiu* і інш. Гэта пераважна спарадычныя розначытанні, і яны не могуць разглядацца як праяўленне паралельнага варыянтнага выкарыстання ў летапіснай мове розных паводле паходжання формаў слова.

Такім чынам, правядзенне параўнальнага аналізу розначытанняў «Летапісца вялікіх князёў літоўскіх» па летапісах I, II і III зводаў і спісах Нікіфараўскім і Супрасльскім і зводу паказала даволі разнастайную фанетыка-арфаграфічную варыянтнасць, звязаную з адлюстраваннем галосных і зычных гукаў беларускай мовы на пісьме. Нягледзячы на ўстойлівае захаванне ў старажытным беларускім пісьменстве марфолага-этымалагічных напісанняў, на ўзроўні арфаграфіі ў пералічаных спісах назіраецца варыянтнае адлюстраванне асноўных фанетычных з'яў беларускай мовы: акання (*Карачев – Корачев – Karaczew, не стаяти – не стоять*), у тым ліку і праз гіпернармалізацыю (*розбити – разбити*), узаемазамена *л – в*, *у – в* (*не рушив – не рушил, почул – почув, уставил – вставил*), зацвярдзення шыпячых, *р* і *ц* (*Корачев – Корачов, будучи – будучы – buduczy*; *принял – прынял – przyniał*; *на Троцэх – Trocech, не пошол / не шоль – не пошель, почул – почюл*), захаванне рэдукаванага ъ і яго замена адпаведнымі галоснымі поўнага ўтварэння (*въгнал – вогна, събра – собра, събралася – собралася, дръжати – держати*). У розных летапісных спісах назіраюцца неаднолькавыя падыходы да паказу такіх важных фанетычных асаблівасцей беларускай мовы, як фрыкатыўнага *г* (***Кгедимин – Кедмин – Гедимин – Gidymin***; *Олкгирд – Олгирд – Олигоръд – Olgierd*; *старшого – starszoho*), наяўнасці *й* у спалучэннях *ыя (ія)* (*Кориат – Корият – Рьять – Koryat*), цекання (*к докцѣ – к дотьце*; *на Троцех*), цвёрдасці губных на канцы слова (*сем*), прыпадабнення шыпячых да свісцячых (*к докцѣ – к дотьце – ко дочце – к дочцѣ*; *Луцеськь – Луческ – Łyczesk)*, асіміляцыі па мяккасці (*в Вилни – во Вильни – па Wilni*), спрашчэння груп зычных (*на князствах – па kniastwach*; *семыи – седмыи*) і інш.

Такім чынам, у беларускім правапісе, які заставаўся традыцыйным, заснаваным на этымалагічна-марфалагічным прынцыпе аж да канца XV – пачатку XVI ст., пад уздзеяннем жывой народна-дыялектнай мовы назіраўся пастаянны колькасны рост фанетычных напісанняў, якія адлюстраваліся ў летапісах у выглядзе варыянтных моўных з'яў. І хоць мера праяўлення ў розных летапісных фрагментах спісаў I–III зводаў працэсаў варыянтнага адлюстравання моўных з'яў неаднолькавая, факты фанетыка-арфаграфічных розначытанняў паказваюць, што як у «Летапісцы вялікіх князёў літоўскіх», так і ў запазычанай з агульнаўсходнеславянскіх летапісаў так званай «агульнарускай» частцы спісаў I беларускага зводу ў актыўнае ўзаемадзеянне з традыцыйнымі напісаннямі ўступалі з'явы жывой беларускай мовы, што і стварала пашыраную варыянтнасць. Адзначаныя ў тэксце летапісаў моўныя рысы пераконваюць, што склад менавіта летапіснай мовы выступаў у старажытны перыяд выразнікам асноўных пісьмова-літаратурных нарматворчых працэсаў.

### Умоўныя скарачэнні


Акад. – Акадэмічны летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 103–114.

Арх. – Летапіс Археалагічнага таварыства // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 91–102.

Віл. – Віленскі летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35 : Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 103–114.

Еўр. – Еўраінаўскі летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 214–238.

Крас. – Летапіс Красінскага // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 128–144.

Нік. – Нікіфараўскі летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 19–35.

Рач. – Летапіс Рачынскага // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35 : Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 145–173.

Рум. – Румянцаўскі летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 193–213.

Сл. – Слуцкі летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 68–84.

Супр. – Супрасльскі летапіс // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1980. – Т. 35: Летописи белорусско-литовские / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 36–67.

ХБ – Хроніка Быхаўца // Полное собрание русских летописей / Акад. наук СССР, Ин-т истории СССР; [отв. ред. Б. А. Рыбаков]. – М., 1975. – Т. 32 : Хроники: Литовская и Жмойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного / сост., авт. предисл. и ред. Н. Н. Улащик. – С. 128–173.

## Літаратура

1. Мова «Нашай Нівы», 1906–1915: варыянтнасць, сінанімія / В. П. Лемцюгова [і інш.]; пад рэд. В. П. Лемцюговай; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства. – Мінск: Беларус. навука, 2005. – 303 с.

2. Г о р б а ч е в и ч, К. С. Вариантность слова и языковая норма: на материале современного русского языка / К. С. Горбачевич. – Л.: Наука, 1978. – 238 с.

3. А л и е в а, Т. К. Вариантность слова и литературная норма (на материале современного карачаево-балкарского языка): автореф. дис.... д-ра филол. наук: 10.02.02 / Т. К. Алиева; Кабардино-Балкарский гос. ун-т. – Нальчик, 2006. – 41 с.

4. Л е п е ш к и н, В. В. Вариантность флексий имен существительных в белорусском литературном языке: автореф. дис.... канд. филол. наук: 10.02.02 / В. В. Лепешкин. – Минск, 1977. – 20 с.

5. Р е м н е в а, М. Л. Литературный язык Древней Руси / М. Л. Ремнева. – М.: Изд-во МГУ, 1988. – 143 с.

*V. K. MAROZ*

**DIFFERENT INTERPRETATIONS OF ANNALS AS ILLUSTRATION OF THE VARIANT FORM USE IN NORM-BUILDING PROCESSES OF THE ANCIENT BELARUSIAN LANGUAGE**

## Summary

Linguistic aspects of Belarusian chronicles have been examined in the article. Subject of research is norms of Belarusian chronicles' language. Facts of linguistic alternative versions in similar parts of Belarussian annales have been viewed. Comparative analysis of quantitative and qualitative peculiarities of variants of the literary norms has been carried out. Conclusion has been made about the accumulation in chronicles all the norms of ancient Belarusian literary language.

*УДК 81'373*

*Т. В. ФЕДУНОВА*

# СУПАСТАЎЛЯЛЬНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ ЛЕКСІЧНАЙ СІСТЭМЫ МОЎ: ВОПЫТ СЕМАСІЯЛАГІЧНАГА АНАЛІЗУ

*Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 08.06.2010)*

**1. Характар супастаўляльных семасіялагічных даследаванняў лексікі.** Апошнія гады развіцця семасіялагічных даследаванняў характарызуюцца павышанай увагай менавіта да сістэмнага аналізу лексікі. Галоўная ўвага вучоных-лінгвістаў, якія займаюцца кантрастыўным аналізам дзвюх ці болей моўных сістэм, даволі працяглы час была ў асноўным спраецыравана на супастаўленне моўных фактаў у межах фанетыка-марфалагічнага аспекту. Гэта, безумоўна, садзейнічае выяўленню спецыфічных рысаў кожнай з моў у анамасіялагічным плане. Эксплікацыя семасіялагічных параметраў дазваляе выявіць істотныя адметныя прыкметы ў плане зместу блізкароднасных моў, што ўяўляе сабой даволі цікавы і адначасова складаны аспект даследавання.

У навуковай літаратуры даволі падрабязна вывучаны фармальна-структурны аспект лексічных адзінак пры супастаўляльным вывучэнні як мінімум дзвюх моўных сістэм – рускай і беларускай, рускай і ўкраінскай, рускай і польскай моў (Л. П. Кунцэвіч [1], І. С. Роўда [2], А. А. Свірыдзенка [3] і інш.). Аднак адзначым, што даследаванні праводзяцца на прыкладзе асобных лексічных з'яў (паралексіі, гетэралексіі, міжмоўнай аманіміі і параніміі): апісаны іх структурныя і функцыянальныя ўласцівасці, прадстаўлена іх тыпалогія па прыкметах фармальнай варыятыўнасці. Толькі ў некаторых навуковых працах паралельна з фармальным разглядам лексічных адзінак закранаюцца праблемы, якія датычацца даследавання іх плана зместу і семантычнай структуры (Р. А. Будагаў [4; 5], У. Г. Гак [6; 7], К. Ч. Кусаль [8], У. М. Манакін [9] і інш.).

Бясспрэчна, аперыраваць фармальным аспектам мовы значна лягчэй, чым семантычным, які прадугледжвае лексіка-семантычнае параўнанне на фоне ўсеагульнага семантычнага кантынуума. Часта гэта выступае прычынай таго, што іншы раз семантыка-змястоўны аспект не прымаецца пад увагу і вызначаецца як нешта другараднае, ценявое ў адносінах да фармальнага разгляду структурных адрозненняў лексічных адзінак супастаўляемых моў. Дадзенае палажэнне пацвярджаецца распаўсюджанай думкай, што «блізкароднасныя мовы ў анамасіялагічным плане выяўляюць больш адрозненняў, чым у семасіялагічным...» [9, с. 236].

Семантычныя даследаванні мовы і зусім могуць выводзіцца за межы лінгвістыкі як навукі. Часам яны атаясамліваюцца з галіной суб'ектыўных уяўленняў, якія апрыёры несумяшчальныя са строгімі навуковымі метадамі. Да таго ж дададзім і факт аддаленасці ад дасканаласці саміх сучасных слоўнікавых артыкулаў, на базе якіх праводзяцца семасіялагічныя даследаванні. Да ліку недахопаў у лексікаграфічным апісанні трэба аднесці непаўнату ахопу ўсіх дыферэнцыяльных прыкмет значэння той ці іншай лексемы ці прыпісванне значэнню адсутнічаючых у рэчаіснасці дыферэнцыяльных прыкмет; блытаніну ў суаднесенасці значэння слова і значэння кантэксту; кругі і таўталогіі ў тлумачэннях, якія не могуць быць апраўданы задачамі апісання. Часта ў межах адной і той жа моўнай сістэмы па-рознаму тлумачыцца тое ці іншае значэнне слова, па-рознаму ажыццяўляюцца групоўка лексіка-семантычных варыянтаў, тлумачэнне сэнсавых адценняў і разнастайных семантычных пераходаў.

Па справядлівай заўвазе Р. Ладо, «існуе ілюзія, якая часам уласціва і адукаваным людзям, быццам значэнні з'яўляюцца аднолькавымі ва ўсіх мовах і мовы адрозіваюцца толькі формай перада-

чы гэтых значэнняў. Па сутнасці ж, значэнні, у якіх класіфікуецца наш вопыт, культурна дэтэрмінаваны ці мадыфікаваны, так што яны значна вар'іруюцца ад культуры да культуры» [10, с. 34–35].

Кантрастыўны аналіз, які праводзіцца ў межах супастаўляльных даследаванняў, дазваляе выявіць падабенства і адрозненне ў семантычнай структуры лексічных адзінак супастаўляемых моў. Правядзенне супастаўляльных даследаванняў рэальна знаходзіць сваё ажыццяўленне як у сферы няроднасных, так і ў сферы роднасных і блізкароднасных моў. Аднак у сувязі з гэтым неабходна адзначыць, што праблема кантрастыўнага даследавання лексічных сістэм у межах блізкароднасных моў мае сваю спецыфіку і складанасць у параўнанні з правядзеннем такога роду даследаванняў у сферы моўных сістэм, якія не маюць паміж сабой роднасных сувязей. Відавочна, што складанасць аперыравання лексічнай базай блізкароднасных моў звязана з празмернай блізкасцю гэтых моўных сістэм, з асаблівасцямі іх гістарычнага шляху развіцця. Тым не менш, як вядома, «знайсці і ацаніць важнасць адрозненняў значна складаней там, дзе іх менш ці амаль няма. Але менавіта гэтыя «амаль» ці «крыху» і з'яўляюцца тым, што адрознівае адну мову ад другой на ўсіх узроўнях. Ведаць гэтыя адрозненні – значыць ведаць гэтыя мовы» [9, с. 9]. Сапраўды, вызначыць адметныя прыкметы дзвюх і болей блізкароднасных моў на фоне іх падабенства і эквівалентнасці – значыць выявіць усё тое характэрнае, што іх складае.

Супастаўляльнае даследаванне дае магчымасць даследчыку паслядоўна праводзіць аналіз адной мовы ў люстэрку другой. Гэта дазваляе маніфеставаць характэрнае, адметнае і ўнікальнае, што складае ядро кожнай з супастаўляемых моў. «Такога кшталту аналіз, выяўляючы адметныя асаблівасці ў словах супастаўляемых моў, даючы магчымасць убачыць нябачнае, у той жа час дазваляе па-новаму ацаніць лексіка-семантычныя асаблівасці кожнай з моў, паўней пазнаць родную мову і мову, з якой яна ўзаемадзейнічае» [9, с. 300–301].

Факт роднасці дзвюх моўных сістэм зусім не сведчыць аб тым, што словы гэтых дзвюх моў знаходзяцца ў адносінах поўнай эквівалентнасці, за выключэннем тэрміналагічнай лексікі. Паназіраннях А. Я. Супруна, у рускай і беларускай мовах да паловы слоў нетэрміналагічнага характару «маюць розны аб'ём ці розныя адценні значэння незалежна ад таго, супадаюць ці не супадаюць гэтыя словы па форме» [11, с. 30].

Па справядлівай заўвазе Р. А. Будагава, «...сфарміраваўшыся з адной крыніцы, словы роднасных моў у далейшым пачынаюць функцыянаваць у кожнай з іх настолькі своеасабліва, што не дазваляюць гаварыць пра семантычнае і стылістычнае адзінства лексем, з генетычнага пункту погляду, здавалася б, цалкам аднародных» [5, с. 110].

Сваю методыку ўстанаўлення семантычнай блізкасці слоў некалькіх супастаўляемых моўных сістэм прапаноўвае У. М. Манакін. Ён адзначае, што большая ці меншая ступень блізкасці лексем абумоўлена ступенню супадзення семантычных прыкмет у структурах іх лексічных значэнняў. Даследчык грунтуецца на матэматычных метадах вызначэння ступені эквівалентнасці лексічных адзінак моў, прадставіўшы гэта ў наступным формульным выглядзе:

$$E = \frac{2c}{A' + B'},$$

дзе $c$ – колькасць агульных для слоў $A$ і $B$ семантычных прыкмет; $A'$ і $B'$ – адпаведна колькасць сем у структуры лексічных значэнняў $A$ і $B$; $E$ – каэфіцыент эквівалентнасці.

Тым не менш пры ўсёй сваёй стройнасці і доказнасці матэматычны метад не можа выступаць у якасці прыярытэтнага метаду пры вызначэнні ступені эквівалентнасці слоў з прычыны рознааб'ёмнасці слоўнікавых дэфініцый і складанасці прыроды семантыкі слова. У дадзеным выпадку даследчык сутыкаецца з сітуацыяй, калі «алгебру слоўнікавай дэфініцыі неабходна праверыць гармоніяй чалавечай моўнай памяці і жывой практыкай» [9, с. 126].

Выніковая велічыня $E$, якая выражаецца каэфіцыентам эквівалентнасці, з'яўляецца паказчыкам той ці іншай ступені семантычнай блізкасці пары слоў супастаўляемых моў. Акрамя таго, У. М. Манакін рэпрэзентуе распрацаваную ім шкалу семантычнай блізкасці лексем у выглядзе адрэзка (0;1), у межах якога семантычна больш блізкія лексічныя адзінкі імкнуцца да 1 ці роўныя 1, што сведчыць пра дастатковае падабенства ці абсалютную эквівалентнасць лексем адпа-

ведна. Больш аддаленыя ў семантычным плане адзінкі імкнуцца да 0. Каэфіцыент, роўны 0, сведчыць пра поўную адсутнасць эквівалентных адносін паміж парай супастаўляемых слоў.

Такім чынам, звяртанне да семантыка-змястоўнага аспекту лексічных адзінак дзвюх моў, блізкароднасных ці аддаленых адна ад адной, дазваляе вызначыць ступень эквівалентнасці, якая вызначаецца «падобнай прадметнай суаднесенасцю; своеасаблівасць і спецыфічны шлях развіцця асобна ўзятай мовы, якая мае свае лексічныя і граматычныя сістэмы, фарміруе ступень гэтай эквівалентнасці» [12, с. 155]. Акрамя гэтага, дапамагае вызначыць і ступень арыгінальнасці і самадастатковасці кожнай асобна ўзятай лексічнай сістэмы. Па словах В. Д. Уітні, «кожная мова мае ўласцівую толькі ёй сістэму ўстойлівых адрозненняў, свае спосабы фарміравання думкі, у адпаведнасці з якімі пераўтвараецца змест і вынікі разумовай дзейнасці чалавека ... увесь запас яго ўражанняў, у тым ліку індывідуальна набытых, яго вопыт і веданне свету» [13, с. 21–22].

У гэтай сувязі неабходна прыняць да ўвагі меркаванне А. А. Уфімцавай, якая адзначае, што «значэнні слоў як феномены ўзнікаюць, замацоўваюцца і функцыянуюць толькі ў канкрэтнай моўнай сістэме, у канкрэтных мікрасістэмах і радах слоў, будучы аформленымі адпаведна гукавым і граматычным ладам дадзенай мовы» [14, с. 15].

Цалкам відавочна, што «... разыходжанне ў рэпертуары лексічных адзінак, у своеасаблівасці сродкаў і тыпаў найменняў, у спецыфіцы «семантычнага карціравання» прадметнага свету гэтымі намінатыўнымі адзінкамі на паняційныя сферы і семантычныя катэгорыі складае адметныя прыкметы кожнай мовы» [14, с. 6].

Супастаўляльныя даследаванні ў сферы лексічных сістэм дзвюх ці болей моў даюць магчымасць ахарактарызаваць змястоўны бок супастаўляемых моў, выявіць семантычны дыяпазон лексічных адзінак той ці іншай моўнай сістэмы, вызначыць функцыянальную сілу лексем. І, як вынік гэтага, дапамагаюць выявіць семантычныя разыходжанні, якія рэпрэзентуюць адрозненні ў моўных карцінах свету розных народаў.

Як правіла, супастаўляльныя даследаванні выводзяць даследчыка-кампаратывіста ў сферу пытанняў, якія закранаюць праблемы прыватнага бачання свету пэўным моўным калектывам і, як вынік, члянення агульнага семантычнага кантынуума, які залежыць ад уяўленняў дадзенага калектыву. Справа ў тым, што мова любой супольнасці людзей выражае адзін і той жа семантычны кантынуум, аднак структурыруецца гэты кантынуум спецыфічным спосабам для асобна ўзятай моўнай сістэмы. Па словах даследчыка С. Г. Беражан, «кожная мова валодае сваёй уласнай семантычнай структурай, якая адпавядае больш ці менш прыватнаму бачанню свету людзьмі, якія размаўляюць на дадзенай мове» [15, с. 32].

Правядзенне супастаўляльных даследаванняў у лексічнай сферы дзвюх ці больш моў (як роднасных, так і няроднасных) мае тэарэтычную і практычную накіраванасць. Канфрантацыя моў дазваляе выявіць агульныя і спецыфічныя прыкметы ў лексіка-семантычнай структуры моў, што адыгрывае значную ролю ў міжмоўнай культурнай камунікацыі, а таксама пры выпрацоўцы аптымальных метадаў пры вывучэнні другой мовы.

**2. Паняцце семантычнага аб'ёму і зместу лексічнага значэння.** Вызначэнне семантычнага аб'ёму значэння лексічных адзінак у дзвюх ці болей мовах прадугледжвае зварот увагі даследчыка да семасіялагічнага аспекту лексікалогіі, у рамках якога асноўныя кампаненты змястоўнай структуры лексемы падказваюць спектр семасіялагічных параметраў супастаўлення і іх іерархічнае размеркаванне: аб'ём і змест прадметна-лагічнага, стылістычнага, канататыўнага і іншых кампанентаў лексічнага значэння. Акрамя таго, неабходна ўлічваць і функцыянальна-стылістычную прыналежнасць лексем (сфера і частотнасць ужывання, архаічнасць). У якасці асобнага і важнага семасіялагічнага параметра супастаўлення трэба адзначыць семантычную стратыфікацыю слоў, якая прадугледжвае «замацаванасць іх лексіка-семантычнага зместу за асобным лексіка-семантычным варыянтам (семемай) ці адценнем значэння, аднясенне да прамога ці пераноснага тыпу значэння» [9, с. 153].

Аналіз лексем у семасіялагічным плане прадугледжвае «выяўленнне адметных прыкмет на ўзроўні асноўных кампанентаў змястоўнай структуры слова, а таксама асаблівасцей рэалізацыі лексічных значэнняў, якія выходзяць за рамкі ўстойлівых сістэмных адносін, акрэсліваючы контуры так званага сэнсу слоў» [9, с. 156]. У якасці асноўных кампанентаў структуры лексічнага значэння выступаюць наступныя: прадметна-лагічны, які ўключае ў сябе лінгвістычную мадэль

паняцця аб прадмеце, што абазначаны словам; граматычны; стылістычны; канататыўна-прагматычны; сінтагматычны кампанент, які рэгулюе спалучальныя магчымасці лексемы.

Для выяўлення характару семантычных сувязей і ўзаемаадносін лексічных адзінак у межах дзвюх супастаўляемых моў, устанаўлення тыпаў семантычных карэляцый і прычын разыходжання ў семантычным аб'ёме неабходна вызначыць, што разумеецца пад самім паняццем семантычнага аб'ёму. Па словах У. М. Манакіна, які дэталёва разглядаў лексіку як сістэмнае ўтварэнне, «семантычны аб'ём значэння вызначаецца колькасцю сем, якія адлюстроўваюць клас пэўных прадметаў і з'яў, якія абагульнены ў значэнні...» [9, с. 159–160].

У гэтай сувязі неабходна праводзіць дыферэнцыяцыю такіх суадносных паняццяў, як семантычны аб'ём значэння і змест лексічнага значэння, якія з'яўляюцца паказчыкамі лексіка-семантычных адрозненняў і рэпрэзентуюцца як якасна-колькасны аспект у вывучэнні складу і зместу семантычных прыкмет. У адрозненне ад паняцця семантычнага аб'ёму змест лексічнага значэння характарызуецца як «сукупнасць істотных семантычных прыкмет прадметаў і з'яў, названых словам» [9, с. 160].

Паміж прадстаўленымі вышэй паняццямі існуюць адносіны адваротна прапарцыянальнай залежнасці: чым вужэй аб'ём, тым больш шырокім і абагульненым з'яўляецца змест лексічнага значэння, і наадварот [9, с. 161].

Пазбегнуць непаслядоўнасці ў кваліфікацыі паняцця семантычнага аб'ёму дапамагае ўзроўневая канкрэтызацыя, якая дазваляе разгледзець паняцце семантычнага аб'ёму на ўзроўні значэння і лексемы ў цэлым. Так, на ўзроўні значэння семантычны аб'ём характарызуецца пэўнай колькасцю сем, рэлевантных для рэпрэзентацыі класа прадметаў і з'яў.

На ўзроўні лексемы ў цэлым паняцце семантычнага аб'ёму кваліфікуецца як колькасць значэнняў (лексіка-семантычных варыянтаў) полісемічнай лексемы.

Асобай увагі патрабуе вырашэнне пытання аб уключэнні ў семантычны аб'ём адцення значэння. Вынікі кантрастыўнага аналізу лексічных значэнняў, у прыватнасці міжмоўных руска-беларускіх лексічных адпаведнасцей, паказваюць, што там, дзе ў адной з моў пэўнае значэнне падаецца як самастойны лексіка-семантычны варыянт, у другой ён пазіцыянуецца толькі як адценне значэння. Тым не менш у дадзеным выпадку мы лічым неабходным адзначыць факт семантычнай рознааб'ёмнасці дзвюх супастаўляемых разнамоўных лексем, таму што адценне значэння з'яўляецца «паказчыкам больш тонкага, «спектральнага» аналізу лексічнага зместу слова, які адлюстроўвае семантычную дынаміку і дыферэнцыруе розныя ўзроўні змястоўнага боку славеснага знака» [9, с. 172].

Сапраўды, «адценні значэння семем маніфестуюць сабой дыялектычныя ўзаемапераходы ў складанейшай сетцы лексіка-семантычнай сістэмы, надаючы ёй дынамізм, непранікальнасць і адкрытасць. Адценні значэнняў, як і ўсякую прамежкавую з'яву ў любой сістэме, надзвычай цяжка кваліфікаваць і апісаць. Яны часам няўлоўныя, паколькі заснаваны на псіхасемантычных асацыяцыях прадметаў і паняццяў, дэманструючы сабой вечнае супрацьстаянне мовы і маўлення, свядомага і несвядомага, сістэмнага і стыхійнага ў чалавечай свядомасці-рэальнасці і ў мове» [9, с. 175].

**3. Пытанне супастаўляльнага аналізу полісемантычных лексем.** Немалаважную ролю ў кантрастыўнай лексікалогіі адыгрывае пытанне супастаўлення семантычнай структуры полісемантычных лексем, галоўнай умовай аб'ектыўнасці якога павінна з'яўляцца аднолькавая дробнасць значэнняў, якія вылучаюцца ў абедзвюх супастаўляемых мовах. Бо, як вядома, для правільнага выбару неабходнага лексіка-семантычнага варыянта ў маўленні на другой мове неабходна праводзіць паслядоўны ўлік фактараў, якія абумоўліваюць сабой разыходжанне ў складзе значэнняў мнагазначнага слова і іерархію гэтых значэнняў. Да такіх фактараў неабходна аднесці неаднолькавую ступень развіцця полісеміі супастаўляемых слоў у розных мовах, наяўнасць самастойных азначаючых для наймення тых ці іншых азначальных, якія ўваходзяць у адной з моў у структуру мнагазначнага слова; суаднесенасць з амонімамі, якія ўзніклі ў выніку распаду былой полісеміі.

Сапраўды, па словах Р. А. Будагава, «словы кожнай натуральнай мовы часцей за ўсё мнагазначныя і мнагапланавыя, таму лінгвіст павінен улічваць не толькі колькасны, але і якасны аспект самой лексікі. Так узнікае, у прыватнасці, важная і складаная праблема прыцягнення і аддалення слоў розных моў не толькі на ўзроўні ўласна слоў, але і на ўзроўні асобных значэнняў або груп значэнняў супастаўляемых лексем. Словы, падобныя ў адных значэннях, могуць не мець гэтага падабенства ў другіх» [5, с. 129].

Таму неабходна звяртаць увагу на тое, што, супадаючы ў адных значэннях, слова ў працэсе міжмоўнага супастаўлення можа не супадаць у другіх. «Прыцягванне слоў і іх аддаленне адно ад аднаго адбываецца ... не на ўзроўні саміх слоў як цэласных адзінак мовы, а *на ўзроўні асобных значэнняў* гэтых слоў, якія ўтвараюць у кожнай з супастаўляемых моў складаную семантычную структуру» [5, с. 123].

Як зазначае У. М. Манакін, «несупадзенне семантычных структур слоў у розных мовах – гэта адно з найбольш прыкметных разыходжанняў, якое адлюстроўвае істотныя асаблівасці моўных лексічных сістэм...» [9, с. 251].

Разгляд лексічнага значэння слова і ў адпаведнасці з гэтым устанаўленне характару іх семантычнага аб'ёму на ўзроўні полісемантычных лексем, бясспрэчна, ажыццяўляецца ў працэсе аналізу слоўнікавых дэфініцый і лексікаграфічнай рэпрэзентацыі слоў. Тым не менш адзначым, што немалаважным фактарам вызначэння лексіка-семантычных сувязей слоў з'яўляецца аналіз сінтагматычных адносін, у якія ўступаюць аналізуемыя словы. У першую чаргу, гэта тлумачыцца тым, што аналіз знакавага значэння праводзіцца не адасоблена, адарвана ад кантэкстнага акружэння, а з улікам яго функцыянавання ў складзе сінтагм ці элементарных прапазіцый.

А. А. Уфімцава, якая дэталёва разглядае семіялагічны аспект апісання лексікі, падыходзіць да пастуліравання слова ў яго дуалістычным праяўленні і ў сувязі з гэтым фармулюе прынцыпы семіялагічнага апісання лексічнай сістэмы мовы: «слова, як і мова ў цэлым, існуе ў дзвюх асноўных іпастасях – віртуальны і семантычна рэалізаваны славесны знак. Пры семіялагічным даследаванні слова як двухбаковай адзінкі мовы прадстаўляецца магчымасць здзейсніць скразное апісанне лексічнага значэння ў напрамку ад віртуальнага, семантычна непадзельнага слова-лексемы праз ступень адносна расчлянёных славесных знакаў, якія маніфестуюцца ў любой мове свабоднымі лексічнымі спалучэннямі слоў (мінімальнымі сінтагмамі), да поўнай семантычнай актуалізацыі слова ў складзе маўленчых адзінак» [14, с. 3–4].

Такі падыход абумоўлены разглядам слова як элемента лексіка-семантычнай сістэмы мовы ў рамках двух дыяметральна супрацьлеглых аспектаў – словацэнтрысцкім і тэкстацэнтрысцкім. Першы прадугледжвае разгляд слова ў трох асноўных іпастасях – слова-лексема як сукупнасць словаформ, слова ў адным з яго лексіка-семантычных варыянтаў і словаўжыванне, якое рэалізуецца непасрэдна ў маўленчым асяроддзі.

У рамках другога аспекту лексічнае значэнне разглядаецца ў напрамку ад тэксту, у якім функцыянуе слова, да выяўлення яго індывідуальных семантычных характарыстык, якімі і дэтэрмінуецца сэнс канкрэтнага выказвання або тэксту.

Разгляд функцыянавання слова ў кантэкстным акружэнні дазваляе дастаткова дакладна ажыццявіць дыферэнцыяцыю семантычных адносін і сувязей слоў, у выніку чаго статус кантэксту «з прымітыўнага паняцця «акружэнне» пераходзіць у статус лінгвагнасеалагічнага абгрунтавання дыялектычнага адзінства цэласнасці і дыскрэтнасці мовы, якая раскрывае рух думкі чалавека ў камунікацыі» [14, с. 14].

**4. Працэс вылучэння лексіка-семантычных карэлятыўных тыпаў.** У аснову вылучэння тыпаў лексіка-семантычных карэляцый пакладзены фармальна-лагічныя адносіны паміж паняццямі: раўназначнасць (супадзенне аб'ёмаў паняццяў), кан'юнкцыя (уключэнне), перасячэнне, дыз'юнкцыя (выключэнне). Дадзеныя тыпы фармальна-лагічных адносін могуць быць спраецыраваны на вылучэнне характэрных семантычных працэсаў і з'яў у галіне кантрастыўнай лексікалогіі. Такая ідэя не з'яўляецца нечым абсалютна новым і рэвалюцыйным, а, наадварот, служыць дэманстрацыйным прыкладам сістэмнага падыходу ў навуцы.

Так, кіруючыся адзначанымі вышэй фармальна-лагічнымі адносінамі раўназначнасці, кан'юнкцыі, дыз'юнкцыі і перасячэння, даследчык К. Ч. Кусаль разглядае аманімічную і паранімічную лексіку рускай і польскай моў. Разам з разглядам фармальнага аспекту аманіміі як лінгвістычнай з'явы даследчык праводзіць аналіз тыпаў семантычных суадносін з апорай на лагічную схему магчымых фармальна-сэнсавых суадносін паміж знакамі – тоеснасці, уключэння, перасячэння і, нарэшце, адсутнасці агульнай семантычнай часткі. Акрамя таго, даследчык закранае і сінтагматычны аспект функцыянавання руска-польскіх лексічных адзінак, які дазваляе раскрыць у працэсе спалучальных магчымасцей супастаўляемых лексічных адзінак спецыфіку іх семантычных сувязей і ўзаемаадносін.

Семантычныя адносіны *тоеснасці* сведчаць аб абсалютнай семантычнай эквівалентнасці лексічных адзінак у рамках супастаўляемых моўных сістэм. Але трэба пагадзіцца з пунктам по-

гляду А. Я. Супруна, які адзначае, што «...семантычная тоеснасць у лексіконе – з'ява хутчэй нетыповая, калі гаворка ідзе пра «нармальныя» словы, а не пра навукова-тэхнічныя тэрміны. Нават цалкам эквівалентныя па паказчыках перакладных слоўнікаў лексемы сур'ёзна адрозніваюцца па канатацыях» [11, с. 30].

Семантычныя адносіны *ўключэння* з прычыны сваёй двухбаковай прыроды прадстаўлены двума прыватнымі варыянтамі – расшырэннем і звужэннем семантычнага аб'ёму. *Расшырэнне* семантычнага аб'ёму мае месца ў тым выпадку, калі слова адной з супастаўляемых моў *А* мае больш шырокае значэнне, у той час як у другой мове *В* слова ўжываецца ў больш вузкім, прыватным значэнні. *Звужэнне* семантычнга аб'ёму прадстаўляе сабой адваротную сітуацыю ў напрамку ад мовы *А* да мовы *В*. «Адносіны ўключэння з'яўляюцца паказчыкам таго, што ў адной мове той ці іншы прадмет не мае спецыяльнага наймення, г. зн. пэўнае паняцце, якое існуе ў свядомасці носьбітаў мовы ў выглядзе комплексу семантычных прыкмет, не замацавана асобным славесным знакам, і для выражэння дадзенага паняцця выкарыстоўваецца найменне большага класа прадметаў, у той час як у другой мове адпаведная з'ява вылучаецца ў асобную семему» [9, с. 130].

У адносінах семантычнага *перасячэння* значэнні супастаўляемых слоў быццам накладваюцца адно на адно: адначасова ў іх складзе прысутнічае супадаючая частка, агульная для кожнага з супастаўляемых слоў, але ў той жа час у кожнага з іх ёсць і несупадаючы семантычны адрэзак.

Адносіны *выключэння* (дыз'юнкцыі) абумоўлены поўнай адсутнасцю агульнай часткі ў значэннях лексічных адзінак супастаўляемых моў. Як правіла, гэта выводзіць даследчыка ў сферу безэквівалентнай лексікі, якая сведчыць пра ўнікальнасць і непаўторнасць моўнай карціны свету, прызванай рэпрэзентаваць этнасацыякультурную рэальнасць пры супастаўленні яе з рэаліямі другой культуры.

Даследчык Р. А. Будагаў на матэрыяле раманскіх моў вылучае тыпы суадносін паміж значэннямі слоў у роднасных раманскіх мовах і будуе сваю класіфікацыю на дзвюх асновах – функцыянальнай і паняційнай. Класіфікацыя, якая прадстаўлена даследчыкам, можа быць ахарактарызавана як перакрыжаваная, у цэнтры якой знаходзяцца сістэмныя адносіны, якія пранізваюць лексіку кожнай мовы: першапачаткова прадстаўлена параўнальна-функцыянальная характарыстыка тыпаў значэння слоў у роднасных раманскіх мовах, а затым назіраецца, як суадносіцца выражэнне паняцця ў лексічнай сістэме адной з роднасных моў з выражэннем гэтага ж паняцця ў лексіцы другой (другіх) роднасных моў.

Функцыянальная аснова рэпрэзентавана шасцю пазіцыямі, у першай з якіх значэнні супастаўляемых лексем у дзвюх мовах прадстаўлены дыхатаміяй «асноўнае значэнне ў адной з моў – перыферыйнае ў другой». Р. А. Будагаў адзначае, што асобныя значэнні слова маюць тэндэнцыю паўтарацца ад мовы к мове, аднак групоўкі значэнняў з прычыны спецыфікі семантычнай структуры кожнага слова паўтарацца не могуць.

У другой пазіцыі значэнні супастаўляемых лексем прадстаўлены суадносінамі «архаічнае значэнне ў адной з моў – неархаічнае ў другой». Зыходзячы з камунікатыўнага аспекту дадзены тып суадносін, па заўвазе даследчыка, можа быць вызначаны як пазіцыя свабоднага і несвабоднага функцыянавання адпаведна.

Адносная свабода і звязанасць значэння служаць дастатковай падставай для вылучэння іх у якасці аднаго з маркераў у рамках трэцяй па ліку функцыянальнай аснове.

Чацвёртае пазіцыйнае рашэнне прадстаўлена некалькімі варыянтамі ў межах драблення адзінай функцыянальнай шкалы. Так, дадзены тып суадносін паміж значэннямі ў роднасных мовах прадугледжвае ўлік прыналежнасці лексемы супастаўляемых моўных структур да таго ці іншага стылявога асяроддзя: нейтральны стыль – высокі, нейтральны – зніжаны, высокі – зніжаны.

Пятая апазіцыя грунтуецца на паняццях нормы і не-нормы, літаратурнасці ў адной мове і нелітаратурнасці ў другой.

Нарэшце, апошняя пазіцыя фіксуе ўступленне аднаго са значэнняў полісемантычнага слова ў карэлятыўныя сувязі з адным са значэнняў зусім іншага слова ў другой мове ці яго ўзаемадзеянне з адназначнай лексемай у супастаўляемай мове.

Вылучэнне Р. А. Будаговым паняційнай асновы ажыццяўляецца з апорай на размежаванне лагічных паняццяў: родавое і відавое, абстрактнае і канкрэтнае і г. д.

Такім чынам, класіфікацыя, якая пабудавана з апорай на функцыянальную аснову, дазваляе праводзіць аналіз фактаў роднасных моў. Паняційная ж аснова дае магчымасць пашырыць сфе-

ру даследавання моўных фактаў і да сферы няроднасных моўных сістэм. Па словах Р. А. Будагава, такая класіфікацыя тыпаў значэнняў слоў, у аснову якой пакладзены адзначаныя вышэй функцыянальнае і паняційнае пазіцыйныя рашэнні, «абумоўлена неабходнасцю двухбаковага аналізу ў семасіялогіі: ад слоў у іх разнастайных і падчас супярэчлівых значэннях да паняццяў і ад гэтых апошніх да спосабаў іх жа перадачы ў мове і маўленні» [5, с. 128].

**Заключэнне.** 1. Супастаўляльныя даследаванні лексічных сістэм некалькіх моў у рэчышчы семасіялагічнага аспекту дапамагаюць выявіць факты падабенства і разыходжання, што, у сваю чаргу, дае магчымасць устанавіць ступень нацыянальнай своеасаблівасці, арыгінальнасці і самадастатковасці кожнай мовы паасобку.

2. Факт блізкай роднасці тых ці іншых моўных сістэм ні ў якім разе не ідэнтычны сцвярджэнню аб поўнай раўназначнасці лексічных адзінак у лексіцы супастаўляемых моў. Як правіла, нават у межах блізкароднасных моў ёсць разыходжанні ў семантычным аб'ёме лексічных адзінак і ў іх спалучальным патэнцыяле.

3. Правядзенне супастаўляльных даследаванняў у межах міжмоўнай лексічнай пары з апорай на фармальна-лагічныя адносіны паміж паняццямі дазваляюць вылучыць асноўныя лексіка-семантычныя карэлятыўныя тыпы – тоеснасць, уключэнне, перасячэнне і выключэнне.

4. Адным з важных семасіялагічных параметраў выступае аналіз семантычных структур полісемантычных лексем, што немалаважна ў ходзе паспяховай камунікацыі, якая заключаецца ў выбары неабходна правільнага лексіка-семантычнага варыянта ў маўленні на другой мове.

## Літаратура


1. К у н ц е в и ч, Л. П. Белорусско-русская паралексия: (типология паралекс и паралексическая интерференция): автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.02.01; 10.02.02 / Л. П. Кунцевич; Акад. наук Белорусской ССР, Ин-т языкознания им. Я. Коласа. – Минск, 1985. – 24 с.

2. Р о в д о, И. С. Межъязыковая омонимия в условиях русско-белорусского и белорусско-русского билингвизма: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.02.01; 10.02.02 / И. С. Ровдо; БГУ им. В. И. Ленина. – Минск, 1980. – 19 с.

3. С в и р и д е н к о, Е. А. Русско-белорусские гетеролексы: структурно-семантический аспект: автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.02.01; 10.02.02 / Е. А. Свириденко; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2005. – 21 с.

4. Б у д а г о в, Р. А. Сравнительно-семасиологические исследования (Романские языки) / Р. А. Будагов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1963. – 301 с.

5. Б у д а г о в, Р. А. Типы соответствий между значениями слов в родственных языках / Р. А. Будагов // Язык, история и современность / Р. А. Будагов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1977. – С. 109–130.

6. Г а к, В. Г. Сопоставительная лексикология. (На материале французского и русского языков) / В. Г. Гак. – М.: Междунар. отношения, 1977. – 264 с.

7. Г а к, В. Г. Языковые преобразования / В. Г. Гак. – М.: Школа «Языки русской культуры», 1998. – 768 с.

8. К у с а л ь, К. Ч. Русско-польская межъязыковая омонимия и паронимия: автореф. дис. ... д-ра филол. наук: 10.02.03 / К. Ч. Кусаль; СПб., гос. ун-т. – СПб., 2006. – 49 с.

9. М а н а к и н, В. Н. Сопоставительная лексикология / В. Н. Манакин. – К.: Знання, 2004. – 326 с.

10. Л а д о, Р. Лингвистика поверх границ культуры / Р. Ладо // Новое в зарубежной лингвистике. – М.,1989. – Вып. XXV: Контрастивная лингвистика. – С. 32–48.

11. С у п р у н, А. Е. Лексическая типология славянских языков / А. Е. Супрун. – Минск: Изд-во БГУ, 1983. – 47 с.

12. М е д н и к о в а, Э. М. Значение слова и методы его описания: учеб. пособие / Э. М. Медникова. – М.: Высш. школа, 1974. – 202 с.

13. W h i t n e y, W. D. The Life and Growth of Language / W. D. Whitney. – Henry S. King & Co., London, 1875. – 326 p.

14. У ф и м ц е в а, А. А. Лексическое значение: Принцип семиологического описания лексики / А. А. Уфимцева; под ред. Ю. С. Степанова. – 2-е изд., стереотип. – М.: Едиториал УРСС, 2002. – 240 с.

15. Б е р е ж а н, С. Г. Сопоставительное изучение микросистем лексики и обоснование системного характера переводных словарей / С. Г. Бережан // Методы сопоставительного изучения языков; отв. ред. В. Н. Ярцева. – М., 1988. – С. 32–37.



*T. V. FEDUNOVA*


**COMPARATIVE INVESTIGATIONS OF LEXICAL SYSTEM OF DIFFERENT LANGUAGES: EXPERIENCE OF THE SEMASIOLOGICAL ANALYSIS**

## Summary


Specificity of contrastive investigations which actualized in the network of lexical language's systems has been considered in the article. Correlation of the question about immediate relationship with the question about the degree of the equivalence of lexical units presenting the lexical base of every language has been disclosed. Both differentiation of such conceptions as the semantic value and content of lexical meaning needed to establish the types of lexical-semantic correlation within pairs of cross-language lexical have been presented. The necessity of separate analysis of polysemous lexical elements by the mismatch of semantic structures in different languages has been substantiated.

## *ВУЧОНЫЯ БЕЛАРУСІ*

# МІХАІЛ ФЁДАРАВІЧ ПІЛІПЕНКА

**(Да 75-годдзя з дня нараджэння)**



19 мая 2011 г. спаўняецца 75 гадоў з дня нараджэння выдатнага этнолага і гісторыка, члена-карэспандэнта Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара Міхаіла Фёдаравіча Піліпенкі.

Нарадзіўся Міхаіл Фёдаравіч у 1936 г. у вёсцы Нежыхаў Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Мазырскага педагагічнага вучылішча паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, які закончыў з адзнакай у 1961 г. Працаваў настаўнікам гісторыі Мамайскай васьмігадовай школы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці, а затым Каплічскай сярэдняй школы на Гомельшчыне. У 1964 г. Міхаіл Фёдаравіч паспяхова здаў экзамены і быў залічаны ў вочную аспірантуру Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава. Яго навуковым кіраўніком быў прызначаны доктар гістарычных навук, прафесар кафедры этналогіі МДУ Леў Паўлавіч Лашук, навуковыя інтарэсы якога былі шырокімі і рознабаковымі, а прафесійная кваліфікацыя і эрудыцыя, па сведчанню калег, была надзвычай высокай. За час вучобы ў аспірантуры М. Ф. Піліпенка атрымаў глыбокую і рознабаковую падрыхтоўку па этналогіі, падрыхтаваў арыгінальную кандыдацкую дысертацыю аб сям'і і шлюбе беларускіх сялян. Пасля заканчэння аспірантуры з кастрычніка 1967 г. працаваў на гістарычным факультэце БДУ спачатку выкладчыкам кафедры гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, а затым дацэнтам кафедры археалогіі, этнаграфіі і дапаможных гістарычных дысцыплін.

Ва ўніверсітэце Міхаіл Фёдаравіч паспяхова распрацаваў і чытаў для студэнтаў гістарычнага факультэта агульны лекцыйны курс – «Асновы этнаграфіі», а таксама спецыяльныя курсы «Этнаграфія Беларусі», «Метады этнаграфічных даследаванняў», «Этнічная гісторыя Беларусі». Шмат увагі М. Ф. Піліпенка надаваў падрыхтоўцы будучых этнографаў. Пад яго кіраўніцтвам паспяхова былі напісаны і абаронены дыпломныя работы студэнтамі, якія ў далейшым звязалі свой лёс з этналагічнай навукай. Выкладчыцкую дзейнасць у БДУ М. Ф. Піліпенка спалучаў з актыўнай і сістэматычнай навуковай працай. М. Ф. Піліпенка распрацоўвае праблему этнагенезу і этнічнай гісторыі беларускага народа, пытанні эвалюцыі форм сям'і, сямейных і грамадскіх адносін, традыцыйных народных вераванняў беларусаў і інш. Шмат увагі вучоны надае таксама даследаванню тэарэтыка-метадалагічных пытанняў, гісторыі, сучаснаму стану і перспектывам развіцця беларускай этналагічнай навукі.

Высокі навуковы аўтарытэт і ўклад у развіццё этналагічнай навукі паспрыялі пераходу М. Ф. Піліпенкі на працу ў Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі на пасаду загадчыка аддзела этнаграфіі. У 1993 г. ён абараняе доктарскую дысертацыю. Праз год яго выбіраюць членам-карэспандэнтам АН Беларусі, з мая 1994 г. па чэрвень 2004 г. ён працуе дырэктарам інстытута, з 2004 г. на пасадзе галоўнага навуковага супрацоўніка.

Асабліва патрэбна адзначыць навуковую і арганізацыйную дзейнасць М. Ф. Піліпенкі на пасадзе дырэктара інстытута. У складаных умовах 1990-х гг., скарачэння бюджэтнага фінансавання,

Міхаіл Фёдаравіч захаваў навуковы патэнцыял інстытута, у тым ліку і кадравы склад этнолагаў. Пад яго кіраўніцтвам пашырыліся і паглыбіліся навуковыя даследаванні. Атрымала далейшае развіццё беларуская этналагічная школа.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам М. Ф. Піліпенкі паспяхова выкананы навуковыя тэмы «Традыцыйныя формы быту і матэрыяльнай культуры беларускага этнасу» (1996–2000), «Славянскія этнакультурныя традыцыі Беларусі» (2001–2005), «Традыцыі народнай культуры этнічных супольнасцей Беларусі» (2006–2010). Толькі па выніках даследавання апошняй тэмы апублікавана 14 манаграфій, 19 падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, 158 навуковых артыкулаў. Міхаіл Фёдаравіч творча падышоў да абгрунтавання новай планавай тэмы «Этнакультурнае развіццё Рэспублікі Беларусь» (2011–2015), кіраўніком якой ён прызначаны.

М. Ф. Піліпенка выступіў адным з арганізатараў падрыхтоўкі і выдання шматтомнага даследавання «Беларусы», прыняў удзел у напісанні чацвёртага, пятага і шостага калектыўных тамоў, з'яўляўся членам рэдкалегіі дзевяці тамоў. Неабходна адзначыць, што гэтае выданне засноўваецца на шырокіх крыніцах (архіўных, палявых, статыстычных, картаграфічных і іншых матэрыялах), вылучаецца сваёй маштабнасцю, грунтоўным аналізам самых розных бакоў жыццядзейнасці беларускага народа (гісторыі этналагічнага вывучэння, вытокаў і этнічнага развіцця беларускага этнасу, промыслаў і рамёстваў, дойлідства, сям'і, грамадскіх традыцый і інш.). Шматтомнае выданне «Беларусы» атрымала шырокае прызнанне ў нашай краіне і за яе межамі.

Кола навуковых інтарэсаў М. Ф. Піліпенкі сапраўды неабмежаванае. Ён аўтар звыш 200 публікацый, сярод якіх найбольш значнымі з'яўляюцца «Сляды родавай арганізацыі ў вясельных звычаях славянскіх народаў» (1969), «Сям'я і шлюб у беларускіх сялян у другой палове XIX – пачатку XX ст.» (1970), «З гісторыі вывучэння беларускай этнаграфіі і фальклору» (1970), «Даследаванні па гісторыі беларускай этнаграфіі» (1974), «Этнаграфія ў краязнаўстве» (1980), «Этнаграфія Беларусі» (1980), «Сучасныя этнічныя і культурна-бытавыя працэсы ў Беларусі» (1982), «Роля эвалюцыі і дыфузіі ў гісторыі традыцый» (1990), «Беларуская традыцыйная культура як феномен еўрапейскай цывілізацыі» (1995); сааўтар калектыўных навуковых прац «Беларуская народная педагогіка» (1996), «Беларусы. Т.4. Вытокі і этнічнае развіццё» (2001), «Беларусы. Т. 5. Сям'я» (2001), «Беларусы. Т.6. Грамадскія традыцыі» (2002) і інш.

Вынікам шматгадовай працы вучонага па праблеме паходжання беларускага народа з'явілася новая канцэпцыя, выкладзеная ім у манаграфіі «Узнікненне Беларусі: Новая канцэпцыя» (1991), асноўныя палажэнні якой былі працягнуты і ўдакладнены аўтарам у працах наступнага часу – «Канцэпцыі ўзнікнення Беларусі», «Старажытныя этнічныя супольнасці на тэрыторыі Беларусі», «Фарміраванне Русі», «Гістарычныя, сацыяльна-эканамічныя, палітычныя ўмовы ўзнікнення Беларусі», «Усталяванне назвы Беларусь» («Беларусь на мяжы тысячагоддзяў», 2000). Аўтар адмовіўся ад уяўлення аб этнагенетычным працэсе паходжання беларусаў як спрошчанай эвалюцыі папярэдніх этнічных супольнасцей, а таксама тлумачэння этнагенезу вынікамі вялікіх міграцый старажытных славянскіх плямёнаў. У сваім даследаванні ён улічвае ролю многіх фактараў (сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, гістарычнага), асаблівую ўвагу звяртае на ролю дыфузіі ў этнічных працэсах, прасторавую і эпахальную перагрупоўку кампанентаў культуры, іх пераемнасць і зменлівасць мовы і самасвядомасці.

Важным кірункам дзейнасці М. Ф. Піліпенкі з'яўляецца аднаўленне і пашырэнне навуковых сувязей, у першую чаргу з навуковымі ўстановамі суседніх краін. Міхаіл Фёдаравіч прыняў актыўны ўдзел у падрыхтоўцы і выданні тома «Беларусы» (М., 1998), міжнароднай серыі «Народы і культуры», з'яўляўся адным з адказных рэдактараў тома, які атрымаў высокую ацэнку навукоўцаў і шырокай грамадскасці.

М. Ф. Піліпенка актыўна ўдзельнічае ў папулярызацыі навуковых ведаў. Ён з'яўляецца членам рэдкалегіі «Беларускай энцыклапедыі» ў 18 тамах, энцыклапедый «Гарады і вёскі Беларусі» ў 6 тамах, «Беларускі фальклор» у 2 тамах, членам навукова-рэдакцыйнага савета энцыклапедый «Гісторыя Беларусі» ў 6 тамах, падрыхтаваў серыю артыкулаў да гэтых выданняў, выступае па беларускім радыё і тэлебачанні.

Значны ўклад унёс Міхаіл Фёдаравіч у падрыхтоўку навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі. Шмат гадоў узначальвае ён савет па абароне доктарскіх дысертацый, на высокім узроў-

ні праводзіць экспертызы дысертацый. Дысертацыі, абароненыя ў савеце, станоўча ацэнены Вышэйшай атэстацыйнай камісіяй. Асабіста падрыхтаваў 8 кандыдатаў і 3 дактароў навук, якія працуюць у навуковых і вышэйшых навучальных установах Рэспублікі Беларусь.

Як вядомаму спецыялісту па беларускай этналогіі, аўтару шматлікіх грунтоўных прац, ініцыятыўнаму арганізатару навукова-даследчай працы, клапатліваму настаўніку М. Ф. Піліпенку ў 1995 г. было прысвоена званне прафесара, у 1994 г. ён быў абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. У 1999 г. яму было прысуджана ганаровае званне заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь.

Свой юбілей Міхаіл Фёдаравіч сустракае ў росквіце творчага таленту, поўны цікавых ідэй і планаў. Ён працягвае працу ў галіне беларускай этналогіі, актыўна ўдзельнічае ў навуковых дыскусіях, выступае з дакладамі на навуковых канферэнцыях, чытае лекцыі па праблеме этнагенезу беларускага народа. Дырэкцыя Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі, навуковая грамадскасць, калегі, сябры і вучні сардэчна віншуюць шаноўнага Міхаіла Фёдаравіча з юбілейнай датай і жадаюць яму моцнага здароўя, дабрабыту і доўгіх гадоў актыўнай навуковай, педагагічнай і грамадскай дзейнасці.

*А. І. ЛАКОТКА, Г. І. КАСПЯРОВІЧ, Т. А. НАВАГРОДСКІ*

# АЛЯКСАНДР АЛЯКСАНДРАВІЧ КАВАЛЕНЯ

**(Да 65-годдзя з дня нараджэння)**



У асяроддзі навукоўцаў, педагогаў і студэнтаў шырока вядома імя акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Аляксандравіча Кавалені.

Нарадзіўся Аляксандр Аляксандравіч 14 сакавіка 1946 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці ў сям'і настаўніка. Бацька – Аляксандр Емяльянавіч, былы партызан, пасля Вялікай Айчыннай вайны працаваў дырэктарам школы, маці – Ганна Аляксандраўна, партызанская сувязная ў гады Вялікай Айчыннай вайны, рызыкуючы жыццём, выконвала баявыя заданні, пасля вайны была хатняй гаспадыняй. У вялікай дружнай сям'і было 6 дзяцей: 4 хлопцы і 2 дзяўчынкі. Менавіта ў сям'і, а затым у школе сфарміраваліся цэльнасць характару Аляксандра Аляксандравіча, яго пастаянная прага да ведаў, настойлівасць і працавітасць.

Пасля заканчэння дзевяці класаў А. А. Каваленя ў 1962 г. паступіў у Мінскае ПТВ № 23, якое скончыў на выдатна і атрымаў спецыяльнасць слесара. Навучанне ў прафесійным вучылішчы юнак сумяшчаў з вучобай у школе рабочай моладзі, якую паспяхова закончыў у 1964 г. Малады хлопец актыўна ўдзельнічаў у грамадскім жыцці. Яго заняткі ў аэраклубе і радыёшколе паўплывалі на тое, што пасля прызыву ў рады Савецкай Арміі ён быў накіраваны ў элітныя дэсантныя войскі. У 1968 г. Аляксандр Аляксандравіч быў дэмабілізаваны ў званні сяржанта і адразу прадоўжыў працу на будоўлях Мінска.

У 1970 г. ён паступіў на гісторыка-геаграфічны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. У інстытуце актыўна займаўся грамадскай дзейнасцю, працаваў у студэнцкіх будаўнічых атрадах у Карэліі, Сібіры, на будоўлях Беларусі. Выкладчыкі і сябры паважалі сціплага і працавітага студэнта, неаднаразова выбіралі яго старшынёй прафсаюзнага бюро факультэта, з 1974 па 1979 г. А. А. Каваленя ўзначальваў студэнцкі прафсаюзны камітэт інстытута.

У 1973 г. Аляксандр Аляксандравіч ажаніўся, у 1975 г. у яго нарадзілася дачка Алена. Нягледзячы на ўсе жыццёвыя цяжкасці, вось ужо 38 гадоў побач з ім яго жонка Тамара Кузьмінічна. У іх падрастае ўнучка Насця.

У 1979 г. А. А. Каваленя стаў аспірантам кафедры гісторыі КПСС МДПІ імя М. Горкага. Яму пашанцавала быць аспірантам, а потым і дактарантам таленавітага вучонага, выдатнага чалавека, доктара гістарычных навук, прафесара Аляксандра Мікалаевіча Мацко. У 1983 г. пад яго кіраўніцтвам ён абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Идейно-политическая работа подпольных партийных организаций КП(б)Б в партизанских зонах».

Са снежня 1982 г. Аляксандр Аляксандравіч працаваў на пасадзе асістэнта кафедры гісторыі КПСС МДПІ імя М. Горкага, а ў маі 1987 г. быў абраны на пасаду дацэнта гэтай кафедры. З 1983 па 1991 г. ён з'яўляўся членам Рэспубліканскага каардынацыйнага савета па распрацоўцы праблем гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з 1987 г. падтрымліваў цесныя сувязі з аддзелам ваеннай гісторыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі, удзельнічаў у распрацоўцы дзяржаўных праграм фундаментальных даследаванняў нацыянальнай гісторыі Беларусі. У 1994 г. быў

залічаны ў дактарантуру, а ў 1996 г. абраны загадчыкам кафедры айчыннай і сусветнай гісторыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Пад кіраўніцтвам А. А. Кавалені кафедра стала адным з цэнтраў вывучэння і папулярызацыі гісторыі Другой сусветнай вайны.

Станоўчую ацэнку навуковай грамадскасці атрымалі выдадзеныя ім манаграфіі і вучэбныя дапаможнікі, якія падрыхтаваны з улікам новых метадалагічных падыходаў і з'яўляюцца вынікам дзясяткаў гадоў працы ў архівах і бібліятэках, шматлікіх сустрэч і гутарак са сведкамі гістарычных падзей. Манаграфія Аляксандра Аляксандравіча «Беларусь у гады Другой сусветнай вайны (1939–1945)» (Мн., 1996) была адзначана прэміяй і Дыпломам лаўрэата конкурсу БДПУ імя Максіма Танка за 1997 г. Вынікам руплівага пошуку даследчыка стала манаграфія «Прагерманскія саюзы моладзі на Беларусі. 1941–1944. Вытокі. Структура. Дзейнасць» (Мн., 1999). У 2000 г. па гэтай тэме А. А. Каваленя абараніў доктарскую дысертацыю, якая ўнесла важкі ўклад у навуковае вырашэнне адной з самых складаных і вострых праблем айчыннай гісторыі перыяду Другой сусветнай вайны. У 2004 г. яму было прысвоена навуковае званне прафесара. Падрыхтаваны пад кіраўніцтвам Аляксандра Аляксандравіча па даручэнні Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь вучэбна-метадычны комплекс «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны)» (Мн., 2006–2009), які ўключае праграму, падручнікі для ВНУ і сярэдніх агульнаадукацыйных устаноў (адзначаны спецыяльнымі дыпломамі на рэспубліканскіх конкурсах «Мастацтва кнігі» ў 2005 і 2006 гг.), даведнік, рабочы сшытак, хрэстаматыю, дапаможнік для настаўніка, прызнаны лепшым сярод краін СНД. Але самай высокай адзнакай гэтай тытанічнай працы з'яўляюцца шматлікія падзякі ад настаўнікаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны.

У 2004–2010 гг. А. А. Каваленя працаваў дырэктарам Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі і выразна прадэманстраваў, што ён не толькі таленавіты вучоны і педагог, але і выдатны арганізатар навукі. Дзякуючы энергіі і арганізацыйнаму таленту Аляксандра Аляксандравіча як кіраўніка, Інстытут гісторыі ператварыўся ў дзяржаўны цэнтр арганізацыі сістэмных гістарычных даследаванняў; навукоўцы Інстытута паспяхова выканалі Дзяржаўную комплексную праграму навуковых даследаванняў на 2006–2010 гг. «Гісторыя беларускай нацыі, дзяржаўнасці і культуры»; упершыню за ўсю гісторыю краіны ў Інстытуце была адкрыта ўнікальная Археалагічная навукова-музейная экспазіцыя, якая яскрава раскрывае багатую гісторыка-культурную спадчыну Беларусі; вучонымі Інстытута былі падрыхтаваны і рэалізаваны на практыцы навуковыя канцэпцыі абноўленага музея гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, музея прыроды і гісторыі Нацыянальнага парка «Белавежская пушча», а таксама распрацавана навуковая канцэпцыя Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь.

У лютым 2009 г. А. А. Кавалене быў аказаны высокі давер з боку кіраўніцтва дзяржавы. Ён быў прызначаны Акадэмікам-сакратаром Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі і ўведзены ў склад Прэзідыума акадэміі навук.

Сёння Аляксандр Аляксандравіч у творчым росквіце. За час яго навукова-педагагічнай дзейнасці ім апублікавана каля 40 асабістых і калектыўных манаграфій, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, больш за 300 навуковых артыкулаў. Ён з'яўляецца навуковым рэдактарам і рэцэнзентам звыш 60 манаграфій, навуковых зборнікаў, навукова-метадычных дапаможнікаў, падручнікаў і дысертацыйных прац. Пад яго навуковым кіраўніцтвам сфарміравана цэлая навуковая школа маладых даследчыкаў Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў. Ім падрыхтаваны 4 кандыдаты навук і 8 магістраў. Ужо 6 гадоў А. А. Каваленя ўзначальвае савет па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый у Інстытуце гісторыі НАН Беларусі. Аляксандр Аляксандравіч – навуковы рэдактар, член рэдакцыйных калегій і саветаў часопісаў «Доклады Национальной академии наук Беларуси», «Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук», «Архівы і справаводства», «Беларуская думка», «Беларускі гістарычны часопіс», «Гісторыя праблемы выкладання», «Историческое пространство. Проблемы истории стран СНГ», «Нёман».

Сведчаннем высокага навуковага аўтарытэту А. А. Кавалені з'яўляецца яго ўдзел у міжнародных кангрэсах, сімпозіумах і канферэнцыях не толькі ў Беларусі, але і далёка за яе межамі. За час навукова-педагагічнай дзейнасці ён прыняў удзел больш чым у 130 навуковых канферэнцыях, кангрэсах, сімпозіумах і «круглых сталах», пры гэтым выступіў арганізатарам каля 90 з іх.

За вялікую плённую працу Аляксандр Аляксандравіч неаднаразова адзначаўся Ганаровымі граматамі прафсаюзных камітэтаў розных узроўняў, двойчы (у 2002 і 2003 гг.) – Пасведчаннем Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за асабісты ўклад у развіццё здольнасцей таленавітай моладзі, у 2002 г. з'яўляўся стыпендыятам Спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, у гэтым жа годзе ўзнагароджаны знакам «Выдатнік адукацыі», у 2005 г. – юбілейным медалём «60 год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў», у 2006 г. – медалём Францыска Скарыны, у 2009 г. – Падзякай Упраўлення справамі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і Ганаровай граматай НАН Беларусі, у 2010 г. – юбілейным медалём «У гонар 80-годдзя Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». За ўклад ва ўмацаванне адзінства славянскіх народаў у 2006 г. абраны сапраўдным членам Міжнароднай славянскай акадэміі адукацыі імя Я. А. Каменскага.

Бясспрэчна, сёння А. А. Каваленя – адзін з буйнейшых спецыялістаў у галіне гістарычнай навукі. З нагоды 65-годдзя Аляксандра Аляксандравіча яго вучні, сябры, калегі жадаюць глыбокапаважанаму юбіляру добрага здароўя, творчага натхнення і новых поспехаў на ніве арганізацыйнай дзейнасці дзеля росквіту сацыяльна-гуманітарных навук нашай краіны.

*М. П. КАСЦЮК, В. В. ДАНІЛОВІЧ*

# *РЕФЕРАТЫ*

*УДК 101.1: 316. 4 + 316.2*

Н о в и ц к а я Т. Е. **Современные релятивистские модели социального пространства** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 4–8.

Анализируются истоки современных релятивистских моделей социального пространства, а также схемы его организации и конституирования. Рассматриваются методологические перспективы применения данных моделей в ходе анализа социальных трансформаций в контексте глобализации.

Библиогр. – 11 назв.

*УДК 13*

К в и л и н к о в а Е. Н., С а к о в и ч А. А. **Национальные культуры в условиях глобализации** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 9–14.

Высказывается тезис о реальности утраты культурной идентичности в результате процессов глобализации не только для малочисленных, но и для многочисленных народов. Затрагиваются некоторые аспекты, связанные с проблемой сохранения национальной культурной идентичности. Особое внимание уделяется рассмотрению соотношения глобальной и национальной культур в условиях глобализационных процессов. Отмечаются устойчивые элементы культуры, а также те области, в которых результаты этнокультурных контактов наиболее заметны (язык, музыка, танцы).

Библиогр. – 14 назв.

*УДК 316.334.2:330.16*

П а л х о в с к а я Е. Б. **Теоретико-методологические подходы к изучению экономического поведения** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 15–21.

Анализируются основные теоретико-методологические подходы к изучению экономического поведения: экономический, экономико-социологический и социологический. Осмысление феномена экономического поведения берет свое начало в экономической теории, в трудах таких экономистов, как А. Смит, А. Маршалл, П. Хейне. Постепенно процесс развития научных взглядов на проблему экономического поведения привел к социологизации экономической мысли. Появляется экономико-социологический подход к анализу экономического поведения индивида. К основным представителям данного подхода можно отнести К. Маркса, Т. Веблена, В. Зомбарта, Й. Шумпетера. В рамках данного подхода происходит интеграция «экономического» и «социального» в изучении феномена экономического поведения. Желание исследователей вписать экономическое поведение в систему социальных связей и социальных институтов привело к возникновению социологического подхода к изучению экономического поведения (основные представители Э. Дюркгейм, М. Вебер, Р. Мертон, М. Грановеттер). Благодаря анализу категории «экономическое поведение», всесторонне изложенному в трудах западных представителей социально-экономической мысли, современные социологи эффективно изучают данный социальный феномен, описывают факторы, влияющие на формирование экономического поведения, выстраивают модели и типологии экономического поведения индивида.

Библиогр. – 17 назв.

*УДК 351*

Д а в ы д и к В. В. **Нормативная правовая база государственной пограничной политики Республики Беларусь** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С.22–27.

Проведен анализ существующей нормативной правовой базы государственной пограничной политики Республики Беларусь, а также изложены рекомендации по ее совершенствованию.

Библиогр. – 9 назв.

*УДК 347.78*

Л о с е в С. С. **Имущественные авторские права в гражданском праве Республики Беларусь** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 28–34.

Статья посвящена исследованию основных теоретических проблем, связанных с определением содержания имущественных авторских прав.

Обзор научных работ отечественных и российских ученых, занимающихся проблематикой авторского права, а также системный анализ законодательства Республики Беларусь позволяют выделить в качестве основных вопросы о соотношении используемых в законодательстве терминов «имущественные авторские права» и «исключительные авторские права», о содержании исключительного права на произведение, а также о правовой природе права на авторское вознаграждение.

Анализируя соотношение понятий «иимущественные авторские права» и «исключительное авторское право», автор делает вывод о том, что эти понятия соотносятся как общее и частное, при этом к категории «имущественные авторские права» наряду с исключительным авторским правом относятся и иные права имущественного характера, названные в Законе Республики Беларусь «Об авторском праве и смежных правах».

Содержание исключительного авторского права можно определить как право использовать произведение в любой форме и любым способом. При этом позитивная составляющая исключительного права не исчерпывается теми способами использования произведения, которые перечислены в ст.16 Закона Республики Беларусь «Об авторском праве и смежных правах».

По своей правовой природе право на авторское вознаграждение является обязательственным правом требования, имеющим характер встречного предоставления в рамках договора с третьим лицом по поводу использования произведения. От авторского вознаграждения необходимо отграничивать компенсационные выплаты, предусматриваемые законодательством за воспроизведение отдельных видов произведений, осуществляемое в личных целях без согласия правообладателя.

Исследование названных выше теоретических вопросов позволяет сформулировать отдельные предложения, которые могут быть учтены при доработке проекта нового Закона Республики Беларусь «Об авторском праве и смежных правах».

Библиогр. – 26 назв.

*УДК 630*945.14:339.9*

Н и к и т е н к о П. Г., П о ч е к и н В. Л. **Научные основы информационной безопасности внешней экономической деятельности** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 35–45.

В условиях неуклонного развития процессов глобализации резко обострились проблемы безопасности международных экономических отношений. Возникла необходимость расширения исследований в области научных основ обеспечения безопасности внешней экономической деятельности на разных уровнях.

Центральное место в этой системе занимает обеспечение информационной безопасности, она рассматривается как одна из приоритетных задач.

Даются анализ и обзор исследований в области информационной безопасности, раскрываются экономические и политические факторы, определяющие необходимость интенсификации исследований и создания научных основ обеспечения безопасности, определены направления дальнейших исследований и разработок, их последовательность и приоритетность.

Ил. 6. Библиогр. – 43 назв.

*УДК 334.012.64/.65.001.76:303.4(476)*

С а ф о н о в а О. А. **Методические аспекты идентификации и формирования кластеров в модели социально-экономического развития Республики Беларусь** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 46–52.

Предлагается методический подход к формированию кластера. Предложенный методический подход включает следующие этапы: 1) анализ и оценку условий создания кластера; 2) структурирование кластера; 3) методическое обеспечение эффективного функционирования кластера; 4) оценку эффективности функционирования кластера.

Ил. 1. Библиогр. – 17 назв.

*УДК 947.6:371*

З я б к о А. А. **Отношение белорусских учителей к воинской обязанности накануне и в годы Первой мировой войны** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 53–58.

Исследуется проблема отношения белорусских учителей к службе в российской императорской армии, а также их отношение к Первой мировой войне. Автор указал причины, которые вызвали негативное отношение учителей из белорусских губерний к военной службе, определил влияние идей белорусского национального движения на восприятие учителями Первой мировой войны.

Библиогр. – 19 назв.

*УДК 930.2 (476)*

Ф и р и н о в и ч Е. Э. **«Женский фактор» в восстании 1863–1864 гг.: информационный потенциал белорусских архивохранилищ** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 59–65.

Рассматриваются информационные возможности документальных материалов отечественных архивов в раскрытии степени присутствия «женского фактора» в событиях 1863–1864 гг. на территории Беларуси. На основании выявленного комплекса источников проведен статистический анализ участия женщин в восстании 1863–1864 гг., исследованы формы и способы женской политической активности, а также виды и степень наказаний за антиправительственную деятельность в 60-е гг. XIX в. Особое внимание уделяется специфике источников местного происхождения в освещении данной проблемы.

Табл. 1. Библиогр. – 31 назв.

*УДК 94 (476–15) «1921/1939»*

Р а д ю к А. Л. **Белорусские кооперативы в Западной Беларуси (1921–1939 гг.): современное состояние исследования проблемы** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 66–73.

Статья посвящена истории изучения проблемы деятельности белорусских кооперативов в Западной Беларуси в период ее нахождения в составе Польши. Проведенный анализ показал, что на сегодняшний день в отечественной историографии отсутствуют специальные исследования по представленной тематике. Абсолютное большинство научных работ затрагивают вопросы деятельности белорусских кооперативов только косвенно и фрагментарно. Представители польской исторической науки уделили несколько большее внимание данной проблеме, но и в их трудах история белорусских кооперативов отражена только частично.

Библиогр. – 61 назв.

*УДК 784.036(476)*

С е м и к о в а Е. В. **Вокальное эстрадное искусство Беларуси: этапы становления и развития в XX веке** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 74–82.

Статья посвящена обзору исторического развития вокального эстрадного жанра в Беларуси. Автором освещаются основные вехи в изменении жанровых и стилевых акцентов вокального эстрадного искусства в XX веке до наших дней, предлагается периодизация его развития. Подчеркивается основной комплекс художественных проблем современной эстрады, формулируется значение актуального понятия эстрадоведения «формат». Отмечается отрыв научного исследования феномена вокального эстрадного искусства от его практической роли и значения в современной массовой культуре.

Библиогр. – 23 назв.

*УДК 78.07*

К л и м о в и ч Ю. М. **Ансамблевое музицирование как вид музыкально-исполнительской деятельности** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 83–87.

Статья посвящена анализу сущности ансамблевого музицирования в контексте музыкально-исполнительской деятельности. Автор предлагает различные подходы к пониманию исполнительской деятельности и музицирования. Особое внимание уделяется соотношению композиторского и исполнительского творчества. Автор придерживается точки зрения, что исполнительская деятельность и, в частности, музицирование как ее вид является вторичной по отношению к творчеству композитора, однако это не снижает ее художественной ценности.

Опираясь на основные характеристики ансамблевого музицирования как вида коллективной исполнительской деятельности, а также принципы ансамблевой игры, автор предлагает определение понятию «ансамблевое музицирование».

Библиогр. – 12 назв.

*УДК 070.1:316.776.2:659.4.78*

С в е р д л о в П. Л. **Проблемы авторства в белорусской музыкальной журналистике** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 88–94.

Статья посвящена анализу влияния на журналистское творчество коммуникационных процессов, набирающих силу в отечественном шоу-бизнесе. Автор разделяет понятия «музыкальная критика и «музыкальная журналистика», рассматривая последнюю как особый формат информационно-аналитической работы, в настоящее время зачастую смыкающийся с пиаром.

Табл. 1. Ил. 1. Библиогр. – 10 назв.

*УДК 882.6 (092) МЕЛЕЖ + 882.6–31.09*

Г о р о д н и ц к и й Е. А. **Субъектность структуры романа Ивана Мележа «Метели, декабрь»** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 95–100.

Анализируются особенности повествовательной структуры романа Ивана Мележа «Метели, декабрь». В качестве основного способа дифференциации структуры повествования рассматривается соотношение точек зрения автора и героя. Исследуются языковые формы выражения точек зрения в художественном произведении. Утверждается многообразие повествовательных средств романа.

Библиогр. – 3 назв.

*УДК 82.0398 (= 161.3)*

Ш а м я к и н а С. В. **Системность компонентов содержательной структуры вещественных образов (на материале белорусских волшебных сказок)** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 101–105.

Рассматривается структура особого типа художественных образов – вещественных, к которым относятся персонажи, локусы и вещи. Анализируется отличие данного типа образов от образов-тропов. Основное внимание уделяется компонентам содержательной структуры вещественных образов и системным взаимосвязям между ними на примере анализа текстов белорусских волшебных сказок. Изучаются также вопросы читательского восприятия образов, создания их общего идейного содержания и приводится концепция о схожести структуры вещественных образов с хаотическими системами.

Библиогр. – 9 назв.

*УДК 808.26.: 800.22*

М о р о з В. К. **Летописные разночтения как отражение вариантного употребления форм в нормотворческих процессах старобелорусского языка** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 106–111.

Рассматриваются факты лингвистических разночтений в однородных структурных фрагментах белорусских летописей XIV–XVI вв. на предмет выявления наиболее распространенных фонетических вариантов. Обосновывается положение о том, что вариантность выступает объективным показателем выработки устойчивых норм древнего белорусского литературно-письменного языка.

Библиогр. – 5 назв.

*УДК 81'373*

Ф е д у н о в а Т. В. **Сопоставительные исследования лексической системы языков: опыт семасиологического анализа** // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманіт. навук. 2011. № 2. С. 112–118.

Анализируется специфика сопоставительных исследований лексических языковых систем. Рассмотрено соотношение вопроса о близком родстве языков с вопросом о степени эквивалентности лексических единиц, составляющих лексическую базу каждого языка. Представлено разграничение понятий семантического объема и содержания лексического значения, необходимых для установления типов лексико-семантических корреляций в пределах межъязыковой лексической пары. Обоснована необходимость отдельного анализа полисемантических лексем в силу несовпадения семантических структур в разных языках.

Библиогр. – 15 назв.